МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ
РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

# ВУЧЭБНЫЯ ПРАГРАМЫ

## па вучэбных прадметах для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання і выхавання

# XI КЛАС

## (ПАВЫШАНЫ ЎЗРОВЕНЬ)

2016



МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

# ВУЧЭБНЫЯ ПРАГРАМЫ

**па вучэбных прадметах
для ўстаноў
агульнай сярэдняй адукацыі
з беларускай мовай навучання
і выхавання**

## XI КЛАС

(ПАВЫШАНЫ ЎЗРОВЕНЬ)

*Зацверджана
Міністэрствам адукацыі
Рэспублікі Беларусь*

МІНСК
НАЦЫЯНАЛЬНЫ ІНСТЫТУТ АДУКАЦЫІ
2016

УДК 373.5.091.214
ББК 74.202
В90

## ЗМЕСТ

Беларуская мова ........ 3
Беларуская літаратура ........ 12
Русский язык ........ 32
Русская литература ........ 55
Замежная мова ........ 84
Матэматыка ........ 109
Гісторыя Беларусі ........ 121
Сусветная гісторыя ........ 134
Грамадазнаўства ........ 153
Геаграфія ........ 173
Біялогія ........ 200
Фізіка ........ 218
Хімія ........ 230

**ISBN 978-985-559-649-4**

© Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, 2016
© НМУ «Нацыянальны інстытут адукацыі», 2016

# БЕЛАРУСКАЯ МОВА

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Праграма па беларускай мове для XI класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання (павышаны ўзровень) падрыхтавана ва ўмовах пераходу сістэмы адукацыі на профільнае навучанне і дапрофільную падрыхтоўку. Пры распрацоўцы праграмы па беларускай мове на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі ўлічвалася магчымасць выбару вучнямі ўзроўню вывучэння прадмета — базавага ці павышанага.

Праграма складзена з улікам узроставых асаблівасцей вучняў (X—XI класы) і псіхолага-педагагічнай дыферэнцыяцыі і рэалізуе сістэмна-функцыянальны, камунікатыўна-дзейнасны, лінгвакультуралагічны і кампетэнтнасны падыходы да арганізацыі адукацыйнага працэсу, у адпаведнасці з якімі навучанне, выхаванне і развіццё асобы на сучасным этапе ажыццяўляецца на аснове засваення не толькі прадметных ведаў, уменняў і навыкаў, а і ўніверсальных вучэбных дзеянняў, актывізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў, іх гатоўнасці да самаразвіцця і самаадукацыі.

Мэта навучання беларускай мове на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі (павышаны ўзровень) прадугледжвае не толькі падагульненне і сістэматызацыю, але і пашырэнне ведаў па прадмеце ў параўнанні з базавым узроўнем, замацаванне і развіццё моўных і маўленчых уменняў і навыкаў, павышэнне матывацыі да працягу адукацыі па выбраным профілі, авалоданне некаторымі прафесійна арыентаванымі кампетэнцыямі.

У сувязі з гэтым змест праграмы накіраваны на рэалізацыю наступных задач:

- пашырэнне ўяўленняў пра беларускую мову як культурную каштоўнасць народа, яе ролю ў жыцці чалавека і грамадства, сувязі з нацыянальнай і сусветнай культурай;

- азнаямленне са сферай лінгвістыкі і беларусістыкі як гуманітарных дысцыплін;
- сістэматызацыя, замацаванне і пашырэнне ведаў пра беларускую мову і моўныя адзінкі розных узроўняў (фанетыку, склад слова, словаўтварэнне, лексіку і фразеалогію, марфалогію і сінтаксіс), правілы і асаблівасці функцыянавання моўных адзінак у маўленні, моўныя нормы (арфаэпічныя, лексічныя, арфаграфічныя, граматычныя, пунктуацыйныя, нормы маўленчых паводзін у розных сітуацыях зносін);
- удасканаленне навыкаў вуснай і пісьмовай камунікацыі (успрыманне, разуменне, перадача, прадуцыраванне);
- развіццё навыкаў аналітычнай дзейнасці ў лінгвістычнай і агульнагуманітарнай сферы: выяўленне, аналіз, класіфікацыя моўных адзінак розных узроўняў, супастаўленне фактаў мовы і маўлення, падбор матэрыялаў для аргументацыі пэўных палажэнняў; ацэнка лінгвістычных з'яў з пункта погляду літаратурных норм, камунікатыўнай мэтазгоднасці, развіццё навыкаў лінгвістычных назіранняў, эксперыментаў і г. д.;
- узбагачэнне ведаў пра стылістычную ролю і тэкстаўтваральныя магчымасці моўных адзінак розных узроўняў;
- удасканаленне навыкаў рэдагавання тэкстаў.

У сувязі з арыентацыяй адукацыі на кампетэнтнасны падыход, звязаны з практыка-арыентаваным характарам адукацыйнага працэсу, што прадугледжвае фарміраванне ў вучняў асобасных, метапрадметных і прадметных кампетэнцый, праграма па беларускай мове накіравана:

- на замацаванне абумоўленых базіснымі нацыянальнымі каштоўнасцямі светапоглядных установак і развіццё індывідуальных і сацыяльных якасцей асобы вучня;
- выхаванне гатоўнасці да папаўнення ведаў і прымянення іх у жыцці;
- замацаванне і ўзбагачэнне ўніверсальных вучэбных уменняў, звязаных з ужываннем ІКТ-кампетэнтнасці ў навучальнай дзейнасці, пошукам, разуменнем і апрацоўкай інфармацыі, прагназаваннем, планаваннем і кантролем уласнай дзейнасці, акумуляцыяй ведаў па розных вучэбных прадметах;

- фарміраванне цэласнага ўяўлення аб вучэбным прадмеце «Беларуская мова» і пашырэнне сістэмы моўных і маўленчых уменняў і навыкаў для падрыхтоўкі да свядомага выбару будучай прафесіі.

Прыярытэтнай задачай профільнага навучання становіцца фарміраванне культуры вуснага і пісьмовага маўлення вучняў, таму засваенне і асэнсаванне ўсіх моўных адзінак на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі адбываецца ў аспекце культуры маўлення, што і перадаецца ў назве раздзела «Сінтаксіс і пунктуацыя. Культура маўлення» вучэбнай праграмы для XI класа. З гэтай мэтай сістэматызуюцца веды вучняў пра нормы беларускай мовы (арфаэпічныя, акцэнталагічныя, лексічныя, словаўтваральныя, граматычныя, арфаграфічныя, пунктуацыйныя, стылістычныя), сродкі і прыёмы маўленчай выразнасці, стылістычную ролю і тэкстаўтваральныя магчымасці моўных сродкаў беларускай мовы, удасканальваюцца ўменні даваць ацэнку чужым і рэдагаваць уласныя выказванні.

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА

**(105 гадзін на год, 3 гадзіны на тыдзень, з іх 19 гадзін — на пісьмовыя работы)**

### Агульныя звесткі аб мове

(3 гадзіны)

### Маўленне

(6 гадзін, з іх 1 гадзіна — на пісьмовую работу)

Асноўныя якасці культуры маўлення: правільнасць, дакладнасць, лагічнасць, чысціня, дарэчнасць, багацце і выразнасць маўлення.

Камунікатыўная сітуацыя і правілы маўленчых паводзін. Маўленчы этыкет і беларускія нацыянальна-культурныя этыкетныя традыцыі.

*Падрыхтоўка віншавальнага прывітання.*

***Пісьмовая творчая работа.***

### АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны в е д а ц ь:

- асноўныя камунікатыўныя якасці маўлення;
- правілы маўленчых паводзін у пэўных сітуацыях маўлення, формулы маўленчага этыкету.

Вучні павінны ў м е ц ь:

- ужываць згодна з маўленчай сітуацыяй і зместам камунікацыі моўныя сродкі для наладжвання неканфліктных, добразычлівых і паспяховых узаемаадносін;
- захоўваць і ўдасканальваць культуру маўленчых паводзін;
- дарэчы карыстацца нацыянальным маўленчым этыкетам.

Вучні павінны в а л о д а ц ь асноўнымі якасцямі культуры маўлення, маўленчым этыкетам.

## Стылістыка

(5 гадзін, з іх 2 гадзіны — на пісьмовыя работы)

Функцыянальныя стылі (навуковы, афіцыйны, публіцыстычны, мастацкі, гутарковы) і жанры, стылеўтваральныя моўныя сродкі.

***Пісьмовая творчая работа.***

***Кантрольны дыктант.***

### АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны в е д а ц ь асноўныя прыметы функцыянальных стыляў маўлення.

Вучні павінны ў м е ц ь:

- распазнаваць тэксты розных стыляў маўлення;
- абгрунтоўваць прыналежнасць тэкстаў да пэўнага стылю;
- выяўляць асаблівасці ўжывання моўных сродкаў у тэкстах розных стыляў і жанраў;
- удасканальваць тэксты рознай стылістычнай прыналежнасці з мэтай захавання стылявога адзінства;
- самастойна ствараць тэксты рознай жанрава-стылістычнай прыналежнасці.

Вучні павінны в а л о д а ц ь стылістычнымі нормамі.

## СІНТАКСІС І ПУНКТУАЦЫЯ. КУЛЬТУРА МАЎЛЕННЯ (87 гадзін)

### Словазлучэнне

(10 гадзін, з іх 3 гадзіны — на пісьмовыя работы)

Словазлучэнне, віды, спосабы і сродкі сінтаксічнай сувязі ў словазлучэнні.

Сінтаксічныя нормы: асаблівасці дапасавання і кіравання ў беларускай мове.

***Кантрольны падрабязны пераказ тэксту.***

Сэнсава-стылістычная роля і тэкстаўтваральныя магчымасці словазлучэнняў у разгортванні тэмы, афармленні звязнага выказвання.

Сінаніміка словазлучэнняў, яе роля ў стварэнні тэкстаў рознай жанрава-стылістычнай прыналежнасці.

***Кантрольнае сачыненне.***

### Просты сказ

(38 гадзін, з іх 6 гадзін — на пісьмовыя работы)

Сказ, асноўныя функцыі сказа. Двухсастаўныя і аднасастаўныя сказы, няпоўныя сказы, сказы з аднароднымі і адасобленымі членамі, пабочнымі і ўстаўнымі канструкцыямі, зваротkамі, параўнальнымі зваротамі: сінтаксічныя прыметы, ужыванне, знакі прыпынку.

***Кантрольны дыктант.***

Сэнсава-стылістычная роля і тэкстаўтваральныя магчымасці простых сказаў рознай будовы і прызначэння.

***Кантрольны падрабязны пераказ тэксту.***

Сінтаксічныя нормы: ужыванне аднародных і адасобленых членаў сказа, парадак слоў, сувязь дзейніка і выказніка ў сказе, правілы ўжывання дзеепрыслоўных і дзеепрыметнікавых зваротаў.

***Кантрольны дыктант.***

Пунктуацыйныя нормы: знакі прыпынку ў сказах з аднароднымі, адасобленымі членамі, параўнальнымі зваротамі, пабочнымі і ўстаўнымі канструкцыямі, звароткамі.

***Кантрольнае сачыненне.***

***Кантрольная тэставая работа.***

## Складаны сказ

(39 гадзін, з іх 7 гадзін — на пісьмовыя работы)

Складаназлучаныя, складаназалежныя, бяззлучнікавыя складаныя сказы і сказы з рознымі відамі сувязі частак: сінтаксічныя прыметы, ужыванне, знакі прыпынку.

***Пісьмовая творчая работа.***

Канструкцыі з чужой мовай, ужыванне, знакі прыпынку.

***Кантрольны падрабязны пераказ тэксту.***

Сінтаксічныя нормы: ужыванне складаных сінтаксічных канструкцый у тэкстах розных тыпаў, стыляў і жанраў.

***Кантрольны дыктант.***

Пунктуацыйныя нормы: знакі прыпынку ў складаных сказах, канструкцыях з чужой мовай.

Сэнсава-стылістычная роля і тэкстаўтваральныя магчымасці складаных сказаў рознай будовы і прызначэння.

***Кантрольны падрабязны пераказ тэксту.***

Сінтаксічная сінаніміка.

***Кантрольная тэставая работа.***

### АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны в е д а ц ь:

- асаблівасці дапасавання і кіравання ў беларускай мове;
- пунктуацыйныя нормы пісьмовага афармлення сказаў.

Вучні павінны ў м е ц ь:

- вызначаць сінтаксічныя прыметы і асаблівасці будовы сказаў розных відаў;
- вызначаць сэнсава-стылістычную ролю словазлучэнняў і сказаў рознай будовы і прызначэння;
- абгрунтоўваць мэтазгоднасць ужывання сінтаксічных канструкцый у тэкстах розных тыпаў, стыляў і жанраў;
- знаходзіць і выпраўляць маўленчыя недахопы і парушэнні норм літаратурнай мовы ў чужым і ўласным маўленні, устанаўліваць прычыны парушэння норм.

Вучні павінны в а л о д а ц ь літаратурнымі нормамі ў вусным і пісьмовым маўленні.

## Падагульненне і сістэматызацыя вывучанага

(2 гадзіны)

## Рэзервовыя гадзіны

(2 гадзіны)

### ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ

Беларуская мова : вучэб. дапам. для 11-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка [і інш.]. — 2-е выд., перапрац. і дап. — Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2016.

Беларуская мова ў 10 класе : вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка [і інш.]. — Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2011.

Беларуская мова ў 11 класе : вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка [і інш.]. — Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2011.

Беларуская мова : навучальныя і кантрольныя дыктанты і пераказы : 10—11 класы : дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка [і інш.]. — Мінск : Аверсэв, 2012, 2014.

*Валочка, Г. М.* Беларуская мова : тэставыя работы : 8—11 класы : дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка, В. У. Зелянко. — Мінск : Аверсэв, 2013, 2014.

*Валочка, Г. М.* Беларуская мова. 10—11 класы. Практыкум па арфаграфіі і пунктуацыі : дапам. для вучняў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка, В. У. Зелянко, І. Л. Бурак. — Мінск : Аверсэв, 2012.

*Валочка, Г. М.* Практыкум па арфаграфіі і пунктуацыі беларускай мовы. 10—11 класы : вучэб.-метад. комплекс / Г. М. Валочка, В. У. Зелянко, І. Л. Бурак. — Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2010.

*Валочка, Г. М.* Беларуская мова : дапаможнік для падрыхтоўкі да цэнтралізаванага тэсціравання : дапам. для агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Валочка, Я. М. Лаўрэль, С. А. Язерская. — Мінск : Новое знание, 2010.

*Жуковіч, М. В.* Сучасныя адукацыйныя тэхналогіі на ўроках беларускай мовы і літаратуры : дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / М. В. Жуковіч. — Мінск : Аверсэв, 2015.

Зборнік матэрыялаў для выпускнога экзамену па вучэбным прадмеце «Беларуская мова» за перыяд навучання і выхавання на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі : тэксты для пераказаў / склад. Г. М. Валочка [і інш.]. — Мінск : Нац. ін-т адукацыі ; Аверсэв, 2014, 2016.

*Зелянко, В. У.* Навучанне беларускай мове : лінгвакультуралагічны падыход. 10—11 класы : вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / В. У. Зелянко. — Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2011.

*Калечыц, А. І.* Дыктанты па беларускай мове. 9—11 класы : дапам. для вучняў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / А. І. Калечыц, А. К. Пекач, Т. Я. Старасценка. — Мінск : Народная асвета, 2013.

*Цыбульская, С. І.* Беларуская мова : 5—11 класы : кантрольныя работы : дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / С. І. Цыбульская. — Мінск : Сэр-Віт, 2012.

Беларуская мова. XI клас : электронны адукацыйны рэсурс (adu.by).

### *Слоўнікі і даведнікі*

*Анисим, Е. Н.* Русско-белорусский словарь для школьников / Е. Н. Анисим, О. В. Мицкевич. — Минск : Сучасная школа, 2010.

Беларускі арфаграфічны слоўнік для школьнікаў : дапам. для ўстаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / уклад. : І. У. Кандраценя, Л. П. Кунцэвіч ; пад рэд. А. А. Лукашанца. — Мінск : Аверсэв, 2011, 2013.

*Капылоў, І. Л.* Арфаграфічны слоўнік беларускай мовы для школьнікаў. Новыя правілы правапісу / І. Л. Капылоў, Т. М. Маракуліна. — Мінск : Сучасная школа, 2010.

*Капылоў, І. Л.* Беларуска-рускі слоўнік для школьнікаў / І. Л. Капылоў, І. У. Ялынцава. — Мінск : Сучасная школа, 2010.

*Капылоў, І. Л.* Слоўнік арфаграфічных новаўвядзенняў беларускай мовы / І. Л. Капылоў, Т. М. Маракуліна. — Мінск : Сучасная школа, 2010.

*Малажай, Г. М.* Школьны тлумачальны слоўнік беларускай мовы : дапам. для ўстаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / Г. М. Малажай, Л. І. Яўдошына. — Мінск : Аверсэв, 2013.

*Николаева, О. М.* Современный русско-белорусский словарь / О. М. Николаева, Т. Н. Трухан ; под ред. А. А. Лукашанца. — Минск : ТетраСистемс, 2011.

*Николаева, О. М.* Современный русско-белорусский словарь для школьников / О. М. Николаева, Т. Н. Трухан ; под ред. А. А. Лукашанца. — Минск : Літаратура і Мастацтва, 2009, 2013.

Пішам па-беларуску : даведнік па арфаграфіі і пунктуацыі з каментарыямі : дапам. для агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання / З. І. Бадзевіч [і інш.]. — Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2010.

Пішам па-беларуску : даведнік па арфаграфіі і пунктуацыі з каментарыямі : дапам. для ўстаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / З. І. Бадзевіч [і інш.]. — Мінск : Аверсэв, 2011, 2013.

Разам, асобна, праз злучок : даведнік : дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / склад. : Н. Д. Бандарэнка, І. Л. Капылоў, Т. М. Маракуліна ; пад рэд. А. А. Лукашанца. — Мінск : Аверсэв, 2012.

*Уласевіч, В. І.* Беларуска-рускі тлумачальны слоўнік новых слоў і новых значэнняў слоў / В. І. Уласевіч, Н. М. Даўгулевіч. — Мінск : Аверсэв, 2013.

# БЕЛАРУСКАЯ ЛІТАРАТУРА

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма па беларускай літаратуры для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі распрацавана ў адпаведнасці з агульнымі задачамі ўдасканалення як сістэмы адукацыі ўвогуле, так і літаратурнага навучання ў прыватнасці. Вывучэнне беларускай літаратуры ва ўстанове агульнай сярэдняй адукацыі арыентавана на дасягненне мэт, вызначаных Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, і ажыццяўляецца ў адпаведнасці з асноўнымі палажэннямі Канцэпцыі вучэбнага прадмета «Беларуская літаратура».

Вучэбная праграма грунтуецца на прынцыпах дэмакратызацыі і гуманізацыі навучання, арыентуе на засваенне духоўных і маральных каштоўнасцей, на эстэтычны і творчы характар засваення прадмета, улічвае ўзроставa-інтэлектуальныя асаблівасці вучняў.

Беларуская літаратура — дысцыпліна культуралагічнага цыкла, якая паслядоўна і сістэматычна далучае вучняў да мастацтва. Літаратура ва ўстанове агульнай сярэдняй адукацыі — сродак эстэтычнага спасціжэння жыцця, яго маральных норм і вартасцей. Родная літаратура каштоўная сваімі ідэямі і тым асобасным сэнсам, які маюць сюжэт літаратурнага твора, мастацкія вобразы, адносіны і стаўленне самога аўтара да герояў і падзей, да жыцця і свету. Вывучэнне літаратуры дапамагае вучням убачыць разнастайнасць свету, адкрыць таямніцы пісьменніцкага майстэрства, набыць вопыт маўленчай і творчай дзейнасці, авалодаць культурай чытання, з павагай і любоўю ставіцца да мастацкай кнігі. Такім чынам, у арганічнай сувязі з пазнаннем літаратуры як мастацтва ідзе і працэс фарміравання сістэмы каштоўнасных арыентацый вучня, адносін яго да жыцця, да людзей, працэс усведамлення сябе асобай. Урок літаратуры — гэта найперш працэс жыццепазнання, скіраваны на выпрацоўку крытычнага і мадэлюючага тыпаў мыслення. Асаблівая ўвага пры гэтым надаецца развіццю творчых здольнасцей, навыкаў і ўменняў самастойнай працы.

Галоўная мэта навучання прадмету — далучэнне вучняў да багацця беларускай мастацкай літаратуры, эстэтычнае спасціжэнне імі свету, складанасці чалавечых узаемаадносін і на гэтай аснове выхаванне асобы з глыбока гуманістычным і дэмакратычным светапоглядам, самастойным мысленнем, з развітым, высокакультурным пачуццём нацыянальнай і асабістай самапавагі, адданасцю агульначалавечым ідэалам, асобы з выразна выяўленымі творчымі схільнасцямі, здатнай ператтварыць успрыманне прыгажосці (эстэтычнае ўспрыманне) у стымул маральнага самаўдасканалення, інтэлектуальнага і духоўнага развіцця.

Змест літаратурнай адукацыі ў XI класе пабудаваны на гісторыка-храналагічным прынцыпе, што дазваляе працягнуць знаёмства вучняў, распачатае ў IX класе, з асаблівасцямі развіцця беларускага мастацтва слова ў розныя перыяды і спрыяе фарміраванню гістарычнага падыходу да літаратурных з'яў, першапачатковаму разуменню ўзаемасувязей і ўзаемаўплыву ў творчасці розных пісьменнікаў, успрыманню літаратуры як працэсу. На гэтым этапе навучання інтэнсіўна фарміруецца сістэма каштоўнасных арыентацый, ідэалаў і перакананняў, інтарэсаў і схільнасцей. Таму ў праграму ўключаны творы маральна-этычнай праблематыкі, дзе выяўляюцца канфлікты характараў, ідэй, поглядаў. Мастацкія тэксты размешчаны ў паслядоўнасці, адпаведнай асноўным этапам развіцця літаратуры.

Значным кампанентам зместу літаратурнай адукацыі з'яўляецца сістэма тэарэтыка- і гісторыка-літаратурных паняццяў, звязаных з фарміраваннем уяўленняў аб развіцці і станаўленні мастацтва слова. На III ступені агульнай сярэдняй адукацыі паглыбляюцца веды вучняў пра структуру мастацкага твора, літаратурныя роды і жанры ў гістарычным аспекце, даецца ўяўленне пра асаблівасці творчай манеры, стылю пісьменніка. Асэнсаванне тэарэтычных пытанняў паспрыяе больш глыбокаму ўспрыманню літаратуры як мастацтва. У працэсе вывучэння манаграфічных тэм прадугледжана атрыманне вучнямі крытыка-біяграфічных ведаў пра жыццё і творчасць пісьменнікаў.

На заключным этапе літаратурнай адукацыі актуалізуюцца, паглыбляюцца і сістэматызуюцца веды і ўменні, атрыманыя ў папярэдніх класах. Сістэматызацыя ведаў і ўменняў аб мастацтве вядзе да сінтэтычнага асэнсавання літаратуры і яе канкрэтных з'яў на светапоглядным, філасофскім, культуралагічным узроў-

нях, да ўсведамлення вучнем сябе як асобы, да яго маральнага самавызначэння. На гэта скіраваны розныя віды работы з літаратурным матэрыялам. Акрамя традыцыйных форм урока, шырока практыкуюцца семінары, дыспуты, чытацкія канферэнцыі і г. д. Метады навучання ў сваёй сукупнасці спрыяюць праяўленню ўсіх функцый літаратуры: пазнавальнай, выхаваўчай, эстэтычнай, эўрыстычнай, камунікатыўнай, геданістычнай. Накіраванасць методыкі на рэалізацыю толькі адной з іх, напрыклад пазнавальнай, аслабляе ўздзеянне літаратуры на асобу вучня. Агульным патрабаваннем для ўсіх метадаў навучання з'яўляецца сарыентаванасць на эстэтычную сутнасць літаратуры, яе мастацкую спецыфіку. Умелае спалучэнне метадаў навучання з задачамі грамадзянскага, патрыятычнага выхавання робіць працэс спасціжэння ведаў яшчэ больш мэтанакіраваным і выніковым. Назапашванне маральных і эстэтычных уражанняў, наступная іх сістэматызацыя і абагульненне, тэарэтычнае асэнсаванне ўзбагачаюць жыццёвы вопыт вучняў, уплываюць на іх духоўна-інтэлектуальнае сталенне.

Развіццё асобы пры вывучэнні літаратуры адбываецца ў двух асноўных напрамках: развіваюцца здольнасці агульныя і ўласна мастацкія. Гэты працэс можа быць паспяховы пры ўмове творчай скіраванасці навучання і рэалізацыі спецыяльнай сістэмы аналітычных і творчых заданняў.

Веданне параметраў развіцця асобы дазваляе рэалізаваць дыферэнцыраваны падыход да навучання літаратуры. Каб развіць здольнасці вучняў з аналітычным тыпам мыслення, мэтазгодна часцей даваць ім заданні творчага характару; вучням з развітым эмацыянальным успрыманнем, наадварот, часцей прапаноўваць аналітычныя ці абагульняльныя пытанні. Важна скарэкціраваць першапачатковае суб'ектыўна-індывідуальнае ўспрыманне, каб вучні маглі паступова ўзнімацца ад эмпірычнага ўзроўню засваення матэрыялу да канцэптуальнага. Гэтаму спрыяюць заданні на выяўленне аўтарскай пазіцыі ў творы, знаёмства з рознымі інтэрпрэтацыямі і ацэнкамі твораў у крытыцы і інш.

Навучанне літаратуры ў XI класе можа ажыццяўляцца на базавым і павышаным узроўнях.

Павышаны ўзровень навучання літаратуры закліканы садзейнічаць паспяховай падрыхтоўцы вучняў да прафесійнай дзейнасці ў гуманітарнай галіне і накіраваны на авалоданне даследчымі і творчымі спосабамі дзейнасці ў межах вучэбнага прадмета «Беларуская

літаратура». Пры гэтым акцэнт робіцца на фарміраванні агульнай літаратуразнаўчай культуры, уменні аналізаваць мастацкі тэкст з выкарыстаннем ведаў па гісторыі і тэорыі літаратуры, рабіць абагульненні на літаратурна-мастацкім матэрыяле, супастаўляць творы розных эпох, суадносіць асаблівасці развіцця роднай літаратуры з агульнаеўрапейскім літаратурным кантэкстам.

Вывучэнне літаратуры на павышаным узроўні дае больш шырокія магчымасці для рэалізацыі міжпрадметных сувязей, у першую чаргу з вучэбным прадметам «Беларуская мова». Еднасць гэтых дысцыплін грунтуецца на агульным прадмеце вывучэння — слове як адзінцы мовы і маўлення ў яго функцыянальным значэнні — і прадугледжвае спасціжэнне мовы і літаратуры як нацыянальна-культурных каштоўнасцей. Дыялог літаратуры з іншымі відамі мастацтва (тэатр, кіно, музыка, жывапіс і інш.) будзе спрыяць фарміраванню ў вучняў уяўленняў пра заканамернасці эстэтычнага і мастацкага асваення свету чалавекам, выпрацоўцы крытэрыяў эстэтычнай ацэнкі твораў. Разам з гісторыяй і грамадазнаўствам літаратура звяртаецца да праблем, непасрэдна звязаных з грамадскай сутнасцю чалавека, фарміруе гістарызм мыслення, узбагачае культурна-гістарычную памяць вучняў, выхоўвае ў іх актыўныя адносіны да рэчаіснасці, прыроды, навакольнага свету.

На вывучэнне літаратуры ў XI класе на павышаным узроўні адводзіцца 105 гадзін, з іх 93 гадзіны — на вывучэнне і абмеркаванне твораў, 10 гадзін — на творчыя работы, 2 гадзіны — на ўрокі па творах для дадатковага чытання.

Рэзерв вучэбнага часу можа быць выкарыстаны для вывучэння і абмеркавання літаратурных твораў.

Прапанаваныя праграмай анатацыі да аглядавых і манаграфічных тэм маюць арыентацыйны характар: у іх акрэсліваецца кола праблем, ключавыя моманты, на якія мэтазгодна звярнуць увагу пры вывучэнні і абмеркаванні твораў. Настаўнік робіць акцэнт на асобных пазіцыях, найбольш актуальных у канкрэтных класах.

Са спіса твораў, прапанаваных для дадатковага чытання, настаўнік выбірае тыя, выкарыстанне якіх ён лічыць больш мэтазгодным на пэўным уроку, улічваючы індывідуальныя магчымасці вучняў і наяўнасць тэкстаў у бібліятэчным фондзе.

Гадзіны, адведзеныя на творчыя работы, настаўнік размяркоўвае ў адпаведнасці з уласным планаваннем.

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА
## (105 гадзін)

## Беларуская літаратура перыяду 1966-га — пач. 1990-х гадоў
(55 гадзін)

**Агляд** *(2 гадзіны)*. Літаратура ва ўмовах новай грамадскай сітуацыі. Значнасць гісторыка-сацыяльных пераўтварэнняў. Пашырэнне сферы мастацкага даследавання рэчаіснасці. Жанравыя і тэматычныя пошукі літаратуры, паглыбленне яе чалавеказнаўчага і гуманістычнага зместу. Узмацненне аналітызму ў даследаванні мінулага і сучаснасці. Антываенны пафас творчасці «шасцідзясятнікаў» і філалагічнага пакалення.

Узбагачэнне светабачання беларускіх паэтаў, іх жанрава-стылёвыя пошукі (Я. Янішчыц, Т. Бондар, Р. Баравікова, А. Разанаў, Г. Пашкоў, К. Камейша, Н. Мацяш і інш.). Грамадзянскасць і маральна-этычная скіраванасць пафасу паэтычнай творчасці. Павышаная цікавасць да філасофскіх праблем, складаных пытанняў чалавечага жыцця.

Праблематыка беларускай прозы (І. Шамякін, Я. Брыль, В. Адамчык, І. Пташнікаў, В. Карамазаў, Л. Левановіч, Я. Сіпакоў, А. Жук, В. Казько, Г. Далідовіч, Г. Марчук, В. Гардзей, В. Гігевіч і інш.).

Здабыткі ў жанрах драмы і камедыі (п’есы Кандрата Крапівы, А. Макаёнка, У. Караткевіча, М. Матукоўскага, А. Петрашкевіча, А. Дзялендзіка, Г. Марчука, А. Дударава і інш.). Праблемнасць, канфліктная аснова твораў беларускіх драматургаў.

***Літаратура***

Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. / С. А. Андраюк [і інш.] ; навук. рэд. : У. В. Гніламёдаў, С. С. Лаўшук. — Мінск : Беларуская навука, 2004. — Т. 4 : у 3 кн., кн. 1 : 1966—1985.

Анталогія беларускай паэзіі : у 3 т. / рэдкал. : Р. Барадулін [і інш.]. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1993. — Т. 2—3.

*Бельскі, А. І.* Беларуская літаратура XX стагоддзя : гісторыя і сучаснасць / А. І. Бельскі. — Мінск : Аверсэв, 2005.

*Бельскі, А. І.* Вывучэнне творчасці пісьменнікаў : класікі і сучаснікі ў школе / А. І. Бельскі. — Мінск : Аверсэв, 2005.

*Гніламёдаў, У.* Ад даўніны да сучаснасці : нарыс пра беларускую паэзію / У. Гніламёдаў. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2001.

Вывучэнне аглядавых тэмаў па беларускай літаратуры / аўт.-склад. : В. Я. Ляшук, Г. М. Снітко. — Мінск : ТАА «Юніпрэс», 2001.

**Іван Шамякін.** Аповесць **«Непаўторная вясна»**; раман **«Сэрца на далоні»** *(10 гадзін).*

Жыццёвы і творчы шлях пісьменніка.

**«Непаўторная вясна».** Пенталогія «Трывожнае шчасце» — кніга аповесцей пра даваеннае пакаленне моладзі, якое прайшло праз выпрабаванні вайны. Творчая задума кнігі. Аўтабіяграфічныя моманты ў «Трывожным шчасці». Пятро Шапятовіч і Саша Траянава — галоўныя героі пенталогіі.

Адлюстраванне даваеннага жыцця моладзі ў аповесці «Непаўторная вясна». Духоўны свет Пятра і Сашы. Паэзія кахання і прыгожых чалавечых пачуццяў. Эмацыянальна-псіхалагічная змястоўнасць твора. Лірычны характар аўтарскага пісьма. Змест і сюжэтныя лініі наступных твораў пенталогіі.

**«Сэрца на далоні».** Праблематыка рамана. Вастрыня канфлікту. Маральна-этычная сутнасць аўтарскай пазіцыі. Рэтраспектыўны зварот да падзей вайны. Сутыкненне праўды і дэмагогіі ў ацэнках дзейнасці падпольшчыкаў. Роля кар'ерыста Гукана, які хавае праўду аб актыўнай падпольнай дзейнасці доктара Савіча. Прынцыповасць і рашучасць Кірылы Шыковіча ў выкрыцці Гукана. Партызанскае мінулае Яраша. Вобраз Зосі Савіч, яе лёс.

Маладое пакаленне ў рамане. Няўстойлівасць жыццёвай пазіцыі Славіка Шыковіча. Складаны шлях духоўнага станаўлення Тараса. Пачатак самастойнага жыцця Славіка і Тараса — напамінак старэйшаму пакаленню аб рэальнай магчымасці ўзнікнення праблемы бацькоў і дзяцей, неабходнасці выхавання новага пакалення.

Сімволіка назвы твора.

***Тэорыя літаратуры.*** Жанр аповесці (паглыбленне паняцця). Пенталогія.

***Мастацтва***

Жывапіс: *М. Будавей.* «Партрэт Івана Шамякіна»; *Н. Шчасная.* «У снежныя зімы (партрэт пісьменніка Шамякіна)»; *У. Масленікаў.* «Мае бацькі ў маі 1945 года».

Т э а т р а л ь н а е  м а с т а ц т в а: спектаклі «Трывожнае шчасце», «Сэрца на далоні», «І змоўклі птушкі» (па творах *І. Шамякіна*).

К і н а м а с т а ц т в а: мастацкія фільмы «Гандлярка і паэт» (рэж. *С. Самсонаў*), «Вазьму твой боль» (рэж. *М. Пташук*).

***Літаратура***

Іван Шамякін : вядомы і невядомы : успаміны, эсэ, аповесць / уклад. Т. Шамякіна. — Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2011.

Іван Шамякін. Летапісец эпохі : успаміны, інтэрв'ю, эсэ / уклад. А. Шамякіна. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2010.

*Локун, В.* Кругі жыцця — кругі літаратуры / В. Локун. — Мінск : ОО «БелАКК», 2002.

**Э р н э с т  Х е м і н г у э й.** Аповесць **«Стары і мора»** *(2 гадзіны).*

**«Стары і мора»** — адзін з найлепшых твораў славутага амерыканскага пісьменніка. Праблемы жыцця і смерці, прыроды і чалавека, пераемнасці пакаленняў. Галоўны герой аповесці, рыбак Санцьяга, — чалавек, які не здаецца перад цяжкімі выпрабаваннямі жыцця. Яго аптымізм, высокае пачуццё чалавечай годнасці. Лейтматыў твора — словы Санцьяга: «Чалавека можна знішчыць, але яго нельга перамагчы». Падтэкст у творы.

***Літаратура***

*Герцык, А.* Літаратура народаў свету ў школе / А. Герцык. — Мінск : Новое знание, 2007.

**В а с і л ь  Б ы к а ў.** Аповесці **«Сотнікаў», «Знак бяды»,** апавяданне **«Жоўты пясочак»** *(11 гадзін).*

Жыццёвы і творчы шлях пісьменніка.

**«Сотнікаў».** Праблематыка аповесці. Чалавек перад знішчальнай сілай бесчалавечных абставін. Вобразы Сотнікава і Рыбака ў творы, глыбокі псіхалагізм у іх распрацоўцы. Уменне Сотнікава змагацца да канца ў любых абставінах; вернасць перакананням. Трагічны фінал Сотнікава. Вобраз Рыбака, яго спрытнасць і лоўкасць. Здрадніцтва дзеля захавання свайго жыцця. Духоўная смерць Рыбака. Персанажы другога плана ў аповесці (стараста, Дзёмчыха, Бася), іх мужнасць. Выкрыццё паліцэйскіх — прыслужнікаў немцаў — у творы (Партноў, Стась Гаманюк, Будзіла).

Мастацкая дасканаласць твора. Яго сюжэт і кампазіцыя. Пейзаж у аповесці. Роля мастацкай дэталі ў абмалёўцы герояў і падзей.

**«Знак бяды».** Актуальнасць маральна-філасофскай праблематыкі аповесці. Вастрыня трагедыйнага канфлікту. Маштабнасць характараў галоўных герояў — Петрака і Сцепаніды. Глыбокі псіхалагізм аповесці. Зварот аўтара да эпізодаў даваеннага жыцця з мэтай больш глыбокага раскрыцця характараў. Выкрыццё жорсткасці, бесчалавечнасці фашызму. Паказ прыслужнікаў акупацыйнага рэжыму. Мастацкая сімволіка твора. Экранізацыя аповесці «Знак бяды» (рэж. М. Пташук).

**«Жоўты пясочак».** Адлюстраванне ў апавяданні трагічных падзей перыяду сталінскіх рэпрэсій 20—30 гадоў XX стагоддзя. Псіхалагізм у абмалёўцы вобразаў герояў твора. Канкрэтна-гістарычны і сімвалічны сэнс апавядання.

Значэнне творчасці Быкава для развіцця беларускай літаратуры.

***Тэорыя літаратуры.*** Выяўленне аўтарскай пазіцыі ў мастацкім творы (паглыбленне паняцця). Аўтарская канцэпцыя жыцця і асобы. Гераічнае і трагічнае ў літаратуры (паглыбленне паняццяў). Вобразы-сімвалы, мастацкія дэталі, іх роля ў тэксце.

***Мастацтва***

Ж ы в а п і с: *М. Будавей.* «Партрэт В. Быкава»; *В. Быкаў.* Ілюстрацыі да апавяданняў «Трое», «Страчаныя мары», карціны «Лужына», «Бацькоўская хата»; *М. Данцыг.* «Партрэт В. Быкава»; *А. Кашкурэвіч.* Ілюстрацыі да аповесцей В. Быкава «Пайсці і не вярнуцца», «Яго батальён»; *Г. Паплаўскі.* Ілюстрацыі да аповесцей В. Быкава «Дажыць да світання», «Сотнікаў»; *У. Тоўсцік.* «Васілю Уладзіміравічу Быкаву прысвячаецца»; «Васілёва зорка»: альбом.

К і н а м а с т а ц т в а: трохсерыйны тэлевізійны фільм «Доўгія вёрсты вайны» (рэж. *А. Карпаў*); фільмы: «Абеліск» (рэж. *Р. Віктараў*), «Дажыць да світання» (рэж. *М. Яршоў, В. Сакалоў*), «Знак бяды» (рэж. *М. Пташук*), «Пастка» (рэж. *Л. Мартынюк*), «Трэцяя ракета» (рэж. *Р. Віктараў*), «Фруза» (рэж. *В. Нікіфараў*), «Узыходжанне» (рэж. *Л. Шэпіцька*), «У тумане» (рэж. *С. Лазніца*).

***Літаратура***

*Бугаёў, Д. Я.* Вывучэнне творчасці Васіля Быкава ў школе / Д. Я. Бугаёў, М. У. Верціхоўская, В. У. Верціхоўская. — Мінск : Аверсэв, 2005.

Васіль Быкаў : вядомы і невядомы : літаратуразнаўчае эсэ, успаміны / уклад. М. Мінзер. — Мінск : Літаратура і Мастацтва, 2011.

*Локун, В. І.* Васіль Быкаў у кантэксце сусветнай літаратуры / В. І. Локун. — Мінск : Тэхнапрынт, 2005.

**Міхась Стральцоў.** Апавяданні **«Сена на асфальце»**, **«На чацвёртым годзе вайны»**, **«Смаленне вепрука»** *(4 гадзіны).*

Кароткія звесткі аб жыцці і творчасці пісьменніка.

**«Сена на асфальце».** Эцюды-ўспаміны пра маладосць, каханне, жыццёвыя праблемы і клопаты. Вобраз аўтара-апавядальніка, яго «самая патаемная і самая душэўная думка» — прымірыць горад і вёску. Прырода ў творы. Глыбокі лірызм апавядання. Адметнасць кампазіцыі.

**«На чацвёртым годзе вайны».** Гора і нястачы, прынесеныя ў сялянскую сям'ю вайной, якую кожны з сямейнікаў перажывае па-свойму. Вобразы старой маці, нявесткі Марусі і яе маленькага сына. Заўчаснае сталенне хлопчыка, яго рашучае жаданне дапамагчы маці і бабулі, узяць на сябе адказнасць за лёс сям'і. Глыбокі псіхалагізм у паказе характараў.

**«Смаленне вепрука».** Адметнасць кампазіцыі апавядання. Роля мастацкай дэталі ў творы. Наватарства аўтарскага індывідуальнага стылю.

***Тэорыя літаратуры.*** Унутраны маналог (паглыбленне паняцця).

***Літаратура***

*Саламаха, У. П.* Літаратура : застаецца сапраўднае : эсе, артыкулы, дыялогі / У. П. Саламаха. — Мінск : Звязда, 2014.

*Сямёнава, А.* Гарачы след таленту / А. Сямёнава. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1979.

*Шамякіна, Т.* На лініі перасячэння / Т. Шамякіна. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1981.

**Ніл Гілевіч.** Вершы **«Ах, якая над Гайнай купальская ноч!..»**, **«Святочны, старажытны дух калядны...»**, **«Паклон табе, мой беларускі краю!..»**; раман у вершах **«Родныя дзеці»** *(4 гадзіны).*

Жыццёвы і творчы шлях паэта.

Шырокі тэматычны змест паэзіі. Любоў да Бацькаўшчыны, клопат пра яе лёс, шанаванне роднай мовы, захаванне культурнай спадчыны. Лірыка прыроды, дружбы, кахання. Глыбокі лірызм, песеннасць вершаў, фальклорныя матывы ў творчасці паэта.

**«Родныя дзеці».** Праблематыка твора. Вобраз галоўнага героя Сцяпана Вячоркі. Другарадныя вобразы і іх роля ў творы. Адметнасць кампазіцыі рамана. Мастацкая спецыфіка твора.

***Тэорыя літаратуры.*** Раман у вершах як жанр.

***Мастацтва***

Ж ы в а п і с: *М. Андруковіч.* «Лагойскі краявід».

Г р а ф і к а: *А. Лапіцкая.* «Гучаць над Палессем старажытныя песні».

М у з ы к а: *Э. Зарыцкі.* Песня «Палыновая ростань» (сл. Н. Гілевіча); *Л. Захлеўны.* Песня «Сонца ў азерцы» (сл. Н. Гілевіча); *І. Лучанок.* Песня «Я хаджу закаханы» (сл. Н. Гілевіча); *Э. Ханок.* Песня «Вы шуміце, бярозы...» (сл. Н. Гілевіча); «Аксамітавы вечар»: кампакт-дыск; «Нашы песні»: кампакт-дыск (ансамбль «Сябры»).

***Літаратура***

Люблю цябе, жыццё... : штрыхі да партрэта народнага паэта Беларусі Ніла Гілевіча / склад. і прадм. Я. Стасевіча. — Мінск : Кнігазбор, 2011.

**І в а н  Ч ы г р ы н а ў.** Апавяданні **«Дзівак з Ганчарнай вуліцы», «У ціхім тумане»** *(3 гадзіны).*

Кароткія звесткі аб жыцці і творчасці пісьменніка.

**«Дзівак з Ганчарнай вуліцы».** Памяць мінулай вайны і лёс старога лесніка Дземідзёнка. Зварот да традыцыйных каштоўнасцей, гармонія чалавека з прыродай, людзьмі, самім сабой. Вобраз аўтара-апавядальніка.

**«У ціхім тумане».** Новыя падыходы да асэнсавання тэмы вайны. Узаемаадносіны ахвяр і здраднікаў. Праблема віны і даравання. Вобразы Рэйдзіхі і Ганны. Гуманістычны пафас апавядання.

***Мастацтва***

Ж ы в а п і с: *В. Грамыка.* «Над Прыпяццю»; *А. Малішэўскі.* «Мы вернемся»; *І. Белановіч.* «Сустрэча з недалёкім мінулым».

*Літаратура*

*Марціновіч, А.* Іван Чыгрынаў : нарыс жыцця і творчасці / А. Марціновіч. — Мінск : Народная асвета, 1998.

*Шамякіна, Т.* На лініі перасячэння / Т. Шамякіна. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1981.

**І в а н Н а в у м е н к а.** Апавяданні **«Сямнаццатай вясной»**, **«Хлопцы самай вялікай вайны»** *(3 гадзіны)*.

Кароткія звесткі аб жыцці і творчасці пісьменніка.

**«Сямнаццатай вясной».** Паказ лёсу моладзі ў гады вайны з фашызмам. Раскрыццё ў творы характараў Цімоха, Стасі і іншых герояў. Эмацыянальнасць зачыну апавядання, лірызм аповеду. Сімвалічнасць вобраза бэзу.

**«Хлопцы самай вялікай вайны».** Жорсткая праўда жыцця. Адсутнасць у апавяданні элементаў рамантыкі. Унутраная самаацэнка юнакоў; жаночы, мацярынскі погляд на рэаліі вайны. Шматгранны партрэт пакалення. Роля мастацкай дэталі ў творы.

***Тэорыя літаратуры.*** Сюжэт і яго элементы, пазасюжэтныя кампаненты твора (паглыбленне паняццяў).

*Літаратура*

*Марціновіч, А.* З вышыні пражытага : штрыхі да творчага партрэта І. Навуменкі / А. Марціновіч // Роднае слова. — 2000. — № 2. — С. 4—8.

*Піскун, Л.* Іван Навуменка / Л. Піскун. — Мазыр : Белы вецер, 1997.

*Сіненка, Г.* Іван Навуменка : нарыс творчасці / Г. Сіненка. — Мінск : Мастацкая літаратура, 1981.

**Г е н р ы х Б ё л ь.** Раман **«Дом без гаспадара»** (ва ўрыўках) *(2 гадзіны)*.

Кароткія звесткі аб жыцці і творчасці пісьменніка.

**«Дом без гаспадара»** — раман пра цяжкія душэўныя пакуты пасляваеннага пакалення Германіі. Лёс удавы паэта Раймунда Баха Нэлы. Вобразы непераадоленага мінулага ў творы. Праблема бацькоў і дзяцей. Думкі аўтара пра ўсенародную віну за паўтарэнне фашызму. Глыбокае раскрыццё псіхалогіі дзяцей-сірот у рамане (Марцін і Генрых). Вобраз мастака Альберта. Сэнс назвы рамана. Асаблівасці кампазіцыі. Прыёмы аўтарскага маналогу пры раскрыцці ўнутранага свету герояў.

*Літаратура*

*Герцык, А.* Раман Генрыха Бёля «Дом без гаспадара» / А. Герцык // Роднае слова. — 1998. — № 1. — С. 111—122.

**Рыгор Барадулін.** Вершы **«Неруш»**, **«Вогнепаклонніца»**, **«Яна адна, зямля вякоў...»**, **«Заспаная раніца мжыстая...»**, **«Чалавек не ўзнікае так...»**, **«Божа, паспагадай усім...»**, 2—3 вершы са зборнікаў **«Евангелле ад Мамы»**, **«Ксты»** (на выбар настаўніка) *(4 гадзіны).*

Жыццёвы і творчы шлях паэта.

Народнасць і самабытнасць паэзіі Р. Барадуліна. Сувязь яго творчасці з традыцыямі фальклору, міфалогіі, класічнай літаратуры. Вобразы Маці і Беларусі як лейтматывы паэзіі Барадуліна. Шчырасць, даверлівасць пачуццяў у лірыцы кахання, тонкі псіхалагізм і экспрэсіўнасць у іх выяўленні. Асаблівасці паэтычнага майстэрства Р. Барадуліна: арыгінальная метафарычна-асацыятыўная вобразнасць, гукапіс, рытміка, рыфма ў яго творах.

***Мастацтва***

Жывапіс: *В. Жолтак.* «Восеньская сімфонія»; *І. Рэй.* «Зямля мая беларуская».

***Тэорыя літаратуры.*** Стыль пісьменніка (паглыбленне паняцця).

*Літаратура*

*Гніламёдаў, У.* Ад даўніны да сучаснасці : нарыс пра беларускую паэзію / У. Гніламёдаў. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2001.

*Штэйнер, І. Ф.* Споведзь перад Богам і людзьмі : беларуская паэзія на стыку тысячагоддзяў : манаграфія / І. Ф. Штэйнер. — Гомель : Сож, 2007.

**Яўгенія Янішчыц.** Вершы **«Чаму ніколі не баюся я...»**, **«Не воблака, а проста аблачынка...»**, **«Помню, помню праз гады...»**, **«Ты пакліч мяне. Пазаві...»**, **«Любоў мая...»** *(2 гадзіны).*

Кароткія звесткі аб жыцці і творчасці паэтэсы.

Тэматычная палітра паэзіі Я. Янішчыц: малая радзіма, казачная палеская прырода, вясковы і гарадскі побыт, пададзеныя ў светлых колерах, каханне. Спроба паяднаць традыцыйны верш і рытмізаваную прозу ў творах. Эвалюцыя пафасу ў творах: ад мажорнага, радаснага да сумнага, трывожнага.

***Літаратура***

*Калядка, С. У.* Непрыручаная птушка Палесся : творчая індывідуальнасць Яўгеніі Янішчыц / С. У. Калядка. — Мінск : Беларуская навука, 2007.

**Г е о р г і й  М а р ч у к.** Навелы **«Канон Богу», «Канон Базару», «Канон Гарыні», «Канон Маці»** *(3 гадзіны).*

Кароткія звесткі аб жыцці і творчасці пісьменніка.

Жанрава-стылёвая спецыфіка твораў, іх спавядальнасць. Захапляльнае падарожжа па радзіме пісьменніка, асэнсаванне жыцця палешукоў, іх традыцый. Мудрасць разумення чалавечага шчасця і іншых духоўных каштоўнасцей.

***Мастацтва***

К і н а м а с т а ц т в а: фільм «Ліст да Феліні» (рэж. *Д. Зайцаў*).

***Літаратура***

*Іконнікава, Л. У.* Мастацкі свет твораў Георгія Марчука : драматургія, проза, казкі / Л. У. Іконнікава ; навук. рэд. В. А. Максімовіч. — Мінск : Беларускі рэспубліканскі літаратурны фонд, 2013.

**А л я к с е й  Д у д а р а ў.** П’еса **«Князь Вітаўт»** *(3 гадзіны).*

Кароткія звесткі аб жыцці і творчасці пісьменніка.

**«Князь Вітаўт».** Наватарскі падыход драматурга да ўвасаблення далёкага мінулага. Жанравая адметнасць твора, асаблівасці яго кампазіцыі. Вітаўт і Ягайла як вобразы-тыпы. Маральна-этычнае завастрэнне канфлікту. Ахвярнасць, вернасць (пакаёўка Алёна) і здрада, халодны разлік, угодлівасць (стражнік Люцень). Праблема асабістага шчасця ў п’есе. Сцвярджэнне ў творы галоўных каштоўнасцей на зямлі: любові, еднасці, згоды і міру.

***Тэорыя літаратуры.*** Гістарычная драма.

***Мастацтва***

Т э а т р а л ь н а е  м а с т а ц т в а: спектаклі «Вечар» (рэж. *В. Мазынскі*), «Князь Вітаўт» (рэж. *В. Раеўскі*), «Радавыя» (рэж. *В. Раеўскі*), «Чорная панна Нясвіжа» (рэж. *В. Раеўскі*).

***Літаратура***

*Аўдоніна, Т. В.* Жыць на зямлі... : філасофія быцця ў драматургіі А. Дударава і класічная традыцыя / Т. В. Аўдоніна. — Гомель : ГДУ, 2005.

*Васючэнка, П.* Сучасная беларуская драматургія / П. Васючэнка. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2000.

*Ратабыльская, Т. А.* «Спыніся, імгненне...» : старонкі тэатральнага жыцця Беларусі 1990-х гадоў / Т. А. Ратабыльская. — Мінск, 2000.

**Алесь Разанаў. «Радзіма...», «На гэтай зямлі», «У крузе», «Спадчына», «Барана», «Горад», «Кожны народ мае...»**, 3—4 (на выбар настаўніка) **пункціры, квантэмы, зномы** *(2 гадзіны)*.

Філасофска-інтэлектуальны кірунак творчасці: суадносіны агульначалавечага (быційнага) і нацыянальна-гістарычнага (асабістага). Тэма Бацькаўшчыны ў лірыцы паэта. Традыцыі і наватарства: адметнасць жанрава-стылёвых форм, стыль пісьма паэта. Асацыятыўная вобразнасць. Роля А. Разанава ў развіцці традыцый філасофскай паэзіі і станаўленні сучаснай беларускай эксперыментальнай (постмадэрнісцкай) паэзіі.

***Тэорыя літаратуры.*** Вершаказ, версэт, пункцір, квантэма.

***Літаратура***

*Кісліцына, Г. М.* Алесь Разанаў : Праблема маст. свядомасці / Г. М. Кісліцына. — Мінск : Беларуская навука, 1997.

*Івашчанка, А. С.* Паэтыка Алеся Разанава : між медытацыяй і рацыяй : манаграфія / А. І. Івашчанка. — Мінск : БНТУ, 2008.

*Ламека, Н. У.* Мастацкі ўніверсум творцы / Н. У. Ламека. — Мінск : Рэспубліканскі інстытут вышэйшай школы, 2005.

*Штэйнер, І. Ф.* Уводзіны ў невымоўнае : філасофія паэзіі Алеся Разанава / І. Ф. Штэйнер. — Мінск : Звязда, 2013.

## Беларуская літаратура на сучасным этапе (з сярэдзіны 1990-х гадоў)

(35 гадзін)

**Агляд** *(2 гадзіны)*. Літаратурны працэс у Беларусі на сучасным этапе. Змяненне ролі літаратуры ў жыцці грамадства. Новая літаратурная сітуацыя. Грамадскае аб’яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі» і іншыя літаратурныя суполкі. Беларускі постмадэрнізм: творчыя асобы і жанры. Найноўшая беларуская літаратура (2000—2015).

Знаёмства з літаратурнымі часопісамі («Полымя», «Маладосць» і інш.) і інтэрнэт-рэсурсамі і публікацыямі ў іх твораў сучасных аўтараў.

**Паэзія** *(11 гадзін)*. Паглыбленне агульначалавечага, маральна-філасофскага, гуманістычнага зместу лірыкі, яе грамадзянска-публіцыстычнага і інтымна-псіхалагічнага пачатку ў творчасці В. Зуёнка, А. Вярцінскага, Я. Сіпакова, Ю. Свіркі, Д. Бічэль, Р. Баравіковай, Г. Пашкова, М. Пазнякова, А. Салтука, М. Маляўкі, М. Дуксы, У. Карызны, Л. Галубовіча, А. Сыса, З. Марозава і інш.

Разнастайнасць творчых індывідуальнасцей у сучаснай паэзіі (М. Башлакоў, А. Бадак, Л. Рублеўская, В. Шніп, К. Жук, М. Шабовіч і інш.).

Урбаністычныя матывы ў сучаснай паэзіі (Адам Глобус, Г. Булыка і інш.).

Пошукі і наватарства ў галіне паэтычнай формы (А. Разанаў, Р. Баравікова, М. Мятліцкі і інш.).

Беларуская постмадэрнісцкая паэзія (С. Мінскевіч, Д. Плакса, З. Вішнёў і інш.).

(9-10 аўтараў на выбар настаўніка.)

**Проза** *(15 гадзін)*. Сацыяльныя і маральна-філасофскія праблемы ў сучаснай прозе (А. Савіцкі. «Пісьмо ў рай»; А. Жук. «Праклятая любоў»; А. Федарэнка. «Вёска»; А. Казлоў. «Незламаная свечка»; У. Сцяпан. «Адна капейка»; У. Саламаха. «Расступіся, зямля» і інш.).

Чарнобыльская тэма ў сучаснай прозе (Б. Сачанка. «Родны кут», «Еўка»; Л. Левановіч. «Палыновы вецер» і інш.).

Тэма вайны (В. Быкаў. «У тумане»; І. Чыгрынаў. «Вяртанне да віны»; А. Адамовіч. «Нямко»; Г. Марчук. «Крык на хутары»; С. Алексіевіч. «У вайны не жаночае аблічча» і інш.).

Тэма гістарычнага мінулага ў творах Л. Дайнекі, В. Коўтун, К. Тарасава, В. Чаропкі і інш.

Адлюстраванне падзей савецкага мінулага (В. Быкаў. «Сцюжа»; І. Навуменка. «Вір»; Я. Сіпакоў. «Кулак» і інш.).

Праблемна-тэматычная, жанрава-стылёвая паліфанічнасць у раскрыцці ідэі адраджэння нацыянальнай самасці. Праблемы гістарычнай памяці, повязі эпох і пакаленняў, стасункаў асобы і грамадства ў найноўшай беларускай прозе (творчасць Л. Рублеўскай, Алеся Наварыча і інш.).

Проза для падлеткаў (А. Бадак, Р. Баравікова і інш.). Жанр фантастыкі ў сучаснай прозе.

(7-8 аўтараў на выбар настаўніка.)

**Драматургія** *(7 гадзін)*. Асноўныя тэндэнцыі ў развіцці беларускай драматургіі другой паловы 1980—1990-х гг. Традыцыі драматургіі Кандрата Крапівы і А. Макаёнка і іх творчае выкарыстанне маладзейшымі пісьменнікамі.

Узмацненне цікавасці да гістарычнага мінулага (А. Петрашкевіч. «Прарок для Айчыны», «Меч Рагвалода»; І. Чыгрынаў. «Звон — не малітва»; Р. Баравікова. «Барбара Радзівіл» і інш.). Трагічны лёс беларускай вёскі і сялянства ў п'есе У. Бутрамеева «Страсці па Аўдзею».

Новыя мастацка-эстэтычныя тэндэнцыі ў сучаснай беларускай драматургіі (С. Кавалёў, Г. Марчук, І. Сідарук, П. Васючэнка, А. Курэйчык і інш.).

(3-4 аўтары на выбар настаўніка.)

***Мастацтва***

С к у л ь п т у р а: *У. Слабодчыкаў.* «Чарнобыльская мадонна».

Ж ы в а п і с: *В. Барабанцаў*. Трыпціх «Пакінутая вёска», «Зона», «Мёртвы калодзеж»; *А. Кашкурэвіч*. Трыпціх «Прадчуванне бяды»; *У. Кожух*. Серыя карцін «Чарнобыльская хроніка»; *І. Рэй*. «Дзякуй, мама!», «З вогненнай вёскі», «Боль вогненных гадоў. Год 41-ы», «Беларуская восень», «Поры года»; *М. Савіцкі*. «Чорная быль»; *У. Гоманаў*. «Партрэт А. Петрашкевіча».

Т э а т р а л ь н а е  м а с т а ц т в а  і  к і н а м а с т а ц т в а: спектаклі «Адкуль грэх?» (рэж. *П. Малчанаў*, *А. Краўчук*, па творы А. Петрашкевіча), «Страсці па Аўдзею» (рэж. *В. Раеўскі*, па творы У. Бутрамеева), «Тарас на Парнасе» (рэж. *Н. Башава*), «Стомлены д'ябал» (рэж. *Р. Таліпаў*), «Трыстан ды Ізольда» (рэж. *А. Гарцуеў*); тэлеспектаклі «Прарок для Айчыны» (па творы А. Петрашкевіча), «Укралі кодэкс» (рэж. *Г. Вагаў*, па творы А. Петрашкевіча).

***Літаратура***

Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. / І. Л. Шаўлякова-Барзенка і інш. ; навук. рэд. : У. В. Гніламёдаў, С. С. Лаўшук. — Мінск : Беларуская навука, 2015. — Т. 4 : у 3 кн., кн. 3.

*Бельскі, А. І.* Беларуская літаратура XX стагоддзя : гісторыя і сучаснасць / А. І. Бельскі. — Мінск : Аверсэв, 2005.

*Бельскі, А. І.* Вывучэнне творчасці пісьменнікаў : класікі і сучаснікі ў школе / А. І. Бельскі. — Мінск : Аверсэв, 2005.

*Бельскі, А. І.* Сучасная літаратура Беларусі : дапам. для настаўнікаў / А. І. Бельскі. — Мінск : Аверсэв, 2000.

*Васючэнка, П.* Сучасная беларуская драматургія / П. Васючэнка. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2000.

*Гніламёдаў, У.* Ад даўніны да сучаснасці : нарыс пра беларускую паэзію / У. Гніламёдаў. — Мінск : Мастацкая літаратура, 2001.

*Грыцаль, Т. М.* Беларуская літаратура ў школе : вывучэнне сучаснай прозы ў старэйшых класах / Т. М. Грыцаль. — Мінск : Тэхнапрынт, 2004.

*Лаўшук, С. С.* Гарызонты беларускай драматургіі / С. С. Лаўшук ; Нацыянальная акадэмія навук Беларусі, Інстытут мовы і літаратуры імя Я. Коласа і Я. Купалы. — Мінск : Беларуская навука, 2010.

Літаратура пераходнага перыяду : тэарэтычныя асновы гісторыка-літаратурнага працэсу / М. А. Тычына [і інш.]. — Мінск : Беларуская навука, 2007.

*Саламаха, У. П.* Літаратура : застаецца сапраўднае : эсэ, артыкулы, дыялогі / У. П. Саламаха. — Мінск : Звязда, 2014.

*Штэйнер, І. Ф.* Споведзь перад Богам і людзьмі : беларуская паэзія на стыку тысячагоддзяў : манаграфія / І. Ф. Штэйнер. — Гомель : Сож, 2007.

## Паўтарэнне і падагульненне вывучанага за год

(1 гадзіна)

## Рэзерв вучэбнага часу

(2 гадзіны)

У с я г о: на вывучэнне твораў — 93 гадзіны;
на творчыя работы — 10 гадзін;
на ўрокі па творах для дадатковага чытання — 2 гадзіны.

### РЭКАМЕНДАЦЫЙНЫ СПІС ТВОРАЎ ДЛЯ ЗАВУЧВАННЯ НА ПАМЯЦЬ

*М. Стральцоў.* Урывак з апавядання «Сена на асфальце» (на выбар настаўніка).

*Н. Гілевіч.* Верш або ўрывак з рамана ў вершах «Родныя дзеці» (на выбар настаўніка).

*Я. Янішчыц.* Верш (на выбар вучняў).

*Р. Барадулін.* Верш (на выбар вучняў).

*А. Разанаў.* Верш (на выбар вучняў).

Верш з сучаснай беларускай паэзіі (на выбар вучняў).

## РЭКАМЕНДАЦЫЙНЫ СПІС ТВОРАЎ ДЛЯ ДАДАТКОВАГА ЧЫТАННЯ

### Паэзія

*Р. Баравікова.* Зб. «Люстэрка для самотнай», «Дрэва для райскай птушкі».

*Р. Барадулін.* Зб. «Евангелле ад Мамы», «Ксты».

*М. Башлакоў.* Зб. «Пяро зязюлі падніму», «Нетры».

*Л. Галубовіч.* Зб. «Споведзь бяссоннай душы», «Заложнік цемры».

*Ю. Голуб.* Зб. «Сын небасхілу».

*А. Звонак.* Зб. «Светлацені».

*В. Зуёнак.* Зб. «Лета трывожных дажджоў», «Чорная лесвіца».

*К. Камейша.* Зб. «Кубак блакіту».

*П. Макаль.* Зб. «Твар і душа», «Азбука любві».

*М. Мятліцкі.* Зб. «Палескі смутак», «Замкнёны дом».

*У. Паўлаў.* Зб. «Чысты чацвер».

*Г. Пашкоў.* Зб. «Тваім святлом благаславёны».

*А. Пісьмянкоў.* Зб. «Чытаю зоры», «Планіда».

*А. Разанаў.* Зб. «У горадзе валадарыць Рагвалод».

*Л. Рублеўская.* Зб. «Замак месячнага сяйва».

*А. Русецкі.* Зб. «Яго вялікасць».

*А. Сербантовіч.* Зб. «Пярсцёнак».

*А. Сыс.* Зб. «Пан лес», «Агмень».

*С. Есенин.* 1—2 стихотворения по выбору учащихся.

*А. Твардовский.* 1—2 стихотворения по выбору учащихся.

*А. Ахматова.* 1—2 стихотворения по выбору учащихся.

*М. Цветаева.* 1—2 стихотворения по выбору учащихся.

*О. Мандельштам.* 1—2 стихотворения по выбору учащихся.

*В. Маяковский.* 1—2 стихотворения по выбору учащихся.

*Б. Пастернак.* 1—2 стихотворения по выбору учащихся.

Поэзия 1970—1990-х гг. 1—2 стихотворения по выбору учащихся.

ВСЕГО: на изучение произведений — 97 ч

## ОСНОВНЫЕ ВИДЫ УСТНЫХ И ПИСЬМЕННЫХ РАБОТ

Устный и письменный пересказ художественных произведений или отрывков из них (подробный, краткий, выборочный, художественный, творческий) с элементами анализа.

Устное и письменное сочинение-рассуждение по изученному произведению: формулировка вопроса к изучаемому произведению, развернутый ответ на вопрос, проблемная характеристика (индивидуальная, сравнительная, групповая) героев произведения.

Устный или письменный отзыв о самостоятельно прочитанном произведении, просмотренном кинофильме, телепередаче, спектакле, прослушанной звукозаписи (с мотивировкой своего отношения), об актерском и авторском чтении.

Устное или письменное сочинение в жанре рассказа, дневниковых записей, письма, инсценировки (о посещении выставки, музея, об архитектурных памятниках города и т. д.).

Очерк, публицистическая, литературно-критическая статья.

Доклад и реферат на литературную тему (по одному или нескольким источникам).

Составление сложного плана прочитанного произведения и собственного высказывания.

Рецензия на самостоятельно прочитанную книгу, просмотренные кинофильм, телепередачу, спектакль, произведение живописи, музыки.

## ОСНОВНЫЕ ТРЕБОВАНИЯ К РЕЗУЛЬТАТАМ УЧЕБНОЙ ДЕЯТЕЛЬНОСТИ УЧАЩИХСЯ

В результате изучения литературы учащиеся должны з н а т ь / п о н и м а т ь:

- образную природу словесного искусства;
- содержание изученных произведений, их тематику, систему образов, композицию, изобразительно-выразительные средства языка, пафос литературного произведения;
- основные факты жизни и творчества писателей-классиков XIX и XX веков;
- этапы и закономерности русского и мирового литературного процесса;
- основные теоретико-литературные понятия, необходимые для самостоятельного анализа и оценки художественных произ-

ведений: модернизм как основа более поздних эстетических систем; роман-эпопея, рассказ; творческая эволюция писателя; реальное и фантастическое в искусстве; художественный образ; образ-символ; лирическое начало в эпическом повествовании; «романность» лирического стихотворения; образность поэтического слова; поэтический синтаксис; индивидуальность стиля; роль метафоры в единой целостности текста, тоническое стихосложение;

- традиции и новаторство в русской литературе;
- взаимодействие русской, белорусской и мировой литератур.

Учащиеся должны у м е т ь:

- выразительно читать изученные литературные произведения (или их фрагменты), соблюдая нормы литературного произношения;
- аргументированно выражать свое отношение к прочитанному произведению;
- анализировать художественное произведение (его эпизод, сцену), используя сведения по истории и теории литературы;
- определять род и жанр произведения;
- сопоставлять произведения русской и родной литератур, выявляя их типологическую общность и национальное своеобразие;
- писать отзывы о прочитанных произведениях и сочинения различных жанров на литературные темы;
- составлять планы, тезисы, конспекты статей учебника, устных выступлений и письменных работ на литературные темы.

# ЗАМЕЖНАЯ МОВА

## (АНГЛІЙСКАЯ, НЯМЕЦКАЯ, ФРАНЦУЗСКАЯ, ІСПАНСКАЯ, КІТАЙСКАЯ)

### ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбны прадмет «Замежная мова» выконвае важную ролю ў фарміраванні полікультурнай асобы, здольнай выкарыстоўваць вывучаемую мову ў разнастайных сітуацыях міжкультурнай камунікацыі. Валоданне замежнымі мовамі разглядаецца як важная перадумова адаптацыі чалавека ў глабалізаваным свеце. Іх галоўнае прызначэнне на сучасным этапе — забяспечваць узаемадзеянне і супрацоўніцтва народаў, выключаць магчымасці негатыўнага ўплыву на працэс нацыянальнай самаідэнтыфікацыі і культурнага самавызначэння асобы; павышаць гатоўнасць чалавека да асобаснай і прафесійнай самарэалізацыі праз выкарыстанне замежнай мовы разам з роднай мовай у якасці матэрыяльнай формы функцыянавання свайго мыслення. Такім чынам, працэс навучання замежнай мове павінен быць накіраваны на падрыхтоўку да міжкультурнай камунікацыі як сукупнасці разнастайных форм адносін і зносін паміж індывідамі і групамі, якія належаць да розных культур.

Роля і магчымасці замежных моў у фарміраванні асобы вучня як суб’екта міжкультурнай камунікацыі надзвычай вялікія. У працэсе авалодання імі фарміруецца другасная кагнітыўная свядомасць, што забяспечвае ўвесь комплекс іншамоўнай камунікатыўнай дзейнасці. Вучань развіваецца як полікультурная асоба, якая валодае высокім узроўнем канфліктаўстойлівасці, здольнасцю прымяняць адэкватныя сродкі для эфектыўнага ўзаемадзеяння з прадстаўнікамі іншых культур.

Мэты і змест навучання замежным мовам арыентаваны на сумеснае вывучэнне моў і культур. Вучань развіваецца як суб’ект міжкультурнай камунікацыі ў працэсе вывучэння моў па меры авалодання навыкамі і ўменнямі, запатрабаванымі ў міжкультурнай камунікацыі.

Замежная мова выступае як сродак фарміравання і выхавання маральна адказнай асобы, як сродак зносін, пазнання, асэнсавання і інтэрпрэтацыі фактаў іншай культуры, усведамлення сваёй уласнай культуры і азнаямлення з ёй прадстаўнікоў іншых моўных згуртаванняў.

## Мэты навучання замежнай мове

*Генеральная мэта* навучання замежным мовам заключаецца ў фарміраванні вучняў як суб'ектаў міжкультурнай камунікацыі праз авалоданне імі іншамоўнай камунікатыўнай кампетэнцыяй і развіццё ў іх якасцей полікультурнай асобы, запатрабаваных сучасным інфармацыйным грамадствам ва ўмовах глабалізацыі.

Працэс авалодання замежнай мовай накіраваны на адукацыю, развіццё і выхаванне вучняў, што прадугледжвае пастаноўку мэт навучання ў адзінстве адукацыйнага, развіццёвага і выхаваўчага кампанентаў.

*Адукацыйныя мэты* навучання замежным мовам заключаюцца ў моўным і маўленчым развіцці асобы вучня шляхам забеспячэння практычнага авалодання замежнай мовай як эфектыўным сродкам зносін у адзінстве і ўзаемадзеянні яе кагнітыўнай, камунікатыўнай і экспрэсіўнай функцый. Дасягненне адукацыйных мэт прадугледжвае засваенне і актуалізацыю ведаў пра вывучаемыя замежныя мовы, авалоданне навыкамі і ўменнямі іншамоўнай маўленчай дзейнасці (успрыманне і разуменне іншамоўнага маўлення на слых, гаварэнне, чытанне, пісьмовае маўленне). Разнастайнасць сфер зносін забяспечвае веданне вучнямі культуразнаўчых і краіназнаўчых рэалій, што ўзбагачае іх уяўленні пра карціну свету, пашырае іх агульны кругагляд і магчымасці самаадукацыі і садзейнічае фарміраванню гатоўнасці да міжкультурных зносін.

*Развіццёвыя мэты* навучання замежным мовам прадугледжваюць кагнітыўнае, камунікатыўнае і эмацыянальнае развіццё вучняў. У працэсе авалодання спосабамі фарміравання і фармулявання думкі на замежнай мове развіваецца лінгвістычны кампанент гуманітарнага мыслення. Пры гэтым узнікаюць магчымасці для развіцця ўяўлення і ўзбагачэння эмацыянальна-пачуццёвай сферы асобы. Навучанне замежным мовам забяспечвае развіццё маўленчых

працэсаў і маўленчых механізмаў, што садзейнічае фарміраванню моўнай здольнасці ў адзінстве параджэння і ўспрымання маўлення.

*Выхаваўчыя мэты* навучання замежным мовам накіраваны на ўзбагачэнне духоўнага свету вучняў, выхаванне ў іх культуры мыслення, пачуццяў, паводзін. У працэсе навучання ў вучняў развіваюцца гуманістычныя каштоўнасныя арыентацыі, уменне ажыццяўляць зносіны ў кантэксце дыялогу культур, фарміруецца псіхалагічная гатоўнасць да міжмоўнай міжкультурнай камунікацыі. Авалоданне замежнымі мовамі як сродкам зносін садзейнічае эфектыўнай адаптацыі асобы да «чужога» сацыяльнага асяроддзя, забяспечваючы самакантроль і адэкватную самаацэнку.

У сувязі з вышэйсказаным задачы замежнай мовы як вучэбнага прадмета заключаюцца ў тым, каб забяспечыць:

- развіццё камунікатыўнай культуры вучняў, засваенне імі вуснага і пісьмовага маўлення на ўзроўні, які з'яўляецца дастатковым для адэкватнай трактоўкі інфармацыі, што перадаецца і прымаецца;
- кагнітыўнае развіццё вучняў, накіраванае на пераструктураванне асобных фрагментаў індывідуальнага вобраза карціны свету, на ўзроўні, дастатковым для ўспрымання свету вывучаемай мовы праз штучна фарміруемы ў свядомасці лінгвадыдактычны канструкт, які дазваляе ўспрымаць пазнавальны свет у адпаведнасці з яго (гэтага свету) уласнымі сацыяльнымі, палітычнымі, культурнымі, моўнымі рэаліямі, а не проста праз пераклад на гэту мову схем роднай, нацыянальнай карціны свету;
- сацыякультурнае развіццё асобы, арыентаванае на ўспрыманне «іншага» ў яго непадобнасці праз пазнанне каштоўнасцей новай культуры ў дыялогу з роднай, супастаўленне вывучаемай мовы з роднай і культуры гэтай мовы са сваёй роднай, звыклай, якое забяспечвае магчымасць прадстаўляць сваю краіну і культуру ва ўмовах іншамоўных міжкультурных зносін;
- развіццё каштоўнасных арыентацый вучняў, што ажыццяўляецца праз фарміраванне гуманістычнай пазіцыі асобы шляхам стварэння ўмоў для ўзбагачэння адпаведнага канструктыўнага вопыту эмацыянальна-пачуццёвых адносін як

найважнейшага фактару ўзнікнення ў чалавека станоўчых адносін да «іншага», якія праяўляюцца ў паважлівых адносінах да яго, прызнанні разнастайнасці культур і іх роўнасці, з'яўленні ў вучняў імкнення да супрацоўніцтва і ўзаемадзеяння з іншымі народамі, да сумеснага рашэння цывілізацыйных праблем;

- развіццё матывацыі да вывучэння замежнай мовы праз фарміраванне патрэбнасці лепш і больш дакладна разумець навакольнае асяроддзе і быць зразуметым ім; усведамленне ролі валодання замежнай мовай для сацыялізацыі ў сучасным свеце;
- развіццё самаадукацыйнага патэнцыялу вучняў, забеспячэнне іх гатоўнасці да самастойнай работы над мовай, якое дасягаецца шляхам авалодання неабходнымі тэхнікамі вучэбна-пазнавальнай працы, стратэгіямі самааналізу, саманазірання.

У якасці стратэгічнай кампетэнцыі, прызначэнне якой заключаецца ў забеспячэнні асэнсавання вучнямі іншай сацыякультуры, пазнання імі сэнсавых арыенціраў іншага лінгвасоцыуму, умення бачыць падабенства і адрозненні паміж культурамі і ўлічваць іх у працэсе іншамоўных зносін, выступае **міжкультурная** кампетэнцыя.

У якасці інтэграцыйнай кампетэнцыі, валоданне якой павінна быць забяспечана, выступае **камунікатыўная** — валоданне сукупнасцю маўленчых, моўных, сацыякультурных норм вывучаемай мовы, а таксама кампенсаторнымі і вучэбна-пазнавальнымі ўменнямі, якія дазваляюць выпускніку ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі ажыццяўляць міжкультурную камунікацыю і вырашаць маўленчыя, адукацыйныя, пазнавальныя і іншыя задачы. Яе кампанентамі з'яўляюцца маўленчая, моўная, сацыякультурная, кампенсаторная, вучэбна-пазнавальная кампетэнцыі, якія выступаюць як субкампетэнцыі.

*Маўленчая кампетэнцыя* — сукупнасць навыкаў і ўменняў маўленчай дзейнасці (гаварэнне, успрыманне маўлення на слых, чытанне і пісьмовае маўленне), веданне норм маўленчых паводзін; набыццё на гэтай аснове вопыту іх выкарыстання для пабудовы лагічнага і звязнага па форме і змесце выказвання, а таксама для тлумачэння сэнсу выказвання іншых людзей.

*Моўная кампетэнцыя* — сукупнасць моўных ведаў аб правілах функцыянавання моўных сродкаў (фанетычных, арфаграфічных, лексічных і граматычных) у маўленні і навыкаў іх выкарыстання з камунікатыўнымі мэтамі.

*Сацыякультурная кампетэнцыя* — сукупнасць ведаў пра нацыянальна-культурную спецыфіку краін вывучаемай мовы, уменняў наладжваць свае маўленчыя і немаўленчыя паводзіны ў адпаведнасці з гэтай спецыфікай, уменняў прадстаўляць сваю краіну і яе культуру ва ўмовах іншамоўных міжкультурных зносін.

*Кампенсаторная кампетэнцыя* — сукупнасць уменняў выкарыстоўваць дадатковыя вербальныя сродкі і невербальныя спосабы для вырашэння камунікатыўных задач ва ўмовах дэфіцыту наяўных моўных сродкаў.

*Вучэбна-пазнавальная кампетэнцыя* — сукупнасць агульных і спецыяльных вучэбных уменняў, неабходных для ажыццяўлення самастойнай дзейнасці па авалоданні замежнай мовай, вопыт іх выкарыстання.

Паслядоўнае і ўзаемазвязанае авалоданне названымі ключавымі кампетэнцыямі забяспечвае фарміраванне ў вучняў адпаведных кампетэнтнасцей.

Дасягненню мэт навучання павінны садзейнічаць усе формы адукацыйнага працэсу.

## Агульныя патрабаванні да зместу навучання

Змест моўнай адукацыі ўяўляе сабой адзінства прадметнага, працэсуальнага і эмацыянальна-каштоўнаснага кампанентаў.

Авалоданне прадметным, працэсуальным і эмацыянальна-каштоўнасным кампанентамі зместу адукацыі прадугледжвае набыццё вопыту, неабходнага ў міжкультурнай камунікацыі.

Прадметны і працэсуальны кампаненты зместу моўнай адукацыі ўключаюць:

- сферы зносін і прадметна-тэматычны змест маўлення;
- віды маўленчай дзейнасці і моўны матэрыял;
- сацыякультурныя веды: культуразнаўчыя, краіназнаўчыя і лінгвакраіназнаўчыя;
- кампенсаторныя і вучэбна-пазнавальныя ўменні і навыкі самастойнай работы з іншамоўным матэрыялам.

Эмацыянальна-каштоўнасны кампанент зместу моўнай адукацыі ўключае сукупнасць адносін асобы да сусветнай моўнай і культурнай спадчыны, а таксама да працэсу авалодання ёй з мэтай асобаснага росту. Названы кампанент забяспечвае набыццё вопыту іншамоўных зносін шляхам рэфлексіі, самапазнання, самавызначэння. Працэс авалодання замежнай мовай набывае для вучня асобасны сэнс.

Змест моўнай адукацыі ў адзінстве яе лінгвістычнага і экстралінгвістычнага кампанентаў фарміруецца з улікам псіхалагічных і псіхалінгвістычных асаблівасцей працэсу авалодання замежнай мовай.

Адбор зместу вучэбнага матэрыялу, які падлягае засваенню, ажыццяўляецца на аснове наступных метадалагічных арыенціраў:

- накіраванасць педагагічнага працэсу на падрыхтоўку да міжкультурных зносін;
- усебаковы ўлік узаемасувязей: мова — мысленне — культура;
- прад'яўленне каштоўнасцей пазнавальнай культуры ў дыялогу з роднай;
- інтэграцыя моўнага, сацыякультурнага, аксіялагічнага кампанентаў зместу навучання;
- аўтэнтычнасць і каштоўнасная значнасць іншамоўных матэрыялаў;
- адпаведнасць вучэбнага матэрыялу сучасным гутарковым нормам вывучаемай мовы.

Структураванне вучэбнага матэрыялу ажыццяўляецца на аснове наступных патрабаванняў:

- бесперапыннае канцэнтрычнае прад'яўленне і накапленне ведаў;
- паэтапнае фарміраванне навыкаў і ўменняў;
- пераемнасць этапаў працэсу авалодання замежнай мовай;
- пастаянная апора на моўны, маўленчы і асобасны суб'ектны вопыт вучняў;
- звязанасць у авалоданні маўленнем і сістэмай мовы;
- улік магчымасцей для фарміравання ўменняў самастойнай работы з іншамоўнымі інфармацыйнымі крыніцамі з мэтай самаадукацыі.

Рэалізацыя зместу моўнай адукацыі прадугледжвае паслядоўны ўлік наступных асноўных палажэнняў камунікатыўна арыентаванага навучання:

- мадэліраванне сітуацый зносін, якія стымулююць вучняў да вырашэння камунікатыўных задач падчас вывучэння замежнай мовы;
- сітуатыўна абумоўленае авалоданне лексікай і граматыкай вывучаемай мовы;
- выкарыстанне камунікатыўна арыентаваных заданняў на аснове імітацыйных, гульнявых і свабодных зносін;
- актыўнае ўцягванне вучняў у працэс зносін у якасці маўленчых партнёраў;
- ажыццяўленне адукацыйнага працэсу ва ўмовах, набліжаных да рэальных зносін;
- стварэнне матывацыйнай гатоўнасці і патрэбнасці вучняў ва ўспрыманні і засваенні вучэбнага матэрыялу ва ўмовах, набліжаных да рэальных зносін.

## Сферы зносін і прадметна-тэматычны змест маўлення

***Сацыяльна-бытавая сфера.*** Сям'я.

***Вучэбна-працоўная сфера.*** Выбар прафесіі.

***Сацыяльна-культурная сфера.*** Міжнароднае супрацоўніцтва. Нацыянальны характар.

***Сацыяльна-пазнавальная сфера.*** Турызм. Экалогія. Сацыякультурны партрэт Рэспублікі Беларусь і краін вывучаемай мовы.

## Маўленчыя ўменні

***Успрыманне і разуменне маўлення на слых*** — уменне разумець іншамоўнае маўленне ў працэсе непасрэдных зносін з субяседнікам, уменне разумець разнажанравыя аўдыя- і відэатэксты з рознай паўнатой і дакладнасцю пранікнення ў іх змест.

***Гаварэнне*** — уменне ажыццяўляць дыялагічныя, маналагічныя і полілагічныя зносіны ў адпаведнасці з мэтамі, задачамі і ўмовамі камунікацыі, з захаваннем норм маўленчага і немаўленчага этыкету.

***Чытанне*** — уменне чытаць і разумець разнажанравыя тэксты з рознай паўнатой і дакладнасцю пранікнення ў іх змест у залежнасці ад віду чытання і далейшага выкарыстання інфармацыі.

***Пісьмовае маўленне*** — уменне прадуцыраваць розныя віды пісьмовых тэкстаў у адпаведнасці з нормамі, прынятымі ў краінах вывучаемай мовы, з улікам камунікатыўных задач і адрасата.

## Моўныя веды і навыкі

Веды пра сістэму вывучаемай мовы, правілы функцыянавання моўных сродкаў (фанетычных, лексічных, граматычных) у маўленні і навыкі іх выкарыстання з камунікатыўнымі мэтамі.

## Сацыякультурныя веды і ўменні

Веданне сацыякультурнага кантэксту сваёй краіны і краін вывучаемай мовы, уменні наладжваць свае маўленчыя і немаўленчыя паводзіны ў адпаведнасці з іх спецыфікай, прадстаўляць сваю краіну і яе культуру ва ўмовах іншамоўных міжкультурных зносін.

## Кампенсаторныя ўменні

Уменні выкарыстоўваць розныя вербальныя і невербальныя сродкі для кампенсацыі недахопаў у камунікацыі ва ўмовах дэфіцыту моўных сродкаў, недахопу маўленчага і сацыяльнага вопыту.

## Вучэбна-пазнавальныя ўменні

Агульныя і спецыяльныя вучэбныя ўменні, неабходныя для ажыццяўлення самастойнай пазнавальнай дзейнасці па авалоданні іншамоўнымі зносінамі і культурай краін вывучаемай мовы.

Адрозненні ў авалоданні замежнай мовай пры яе вывучэнні на базавым і павышаным узроўнях заключаюцца ў наступным:

- аб'ём засвоенага прадуктыўнага і рэцэптыўнага лексічнага матэрыялу;
- колькасць прадуктыўна засвоенага граматычнага матэрыялу;
- ступень складанасці і колькасць вырашаемых камунікатыўных задач;

- ступень самастойнасці ў інтэрпрэтацыі з’яў міжкультурнай камунікацыі;
- ступень падрыхтаванасці да ажыццяўлення маўленчых і немаўленчых паводзін адэкватна сацыякультурнай спецыфіцы краіны вывучаемай мовы;
- узровень падрыхтаванасці да самастойнай дзейнасці вучняў у аваладанні замежнай мовай.

* * *

Змест навучання пададзены ў вучэбнай праграме праз прадметна-тэматычны змест зносін, патрабаванні да практычнага валодання відамі маўленчай дзейнасці, моўны матэрыял (фанетыка, лексіка, граматыка).

У прадметна-тэматычным змесце зносін акрэслены камунікатыўныя задачы для вывучэння замежнай мовы на базавым узроўні (прамы шрыфт) і павышаным узроўні (прамы шрыфт і курсіў).

Патрабаванні да практычнага валодання відамі маўленчай дзейнасці: працягласць гучання тэксту, колькасць рэплік на кожнага субяседніка ў дыялагічным маўленні, аб’ём выказвання ў маналагічным маўленні, аб’ём тэксту для чытання, аб’ём тэксту для пісьмовага маўлення — задаюць асноўныя параметры для ўсіх відаў маўленчай дзейнасці. Дадзеныя параметры, а таксама аб’ём прадуктыўнага і рэцэптыўнага лексічнага мінімуму абазначаюцца наступным чынам: першая лічба — патрабаванні для базавага ўзроўню, другая — для павышанага ўзроўню. Напрыклад, працягласць гучання тэксту: 2—3 мін; прадуктыўны мінімум: 230—280 лексічных адзінак; рэцэптыўны мінімум: 200—280 лексічных адзінак; агульны аб’ём прадуктыўнай лексікі: 1970—2300 лексічных адзінак; агульны аб’ём рэцэптыўнай лексікі: 1310—1920 лексічных адзінак.

Граматычны матэрыял, які падлягае вывучэнню, аднолькавы для ўсіх відаў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Патрабаванні да валодання граматычным матэрыялам адрозніваюцца аб’ёмам яго прадуктыўнага засваення. Граматычныя з’явы для рэцэптыўнага засваення, адзначаныя зорачкай (*), прызначаны для прадуктыўнага засваення на павышаным узроўні.

Больш высокія патрабаванні да валодання моўным і маўленчым матэрыялам пры вывучэнні замежнай мовы на павышаным

узроўні забяспечаць больш высокі ўзровень фарміравання ў вучняў моўных навыкаў і маўленчых уменняў, што будзе праяўляцца ў іх здольнасці больш якасна вырашаць вучэбныя камунікатыўныя задачы.

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА

**105/175 гадзін**

## ПРАДМЕТНА-ТЭМАТЫЧНЫ ЗМЕСТ ЗНОСІН

| Сфера зносін | Прадметна-тэматычны змест | Камунікатыўныя задачы |
|---|---|---|
| | | У канцы года вучань павінен умець |
| Сацыяльна-бытавая | Сям'я | • Выказаць думку пра ролю сям'і ў жыцці грамадства;<br>• параўнаць інстытут сям'і ў Рэспубліцы Беларусь і краіне вывучаемай мовы;<br>• расказаць пра сямейныя святы і традыцыі ў Рэспубліцы Беларусь;<br>• распытаць пра сямейныя святы і традыцыі ў краіне вывучаемай мовы;<br>• *даказаць важнасць сям'і ў жыцці чалавека*;<br>• *абмеркаваць мадэль/шляхі стварэння шчаслівай сям'і*;<br>• *абмеркаваць праблемы выхавання дзяцей у сям'і* |
| Вучэбна-працоўная | Выбар прафесіі | • Расказаць аб прафесіях, запатрабаваных у сучасным грамадстве;<br>• распытаць пра папулярныя прафесіі ў краіне вывучаемай мовы;<br>• абгрунтаваць свой выбар прафесіі;<br>• *параўнаць асаблівасці розных прафесій*;<br>• *даказаць важнасць валодання замежнай мовай у прафесійнай дзейнасці чалавека* |

| Сфера зносін | Прадметна-тэматычны змест | Камунікатыўныя задачы<br>У канцы года вучань павінен умець |
|---|---|---|
| Сацыяльна-культурная | Нацыянальны характар | • Апісаць асаблівасці нацыянальнага характару беларусаў;<br>• абмеркаваць асаблівасці нацыянальнага характару прадстаўнікоў краін вывучаемай мовы;<br>• параўнаць асаблівасці нацыянальнага характару прадстаўнікоў розных краін;<br>• *выказаць і абгрунтаваць сваю думку наконт стэрэатыпных уяўленняў пра нацыянальны характар*;<br>• *даказаць супярэчлівасць стэрэатыпнай думкі пра характар прадстаўнікоў розных краін* |
| | Міжнароднае супрацоўніцтва | • Расказаць пра магчымасці кантактаў з зарубежнымі равеснікамі ў сучасным свеце;<br>• распытаць пра кантакты з зарубежнымі равеснікамі;<br>• расказаць пра культурныя сувязі Рэспублікі Беларусь з іншымі краінамі;<br>• *абгрунтаваць важнасць міжнароднага супрацоўніцтва Рэспублікі Беларусь з іншымі краінамі ў розных сферах дзейнасці* |
| Сацыяльна-пазнавальная | Турызм | • Расказаць пра значэнне турызму ў жыцці сучаснага чалавека;<br>• абмяняцца думкамі пра розныя віды турызму;<br>• распытаць пра найбольш папулярныя віды турызму ў краіне вывучаемай мовы;<br>• зрабіць запыт інфармацыі, неабходнай для падарожжа, у турыстычным агенстве; |

| Сфера зносін | Прадметна-тэматычны змест | Камунікатыўныя задачы<br>У канцы года вучань павінен умець |
|---|---|---|
| | | • *выказаць сваё меркаванне пра перспектывы развіцця турызму ў Рэспубліцы Беларусь*;<br>• *параіць, як пазбегнуць цяжкасцей, якія ўзнікаюць падчас падарожжа*;<br>• *прапанаваць свой маршрут падарожжа па Беларусі* |
| | Экалогія | • Расказаць пра асноўныя экалагічныя праблемы сваёй краіны;<br>• распытаць пра асноўныя экалагічныя праблемы краіны вывучаемай мовы;<br>• даказаць неабходнасць аховы навакольнага асяроддзя;<br>• *абгрунтаваць шляхі і спосабы вырашэння праблем аховы навакольнага асяроддзя* |
| | Сацыякультурны партрэт Рэспублікі Беларусь і краін вывучаемай мовы | • Паказаць сацыякультурны партрэт Рэспублікі Беларусь;<br>• апісаць сацыякультурны партрэт краін вывучаемай мовы;<br>• *параўнаць сацыякультурны партрэт Рэспублікі Беларусь і краіны вывучаемай мовы*;<br>• *абмеркаваць сучаснае культурнае жыццё ў Рэспубліцы Беларусь і краінах вывучаемай мовы* |

## ПАТРАБАВАННІ ДА ПРАКТЫЧНАГА ВАЛОДАННЯ ВІДАМІ МАЎЛЕНЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

### Успрыманне і разуменне маўлення на слых

Вучні павінны р а з у м е ц ь на слых пры непасрэдных зносінах і ў гука-/відэазапісе:

- ♦ асноўны змест аўдыя- і відэатэкстаў, якія пабудаваны на вывучаным матэрыяле і змяшчаюць 3—4 % незнаёмых слоў;
- ♦ адносна поўна разумець змест тэкстаў, якія пабудаваны на вывучаным матэрыяле і змяшчаюць 2—3 % незнаёмых слоў, пра значэнне якіх можна здагадацца.

Віды тэксту: апавяданне, інтэрв'ю, аб'ява, размова па тэлефоне, фрагмент радыёпраграмы/відэафільма, тэленавіны.

Працягласць гучання тэксту: 2—3 мін.

### Гаварэнне

***Дыялагічнае маўленне***

Вучні павінны ў м е ц ь:

- удзельнічаць у абмеркаванні тэм і праблем, вызначаных прадметна-тэматычным зместам маўлення;
- абгрунтоўваць сваю думку;
- абменьвацца фактычнай і ацэначнай інфармацыяй з некалькімі ўдзельнікамі зносін.

Віды дыялогу: дыялог-распытванне, дыялог — абмен думкамі, інтэрв'ю, дыялог-разважанне, палілог.

Колькасць рэплік на кожнага субяседніка: 7—8.

***Маналагічнае маўленне***

Вучні павінны ў м е ц ь:

- ♦ апісваць і параўноўваць прадметы, факты, з'явы;
- ♦ расказваць пра пачутае/прачытанае/убачанае;
- ♦ спалучаць апісанне і апавяданне з разважаннем і выказваннем асабістай ацэнкі;
- ♦ разважаць пра факты, падзеі, аргументаваць свой пункт гледжання, рабіць вывады.

Віды маналагічнага выказвання: апісанне, параўнанне, апавяданне, разважанне, ацэначнае меркаванне.

Аб'ём выказвання: не менш за 15—20 фраз.

## Чытанне

Вучні павінны р а з у м е ц ь тэксты з рознай паўнатой, дакладнасцю і глыбінёй пранікнення ў іх змест у залежнасці ад віду чытання:

- ♦ разумець асноўны змест аўтэнтычных мастацкіх, навукова-папулярных і публіцыстычных тэкстаў (азнаямленчае чытанне);
- ♦ поўна і дакладна разумець змест аўтэнтычных мастацкіх і навукова-папулярных тэкстаў (вывучальнае чытанне);
- ♦ знаходзіць неабходную/значную інфармацыю ў тэкстах розных жанраў (праглядальнае/пошукавае чытанне);
- ♦ вызначаць галоўную ідэю і задуму аўтара, у тым ліку выражаныя імпліцытна.

Тэксты, прызначаныя для азнаямленчага чытання, могуць уключаць да 4—6 % незнаёмых слоў, пра значэнне якіх можна здагадацца. Аб'ём тэксту: прыкладна 3000—4000 друкаваных знакаў з прабеламі.

Тэксты для вывучальнага чытання могуць уключаць да 3—5 % незнаёмых слоў, раскрыццё значэння якіх магчыма пры выкарыстанні двухмоўнага слоўніка. Аб'ём тэксту: прыкладна 2500—3500 друкаваных знакаў з прабеламі.

Для навучання праглядальнаму/пошукаваму чытанню мэтазгодна выкарыстоўваць адзін або некалькі тэкстаў прагматычнага характару.

Віды тэксту: апавяданне, артыкул у газеце/часопісе, дзелавое пісьмо, прыватнае пісьмо, анкета, рэзюмэ, справаздача, вэб-старонка, e-mail, турыстычны буклет/брашура, рэклама.

## Пісьмовае маўленне

Вучні павінны ў м е ц ь прадуцыраваць нескладаныя віды пісьмовых тэкстаў у адпаведнасці з нормамі, прынятымі ў краіне вывучаемай мовы:

- ♦ пісаць віншаванні, запрашэнні, прыватныя пісьмы;
- ♦ пісаць нескладаныя дзелавыя пісьмы;
- ♦ пісаць аўтабіяграфію, запаўняць анкету;
- ♦ складаць рэзюмэ па змесце праслуханага/прачытанага тэксту;
- • пісаць сачыненне на прапанаваную тэму.

Аб'ём тэксту: не менш за 110—170 слоў.

## МОЎНЫ МАТЭРЫЯЛ

### АНГЛІЙСКАЯ МОВА

**Фанетыка**

Удасканаленне слыхавымаўленчых і рытміка-інтанацыйных навыкаў вучняў на аснове вывучаемага моўнага і маўленчага матэрыялу.

**Лексіка**

*Прадуктыўны мінімум:* 230—280 лексічных адзінак.

*Рэцэптыўны мінімум:* 200—280 лексічных адзінак.

*Агульны аб'ём прадуктыўнай лексікі:* 1970—2300 лексічных адзінак.

*Агульны аб'ём рэцэптыўнай лексікі:* 1310—1920 лексічных адзінак.

*Сродкі міжфразавай сувязі: however, nevertheless, etc.*

*Словаўтварэнне:* суфіксы прыметнікаў: *-ian, -an*; прыстаўка дзеясловаў *en-*.

Суфіксы назоўнікаў для рэцэптыўнага засваення: *-dom, -hood, -ism, -ese.*

**Граматыка**

***Граматычны матэрыял для прадуктыўнага засваення***

***М а р ф а л о г і я***

*Артыкль:* сістэматызацыя правіл ужывання артыкля.

*Займеннік:* сістэматызацыя асноўных тыпаў.

*Дзеяслоў:* сістэматызацыя часавых форм дзеясловаў.

*Мадальныя дзеясловы:* сістэматызацыя мадальных дзеясловаў па значэнні.

*Прыназоўнік:* прыназоўнікі з дзеясловамі.

*Злучнік:* сістэматызацыя злучнікаў і злучальных слоў.

***С і н т а к с і с***

Умоўны лад у складаназалежных сказах нерэальнай умовы, якія адносяцца да цяперашняга, будучага і прошлага часу.

***Граматычны матэрыял для рэцэптыўнага засваення***

*Дзеяслоў:* сцвярджальныя, адмоўныя і пытальныя формы дзеясловаў у *Present Perfect Passive, Past Perfect Passive, Future Perfect Continuous*.

Герундыяльныя і дзеепрыметнікавыя звароты.

Звароты з фармальным дзейнікам.

Суб'ектны інфінітыўны зварот *Complex Subject*.

*Дапасаванне дзейніка і выказніка.

## НЯМЕЦКАЯ МОВА

**Фанетыка**

Інтанацыя сказаў са словамі, якія ўводзяць простую мову.

**Лексіка**

*Прадуктыўны мінімум:* 230—280 лексічных адзінак.

*Рэцэптыўны мінімум:* 200—280 лексічных адзінак.

*Агульны аб'ём прадуктыўнай лексікі:* 1970—2300 лексічных адзінак.

*Агульны аб'ём рэцэптыўнай лексікі:* 1310—1920 лексічных адзінак.

**Граматыка**

***Граматычны матэрыял для прадуктыўнага засваення***

***Марфалогія***

*Дзеяслоў:* умоўны лад. *Die würde-Form ... Infinitiv* для выказвання ветлівай прапановы, просьбы, парады, рэкамендацыі. *Präteritum Konjunktiv* для выказвання нерэальнага дзеяння ў цяперашні час. *Plusquamperfekt Konjunktiv* для выказвання нерэальнага дзеяння ў мінулым.

***Сінтаксіс***

Складаназалежныя сказы. Даданыя ўступальныя сказы са злучнікам *obwohl/obgleich*. Складаназалежныя сказы (сістэматызацыя).

***Граматычны матэрыял для рэцэптыўнага засваення***

Ускосная мова. *Partizip I* і *Partizip II* у ролі азначэння. Субстантываваныя дзеепрыметнікі. Развітае азначэнне.

## ФРАНЦУЗСКАЯ МОВА

**Фанетыка**

Удасканаленне слыхавымаўленчых і рытміка-інтанацыйных навыкаў вучняў на аснове вывучаемага моўнага і маўленчага матэрыялу.

**Лексіка**

*Прадуктыўны мінімум:* 230—280 лексічных адзінак.

*Рэцэптыўны мінімум:* 200—280 лексічных адзінак.

*Агульны аб'ём прадуктыўнай лексікі:* 1970—2300 лексічных адзінак.

*Агульны аб'ём рэцэптыўнай лексікі:* 1310—1920 лексічных адзінак.

*Словаўтварэнне:* сістэматызацыя спосабаў словаўтварэння.

**Граматыка**

***Граматычны матэрыял для прадуктыўнага засваення***

***М а р ф а л о г і я***

Сістэматызацыя ўжывання назоўнікаў; прыметнікаў у звычайнай, вышэйшай і найвышэйшай ступенях; прыслоўяў; прыназоўнікаў; злучнікаў; трывальна-часавых форм дзеяслова.

***С і н т а к с і с***

Дапасаванне часоў. Сістэматызацыя ўжывання розных тыпаў складаназлучанага і складаназалежнага сказаў.

***Граматычны матэрыял для рэцэптыўнага засваення***

*Дзеяслоў:* неасабовая форма дзеяслова *le gérondif*. *Le conditionnel passé*. *Le subjonctif passé*.

## ІСПАНСКАЯ МОВА

**Фанетыка**

Удасканаленне слыхавымаўленчых і рытміка-інтанацыйных навыкаў вучняў на аснове вывучаемага лексіка-граматычнага матэрыялу.

**Лексіка**

*Прадуктыўны мінімум:* 230—280 лексічных адзінак.

*Рэцэптыўны мінімум:* 200—280 лексічных адзінак.

*Агульны аб'ём прадуктыўнай лексікі:* 1970—2300 лексічных адзінак.

*Агульны аб'ём рэцэптыўнай лексікі:* 1310—1920 лексічных адзінак.

*Словаўтварэнне:* суфіксы назоўнікаў: *-ador, -edor, -idor, -ario, -aje, -miento, -ura, -idad, -anza, -ez, -eza*; дзеясловаў *-izar*; прыстаўкі:

*en(m)-, ante-, entre-, ex-, ultra-, extra-, sobre-, sub-, pro-, trans-*. Сістэматызацыя спосабаў словаўтварэння.

**Граматыка**

***Граматычны матэрыял для прадуктыўнага засваення***

***М а р ф а л о г і я***

*Артыкль:* сістэматызацыя ўжывання артыкля. Адсутнасць артыкля.

*Займеннік:* прыназоўнікавая і беспрыназоўнікавая формы асабовых займеннікаў у якасці прамых і ўскосных дапаўненняў; адносныя займеннікі: *que, quien/es; cual/cuales, el cual, la cual, los cuales, las cuales, lo cual; cuyo/a, cuyos/as*.

*Дзеяслоў: Modo Subjuntivo* ў самастойных сказах.

***С і н т а к с і с***

Дапасаванне часоў. Простая і ўскосная мова. Перавод з простай мовы ва ўскосную.

Складаназалежныя сказы з даданымі ўмовы I і II тыпаў.

***Граматычны матэрыял для рэцэптыўнага засваення***

***М а р ф а л о г і я***

Азнаямленне з асаблівасцямі і ўжываннем дзеясловаў *Pluscuamperfecto de Subjuntivo*.

Азнаямленне з канструкцыяй *Ac. + Inf.* і канструкцыямі з герундыем: *ir, andar, llevar, seguir, continuar + Gerundio*.

***С і н т а к с і с***

Даданыя сказы ўмовы III і змешанага тыпаў.

## КІТАЙСКАЯ МОВА

## ПАТРАБАВАННІ ДА ПРАКТЫЧНАГА ВАЛОДАННЯ ВІДАМІ МАЎЛЕНЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

### Успрыманне і разуменне маўлення на слых

Вучні павінны р а з у м е ц ь на слых пры непасрэдных зносінах і ў гука-/відэазапісе:

- асноўны змест аўдыя- і відэатэкстаў, якія пабудаваны на вывучаным матэрыяле і змяшчаюць 3—4 % незнаёмых слоў;

- адносна поўна разумець змест тэкстаў, якія пабудаваны на вывучаным матэрыяле і змяшчаюць 2—3 % незнаёмых слоў, пра значэнне якіх можна здагадацца.

Віды тэксту: апавяданне, інтэрв’ю, аб’ява, размова па тэлефоне, фрагмент радыёпраграмы/відэафільма, тэленавіны.

Працягласць гучання тэксту: 2—3 мін.

## Гаварэнне

***Дыялагічнае маўленне***

Вучні павінны ў м е ц ь:

- удзельнічаць у абмеркаванні тэм і праблем, вызначаных прадметна-тэматычным зместам зносін;
- абгрунтоўваць сваю думку;
- абменьвацца фактычнай і ацэначнай інфармацыяй з некалькімі ўдзельнікамі зносін.

Віды дыялогу: дыялог-распытванне, дыялог — абмен думкамі, інтэрв’ю, дыялог-абмеркаванне, палілог.

Колькасць рэплік на кожнага субяседніка: 7—8.

***Маналагічнае маўленне***

Вучні павінны ў м е ц ь:

- апісваць і параўноўваць прадметы, факты, з’явы;
- расказваць пра пачутае/прачытанае/убачанае;
- спалучаць апісанне і апавяданне з разважаннем і выказваннем асабістай ацэнкі;
- разважаць пра факты, падзеі, аргументаваць свой пункт гледжання, рабіць вывады.

Від маналагічнага выказвання: апісанне, параўнанне, апавяданне, разважанне.

Аб’ём выказвання: 12—16 фраз.

## Чытанне

Вучні павінны р а з у м е ц ь тэксты, якія напісаны з дапамогай іерогліфаў, з рознай паўнатой, дакладнасцю і глыбінёй пранікнення ў іх змест у залежнасці ад віду чытання:

- разумець асноўны змест аўтэнтычных мастацкіх, навукова-папулярных і публіцыстычных тэкстаў (азнаямленчае чытанне);

- ♦ поўна і дакладна разумець змест аўтэнтычных мастацкіх і навукова-папулярных тэкстаў (вывучальнае чытанне);
- ♦ знаходзіць неабходную/значную інфармацыю ў тэкстах розных жанраў (праглядальнае/пошукавае чытанне);
- ♦ вызначаць галоўную ідэю і задуму аўтара, у тым ліку выражаныя імпліцытна.

Тэксты, прызначаныя для азнаямленчага чытання, могуць уключаць да 4—6 % незнаёмых слоў, пра значэнне якіх можна здагадацца. Аб'ём тэксту: 0,75—1,0 старонка.

Тэксты для вывучальнага чытання могуць уключаць да 3—5 % незнаёмых слоў, раскрыццё значэння якіх магчыма пры выкарыстанні двухмоўнага слоўніка. Аб'ём тэксту: 0,5—0,75 старонкі.

Для навучання праглядальнаму/пошукаваму чытанню мэтазгодна выкарыстоўваць адзін або некалькі тэкстаў прагматычнага характару.

Віды тэксту: апавяданне, артыкул у газеце/часопісе, дзелавое пісьмо, прыватнае пісьмо, анкета, рэзюмэ, справаздача, вэб-старонка, e-mail, турыстычны буклет/брашура, рэклама.

Вучні павінны ў м е ц ь чытаць іерогліфы (250—1500 адзінак).

## Пісьмовае маўленне

Вучні павінны ў м е ц ь прадуцыраваць нескладаныя віды пісьмовых тэкстаў, якія напісаны з дапамогай іерогліфаў, у адпаведнасці з нормамі, прынятымі ў краіне вывучаемай мовы:

- ♦ пісаць віншаванні, запрашэнні, прыватныя пісьмы;
- ♦ пісаць нескладаныя дзелавыя пісьмы;
- ♦ пісаць аўтабіяграфію, запаўняць анкету;
- ♦ састаўляць рэзюмэ па змесце праслуханага/прачытанага тэксту;
- ♦ пісаць сачыненне па прапанаванай тэме.

Аб'ём тэксту: 110—170 слоў (да 1 старонкі).

Вучні павінны ў м е ц ь пісаць іерогліфы (250—1250 адзінак).

## МОЎНЫ МАТЭРЫЯЛ

**Фанетыка**

Удасканаленне слыхавымаўленчых і рытміка-інтанацыйных навыкаў вучняў на аснове вывучаемага моўнага і маўленчага матэрыялу.

**Лексіка**

*Прадуктыўны мінімум:* 230—280 лексічных адзінак.

*Рэцэптыўны мінімум:* 200—280 лексічных адзінак.

*Агульны аб'ём прадуктыўнай лексікі:* 1970—2300 лексічных адзінак.

*Агульны аб'ём рэцэптыўнай лексікі:* 1310—1920 лексічных адзінак.

**Граматыка**

***Граматычны матэрыял для прадуктыўнага засваення***

Сістэматызацыя розных тыпаў апавядальных і пытальных сказаў, складаназлучаных і складаназалежных сказаў, сказаў з інверсійным парадкам слоў, тыпаў дзеяслоўнага дапаўнення, ужывання прыслоўяў, прыназоўнікаў, ужывання 的, 地, 得, 了, фразавых мадальных часціц, катэгорый выражэння часу.

* * *

Пры заканчэнні навучання на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі (базавы ўзровень) вучні павінны:

***ведаць:***

- асноўныя артыкуляцыйныя і рытміка-інтанацыйныя асаблівасці афармлення выказвання на вывучаемай замежнай мове;
- камунікатыўна значныя і стылістычна афарбаваныя лексічныя адзінкі (словы і ўстойлівыя словазлучэнні), нормы іх словаўжывання ў адпаведнасці з сітуацыяй зносін і спосабы словаўтварэння;
- граматычныя з'явы і асаблівасці іх ужывання ў вусным і пісьмовым маўленні ў адпаведнасці з камунікатыўнымі задачамі;
- нацыянальна-культурную спецыфіку народаў краін вывучаемай мовы і асаблівасці іх маўленчых і немаўленчых паводзін;
- асноўныя рацыянальныя спосабы і прыёмы ажыццяўлення вучэбна-пазнавальнай дзейнасці;
- асноўныя вербальныя сродкі і невербальныя спосабы пераадолення цяжкасцей у час зносін;

*умець:*

- ♦ афармляць вусныя і пісьмовыя выказванні ў адпаведнасці з фанетычнымі, лексічнымі і граматычнымі нормамі вывучаемай мовы для вырашэння больш складаных камунікатыўных задач у стандартных і нестандартных сітуацыях зносін з высокай ступенню рэпрадуктыўнасці;
- ♦ разумець/выбіраць інфармацыю з аўтэнтычных і часткова адаптаваных тэкстаў з рознай ступенню дакладнасці, глыбіні і паўнаты пры чытанні і ўспрыманні маўлення на слых і інтэрпрэтаваць успрымаемую інфармацыю;
- ♦ прадстаўляць сваю краіну і яе культуру ва ўмовах іншамоўнай міжкультурнай камунікацыі; ажыццяўляць узаемадзеянне з прадстаўнікамі краін вывучаемай мовы з улікам асаблівасцей іх нацыянальна-культурнай спецыфікі і норм маўленчых і немаўленчых паводзін;
- ♦ выкарыстоўваць дадатковыя вербальныя сродкі і невербальныя спосабы вырашэння камунікатыўных задач ва ўмовах дэфіцыту наяўных моўных і маўленчых сродкаў;
- ♦ ажыццяўляць самастойную вучэбна-пазнавальную дзейнасць; выкарыстоўваць даведачна-інфармацыйныя крыніцы, у тым ліку на замежнай мове;

*валодаць:*

- ♦ фанетычнымі, лексічнымі і граматычнымі нормамі вывучаемай замежнай мовы, дастатковымі для вырашэння камунікатыўных задач у стандартных і нестандартных сітуацыях міжкультурнай камунікацыі;
- ♦ прадуктыўнымі відамі іншамоўнай маўленчай дзейнасці (гаварэнне, пісьмовае маўленне) з дастатковай ступенню самастойнасці, захоўваючы сацыякультурныя нормы маўленчых паводзін;
- ♦ рэцэптыўнымі відамі маўленчай дзейнасці (чытанне, успрыманне і разуменне маўлення на слых) з рознай ступенню дакладнасці, паўнаты і глыбіні разумення зместу аўтэнтычных і часткова адаптаваных тэкстаў і інтэрпрэтаваць успрымаемую інфармацыю;
- ♦ здольнасцю знаходзіць падабенства і адрозненні паміж узаемадзейнымі культурамі і ўлічваць іх у працэсе міжкультурных зносін;

- асноўнымі рацыянальнымі спосабамі і прыёмамі ажыццяўлення самастойнай вучэбна-пазнавальнай дзейнасці па аваloданні замежнай мовай;
- агульнымі і спецыяльнымі ўменнямі для ажыццяўлення самастойнай вучэбна-пазнавальнай дзейнасці па вывучэнні замежнай мовы.

Пры заканчэнні навучання на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі (павышаны ўзровень) вучні павінны:

***ведаць:***

- артыкуляцыйныя і рытміка-інтанацыйныя асаблівасці афармлення выказвання на замежнай мове з улікам фанетычнай варыятыўнасці;
- лексічныя адзінкі (словы, устойлівыя словазлучэнні і фразеалагізмы) з улікам іх стылістычнай неабмежаванасці ў сучаснай замежнай мове, асаблівасці іх словаўжывання і спосабы словаўтварэння;
- асаблівасці функцыянавання граматычных з'яў у вусных і пісьмовых зносінах;
- сістэму нацыянальна-культурных каштоўнасцей народаў краін вывучаемай мовы і стэрэатыпы іх маўленчых і немаўленчых паводзін;
- рацыянальныя спосабы і прыёмы ажыццяўлення і самаацэнкі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці;
- стратэгіі рашэння камунікатыўных задач ва ўмовах дэфіцыту наяўных моўных і маўленчых сродкаў;

***умець:***

- афармляць вусныя і пісьмовыя выказванні ў адпаведнасці з фанетычнымі, лексічнымі і граматычнымі нормамі вывучаемай мовы для вырашэння шырокага спектра камунікатыўных задач у стандартных і нестандартных сітуацыях зносін з высокай ступенню прадуктыўнасці; вар'іраваць моўныя і маўленчыя сродкі;
- разумець/выбіраць інфармацыю з аўтэнтычных і часткова адаптаваных тэкстаў з рознай ступенню дакладнасці, глыбіні і паўнаты пры чытанні і ўспрыманні мовы на слых і

інтэрпрэтаваць успрымаемую інфармацыю; даваць ацэнку на аснове разумення ідэі тэксту;

- ♦ прадстаўляць сваю краіну і яе культуру ва ўмовах іншамоўнай міжкультурнай камунікацыі; выдзяляць агульнае і markdown розн ае ў культуры роднай краіны і краін вывучаемай мовы; ажыццяўляць узаемадзеянне з прадстаўнікамі краін вывучаемай мовы з улікам асаблівасцей іх нацыянальна-культурнай спецыфікі і норм маўленчых і немаўленчых паводзін;
- ♦ выкарыстоўваць кампенсаторныя стратэгіі ў розных відах маўленчай дзейнасці ва ўмовах дэфіцыту моўных і маўленчых сродкаў;
- ♦ ажыццяўляць і ацэньваць самастойную вучэбна-пазнавальную дзейнасць па авалоданні замежнай мовай;

***валодаць:***

- ♦ фанетычнымі, лексічнымі і граматычнымі нормамі вывучаемай замежнай мовы, дастатковымі для вырашэння камунікатыўных задач у стандартных і нестандартных сітуацыях міжкультурнай камунікацыі з улікам варыятыўнага выкарыстання моўных сродкаў у вуснай і пісьмовай формах міжкультурнай камунікацыі;
- ♦ прадуктыўнымі відамі іншамоўнай маўленчай дзейнасці (гаварэнне, пісьмовае маўленне) з высокай ступенню самастойнасці і ініцыятыўнасці, здольнасці інтэрпрэтаваць, рабіць абагульненні і высновы, аргументаваць выказаныя палажэнні, захоўваючы сацыякультурныя нормы маўленчых паводзін;
- ♦ рэцэптыўнымі відамі маўленчай дзейнасці (чытанне, успрыманне і разуменне маўлення на слых) з рознай ступенню дакладнасці, паўнаты і глыбіні разумення зместу аўтэнтычных і часткова адаптаваных тэкстаў, інтэрпрэтаваць успрынятую інфармацыю і даваць ёй ацэнку;
- ♦ сістэмай сацыякультурных норм вывучаемай замежнай мовы; уменнямі выяўляць падабенства і адрозненні паміж узаемадзейнымі культурамі і ўлічваць іх у працэсе міжкультурных зносін;
- ♦ сукупнасцю рацыянальных спосабаў і прыёмаў ажыццяўлення і самакантролю вучэбна-пазнавальнай дзейнасці па авалоданні замежнай мовай.

## ПРАГРАМНА-МЕТАДЫЧНЫЯ МАТЭРЫЯЛЫ

Концепция обучения иностранным языкам в системе непрерывного образования Республики Беларусь // Замежныя мовы ў Рэспубліцы Беларусь. — 2002. — № 3. — С. 21—28.

Концепция учебного предмета «Иностранный язык» // Замежныя мовы ў Рэспубліцы Беларусь. — 2007. — № 4. — С. 3—11.

Вучэбная праграма для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай мовай навучання. «Замежныя мовы : англійская, нямецкая, французская, іспанская, кітайская». III—XI класы / Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2012.

Федеральный компонент государственного стандарта общего образования / Проект. М-во образования РФ // Учительская газета. — 2004 г. — 27 янв. — № 3 (9980). — С. 17, 23.

Цели обучения иностранным языкам : учеб. пособие / под ред. Е. И. Пассова, Е. С. Кузнецовой. — Воронеж : НОУ «Интерлингва», 2002. — 40 с.

# МАТЭМАТЫКА

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Матэматыка займае адно з цэнтральных месцаў у адукацыі як важны сродак фарміравання агульнай культуры, інтэлектуальнага развіцця сучаснага чалавека. Матэматычныя веды неабходны для вывучэння з'яў прыроды, без іх немагчыма дасягненне поспехаў у развіцці вытворчасці і навукі. Веды пра колькасныя адносіны і прасторавыя формы навакольнага свету неабходны практычна ва ўсіх галінах дзейнасці чалавека.

Метады, якія прымяняюцца ў матэматыцы, неабходны для спецыялістаў у любой галіне дзейнасці, асабліва ў галіне навукаёмістых тэхнічных вытворчасцей. Таму развіццё кампетэнцый у вучняў сродкамі вучэбнага прадмета для працягу адукацыі на ўзроўнях прафесійна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі з'яўляецца асабліва важным.

Змест матэматыкі як вучэбнага прадмета грунтуецца на тэарэтычнай аснове трох падыходаў: ведавага, асобасна арыентаванага, кампетэнтнаснага.

**Мэты** і **задачы** вывучэння вучэбнага прадмета на павышаным узроўні пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы сярэдняй адукацыі:

- працяг фарміравання ўяўленняў пра матэматыку як частку агульначалавечай культуры, яе ролю ў пазнанні з'яў і працэсаў рэчаіснасці;
- фарміраванне матэматычных ведаў і ўменняў, неабходных для вывучэння прыродазнаўчанавуковых вучэбных прадметаў на базавым і павышаным узроўнях і для працягу адукацыі ў галінах, якія патрабуюць паглыбленай матэматычнай падрыхтоўкі;
- фарміраванне рэпрадуктыўнага, рэпрадуктыўна-прадуктыўнага і творчага відаў дзейнасці пры рашэнні вучэбных і прыкладных задач;

- развіццё лагічнага мыслення, прасторавага ўяўлення, алгарытмічнай культуры і крытычнага мыслення на ўзроўні, неабходным у паўсядзённым жыцці і будучай прафесійнай дзейнасці;
- фарміраванне матывацыі да самастойнага набыцця матэматычных ведаў і ўменняў, развіцця кампетэнцый, запатрабаваных ва ўмовах бесперапыннай адукацыі і прафесійнай дзейнасці;
- выхаванне культуры асобы і асобасных якасцей (мэтанакіраванасць, самастойнасць, адказнасць, самакантроль і інш.).

Змест алгебраічнага кампанента прадугледжвае вывучэнне паказальных і лагарыфмічных функцый, іх уласцівасцей, паказальных і лагарыфмічных ураўненняў, няроўнасцей, элементаў тэорыі імавернасці; разглядаецца паняцце вытворнай функцыі і яе прымяненне пры даследаванні функцыі і рашэнні практычных задач, а зместам геаметрычнага кампанента з'яўляецца вывучэнне мнагаграннікаў і іх уласцівасцей, аб'ёмаў і плошчаў іх паверхняў; цел вярчэння, іх уласцівасцей, аб'ёмаў і плошчаў іх паверхняў.

Павялічаны патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў, абумоўленыя пашырэннем зместу вучэбнага прадмета, спосабаў дзейнасці вучняў, абагульненнем і сістэматызацыяй тэарэтычных ведаў і іх прымяненнем пры выкананні розных заданняў.

## АРГАНІЗАЦЫЯ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ

Адукацыйны працэс ажыццяўляецца з улікам узроставых асаблівасцей вучняў, спецыфікі вучэбнага прадмета, яго месца і ролі ў сістэме агульнай сярэдняй адукацыі.

Арганізацыя адукацыйнага працэсу павінна быць накіравана на дасягненне вучнямі вынікаў, вызначаных дадзенай вучэбнай праграмай. Разам з тым адукацыйны працэс павінен быць пастаўлены так, каб у вучняў была магчымасць рэалізаваць свае адукацыйныя запатрабаванні. Пры гэтым неабходна, каб вучні не толькі засвоілі пэўныя тэарэтычныя веды, але і навучыліся выкарыстоўваць іх пры рашэнні вучэбных задач і задач прыкладнога характару.

Навучанне матэматыцы павінна спрыяць далейшаму развіццю культуры вуснага і пісьмовага маўлення вучняў, уменняў працаваць з рознымі крыніцамі інфармацыі, ставіць мэты, планаваць і шукаць шляхі іх дасягнення, аналізаваць і ацэньваць вынікі.

Арганізоўваючы адукацыйны працэс, настаўнік матэматыкі мае права самастойна выбіраць метады, прыёмы і тэхналогіі навучання, якія забяспечваюць дасягненне мэт навучання і выхавання. Лагічная строгасць выкладу вучэбнага матэрыялу павінна спалучацца з высокай ступенню нагляднасці і даступнасці.

Адукацыйны працэс пры вывучэнні матэматыкі павінен спрыяць развіццю інтарэсу да авалодвання ведамі, спосабамі пазнання навакольнага свету; стварэнню станоўчага эмацыянальнага стану; фарміраванню адэкватнай самаацэнкі; эстэтычнаму выхаванню вучняў.

У вучэбнай праграме па матэматыцы для ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі вылучаюцца раздзелы: *«Змест вучэбнага прадмета»* і *«Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў»*.

У раздзеле *«Змест вучэбнага прадмета»* паказаны аб'ём вучэбнага матэрыялу, прызначанага для абавязковага вывучэння. Гэта дае настаўніку магчымасць вызначыць месца той ці іншай тэмы ў курсе, расставіць акцэнты ў навучанні, арганізаваць выніковае паўтарэнне.

У раздзеле *«Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў»* пазначаны вынікі, якіх павінны дасягнуць вучні пры вывучэнні прад'яўленага зместу адукацыі.

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА

**210 гадзін (6 гадзін на тыдзень)**

### **АЛГЕБРАІЧНЫ КАМПАНЕНТ** — 140 гадзін

### **Абагульненне паняцця ступені. Паняцце лагарыфма ліку** (7 гадзін)

Ступень з рацыянальным паказчыкам. Уласцівасці ступені з рацыянальным паказчыкам. Ступень з ірацыянальным паказчыкам. Азначэнне лагарыфма ліку. Асноўная лагарыфмічная тоеснасць.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ
ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучань павінен:

*ведаць:*

- азначэнне і ўласцівасці ступені з рацыянальным і ірацыянальным паказчыкамі;
- азначэнне лагарыфма ліку;
- асноўную лагарыфмічную тоеснасць;

*умець:*

- прымяняць асноўную лагарыфмічную тоеснасць для спрашчэння выразаў, запісу дадатнага ліку ў выглядзе ступені з любой дадатнай асновай;
- прымяняць атрыманыя веды пры рашэнні задач практычнай накіраванасці.

## **Паказальная функцыя** (20 гадзін)

Працэсы паказальнага нарастання і паказальнага спадання. Паказальная функцыя. Уласцівасці паказальнай функцыі. Рашэнне задач на прымяненне ўласцівасцей паказальнай функцыі.

Паказальныя ўраўненні. Рашэнне паказальных ураўненняў на падставе ўласцівасцей паказальнай функцыі. Рашэнне паказальных ураўненняў з дапамогай раскладання на множнікі, заменай зменнай, рашэнне аднародных паказальных ураўненняў.

Рашэнне сістэм, якія змяшчаюць паказальныя ўраўненні.

Паказальныя няроўнасці. Рашэнне паказальных няроўнасцей і сістэм, якія змяшчаюць паказальныя няроўнасці. Рашэнне нестандартных ураўненняў і няроўнасцей, задач інтэграванага характару.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ
ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучань павінен:

*ведаць:*

- азначэнне і ўласцівасці паказальнай функцыі;
- метады рашэння паказальных ураўненняў і няроўнасцей;

*мець уяўленне* пра паказальную функцыю як матэматычную мадэль, якая знаходзіць шырокае прымяненне пры вывучэнні працэсаў і з'яў навакольнага свету (радыеактыўны распад рэчыва, рост калоніі бактэрый);

*умець:*

- будаваць графікі паказальнай функцыі з рознымі асновамі; прымяняць уласцівасці і графікі паказальнай функцыі з рознымі асновамі для параўнання значэнняў паказальнай функцыі, вызначэння абсягу значэнняў, найбольшага і найменшага значэнняў выразаў;
- рашаць паказальныя ўраўненні на падставе ўласцівасцей паказальнай функцыі, з дапамогай раскладання на множнікі, заменай зменнай; рашаць аднародныя паказальныя ўраўненні;
- рашаць паказальныя няроўнасці на падставе ўласцівасцей паказальнай функцыі, з дапамогай раскладання на множнікі, заменай зменнай; рашаць аднародныя паказальныя няроўнасці;
- рашаць сістэмы паказальных ураўненняў;
- рашаць сістэмы паказальных няроўнасцей;
- выкарыстоўваць прыёмы пошуку і рашэння нестандартных ураўненняў і няроўнасцей;
- прымяняць атрыманыя веды пры рашэнні задач практычнай накіраванасці.

### **Лагарыфмічная функцыя** (35 гадзін)

Уласцівасці лагарыфмаў: лагарыфм здабытку, дзелі, ступені. Формула пераходу ад лагарыфма з адной асновай да лагарыфма з другой асновай. Дзесятковы лагарыфм.

Лагарыфмічная функцыя. Уласцівасці лагарыфмічнай функцыі. Рашэнне задач на прымяненне ўласцівасцей лагарыфмічнай функцыі.

Лагарыфмічныя ўраўненні. Рашэнне лагарыфмічных ураўненняў на падставе ўласцівасцей лагарыфмічнай функцыі і ўласцівасцей лагарыфмаў. Рашэнне лагарыфмічных ураўненняў заменай зменнай.

Лагарыфмічныя няроўнасці. Рашэнне лагарыфмічных няроўнасцей.

Рашэнне сістэм лагарыфмічных ураўненняў і лагарыфмічных няроўнасцей. Рашэнне нестандартных ураўненняў і няроўнасцей, задач інтэграванага характару.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучань павінен:

*ведаць:*

- уласцівасці лагарыфмаў: лагарыфм здабытку, дзелі, ступені;
- формулу пераходу ад лагарыфма з адной асновай да лагарыфма з другой асновай;
- азначэнне дзесятковага лагарыфма;
- азначэнне і ўласцівасці лагарыфмічнай функцыі як функцыі, адваротнай паказальнай;
- метады рашэння лагарыфмічных ураўненняў і няроўнасцей;

*умець:*

- будаваць графікі лагарыфмічнай функцыі з рознымі асновамі;
- прымяняць уласцівасці і графікі лагарыфмічнай функцыі з рознымі асновамі для параўнання значэнняў лагарыфмічнай функцыі, знаходжання абсягу вызначэння і абсягу значэнняў, найбольшага і найменшага значэнняў выразаў;
- рашаць лагарыфмічныя ўраўненні на падставе ўласцівасцей лагарыфмічнай функцыі, з дапамогай раскладання на множнікі, заменай зменнай, рашаць сістэмы лагарыфмічных ураўненняў;
- рашаць лагарыфмічныя няроўнасці і іх сістэмы;
- выкарыстоўваць прыёмы пошуку і рашэння нестандартных ураўненняў і няроўнасцей;
- прымяняць атрыманыя веды пры рашэнні задач практычнай накіраванасці.

### **Вытворная** (26 гадзін)

Вытворная, фізічны сэнс вытворнай, геаметрычны сэнс вытворнай.

Вытворныя функцый: $y = c$, $y = ax + b$, $y = ax^2 + bx + c$, $y = \frac{k}{x}$, $y = x^n$, $n \in \mathbf{N}$.

Правілы знаходжання вытворных: $(cf)' = cf'$, $(f + g)' = f' + g'$,

$(fg)' = f'g + fg'$, $\left(\frac{f}{g}\right)' = \frac{f'g - fg'}{g^2}$.

Сувязь паміж знакам вытворнай функцыі і яе нарастаннем або спаданнем.

Ураўненне датычнай да графіка функцыі.

Знаходжанне найбольшага і найменшага значэнняў функцыі на прамежку.

Прымяненне вытворнай да даследавання функцый, рашэння ўраўненняў і няроўнасцей.

### АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучань павінен:

*ведаць:*

- фізічны і геаметрычны сэнс вытворнай;
- правілы знаходжання вытворнай сумы, рознасці, здабытку, дзелі функцый;
- сувязь паміж нарастаннем (спаданнем) функцыі і знакам яе вытворнай;

*умець:*

- знаходзіць вытворную функцыі па правілах знаходжання вытворных;
- знаходзіць значэнні вытворнай функцыі ў пункце;
- вызначаць прамежкі манатоннасці, пункты экстрэмуму, экстрэмумы функцыі;
- рашаць задачы на знаходжанне найбольшага і найменшага значэнняў функцыі на прамежку;
- састаўляць ураўненне датычнай да графіка функцыі;
- выкарыстоўваць вытворную пры даследаванні функцый і пабудове графікаў;
- прымяняць атрыманыя веды пры рашэнні задач практычнай накіраванасці.

## **Элементы тэорыі імавернасцей** (12 гадзін)

Дакладныя, немагчымыя і выпадковыя падзеі. Аперацыі над падзеямі. Элементарныя падзеі. Частата падзеі.

Класічнае азначэнне імавернасці. Паняцце пра геаметрычную імавернасць.

Формула складання імавернасцей. Імавернасць здабытку незалежных падзей. Выпадковыя велічыні. Матэматычнае чаканне выпадковай велічыні. Выбарачныя характарыстыкі.

### АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучань павінен:

*ведаць:*

- ♦ азначэнне імавернасці;
- ♦ віды выпадковых велічынь;
- ♦ метады рашэнняў класічных і сучасных імавернасных прыкладных задач;

*умець:*

- ♦ выконваць аперацыі аб’яднання, перасячэння, дапаўнення з выпадковымі падзеямі;
- ♦ вылічваць імавернасці выпадковых падзей, карыстаючыся класічным і геаметрычным азначэннем імавернасці;
- ♦ знаходзіць імавернасці сумы, здабытку выпадковых падзей; карыстацца формулай поўнай імавернасці;
- ♦ вылічваць матэматычнае чаканне выпадковай велічыні і выбарачнае сярэдняе па зададзенай выбарцы;
- ♦ прымяняць атрыманыя веды пры рашэнні задач практычнай накіраванасці.

## **ГЕАМЕТРЫЧНЫ КАМПАНЕНТ** — 70 гадзін

### **Мнагаграннікі** (16 гадзін)

Паняцце мнагагранніка. Выпуклыя мнагаграннікі.

Уласцівасці прызмы, правільнай прызмы, паралелепіпеда. Плошча бакавой і поўнай паверхняў прызмы.

Уласцівасці правільнай піраміды. Уласцівасці піраміды з роўнымі або роўна нахіленымі бакавымі кантамі. Уласцівасці піраміды з роўнымі вышынямі бакавых граней, апушчанымі з вяршыні піраміды, або роўна нахіленымі бакавымі гранямі. Плошча бакавой і поўнай паверхняў піраміды. Усечаная піраміда. Усечаная

правільная піраміда.

Правільныя мнагаграннікі.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ
ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучань павінен:

*ведаць і правільна выкарыстоўваць азначэнні:* выпуклага мнагагранніка; прызмы, прамой прызмы, правільнай прызмы, паралелепіпеда, куба; піраміды, правільнай піраміды, усечанай піраміды, усечанай правільнай піраміды; тэтраэдра; дыяганальнага сячэння прызмы, піраміды, усечанай піраміды; правільнага мнагагранніка, правільных: тэтраэдра, гексаэдра, актаэдра, дадэкаэдра, ікасаэдра;

*ведаць уласцівасці:* прызмы, прамой прызмы, правільнай прызмы, паралелепіпеда, прамавугольнага паралелепіпеда, куба; правільнай піраміды, піраміды з роўнымі або роўна нахіленымі бакавымі кантамі; піраміды з роўнымі вышынямі бакавых граней, апушчанымі з вяршыні піраміды, або роўна нахіленымі бакавымі гранямі;

*ведаць і ўмець выводзіць формулы:* плошчы бакавой паверхні прызмы, плошчы бакавой паверхні правільнай піраміды, плошчы бакавой паверхні правільнай усечанай піраміды;

*умець:*

- прымяняць формулы плошчы паверхні прамой прызмы, правільнай піраміды, правільнай усечанай піраміды;
- рашаць геаметрычныя задачы на доказ і вылічэнне з выкарыстаннем вядомых уласцівасцей прызмы, піраміды, усечанай піраміды;
- прымяняць атрыманыя веды пры рашэнні задач практычнай накіраванасці.

## **Аб’ём мнагаграннікаў** (20 гадзін)

Аб’ём цела. Уласцівасці аб’ёмаў. Аб’ём паралелепіпеда. Аб’ём прызмы. Аб’ём піраміды. Аб’ём усечанай піраміды.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ
ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучань павінен:

*ведаць формулы аб'ёму:* прамавугольнага паралелепіпеда, прызмы, піраміды, правільнай усечанай піраміды;

*умець выводзіць формулы аб'ёму:* прамога паралелепіпеда, нахіленага паралелепіпеда, трохвугольнай прызмы, адвольнай прызмы, піраміды, усечанай піраміды;

*умець:*

- ♦ прымяняць формулы аб'ёмаў прызмы, піраміды, усечанай піраміды да рашэння задач;
- ♦ рашаць геаметрычныя задачы на доказ і вылічэнне з выкарыстаннем вядомых уласцівасцей прызмы і піраміды;
- ♦ прымяняць атрыманыя веды пры рашэнні задач практычнай накіраванасці.

### **Целы вярчэння** (24 гадзіны)

Сфера і шар. Сячэнні сферы і шара плоскасцю. Датычная плоскасць да сферы (шара). Плошча сферы. Аб'ём шара.

Цыліндр. Восевае сячэнне цыліндра. Сячэнні цыліндра, паралельныя і перпендыкулярныя восі цыліндра. Разгортка бакавой паверхні цыліндра. Плошча бакавой і поўнай паверхняў цыліндра. Аб'ём цыліндра.

Конус. Восевае сячэнне конуса. Разгортка бакавой паверхні конуса. Плошча бакавой і поўнай паверхняў конуса. Аб'ём конуса. Сячэнне конуса, перпендыкулярнае восі конуса.

Усечаны конус. Аб'ём усечанага конуса.

Камбінацыі мнагаграннікаў і цел вярчэння.

#### АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучань павінен:

*ведаць і правільна выкарыстоўваць азначэнні:* сферы, шара; радыуса, хорды, дыяметра сферы (шара); датычнай плоскасці да сферы (шара); датычнай прамой да сферы (шара); сякучай прамой да сферы (шара); сячэння сферы і шара плоскасцю; цыліндра, восевага сячэння цыліндра; конуса, восевага сячэння конуса, усечанага конуса; сферы (шара), апісанай каля мнагагранніка; сферы

(шара), упісанай у мнагаграннік; цыліндра, упісанага ў прызму і апісанага каля прызмы; конуса, упісанага ў піраміду і апісанага каля пірамiды;

*ведаць:* уласцівасць датычнай плоскасці да сферы (шара), прымету датычнай плоскасці да сферы (шара); уласцівасці: сячэння сферы і шара плоскасцю; восевага сячэння цыліндра, сячэння, паралельнага і перпендыкулярнага восі цыліндра; восевага сячэння конуса і сячэння, перпендыкулярнага восі конуса;

*умець даказваць:* уласцівасць датычнай плоскасці да сферы (шара), прымету датычнай плоскасці да сферы (шара);

*ведаць формулы:* плошчы сферы, аб'ёму шара, плошчы бакавой і поўнай паверхні цыліндра, аб'ёму цыліндра, плошчы бакавой і поўнай паверхні конуса і ўсечанага конуса, аб'ёму конуса і ўсечанага конуса;

*умець выводзіць формулы:* плошчы бакавой паверхні цыліндра, конуса і ўсечанага конуса; аб'ёму цыліндра, конуса і ўсечанага конуса;

*умець:*

- знаходзіць аб'ёмы і плошчы паверхні цел вярчэння;
- рашаць задачы на камбінацыю цел вярчэння;
- рашаць задачы на камбінацыю цел вярчэння і мнагаграннікаў;
- знаходзіць радыус апісанай сферы (шара) і радыус упісанай сферы (шара) для правільнай і прамой прызмы, правільнай піраміды;
- рашаць задачы на камбінацыю піраміды і ўпісанай у яе прызмы;
- рашаць геаметрычныя задачы на доказ і вылічэнне;
- рашаць задачы на сячэнне цел вярчэння;
- прымяняць атрыманыя веды пры рашэнні задач практычнай накіраванасці.

**Падагульненне і сістэматызацыя ведаў** — 50 гадзін

## ВУЧЭБНЫЯ ДАПАМОЖНІКІ

Алгебра : вучэб. дапам. для 11-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / А. П. Кузняцова [і інш.] ; пад рэд. Л. Б. Шнэпермана. — 2-е выд., выпр. і дап. — Мінск : Народная асвета, 2013.

*Латоцін, Л. А.* Матэматыка : вучэб. дапам. для 11-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / Л. А. Латоцін, Б. Д. Чабатарэўскі. — 2-е выд., перагледж. — Мінск : Народная асвета, 2013.

Зборнік задач па алгебры : вучэб. дапам. для 11-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / А. П. Кузняцова [і інш.] ; пад рэд. Л. Б. Шнэпермана. — Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2011.

*Латоцін, Л. А.* Зборнік задач па матэматыцы : вучэб. дапам. для 11-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / Л. А. Латоцін, Б. Д. Чабатарэўскі. — Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2014.

Алгебра 11 : самост. и контрол. работы : тестовые задания : в 4 вариантах : 1, 2 варианты : пособие для учителей учреждений общ. сред. образования с рус. яз. обучения / Е. П. Кузнецова [и др.]. — 6-е изд. — Минск : Аверсэв, 2014.

Алгебра 11 : самост. и контрол. работы : тестовые задания : в 4 вариантах : 3, 4 варианты : пособие для учителей учреждений общ. сред. образования с рус. яз. обучения / Е. П. Кузнецова [и др.]. — 6-е изд. — Минск : Аверсэв, 2014.

*Шлыкаў, У. У.* Геаметрыя : вучэб. дапам. для 11-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / У. У. Шлыкаў. — 3-е выд., выпр. і дап. — Мінск : Народная асвета, 2013.

# ГІСТОРЫЯ БЕЛАРУСІ

## Гісторыя Беларусі: другая палова 40-х гг. XX ст. — пачатак XXI ст.

### ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная праграма мае пераходны характар ва ўмовах паступовага забеспячэння канцэнтрычнага прынцыпу структуравання вучэбных гістарычных ведаў і парадку іх засваення. Яна складзена з улікам магчымасці рэалізацыі кампетэнтнаснага падыходу да падрыхтоўкі вучняў па гісторыі, які арыентаваны на фарміраванне асобасных, метапрадметных і прадметных вынікаў навучання, што забяспечваюць выбраны напрамак далейшай адукацыі ў межах прафесійнага самавызначэння, а таксама асабістае развіццё асобы і яе паспяховую сацыялізацыю.

Вывучэнне гісторыі Беларусі на павышаным узроўні складае змястоўную аснову профільнай падрыхтоўкі вучняў, якая накіравана на задавальненне іх пазнавальных патрэбнасцей і забеспячэнне выбару будучай прафесійнай дзейнасці. Навучанне на павышаным узроўні ажыццяўляецца як за кошт павелічэння аб'ёму вывучаемага тэарэтычнага і фактычнага матэрыялу, так і за кошт далейшага ўдасканальвання метапрадметных і прадметных (спецыяльных гістарычных) спосабаў дзейнасці. Кампетэнцыі разглядаюцца як гатоўнасць вучняў выкарыстоўваць засвоеныя імі веды і ўменні для працягу адукацыі па гістарычных і сацыяльна-гуманітарных спецыяльнасцях, а таксама для ўласнай паспяховай інтэграцыі ў сучасным беларускім грамадстве.

Вывучэнне гісторыі Беларусі на павышаным узроўні арыентавана на фарміраванне ў вучняў наступных сацыяльна значных ведаў:

- пра асноўныя этапы афармлення беларускай дзяржаўнасці, у тым ліку станаўлення і канстытуцыйнага афармлення дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь, а таксама дзяржаўную сімволіку БССР і Рэспублікі Беларусь;
- асаблівасці функцыянавання савецкага грамадска-палітычнага і сацыяльна-эканамічнага ладу ў БССР у перыяд

мадэрнізацыі, звязаныя з пабудовай сацыялізму і ўсталяваннем індустрыяльнага грамадства ў БССР;

- тэндэнцыі сацыяльна-эканамічнага жыцця сучаснай беларускай нацыі ва ўмовах глабалізацыі і інтэграцыі, распрацоўку мадэлі эканамічнага развіцця і яе рэалізацыю ў Рэспубліцы Беларусь;
- дасягненні ўраджэнцаў Беларусі і прадстаўнікоў беларускай савецкай і сучаснай навукі і культуры, літаратуры і мастацтва, алімпійскіх відаў спорту;
- геапалітычнае становішча БССР і шматвектарны напрамак знешнепалітычнай дзейнасці Рэспублікі Беларусь.

**Мэта** вывучэння прадмета: авалодаць сістэматызаванымі тэарэтычнымі і факталагічнымі ведамі і спецыяльнымі спосабамі дзейнасці пра вызначальныя працэсы гісторыі Беларусі ва ўзаемасувязі і ўзаемаабумоўленасці з сусветнай і савецкай гісторыяй для фарміравання грамадзянскага патрыятызму, паспяховай сацыялізацыі і прафесійнага самавызначэння асобы ў сучасным сацыякультурным асяроддзі.

**Задачы** вывучэння прадмета:

- засвоіць важнейшыя паняцці і факты, якія характарызуюць перыяд развіцця Беларусі ад аднаўлення пасля Вялікай Айчыннай вайны і да станаўлення суверэннай Рэспублікі Беларусь з раскрыццём і тлумачэннем найбольш істотных прычынна-выніковых сувязей;
- выпрацоўваць каштоўнасныя арыентацыі і ацэначныя меркаванні асобы на падставе ўсведамлення калектыўнай гістарычнай памяці і фарміравання нацыянальнай ідэнтычнасці грамадзян Рэспублікі Беларусь, пачуцця гонару за культурна-гістарычную спадчыну Беларусі, адказнасці як за прагназаванне ўласнай жыццядзейнасці, так і за далейшы шлях развіцця Беларусі;
- фарміраваць вопыт гістарычнага мыслення вучняў праз асэнсаванне імі вучэбных гістарычных ведаў пра важнейшыя працэсы і падзеі ў развіцці беларускага савецкага і сучаснага грамадства і ўменне выкарыстоўваць іх ва ўмовах інфармацыйнай камунікатыўнай прасторы і ва ўласнай сацыяльнай практыцы.

У адпаведнасці з асобаснымі вынікамі навучання на павышаным узроўні прадугледжваюцца фарміраванне светапогляду і ўсведамленне вучнямі сваёй ідэнтычнасці як грамадзян Рэспублікі Беларусь; прыняцце імі ў якасці норм сацыяльных паводзін традыцыйнай сістэмы каштоўнасцей, існуючай у беларускім грамадстве; далучэнне да культурнай разнастайнасці беларускага грамадства, выпрацоўка адказнасці за свой прафесійны выбар.

У адпаведнасці з метапрадметнымі вынікамі навучання на павышаным узроўні прадугледжваюцца ўменні самастойна вызначаць мэты свайго навучання, прадстаўляць, аналізаваць і карэкціраваць вынікі ва ўмовах індывідуальнай і калектыўна-размеркавальнай форм дзейнасці, сістэматызаваць і абагульняць змест вучэбнага матэрыялу, у тым ліку паняцці, і рабіць на гэтай падставе аргументаваныя высновы; авалоданне спосабамі пошуку, збору, апрацоўкі, выкарыстання разнастайных крыніц сацыяльна-гістарычнай інфармацыі з магчымасцю яе пераводу з візуальнага ў вербальны від і наадварот.

Прадметнымі вынікамі навучання з’яўляюцца засваенне вучнямі змястоўнага і дзейнаснага кампанентаў, што ўвасоблена ў прадметных кампетэнцыях (спосабах вучэбна-пазнавальнай дзейнасці), якія прадстаўлены ў раздзеле «Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў». Пры засваенні зместу вучэбнага матэрыялу асаблівае значэнне надаецца фарміраванню ўменняў характарызаваць і параўноўваць гістарычныя падзеі дзяржаваўтваральнага, сацыяльна-эканамічнага, нацыянальна-культурнага развіцця БССР і Рэспублікі Беларусь у іх прычынна-выніковых сувязях праз канкрэтызацыю з дапамогай паняццяў, з правядзеннем аналізу зместу гістарычных дакументаў (першакрыніц).

Асаблівае значэнне ў працэсе навучання гісторыі на павышаным узроўні мае практыка-арыентаваная дзейнасць, на арганізацыю якой у кожным з раздзелаў ва ўроках-практыкумах прадугледжваецца па 2 вучэбныя гадзіны. На такіх уроках-практыкумах ажыццяўляецца замацаванне вучэбных тэарэтычных і фактдалагічных ведаў у іх сукупнасці, развіццё ўменняў выкарыстоўваць назапашаныя веды для рашэння пазнавальных задач, правядзення вучэбнага даследавання, аналізу зместу хрэстаматыйных гістарычных дакументаў.

Адной з найбольш эфектыўных форм ажыццяўлення практыка-арыентаванай дзейнасці з'яўляецца арганізацыя праектаў. Праекты прадугледжваюць сукупнасць складаючых іх кампанентаў: вызначэнне тэматыкі (фармулёўку праблемы) вучэбнага даследавання; правядзенне збору, вывучэнне і сістэматызацыя крыніц інфармацыі; практычная работа па стварэнні (напісанні) праекта; яго прадстаўленне (прэзентацыя) і абарона. У працэсе выканання праектаў вучні на аснове раней сфарміраваных ведаў і ўменняў удасканальваюць навыкі працы з крыніцамі гістарычнай інфармацыі, у тым ліку вуснай гісторыі, прадстаўляюць вынікі індывідуальнай і калектыўнай дзейнасці праблемнага і творчага характару, у тым ліку на электронных носьбітах у выглядзе мультымедыяпрэзентацый.

Варта звярнуць увагу на магчымасці выкарыстання міжпрадметных сувязей з беларускай літаратурай пры вывучэнні тэм, прысвечаных развіццю культуры і мастацтва.

Праграмай прадугледжваецца правядзенне ўрокаў падагульнення ведаў па кожным з раздзелаў, а таксама выніковага падагульнення.

Па кожным з раздзелаў прадугледжваецца па 2 вучэбныя гадзіны на правядзенне ўрокаў «Наш край», што дазволіць улічыць асаблівасці гістарычнага развіцця канкрэтнага рэгіёна і магчымасці выкарыстання мясцовага матэрыялу, а таксама гісторыка-дакументальнай хронікі гарадоў і раёнаў Беларусі «Памяць». Вывучэнне краязнаўчага матэрыялу можа стаць тэматыкай (праблематыкай) пры выкананні вучнёўскіх даследаванняў (праектаў).

Рэзервовы час прызначаны для арганізацыі праектнай дзейнасці, правядзення ўрокаў кантролю сфарміраванасці ведаў і ўменняў па кожным з раздзелаў, правядзення перадэкзаменацыйнага паўтарэння.

Настаўнік, зыходзячы з педагагічнай мэтазгоднасці і з улікам асаблівасцей навучання, можа змяніць рэкамендаваную праграмай колькасць вучэбных гадзін на вывучэнне асобных тэм і паслядоўнасць іх вывучэння, не парушаючы рэкамендаваныя прапорцыі вучэбных гадзін па раздзелах.

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА

**87 гадзін (2 гадзіны на тыдзень у першым паўгоддзі, 3 гадзіны на тыдзень у другім паўгоддзі, у тым ліку 22 гадзіны — рэзервовы час)**

## Раздзел І
## БССР у другой палове 1940-х — першай палове 1950-х гг. (15 гадзін)

**БССР у першае пасляваеннае дзесяцігоддзе.** Сацыяльна-эканамічнае аднаўленне краіны ў пасляваенны перыяд. Працоўны энтузіязм. Асаблівасці грамадска-палітычнага жыцця. Развіццё культуры.

**Пераадоленне наступстваў вайны. Выхад на новы ўзровень развіцця.** Людскія і матэрыяльныя страты Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны. Матэрыяльнае становішча насельніцтва ў першыя пасляваенныя гады. Асаблівасці пасляваеннага аднаўлення. Атрыманне БССР часткі германскіх рэпарацый. Выкарыстанне працы ваеннапалонных. Развіццё прамысловасці і транспарту ў гады чацвёртай пяцігодкі. Працоўны подзвіг беларускага народа. Курс на апераджальны рост цяжкай прамысловасці ў гады пятай пяцігодкі. Пасляваенная індустрыялізацыя ў БССР: яе асаблівасці і вынікі. Меры па аднаўленні сельскай гаспадаркі. Асаблівасці пасляваеннага правядзення калектывізацыі ў заходніх абласцях Беларусі.

**Грамадска-палітычнае жыццё БССР.** Асаблівасці грамадска-палітычнага жыцця. Ідэалагічны кантроль органаў улады. Адносіны ўлады да грамадзян, якія падвергліся рэпатрыяцыі. Пасляваенная сітуацыя ў заходніх абласцях Беларусі. Месца Камуністычнай партыі Беларусі ў грамадска-палітычнай сістэме. Роля Саветаў дэпутатаў працоўных, прафсаюзаў, камсамола ў грамадска-палітычным жыцці рэспублікі. Партыйна-дзяржаўныя кіраўнікі: П. К. Панамарэнка, В. І. Казлоў. Дзяржаўная сімволіка. Узаемаадносіны дзяржавы і рэлігійных канфесій. БССР. Знешнепалітычная дзейнасць ураджэнцаў Беларусі К. В. Кісялёва і А. А. Грамыкі.

**Адраджэнне і развіццё адукацыі і навукі ў БССР у пасляваенны перыяд.** Аднаўленне агульнаадукацыйнай школы. Вышэйшая і сярэдняя спецыяльная адукацыя Беларусі ў першыя пасляваенныя

гады. Адраджэнне і выхад беларускай навукі на новыя рубяжы. Прэзідэнты АН БССР А. Р. Жэбрак і В. Ф. Купрэвіч.

**Літаратура і мастацтва.** Развіццё беларускай літаратуры. Адлюстраванне тэмы Вялікай Айчыннай вайны і асвятленне мірнага жыцця Беларусі ў пасляваенныя гады ў творах Якуба Коласа, Кузьмы Чорнага, М. Лынькова, І. Мележа, А. Куляшова. Тэатр. Музычнае жыццё. Выяўленчае мастацтва.

**Наш край** (2 гадзіны)

**Практыкум да раздзела І** (2 гадзіны)

**Падагульненне да раздзела І**

***Асноўныя паняцці:*** *пасляваеннае аднаўленне, рэпарацыі, рэпатрыяцыя, прынцып партыйнасці.*

## Раздзел II
## БССР у другой палове 1950-х — 1980-я гг. (24 гадзіны)

**Беларусь ва ўмовах рэфармавання грамадска-палітычнага і сацыяльна-эканамічнага жыцця.** Курс на рэфармаванне грамадства ў другой палове 1950-х — першай палове 1960-х гг. Узмацненне ролі партыйных органаў і нарастанне кансерватызму ў кіраўніцтве краінай. Паступовае зніжэнне тэмпаў эканамічнага развіцця. Прыняцце курсу на паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. Дэмакратызацыя грамадска-палітычнага жыцця ў перыяд перабудовы.

**Грамадска-палітычнае жыццё ў другой палове 1950-х — першай палове 1960-х гг.** Спробы дэмакратызацыі грамадска-палітычнага жыцця ва ўмовах рэалізацыі курсу XX з'езда КПСС. Пачатак працэсу рэабілітацыі ахвяр палітычных рэпрэсій. Кіруючая роля камуністычнай партыі. К. Т. Мазураў. Прыняцце курсу на будаўніцтва камуністычнага грамадства. Роля Саветаў дэпутатаў працоўных, камсамола, прафсаюзаў у грамадска-палітычным жыцці. Палітыка дзяржавы ў адносінах да канфесій.

**Сацыяльна-эканамічнае развіццё ў другой палове 1950-х — першай палове 1960-х гг.** Фарміраванне прамысловага комплексу ў БССР. Увядзенне новай сістэмы кіравання народнай гаспадаркай і стварэнне саўнаргасаў. Развіццё машынабудавання і металаапрацоўкі, хімічнай і нафтахімічнай прамысловасці. Вынікі развіцця

сельскай гаспадаркі рэспублікі. К. П. Арлоўскі. З'яўленне новых гарадоў і жыллёвае будаўніцтва. Умовы жыцця сельскага і гарадскога насельніцтва.

**Грамадска-палітычнае становішча ў другой палове 1960-х — першай палове 1980-х гг.** Савецкая грамадска-палітычная сістэма і яе сутнасць. Далейшае замацаванне кіруючай і накіроўваючай ролі камуністычнай партыі. Прыняцце канцэпцыі «развітога сацыялізму». Канстытуцыя БССР 1978 г. П. М. Машэраў. Асаблівасці ўдзелу насельніцтва БССР у грамадска-палітычным жыцці. Узаемаадносіны дзяржавы і рэлігійных канфесій.

**Сацыяльна-эканамічнае становішча ў другой палове 1960-х — першай палове 1980-х гг.** Асноўныя прынцыпы эканамічнай рэформы 1965 г. Прамысловае развіццё рэспублікі ў 1970-я — першай палове 1980-х гг. Далейшае развіццё працэсу ўрбанізацыі. Сельская гаспадарка: меліярацыя і хімізацыя, будаўніцтва буйных жывёлагадоўчых комплексаў. Стан калгасна-саўгаснай сістэмы. Узнікненне харчовай праблемы. Замаруджванне тэмпаў росту эканомікі і сацыяльнай сферы ў першай палове 1980-х гг. Узровень жыцця народа і паўсядзённае жыццё насельніцтва. Гаспадарчыя кіраўнікі ў галіне прамысловасці і сельскай гаспадаркі А. Я. Андрэеў і С. Г. Скарапанаў.

**Палітыка перабудовы і вынікі яе ажыццяўлення ў БССР.** Сацыяльна-эканамічнае развіццё ў другой палове 1980-х гг. Курс на паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця. Перавод прадпрыемстваў на гаспадарчы разлік і самафінансаванне. Чарнобыльская катастрофа і ліквідацыя яе наступстваў. Пагаршэнне становішча ў прамысловасці і сельскай гаспадарцы.

Рэфармаванне савецкай грамадска-палітычнай сістэмы. Палітыка галоснасці. Выбары народных дэпутатаў у Вярхоўны Савет БССР і мясцовыя саветы на альтэрнатыўнай аснове. Фарміраванне шматпартыйнасці. Грамадскія арганізацыі і аб'яднанні.

**Развіццё адукацыі і навукі.** Рэформа агульнаадукацыйнай школы і пераход да абавязковага 8-гадовага навучання. Увядзенне ўсеагульнай сярэдняй адукацыі. Пашырэнне сістэмы прафесійна-тэхнічнай адукацыі. Развіццё вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Прадстаўнікі педагагічнай прафесіі ў БССР — Героі Сацыялістычнай Працы. Дасягненні вучоных Беларусі. Прэзідэнт АН БССР М. А. Барысевіч. Удзел беларусаў у асваенні касмічнай

прасторы. Уклад вучоных — ураджэнцаў Беларусі — у развіццё ваенна-прамысловага комплексу СССР. Дасягненні беларускіх савецкіх спартсменаў.

**Літаратура.** Развіццё літаратуры. Тэма Вялікай Айчыннай вайны ў творах В. Быкава, Алеся Адамовіча, Янкі Брыля, І. Навуменкі, І. Чыгрынава. Лёсы беларусаў у творчасці І. Мележа. Гістарычная тэматыка ў творчасці У. Караткевіча, І. Шамякіна. Беларуская паэзія: П. Броўка, Максім Танк, П. Панчанка.

**Тэатральнае, музычнае і выяўленчае мастацтва.** Адлюстраванне культурна-гістарычнай спадчыны Беларусі ў мастацтве. Тэатральнае і музычнае мастацтва. Жывапіс. Скульптура. Кіно.

**Наш край** (2 гадзіны)
**Практыкум да раздзела II** (2 гадзіны)
**Падагульненне да раздзела II**

***Асноўныя паняцці:*** *рэабілітацыя, валюнтарызм, камунізм, «развіты сацыялізм», урбанізацыя, меліярацыя, стагнацыя, гаспадарчы разлік, ваенна-прамысловы комплекс, дэфіцыт, экстэнсіўны і інтэнсіўны шляхі развіцця эканомікі, перабудова, галоснасць, выбары на альтэрнатыўнай аснове, парламенцкая апазіцыя.*

## Раздзел III
## Станаўленне і ўмацаванне дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь (24 гадзіны)

**Станаўленне і развіццё Рэспублікі Беларусь.** Этапы і напрамкі развіцця Рэспублікі Беларусь. Абвяшчэнне і ўмацаванне дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь. Станаўленне і развіццё палітычнай сістэмы. Распрацоўка і рэалізацыя беларускай мадэлі сацыяльна-эканамічнага развіцця.

**Станаўленне дзяржаўнага суверэнітэту.** Рух за дзяржаўны суверэнітэт. Дэкларацыя аб дзяржаўным суверэнітэце БССР ад 27 ліпеня 1990 г. і наданне ёй статусу канстытуцыйнага закона. Белавежскае пагадненне. Стварэнне СНД. Прыняцце Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь 15 сакавіка 1994 г. і станаўленне інстытута прэзідэнцтва. Першы Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь — А. Р. Лукашэнка. Рэспубліканскі рэферэндум 14 мая 1995 г. і яго вынікі. Дзяржаўная сімволіка Рэспублікі Беларусь.

**Грамадска-палітычнае жыццё ў другой палове 90-х гг. XX ст. — пачатку XXI ст.** Умацаванне палітычнай сістэмы ў Рэспубліцы Беларусь. Фарміраванне заканадаўчай і выканаўчай галін дзяржаўнай улады. Рэспубліканскі рэферэндум 24 лістапада 1996 г. і яго вынікі. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь са змяненнямі і дапаўненнямі, прынятымі на рэферэндуме. Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь 2001 г. Замацаванне інстытута прэзідэнцкай улады.

Рэспубліканскі рэферэндум 17 кастрычніка 2004 г. і яго вынікі. Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь 2006, 2010, 2015 гг. Асновы ідэалогіі беларускай дзяржавы. Палітычныя партыі і грамадскія аб'яднанні. Узаемаадносіны дзяржавы і рэлігійных канфесій.

**Сацыяльна-эканамічнае развіццё.** Эканамічнае становішча Рэспублікі Беларусь у першай палове 1990-х гг. Пошук шляхоў пераходу да рыначнай сістэмы эканамічных адносін. Падыходы да правядзення прыватызацыі. Увядзенне сістэмы грашовых адзінак Рэспублікі Беларусь.

Беларуская мадэль сацыяльна-эканамічнага развіцця і яе сутнасныя характарыстыкі. Мэты і сродкі рэалізацыі сацыяльна арыентаванай эканомікі. Эканамічная інтэграцыя з Расіяй і краінамі СНД. Гаспадарчыя дзеячы — Героі Беларусі. Роля Усебеларускіх народных сходаў у вызначэнні прыярытэтаў сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь. Дзяржаўная маладзёжная палітыка.

**Знешняя палітыка Рэспублікі Беларусь.** Фарміраванне і прыярытэты знешнепалітычнага курсу Рэспублікі Беларусь. Дзейнасць Беларусі ў ААН. Умацаванне сувязей з краінамі СНД. Развіццё ўзаемаадносін паміж Беларуссю і Расіяй: Саюзная дзяржава Беларусі і Расіі. Фарміраванне Мытнага саюза, Еўразійскага эканамічнага супольніцтва, Адзінай эканамічнай прасторы і Еўразійскага эканамічнага саюза.

Шматвектарнасць знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь. Узаемаадносіны Беларусі з краінамі Еўрапейскага Саюза і НАТА. Супрацоўніцтва з краінамі Азіяцка-Ціхаакіянскага рэгіёна, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі. Развіццё міжнароднага эканамічнага супрацоўніцтва Рэспублікі Беларусь.

**Развіццё адукацыі, навукі і культуры.** Культура Беларусі ва ўмовах дзяржаўнага суверэнітэту Рэспублікі Беларусь. Афармленне

дзяржаўнага статусу беларускай і рускай моў. Забеспячэнне адзінства правапісных норм беларускай мовы. Станаўленне і развіццё нацыянальнай сістэмы адукацыі. Адукацыя як адзін з галоўных рэсурсаў развіцця чалавечага капіталу. Рэформа агульнаадукацыйнай школы. Роля прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Масавая вышэйшая адукацыя ў Беларусі і Балонскі працэс. Развіццё беларускай навукі. Ураджэнцы Беларусі, грамадзяне Рэспублікі Беларусь — Нобелеўскія лаўрэаты. Развіццё ІТ-галіны.

Новы этап у развіцці беларускай літаратуры. Выяўленчае мастацтва. Тэатральнае і музычнае жыццё. Беларускае кіно. Адлюстраванне ў мастацтве гістарычнай памяці пра мінулае беларускага народа і яго асоб. Аднаўленне помнікаў архітэктуры. Дзеячы навукі і культуры. Дасягненні беларускага алімпійскага спорту.

**Наш край** (2 гадзіны)

**Практыкум да раздзела III** (2 гадзіны)

**Падагульненне да раздзела III**

***Асноўныя паняцці:*** *дзяржаўны суверэнітэт, рэферэндум, Белавежскае пагадненне, Садружнасць Незалежных Дзяржаў, унітарная дзяржава, прававая дзяржава, Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь, Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў, Савет Рэспублікі, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь, ідэалогія беларускай дзяржавы, грамадзянская супольнасць, рыначная сістэма эканамічных адносін, прыватызацыя, сацыяльна арыентаваная эканоміка, чалавечы капітал, інтэграцыя, Мытны саюз, Еўразійскі эканамічны саюз, Арганізацыя Дагавора аб калектыўнай бяспецы, Саюзная дзяржава Беларусі і Расіі, Усходняе партнёрства, «Партнёрства дзеля міру», Балонскі працэс.*

**Выніковае падагульненне** (1 гадзіна)

**Перадэкзаменацыйнае паўтарэнне** (за кошт рэзервовых гадзін).

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

У працэсе засваення зместу вучэбнага матэрыялу на павышаным узроўні вучні будуць:

*ведаць:*

- азначэнні пададзеных у праграме паняццяў з канкрэтызацыяй іх зместу;
- храналогію асноўных падзей гісторыі Беларусі другой паловы 40-х гг. XX ст. — пачатку XXI ст., іх вынікі і лакалізацыю на гістарычнай карце;
- вынікі дзейнасці выдатных гістарычных асоб і прыклады творчасці дзеячаў культуры;
- розныя ацэнкі, пункты гледжання па адной і той жа праблеме, характарыстыкі гістарычных асоб і дзеячаў культуры;

*умець:*

- лакалізаваць падзеі гісторыі Беларусі другой паловы 40-х гг. XX ст. — пачатку XXI ст. у часе і геапалітычнай прасторы з апорай на храналагічныя і сінхраністычныя табліцы, гістарычную карту і атлас;
- характарызаваць асноўныя перыяды і падзеі гісторыі Беларусі другой паловы 1940-х гг. — пачатку XXI ст.;
- суадносіць гістарычныя падзеі, якія тычацца дзяржаваўтваральнага, сацыяльна-эканамічнага, нацыянальна-культурнага развіцця Беларусі, з грамадска-гістарычным працэсам і савецкай гісторыяй;
- рэканструяваць і інтэрпрэтаваць змест вучэбнага матэрыялу;
- раскрываць і тлумачыць прычынна-выніковыя сувязі паміж гістарычнымі падзеямі і з'явамі, раскрываць узаемаабумоўленасць змен у розных галінах грамадскага жыцця;
- параўноўваць па прапанаваных ці самастойна вызначаных прыметах, сістэматызаваць і абагульняць гістарычныя факты і рабіць на падставе гэтага аргументаваныя вывады;
- выкарыстоўваць веданне прымет і зместу прыведзеных у праграме паняццяў для канкрэтызацыі тэарэтычных вывадаў;
- параўноўваць аргументацыю розных пунктаў гледжання па адной і той жа праблеме;

- адрозніваць меркаванні і інтэрпрэтацыі ад гістарычных фактаў;
- абгрунтоўваць уласнае меркаванне па праблемах грамадска-гістарычнага развіцця;
- праводзіць пошук гістарычнай інфармацыі ў разнастайных крыніцах;
- праводзіць аналіз гістарычных крыніц і рэканструяваць на іх аснове вобразы гістарычнага мінулага і яго ўдзельнікаў;
- характарызаваць умовы і вобраз жыцця насельніцтва Беларусі;
- рыхтаваць і прэзентаваць паведамленні пра дзейнасць гістарычных асоб з вызначэннем яе матываў і ацэнкай вынікаў, творчасць дзеячаў культуры з характарыстыкай гістарычнай тэматыкі ў іх творах;
- характарызаваць помнікі культуры Беларусі, створаныя ў перыяд другой паловы 40-х гг. XX ст. — пачатку XXI ст. і прысвечаныя гістарычным падзеям;

*выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні*:

- для напісання і прэзентацыі рэфератаў, гістарычных сачыненняў (эсэ); праектаў (вучнёўскіх даследаванняў) пра гістарычныя працэсы (падзеі) і асоб з вызначэннем іх праблематыкі, мэты, зборам і апрацоўкай матэрыялу, абаронай вынікаў;
- вызначэння ўласнай пазіцыі пры абмеркаванні значнасці гістарычных падзей і вынікаў дзейнасці іх удзельнікаў;
- тлумачэння ўзаемаабумоўленасці сучасных і гістарычных з’яў;
- правядзення пошуку і аналізу зместу сацыяльна значнай інфармацыі;
- ідэнтыфікацыі сваіх сацыяльных паводзін як грамадзяніна Рэспублікі Беларусь;
- ажыццяўлення камунікацыі ў шматканфесійным і полікультурным грамадстве;
- захавання помнікаў гісторыі і культуры Беларусі.

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ

*Фамін, В. М.* Гісторыя Беларусі, другая палова 1940-х гг. — пачатак XXI ст. : вучэб. дапам. для 11-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / В. М. Фамін, С. В. Паноў, Н. М. Ганушчанка ; пад рэд. В. М. Фаміна. — Мінск : Нац. ін-т адукацыі, 2013.

*Фамін, В. М.* Гісторыя Беларусі, другая палова 1940-х гг. — пачатак XXI ст. : 11 кл. : хрэстаматыя : дапам. для вучняў агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання / аўт. уступн. арт., метад. апарату, склад. В. М. Фамін, С. В. Паноў, Т. Ф. Ходзіна. — Мінск : Народная асвета, 2009.

*Паноў, С. В.* Гісторыя Беларусі ў 11 класе : вучэб.-метад. дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / С. В. Паноў. — Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2015.

История. 11 класс : рабочая тетрадь : пособие для учащихся учреждений общ. сред. образования с рус. яз. обучения / М. А. Краснова [и др.]. — Минск : Аверсэв, 2014.

*Паноў, С. В.* Ад БССР да Рэспублікі Беларусь : выбар шляхоў развіцця : 11 кл. : дапам. для вучняў агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання / С. В. Паноў. — Мінск : АСАР, 2010.

*Паноў, С. В.* Ад БССР да Рэспублікі Беларусь : выбар шляхоў развіцця : 11 кл. : дапам. для настаўнікаў агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання / С. В. Паноў. — Мінск : АСАР, 2010.

Вучэбная праграма факультатыўных заняткаў для 11 класа «Гісторыя Беларусі ў імёнах і падзеях» / С. В. Паноў, Л. А. Ярашэвіч // Веснік адукацыі. — 2013. — № 4.

*Гінчук, В. В.* Гісторыя Беларусі : тэставыя і рознаўзроўневыя заданні : 10—11 кл. : дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. і рус. мовамі навучання / В. В. Гінчук. — Мінск : Сэр-Віт, 2012.

Зборнік заданняў для выпускнога экзамену па вучэбным прадмеце «Гісторыя Беларусі». 11 клас : дапам. для настаўнікаў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / С. В. Паноў, Л. А. Ярашэвіч. — Мінск : Аверсэв, 2015.

История Беларуси : вторая половина 1940-х гг. — начало XXI в. XI класс / Moodle [Электронный ресурс]. — Режим доступа : http://moodle.adu.by.

# СУСВЕТНАЯ ГІСТОРЫЯ

## Сусветная гісторыя Навейшага часу: 1945—2015 гг.

### ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

### Агульная характарыстыка вучэбнага прадмета, яго спецыфіка ў сістэме агульнай сярэдняй адукацыі

Гісторыя Навейшага часу з'яўляецца важным этапам фарміравання ў вучняў цэласнай карціны гістарычнага развіцця свету, без якога цяжка арыентавацца ў сучаснай сацыяльнай рэчаіснасці. Яна раскрывае карціну гістарычнага працэсу ў яго адзінстве і супярэчнасці ад заканчэння Першай сусветнай вайны да пачатку XXI ст. У навучанні гісторыі гэты курс займае асаблівае месца. Ён з'яўляецца лагічным завяршэннем вывучэння сістэматычнага курса гісторыі, таму ў ім знаходзяць адлюстраванне абагульняльныя вывады пра асноўныя тэндэнцыі і грамадска-гістарычны вопыт папярэдняга развіцця. Курс Навейшай гісторыі мае ключавое значэнне з пункта гледжання фарміравання светапогляду і грамадзянскага выхавання вучняў, атрымання імі сацыяльна значных ведаў пра сучасныя тэндэнцыі развіцця свету, інтэлектуальнай і псіхалагічнай падрыхтоўкі вучняў да ўваходжання ў самастойнае жыццё.

Праграма грунтуецца на спалучэнні храналагічнага, краіназнаўчага, параўнальна-гістарычнага і праблемнага падыходаў. Храналагічны падыход выявіўся ў захаванні традыцыйнага падзелу курса на дзве часткі: 1918—1945 гг., якая вывучаецца ў X класе, і з 1945 г. па сённяшні час, якая вывучаецца ў XI класе, — а таксама ў тым, што падзеі і з'явы гісторыі ў рамках тэмы вывучаюцца ў часавым (храналагічным) парадку. Краіназнаўчы падыход выявіўся ў вылучэнні асобных блокаў: краіны Еўропы і ЗША; Расія — СССР — Расійская Федэрацыя; краіны Азіі, Афрыкі

і Лацінскай Амерыкі — пры гэтым асаблівая ўвага надаецца тым дзяржавам, якія шмат у чым вызначаюць асноўны вектар сусветнага развіцця. Параўнальна-гістарычны падыход дапамагае знаходзіць агульнае і рознае ў развіцці працэсаў сусветнай гісторыі, паказваць узаемасувязь і ўзаемаабумоўленасць падзей. Праблемны падыход знайшоў сваё адлюстраванне ў разглядзе пытанняў, якія не маюць адназначнага адказу ў гістарычнай навуцы. Сярод іх можна адзначыць такія ключавыя праблемы, як пытанні вайны і міру, праблемы трансфармацыі і мадэрнізацыі палітычных і сацыяльна-эканамічных сістэм, прынцыпы пабудовы стабільнага светапарадку для ўстойліва-бяспечнага развіцця чалавецтва.

## Месца вучэбнага прадмета ў вучэбным плане

Вучэбная праграма прызначана для арганізацыі вывучэння другога перыяду гісторыі Навейшага часу (1945—2015) у XI класе на павышаным узроўні, які прадугледжвае засваенне вучнямі ведавага і дзейнаснага кампанентаў зместу адукацыі, неабходнага для асобаснага самаразвіцця, далейшага навучання і прафесійнага самавызначэння, а таксама для ўсвядомленага і эфектыўнага вырашэння адукацыйных і жыццёвых (сацыякультурных) задач.

Павышаны ўзровень дазваляе рэалізаваць дыферэнцыяцыю навучання, пабудаваць індывідуальную адукацыйную траекторыю, забяспечыць пераемнасць агульнай сярэдняй і вышэйшай адукацыі і падрыхтаваць вучняў да дзейнасці ў выбранай прафесійнай сферы. Асаблівасцю курса гісторыі, які вывучаецца на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі на павышаным узроўні, з’яўляецца яго непасрэдная сувязь з задачамі прафілізацыі адукацыі. Павышаны ўзровень вывучэння гісторыі рэалізуецца як за кошт пашырэння ведавага кампанента зместу курса гісторыі, так і за кошт удасканалення агульных і спецыяльных спосабаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці.

Неабходна ўлічваць тое, што разам з захаваннем важнасці атрымання вучнямі ведаў пра навейшы перыяд гісторыі асаблівая ўвага павінна надавацца ўдасканаленню спосабаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці, неабходных для далейшага самастойнага выкарыстання пры аналізе сучаснай сацыяльнай рэчаіснасці і паспяховага працягу навучання ва ўстановах вышэйшай адукацыі.

У адпаведнасці з Вучэбным планам на 2016/2017 навучальны год на вывучэнне сусветнай гісторыі Навейшага часу (1945—2015) адводзіцца 3 вучэбныя гадзіны на тыдзень у першым паўгоддзі і 2 вучэбныя гадзіны на тыдзень у другім паўгоддзі, усяго 87 вучэбных гадзін.

Настаўнік, зыходзячы з педагагічнай мэтазгоднасці і ўлічваючы асаблівасці навучання ў канкрэтных умовах, можа змяніць рэкамендуемую праграмай колькасць вучэбных гадзін на вывучэнне асобных тэм і парадак іх вывучэння, не выходзячы за агульную колькасць вучэбнага часу па раздзелах.

## Мэта і задачы вывучэння вучэбнага прадмета

**Мэта** вывучэння гісторыі: авалоданне вучнямі сістэматызаванымі ведамі пра сусветны гістарычны працэс з 1945 па 2015 г., неабходнымі для фарміравання грамадзянскага патрыятызму, паспяховага прафесійнага самавызначэння і сацыялізацыі ў сучасным сацыякультурным асяроддзі, і развіццё на гэтай аснове гістарычнага мыслення.

**Асноўныя задачы:**

- засвоіць сістэму важнейшых фактаў, якія характарызуюць перыяд Навейшай гісторыі ад заканчэння Другой сусветнай вайны да пачатку XXI ст., з раскрыццём найбольш істотных прычынна-выніковых сувязей, неабходных для працягу навучання ва ўстановах вышэйшай адукацыі па адпаведным профілі;
- засвоіць асноўныя гістарычныя паняцці ў іх сістэме і ўзаемасувязі;
- асвоіць асноўныя спосабы самастойнага атрымання новых сацыяльна-гістарычных ведаў і аперыравання гатовымі ведамі;
- вызначаць уласную пазіцыю ў адносінах да падзей і з'яў мінулага і сучаснасці;
- выхоўваць у вучняў грамадзянскі патрыятызм і фарміраваць дзяржаўна-нацыянальную ідэнтычнасць;
- умець выкарыстоўваць атрыманыя гістарычныя веды ў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці і жыццёвых сітуацыях, а таксама для разумення сучасных грамадскіх з'яў ва ўзаемасувязі з мінулым.

## Асобасныя, метапрадметныя і прадметныя вынікі засваення вучэбнага прадмета

Вывучэнне гісторыі на павышаным узроўні ажыццяўляецца з улікам магчымасці рэалізацыі кампетэнтнаснага падыходу да падрыхтоўкі выпускніка на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі, які ўлічвае фарміраванне прадметных, метапрадметных, асобасных кампетэнцый. Кампетэнцыі разглядаюцца як асобасная якасць, якая фарміруецца ў адукацыйным працэсе ў ходзе засваення ведаў, набыцця ўменняў, навыкаў, вопыту дзейнасці, неабходных для працягу адукацыі, працоўнай дзейнасці, паспяховай сацыялізацыі ў грамадстве.

*Прадметныя* вынікі вывучэння гісторыі на павышаным узроўні накіраваны на засваенне зместу гісторыі Навейшага часу з 1945 па 2015 г. і асваенне спецыяльных спосабаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці. Прадметныя вынікі навучання павінны дапамагчы ў паспяховым навучанні на наступнай ступені адукацыі. Яны прадстаўлены ў раздзеле «Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў».

*Метапрадметныя* вынікі вывучэння гісторыі на павышаным узроўні адлюстроўваюць уменні:

- самастойна вызначаць мэты свайго навучання і пазнавальнай дзейнасці, а таксама шляхі іх дасягнення;
- аналізаваць сваю дзейнасць і карэкціраваць яе;
- абагульняць, сістэматызаваць, класіфікаваць факты, выяўляць асноўныя прычынна-выніковыя сувязі, рабіць высновы;
- аперыраваць знакава-сімвальнай інфармацыяй;
- вызначаць паняцці і падводзіць пад паняцці;
- працаваць з разнастайнымі крыніцамі інфармацыі;
- арганізоўваць і прадстаўляць вынікі сваёй вучэбна-пазнавальнай дзейнасці;
- узаемадзейнічаць з іншымі людзьмі, працаваць у групе, камандзе, калектыве.

*Асобасныя* вынікі вывучэння гісторыі на павышаным узроўні адлюстроўваюць:

- усведамленне сябе як грамадзяніна Рэспублікі Беларусь;
- фарміраванне базавай сістэмы каштоўнасцей;

- далучэнне да культурнай разнастайнасці сучаснага грамадства;
- развіццё светапогляду, самасвядомасці, адносін да рэчаіснасці, характару, здольнасцей, псіхічных працэсаў, назапашванне вопыту.

## Рэкамендаваныя формы і метады навучання і выхавання

Вывучэнне гісторыі на павышаным узроўні патрабуе змянення метадаў навучання. Павялічваецца аб'ём самастойнай працы вучняў, большая ўвага надаецца працы з гістарычнымі крыніцамі, арганізуецца даследчая і праектная дзейнасць. Гэта дазваляе вырашыць праблему найбольш поўнага ўліку індывідуальных магчымасцей і патрэбнасцей вучняў.

Найбольш эфектыўнымі формамі заняткаў пры вывучэнні гісторыі на павышаным узроўні з'яўляюцца інтэрактыўныя лекцыі, семінары, практычныя заняткі (практыкумы), канферэнцыі, круглыя сталы, дыспуты, дыскусіі і г. д., заснаваныя на выкарыстанні актыўных і інтэрактыўных метадаў навучання. З мэтай выпрацоўкі асобасных адносін вучняў да падзей і працэсаў, якія вывучаюцца, важна звязваць вывучаемы матэрыял з сучасным жыццём.

Асаблівае значэнне ў працэсе вывучэння гісторыі на павышаным узроўні маюць практыка-арыентаваныя формы вучэбных заняткаў, падчас якіх вучні ўдасканальваюць навыкі індывідуальнай і калектыўнай дзейнасці з разнастайнымі крыніцамі гістарычнай інфармацыі, вырашаюць пазнавальныя задачы, выконваюць праблемныя заданні, ажыццяўляюць інфармацыйна-пазнавальную, вучэбна-даследчую і праектную дзейнасць. Для правядзення такіх заняткаў у праграме адведзены дадатковы вучэбны час. Тэмы ўрокаў-практыкумаў вызначае настаўнік, зыходзячы са складанасці вучэбнага матэрыялу, неабходнасці больш якаснага яго засваення, інтарэсаў вучняў, а таксама забяспечанасці неабходнымі сродкамі навучання.

Пашырыць праблематыку зместу гістарычнага курса, стварыць умовы для арганізацыі засваення адпаведных спосабаў дзейнасці, адпрацаваць навыкі даследчай працы з гістарычнымі крыніцамі, удасканальваць уменне фармуляваць і аргументаваць уласны пункт

гледжання магчыма на аснове вывучэння шырокага спектра гістарычных крыніц. Асноўнае месца пры працы з дакументамі мэтазгодна адвесці іх крытычнаму аналізу і інтэрпрэтацыі. Разам з традыцыйнымі відамі гістарычных крыніц (заканадаўчыя акты, мемуары, гістарычныя даследаванні і інш.) могуць выкарыстоўвацца крыніцы інфармацыі, не зусім звыклыя для ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі, але, безумоўна, здольныя павысіць пазнавальны інтарэс, такія як эпісталярная спадчына (прыватная перапіска); вусная гісторыя; творы публіцыстычнага, карыкатурнага жанраў; інфармацыя СМІ, музейныя зборы; краязнаўчы матэрыял і г. д.

Вывучэнне кожнага раздзела завяршаецца падагульненнем, якое садзейнічае сістэматызацыі ведаў вучняў, устанаўленню ўнутры- і міжпрадметных сувязей, выяўленню заканамернасцей і тэндэнцый, удасканаленню спосабаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці. Павышэнню якасці навучання таксама будзе садзейнічаць выкарыстанне ў адукацыйным працэсе інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій.

Рэзервовы час прызначаны для правядзення кантролю засваення ведавага і дзейнаснага кампанентаў зместу гістарычнай адукацыі, а таксама для арганізацыі праектнай дзейнасці вучняў.

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА

### 87 гадзін, у тым ліку 9 гадзін — рэзервовы час

### Уводзіны (1 гадзіна)

Асноўныя тэндэнцыі развіцця краін свету пасля Другой сусветнай вайны. Крушэнне сусветнай каланіяльнай сістэмы. Фарміраванне двухполюснага свету. Пачатак халоднай вайны. Разрадка міжнароднай напружанасці. Паварот ад разрадкі да канфрантацыі. Змяненне суадносін сіл у свеце. Распад сацыялістычнага лагера. Паглыбленне інтэграцыі і працэсы дэзынтэграцыі.

***Асноўныя паняцці:*** *Паўночнаатлантычны блок (НАТА), Арганізацыя Варшаўскага Дагавора (АВД), двухполюсны свет, сусветная сістэма сацыялізму, «дактрына Картэра», разрадка міжнароднай напружанасці.*

## Раздзел I
## Асаблівасці развіцця ЗША і краін Еўропы (26 гадзін)

**Фарміраванне і крызіс «грамадства ўсеагульнага дабрабыту» ў краінах Захаду** (2 гадзіны). Пасляваеннае аднаўленне эканомікі і трансфармацыя эканамічнай мадэлі. Агульны рынак. Фарміраванне «грамадства ўсеагульнага дабрабыту». Дактрына сацыяльнага лібералізму. НТР і яе сацыяльна-эканамічныя наступствы. Рост невытворчай сферы. Сусветны эканамічны крызіс 1974—1975 гг. і яго наступствы. Неакансерватыўная хваля 1980—1990-х гг.

**Постындустрыяльнае грамадства ў развітых краінах** (2 гадзіны). Асноўныя рысы постындустрыяльнага (інфармацыйнага) грамадства. Глабалізацыя сусветнай эканомікі. Інтэграцыйныя працэсы. Маастрыхцкі дагавор. Фінансавы крызіс (2008). Крызісныя з'явы ў постындустрыяльным грамадстве ў пачатку XXI ст.

**Злучаныя Штаты Амерыкі** (2 гадзіны). Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае развіццё пасля Другой сусветнай вайны. Макартызм. Барацьба супраць расавай дыскрымінацыі. М. Л. Кінг. Прэзідэнцтва Д. Эйзенхаўэра. Ваенна-прамысловы комплекс. ЗША на «новых рубяжах». Д. Кенэдзі. Крызісныя з'явы ў 1970-х гг. Р. Рэйган і «рэйганоміка». ЗША ў 1990-х — пачатку XXI ст. Асноўныя напрамкі знешняй палітыкі ЗША.

**Федэратыўная Рэспубліка Германія і Германская Дэмакратычная Рэспубліка** (2 гадзіны). Утварэнне ФРГ і ГДР. Германскі «эканамічны цуд». Сацыяльная рынавая эканоміка. Палітычнае развіццё ФРГ. К. Адэнаўэр. Будаўніцтва сацыялізму ў ГДР. Э. Хонекер. Адносіны ФРГ і ГДР. Берлінскі крызіс 1961 г. «Новая ўсходняя палітыка». В. Брант. Сацыяльна-палітычнае развіццё ФРГ і ГДР у 1970—1980-я гг. Г. Коль. Аб'яднанне Германіі. Адзіная Германія на мяжы стагоддзяў. А. Меркель.

**Вялікабрытанія** (2 гадзіны). Пачатак распаду Брытанскай каланіяльнай імперыі. Унутраная палітыка кансерватараў (1951—1964). Ірландская (Ольстэрская) праблема і шляхі яе вырашэння. Кансерватары і лейбарысты перад эканамічнымі праб-

лемамі 1970-х гг. Сацыяльна-эканамічная палітыка кансерватараў. М. Тэтчэр. Тэтчэрызм. Фалклендскі канфлікт. Вяртанне лейбарыстаў да ўлады. Канцэпцыя «новага лейбарызму». Праўленне кансерватараў.

**Францыя** (2 гадзіны). Становішча Францыі пасля Другой сусветнай вайны. Ш. дэ Голь. Фарміраванне рэжыму Чацвёртай рэспублікі. Пачатак распаду Французскай каланіяльнай імперыі. Пятая рэспубліка. Эканамічны ўздым у Францыі ў канцы 1950—1960-х гг. Палітычны крызіс 1968 г. Францыя ў 1970-я гг. — пачатку XXI ст. Унутраная і знешняя палітыка Францыі ў 1970-я гг. — пачатку XXI ст. Прыход да ўлады сацыялістаў.

**Італія** (2 гадзіны). Пасляваенныя дэмакратычныя пераўтварэнні. Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае развіццё ў 1950—1980-я гг. Праблема Поўдня. Палітычны тэрарызм. Пошукі шляхоў выхаду з палітычнага крызісу. Еўракамунізм. Палітыка «гістарычнага кампрамісу». Палітычныя перамены ў 1990-я гг. — пачатку XXI ст.

**Краіны Паўночнай Еўропы** (2 гадзіны). Месца краін Паўночнай Еўропы ў сучасным свеце. Сацыяльна-эканамічнае развіццё краін Паўночнай Еўропы пасля Другой сусветнай вайны. Шведская мадэль сацыялізму. У. Пальме. Палітычнае развіццё пасля 1945 г. Знешняя палітыка. Краіны Паўночнай Еўропы ў канцы XX — пачатку XXI ст.

**Краіны Цэнтральнай і Паўднёва-Усходняй Еўропы** (2 гадзіны). Дэмакратычныя пераўтварэнні першых пасляваенных гадоў. Поспехі і цяжкасці сацыялістычнага будаўніцтва. Нарастанне сістэмнага крызісу сацыялізму. Дэмакратычныя рэвалюцыі 1989—1991 гг. і іх наступствы. Грамадзянская вайна ў Югаславіі і яе распад. Падзел Чэхаславакіі. Інтэграцыя ў еўрапейскія структуры і НАТА.

**Культура краін ЗША і Еўропы. Спосаб жыцця насельніцтва** (3 гадзіны). Асноўныя напрамкі развіцця мастацкай культуры. Элітарная і масавая культура. Постмадэрнізм. Музыка, літаратура і тэатр: асноўныя тэндэнцыі развіцця. Неарэалізм. Кіно. Архітэктура. Спосаб жыцця і матэрыяльнае становішча сярэдняга класа. Шоу-бізнес і рэклама. Масавая культура. Рост уплыву сродкаў масавай інфармацыі.

**Практыкум па раздзеле I** (4 гадзіны)

**Падагульненне па раздзеле I** (1 гадзіна)

***Асноўныя паняцці:*** *«грамадства ўсеагульнага дабрабыту», Агульны рынак, навукова-тэхнічная рэвалюцыя (НТР), інтэграцыя, Савет эканамічнай узаемадапамогі (СЭУ), Еўрапейскі Саюз (ЕС), макартызм, глабалізацыя, транснацыянальная карпарацыя, ваенна-прамысловы комплекс (ВПК), «рэйганоміка», Стратэгічная абаронная ініцыятыва (САІ), тэтчэрызм, галізм, неакансерватыўная хваля, мафія, шведская мадэль сацыялізму, Будапешцкая восень, Пражская вясна, «новая ўсходняя палітыка», «аксамітныя рэвалюцыі», постындустрыяльнае (інфармацыйнае) грамадства, постмадэрнізм, авангарднае мастацтва.*

## Раздзел II
## Гісторыя СССР і Расійскай Федэрацыі (16 гадзін)

**СССР у 1945—1953 гг.** (2 гадзіны). Перавод народнай гаспадаркі на мірныя рэйкі. Аднаўленне разбуранай вайной народнай гаспадаркі. Грамадска-палітычная сітуацыя пасля вайны. Палітычныя рэпрэсіі. «Ленінградская справа». Барацьба з касмапалітызмам.

**СССР у 1953—1964 гг.** (2 гадзіны). Змяненні ў палітычным курсе краіны пасля смерці І. В. Сталіна. М. С. Хрушчоў. XX з'езд КПСС. Крытыка культу асобы Сталіна. Грамадска-палітычнае жыццё ў краіне. Рэформы ў сельскай гаспадарцы і прамысловасці. Асваенне цаліны. Умовы жыцця савецкіх людзей.

**СССР у сярэдзіне 1960-х — пачатку 1980-х гг.** (2 гадзіны). Асаблівасці грамадска-палітычнага жыцця савецкай краіны. Л. І. Брэжнеў. Адміністрацыйна-гаспадарчая рэформа 1965 г. Канстытуцыя СССР 1977 г. Канцэпцыя «развітога сацыялізму». Зніжэнне тэмпаў развіцця. Стан эканомікі ў 1970-я — пачатку 1980-х гг.

**Распад СССР і ўтварэнне СНД** (2 гадзіны). Пачатак перабудовы. М. С. Гарбачоў. Курс на паскарэнне сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны. Новыя з'явы ў грамадска-палітычным жыцці краіны. Палітыка галоснасці. Дэмакратызацыя. «Парад суверэнітэтаў». Падпісанне Белавежскага пагаднення і ўтварэнне СНД.

**Расійская Федэрацыя і СНД** (2 гадзіны). Палітычны крызіс верасня-кастрычніка 1993 г. Канстытуцыя Расійскай Федэрацыі. Б. М. Ельцын. Сацыяльна-эканамічнае развіццё краіны. Падзеі ў Чачні. Унутраная палітыка прэзідэнта У. У. Пуціна. Праблема ўмацавання расійскай дзяржаўнасці. Палітычная сістэма сучаснай Расіі.

Інтэграцыйныя працэсы ў рамках СНД. Стварэнне Саюзнай дзяржавы Беларусі і Расіі. Утварэнне АДКБ, ЕўрАзЭС, ЕАЭС. Асаблівасці сацыяльна-эканамічнага і палітычнага развіцця. Узброеныя канфлікты ў СНД. Праблемы далейшага развіцця.

**Навука і культура ў СССР і Расійскай Федэрацыі** (2 гадзіны). Адукацыя. Дасягненні савецкай навукі і яе ўклад у развіццё сусветнай цывілізацыі. Літаратура, мастацтва і музыка. Дысідэнцкі рух. Перабудова і змяненні ў культурным жыцці. Ідэалы і каштоўнасці савецкага грамадства. Развіццё культуры ў Расійскай Федэрацыі.

**Практыкум па раздзеле II** (3 гадзіны)
**Падагульненне па раздзеле II** (1 гадзіна)

***Асноўныя паняцці:*** *канверсія ваеннай вытворчасці, культ асобы, дэсталінізацыя, рэабілітацыя, дэмакратызацыя, «адліга», валюнтарызм, дысідэнты, шасцідзясятнікі, мірнае суіснаванне, інтэнсіўны шлях развіцця гаспадаркі, экстэнсіўны шлях развіцця гаспадаркі, «дактрына Брэжнева», стагнацыя, ценявая эканоміка, перабудова, галоснасць, шматпартыйнасць, плюралізм, новае палітычнае мысленне, «парад суверэнітэтаў», Белавежскае пагадненне, Садружнасць Незалежных Дзяржаў (СНД), «шокавая тэрапія», лібералізацыя цэн, прыватызацыя, акцыянаванне, рыначная эканоміка, прэзідэнцкая рэспубліка, сепаратызм, Еўразійскі эканамічны саюз (ЕАЭС), Арганізацыя Дагавора аб калектыўнай бяспецы (АДКБ), Мытны саюз.*

## Раздзел III
## Краіны Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі ў 1945—2015 гг. (18 гадзін)

**Распад каланіяльнай сістэмы** (1 гадзіна). Ідэалогіі нацыянальна-вызваленчых рухаў. Дэкаланізацыя. Утварэнне незалежных дзяржаў. Праблема выбару шляхоў развіцця. Неакаланіялізм. Сацыялістычная арыентацыя краін Азіі і Афрыкі. СССР і «трэці свет».

**Кітайская Народная Рэспубліка** (3 гадзіны). Утварэнне Кітайскай Народнай Рэспублікі (КНР). Мао Цзэдун. Аднаўленчы перыяд. Палітыка «вялікага скачка» і «культурнай рэвалюцыі».

Рэфармаванне кітайскага грамадства пасля смерці Мао Цзэдуна. Дэн Сяапін. Эканамічныя рэформы. Палітычнае развіццё КНР у гады рэформ. Савецка-кітайскія адносіны. Знешняя палітыка КНР. Палітыка «адна дзяржава — дзве сістэмы».

**Японія** (2 гадзіны). Рэформы 1945—1949 гг. Канстытуцыя 1946 г. Сан-Францыскі дагавор. «Эканамічны цуд». Унутрыпалітычная барацьба ў 60—70-я гг. XX ст. Сучаснае становішча Японіі (канец XX — пачатак XXI ст.). Стан эканомікі. Адносіны з СССР і ЗША.

**Індыя** (2 гадзіны). Барацьба індыйскага народа за незалежнасць. Утварэнне дамініёна і рэспублікі. Курс на лібералізм І. Гандзі. Р. Гандзі. Палітычная нестабільнасць у 1990-я гг. Міжпартыйная барацьба. Праблемы знешняй палітыкі. Узаемаадносіны з Кітаем, Пакістанам, ЗША і СССР/Расіяй.

**Краіны мусульманскага свету** (2 гадзіны). Агульная характарыстыка краін мусульманскага свету. Антыманархічныя рэвалюцыі ў арабскім рэгіёне (Егіпет, Ірак, Ліван, Лівія), барацьба за незалежнасць Алжыра. Праблема выбару шляхоў развіцця. Мадэрнізацыя Ірана. Турцыя. Ісламскі фундаменталізм. «Арабская вясна» і яе наступствы.

**Краіны Лацінскай Амерыкі** (2 гадзіны). Асноўныя тэндэнцыі сацыяльна-эканамічнага развіцця. Палітычнае жыццё. Рэформы, ваенныя дыктатуры і рэвалюцыі. Куба. Фідэль Кастра. Чылі. Сальвадор Альенда. Бразілія. Венесуэла. Уга Чавес.

**Культура краін Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі** (2 гадзіны). Мадэрнізацыя традыцыйнай культуры. Адукацыя і навука. Мастацкая літаратура, жывапіс, архітэктура. Кіно.

**Практыкум па раздзеле III** (3 гадзіны)

**Падагульненне па раздзеле III** (1 гадзіна)

***Асноўныя паняцці:*** *краіны «трэцяга свету», дэкаланізацыя, Год Афрыкі, апартэід, неакаланіялізм, палітыка «трох чырвоных сцягоў», «Вялікая пралетарская культурная рэвалюцыя», мааізм, палітыка «вялікага скачка», Шанхайская арганізацыя супрацоўніцтва (ШАС), дамініён, «курс Нэру», Рух недалучэння, новыя індустрыяльныя краіны, ісламскі фундаменталізм, «белая рэвалюцыя», тэрарызм.*

## Раздзел IV
## Міжнародныя адносіны і лакальныя канфлікты (16 гадзін)

**Фарміраванне біпалярнага свету і пачатак глабальнага супрацьстаяння (1945—1950-я)** (2 гадзіны). Ваенна-палітычныя вынікі Другой сусветнай вайны. Парыжская мірная канферэнцыя (1946). Прычыны і пачатак халоднай вайны. Раскол Германіі. Стварэнне НАТА і АВД. Супрацьстаянне ЗША — СССР. Крызіс каланіяльнай сістэмы. Халодная вайна ў Азіі. Суэцкі крызіс (1956) і яго міжнародныя наступствы.

**Супрацьстаянне паміж Усходам і Захадам (1960—1970-я)** (2 гадзіны). Другі Берлінскі крызіс. Карыбскі крызіс (1962) і яго вынікі. «Дактрына Брэжнева». Дагаворы аб абмежаванні гонкі ў галіне ядзерных узбраенняў (1972, 1979). Вайна ў В'етнаме. Войны на Блізкім Усходзе. Разрадка міжнароднай напружанасці. Нарада па бяспецы і супрацоўніцтве ў Еўропе. Ад разрадкі да канфрантацыі.

**Міжнародныя адносіны ў 1980-я гг. — пачатку XXI ст.** (2 гадзіны). Абвастрэнне міжнародных адносін у канцы 1970-х — першай палове 1980-х гг. Вайна ў Афганістане. Крызіс у Польшчы. Савецка-амерыканскі дыялог (1985—1991) і яго вынікі. Распад СССР. Геапалітычныя наступствы распаду СССР і дэзынтэграцыі постсацыялістычнай прасторы. Лакальныя канфлікты і войны. Праблема стварэння новай сістэмы еўрапейскай і сусветнай бяспекі.

**Войны ў В'етнаме** (1 гадзіна). Утварэнне ДРВ. Вайна Супраціўлення супраць Францыі. Жэнеўскія пагадненні. «Асобая вайна» ЗША ў Паўднёвым В'етнаме. Танкінскі інцыдэнт. Вайна ЗША супраць ДРВ. «Гуамская дактрына». Парыжскія пагадненні. Аб'яднанне В'етнама.

**Блізкаўсходні канфлікт** (1 гадзіна). Вытокі і прычыны. Палесцінская праблема. Араба-ізраільскія войны і іх наступствы. Праблема ўрэгулявання блізкаўсходняга канфлікту. Арганізацыя вызвалення Палесціны і стварэнне Палесцінскай аўтаноміі.

**Карэйская вайна і праблема аб'яднання Карэі** (1 гадзіна). Утварэнне Рэспублікі Карэя і КНДР. Вайна паміж Поўначчу і Поўднем у 1950—1953 гг. Праблема аб'яднання дзвюх дзяржаў. Палітыка «сонечнага цяпла» ў пачатку XXI ст.

**Войны ў Афганістане** (1 гадзіна). Утварэнне Дэмакратычнай Рэспублікі Афганістан. Барацьба паміж фракцыямі «Хальк» і «Парчам» у НДПА. Заключэнне Дагавора аб дружбе, добрасусед-

стве і супрацоўніцтве паміж ДРА і СССР. Увод савецкіх войскаў у Афганістан. Курс на нацыянальнае прымірэнне. Вывад савецкіх войскаў. Прыход да ўлады афганскіх ісламістаў. Увод войскаў антытэрарыстычнай кааліцыі ў Афганістан. Звяржэнне рэжыму талібаў. Праблема вываду замежных войскаў з Афганістана.

**Войны ў зоне Персідскага заліва** (1 гадзіна). Ірана-іракская вайна 1980—1988 гг. Акупацыя Кувейта Іракам. Стварэнне міжнароднай кааліцыі. Аперацыя «Бура ў пустыні». Падрыхтоўка ЗША новай вайны супраць Ірака. Звяржэнне рэжыму Садама Хусейна. Ваенна-палітычная нестабільнасць у Іраку. Тэрарыстычная дзейнасць так званай ісламскай дзяржавы Ірака і Леванта (ИГИЛ).

**Глабальныя праблемы чалавецтва** (2 гадзіны). Ваенная і тэрарыстычная пагрозы. Экалагічныя праблемы і пошукі шляхоў іх вырашэння. Праблема выкарыстання дасягненняў НТР: новых біятэхналогій, геннай інжынерыі, штучнага інтэлекту, кланіравання. Праблема барацьбы са СНІДам, новымі вірусамі і хваробамі. Праблемы нераўнамернасці развіцця.

**Практыкум па раздзеле IV** (2 гадзіны)
**Падагульненне па раздзеле IV** (1 гадзіна)

***Асноўныя паняцці:*** *план Маршала, «дактрына Трумэна», халодная вайна, гонка ўзбраенняў, Карыбскі крызіс, Берлінскі крызіс, абмежаванне стратэгічных узбраенняў (АСУ), Хельсінкскі працэс, глабальныя праблемы чалавецтва.*

## **Выніковае падагульненне** (1 гадзіна)

### АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

У выніку асваення вучэбнай праграмы на павышаным узроўні вучні XI класа будуць:

*ведаць:*

- асноўныя падзеі сусветнай гісторыі Навейшага часу з 1945 па 2015 г., іх даты, удзельнікаў і вынікі;
- значэнне асноўных паняццяў;
- асноўныя факты пра жыццё і дзейнасць найбольш значных гістарычных асоб і дзеячаў культуры;

♦ прыведзеныя ў вучэбнай літаратуры ацэнкі важнейшых падзей, гістарычных асоб, дасягненняў і наступстваў развіцця навукі і тэхнікі;
♦ асаблівасці палітычнага, сацыяльна-эканамічнага і культурнага развіцця прадстаўленых у праграме краін свету ў вывучаемы перыяд;

*умець:*

♦ лакалізаваць падзеі сусветнай і айчыннай гісторыі 1945—2015 гг. у часе і прасторы;
♦ апісваць: ключавыя падзеі другога перыяду Навейшай гісторыі; умовы і спосаб жыцця людзей рознага сацыяльнага становішча ў розных краінах у 1945—2015 гг.; помнікі культуры другога перыяду Навейшай гісторыі;
♦ тлумачыць значэнне асноўных паняццяў і правільна іх выкарыстоўваць пры характарыстыцы гістарычнай і сучаснай сацыяльнай рэчаіснасці;
♦ суадносіць гістарычныя падзеі, з'явы і працэсы айчыннай, еўрапейскай і сусветнай гісторыі;
♦ характарызаваць асноўныя перыяды Навейшай гісторыі, асноўныя гістарычныя падзеі; геапалітычнае становішча краін і рэгіёнаў у 1945—2015 гг.; палітычныя рэжымы, якія існавалі ў другой палове XX ст.: дэмакратычныя, аўтарытарныя, таталітарныя; сацыяльна-эканамічнае і палітычнае становішча краін у 1945—2015 гг.; нацыянальна-вызваленчыя рухі і працэс дэкаланізацыі; дзейнасць палітычных і дзяржаўных асоб і дзеячаў культуры; найбольш значныя з'явы культуры ў 1945—2015 гг.;
♦ тлумачыць прычынна-выніковыя сувязі найбольш значных падзей і з'яў другога перыяду Навейшай гісторыі, раскрываць узаемаабумоўленасць змяненняў у асноўных сферах грамадскага жыцця;
♦ сістэматызаваць, класіфікаваць і абагульняць гістарычныя факты і рабіць на аснове гэтага аргументаваныя вывады;
♦ параўноўваць гістарычныя факты па самастойна вызначаных крытэрыях;
♦ праводзіць аналіз зместу гістарычных дакументаў;
♦ пераводзіць тэкставую інфармацыю ў знакава-сімвальную і наадварот;

- тлумачыць розныя пункты гледжання на адны і тыя ж гістарычныя факты;
- канкрэтызаваць вывады, гістарычныя паняцці;
- выказваць і аргументаваць сваё стаўленне да гістарычных падзей і асоб, выказваць аргументаваны пункт гледжання пры абмеркаванні гістарычных праблем;
- даваць ацэнку гістарычным падзеям, дзейнасці ўрадаў, палітычных і дзяржаўных дзеячаў; ацэньваць уклад дзеячаў культуры і навукі ў гістарычнае развіццё чалавечага грамадства;
- праводзіць пошук гістарычнай інфармацыі ў крыніцах рознага тыпу;
- праводзіць вучэбнае гістарычнае даследаванне: фармуляваць праблемы; ажыццяўляць збор, сістэматызацыю і абагульненне інфармацыі; праводзіць якасны/колькасны аналіз; апісваць атрыманыя вынікі; праводзіць прэзентацыю і абарону вынікаў даследавання;

*выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні:*

- для вызначэння ўласнай пазіцыі ў адносінах да гістарычных падзей, з'яў і асоб, а таксама да падзей сучаснага жыцця;
- аналізу пры працы з гістарычнымі крыніцамі і сучаснай сацыяльнай інфармацыяй;
- усвядомленых паводзін як прадстаўніка грамадзянскай, этнакультурнай, канфесійнай супольнасці, якая гістарычна склалася, грамадзяніна Беларусі;
- беражлівых адносін да помнікаў гісторыі і культуры.

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЕ І МАТЭРЫЯЛЬНА-ТЭХНІЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ АДУКАЦЫЙНАГА ПРАЦЭСУ

### *Вучэбна-метадычная літаратура*

У працэсе навучання могуць быць выкарыстаны наступныя кампаненты **вучэбна-метадычнага комплексу**:

*Космач, Г. А.* Сусветная гісторыя Навейшага часу, 1945 г. — пачатак XXI ст. : вучэб. дапам. для 11-га кл. установ агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / Г. А. Космач, У. С. Кошалеў, М. А. Краснова ; пад рэд. Г. А. Космача. — Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2012. — 264 с.

*Космач, Г. А.* Всемирная история Новейшего времени, 1945 г. — начало XXI в. : Атлас : учеб. пособие для 11-го кл. учреждений общего среднего образования / Г. А. Космач, В. Н. Темушев. — Минск : Белкартография, 2010.

Всемирная история Новейшего времени, 1945—2010 гг. : 11-й кл. : хрестоматия : пособие для учащихся общеобразоват. учреждений с белорус. и рус. яз. обучения / авт.-сост. Г. А. Космач, В. С. Кошелев, М. А. Краснова ; под ред. Г. А. Космача. — Минск : Пачатковая школа, 2010. — 320 с.

История Новейшего времени в 11 классе : учеб.-метод. пособие / Л. В. Гавриловец [и др.]. — Минск : Изд. центр БГУ, 2014.

История. 11 класс : рабочая тетрадь : пособие для учащихся учреждений общ. сред. образования / М. А. Краснова [и др.]. — Минск : Аверсэв, 2014. — 191 с.

*Краснова, М. А.* Всемирная история Новейшего времени : тестовые и разноуровневые задания : 10—11 кл. : пособие для учителей учреждений общ. сред. образования / М. А. Краснова. — Минск : Сэр-Вит, 2012. — 192 с .

*Кошалеў У. С.* Сусветная гісторыя, XIX — пачатак XXI ст. : вучэб. дапам. для 11-га кл. агульнаадукац. устаноў з беларус. мовай навучання / У. С. Кошалеў. — Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2009. — 240 с.

*Краснова, М. А.* Всемирная история Новейшего времени : 1918—1945 гг. 11-й кл. : примерное календарно-тематическое планирование : учеб.-метод. пособие. — Минск, 2016.

Для фарміравання картаграфічных уменняў вучняў у адукацыйным працэсе могуць быць выкарыстаны **вучэбныя насценныя карты:**

Страны Азии после Второй мировой войны.

СССР в 1953—1991 гг.

Европа после Второй мировой войны.

Страны Америки после Второй мировой войны.

Территориальные и политические изменения в Европе (1991—2005).

Інтэнсіфікацыі працэсу навучання і павышэнню яго эфектыўнасці будзе садзейнічаць выкарыстанне камп'ютарнай і мультымедыйнай тэхнікі, інтэрактыўных дошак і электронных сродкаў навучання.

*Навуковая літаратура*

**Раздзел I. Асаблівасці развіцця ЗША і краін Еўропы**

Американские президенты : 41 ист. портрет от Джорджа Вашингтона до Билла Клинтона. — Ростов н/Д. ; М., 1997.

*Барабанов, О. Н.* Италия после холодной войны : от средней державы к миру протагонистов / О. Н. Барабанов. — М. : РОССПЭН, 2002.

*Броган, Х.* Джон Кеннеди / Х. Броган. — Ростов н/Д., 1997.

Великобритания : эпоха реформ / под ред. А. А. Громыко. — М., 2007.

*Вяткин, К. С.* Гельмут Коль / *К. С. Вяткин* // Вопросы истории. — 1995. — № 3.

*Голдман, А.* Джон Леннон / А. Голдман. — М., 2004. — (ЖЗЛ).

*Ежов, В. Д.* Аденауэр / В. Д. Ежов. — М., 2003. — (ЖЗЛ).

Италия / отв. ред. Н. П. Васильков, К. Г. Холодковский. — М. : Мысль, 1983.

*Ле Корбюзье.* Архитектура XX века / Ле Корбюзье. — М., 1970.

*Ле Корбюзье.* Три формы расселения. Афинская хартия / Ле Корбюзье. — М., 1976.

*Медведев, Д. Л.* Тэтчер : Неизвестная Мэгги / Д. Л. Медведев. — М., 2009.

*Молчанов, Н. Н.* Де Голль / Н. Н. Молчанов. — М., 2003.

Музыка наших дней : совр. энцикл. — М. : Аванта+, 2002.

*Смирнов, В. П.* Франция в XX веке : учеб. пособие / В. П. Смирнов. — М., 2001.

*Согрин, В. В.* Политическая история США / В. В. Согрин. — М., 2001.

*Согрин, В. В.* Президенты и демократия. Американский опыт / В. В. Согрин. — М., 1998.

**Раздзел II. Гісторыя СССР і Расійскай Федэрацыі**

*Андриянов, В. И.* Косыгин / В. И. Андриянов. — М., 2004. — (ЖЗЛ).

*Бурлацкий, Ф. М.* Вожди и советники : О Хрущеве, Андропове и не только о них... / Ф. М. Бурлацкий. — М., 1990.

*Волкогонов, Д. А.* Семь вождей : Галерея лидеров СССР : в 2 кн. / Д. А. Волкогонов. — М., 1996. — Кн. 2 : Леонид Брежнев, Юрий Андропов, Константин Черненко, Михаил Горбачев.

*Горелик, Г. Е.* Андрей Сахаров / Г. Е. Горелик. — М., 2010. — (ЖЗЛ).

*Лихачев, Д. С.* Русская культура / Д. С. Лихачев. — М., 2000.

Лучше десять лет переговоров, чем один день войны. Воспоминания об Андрее Андреевиче Громыко. — М., 2009.

*Медведев, Р. А.* Юрий Андропов / Р. А. Медведев. — М., 2007. — (ЖЗЛ).

Советская внешняя политика в годы «холодной войны» / под ред. Л. Н. Нежинского. — М., 1995.

*Согрин, В. В.* Политическая история современной России. 1985 — 2001 : от Горбачева до Путина / В. В. Согрин. — М., 2001.

*Хрущев, Н. С.* Воспоминания : Избранные фрагменты / Н. С. Хрущев. — М., 1997.

### Раздзел III. Краіны Азіі, Афрыкі і Лацінскай Амерыкі ў 1945—2015 гг.

*Агаев, С. Л.* Иран между прошлым и будущим. События, люди, идеи / С. Л. Агаев. — М., 1987.

*Апдайк, Р. Дж.* Саддам Хусейн. Политическая биография / Р. Дж. Апдайк. — Ростов н/Д., 1999.

*Арешидзе, Л. Г.* Современная Япония : полит. справ. в схемах и табл. / Л. Г. Арешидзе, И. М. Крупянко, М. И. Крупянко. — М., 2003.

*Бар-Зохар, М.* Бен-Гурион / М. Бар-Зохар. — Ростов н/Д., 1998.

*Бурлацкий, Ф. М.* Мао Цзэдун и его наследники / Ф. М. Бурлацкий. — М., 1979.

*Гавриков, Ю. П.* Фидель Кастро. Неистовый команданте Острова свободы / Ю. П. Гавриков. — М., 2006.

*Джил, С. С.* Династия Ганди / С. С. Джил. — Ростов н/Д., 1997.

История Латинской Америки. Вторая половина XX века. — М., 2004.

*Королев, Ю. Н.* Чили : революция и контрреволюция / Ю. Н. Королев. — М., 1976.

*Концельман, Г.* Ясир Арафат / Г. Концельман. — Ростов н/Д., 1997.

*Кормье, Ж.* Че Гевара / Ж. Кормье. — Ростов н/Д., 1997.

Культура классической Японии : словарь-справочник. — Ростов н/Д. ; Харьков, 2002.

*Лаврецкий, И. Р.* Эрнесто Че Гевара / И. Р. Лаврецкий. — М., 2002.

*Молодяков, В. Э.* История Японии. XX век / В. Э. Молодяков, Э. В. Молодякова, С. Б. Макарьян. — М., 2009.

*Панцов, А. В.* Мао Цзэдун / А. В. Панцов. — М., 2007. — (ЖЗЛ).

*Полевой, В. М.* Искусство стран Латинской Америки / В. М. Полевой. — М., 1967.

Политические портреты деятелей стран Ближнего и Среднего Востока : очерки / под ред. В. В. Наумкина и В. В. Попова. — М., 2015.

*Селищев, А. С.* Китайская экономика в XXI веке / А. С. Селищев, Н. А. Селищев. — СПб., 2004.

*Усов, В. Н.* Дэн Сяопин и его время / В. Н. Усов. — М., 2009.

**Раздзел IV. Міжнародныя адносіны
і лакальныя канфлікты**

Арабо-израильские войны. Арабский взгляд. — М., 2008.

*Белл, Д.* Грядущее постиндустриальное общество : опыт социального прогнозирования / Д. Белл. — М., 1999.

*Белокреницкий, В. Я.* Южная Азия в мировой политике / В. Я. Белокреницкий [и др.]. — М., 2003.

*Богатуров, А. Д.* История международных отношений. 1945—2008 гг. / А. Д. Богатуров, В. В. Аверков. — М., 2010.

*Гаджиев, К. С.* Введение в геополитику / К. С. Гаджиев. — М., 2002.

*Гэлбрейт, Дж.* Новое индустриальное общество / Дж. Гэлбрейт. — М., 1969.

История международных отношений : учеб. пособие : в 4 ч. / А. А. Розанов [и др.]. — Минск, 2010. — Ч. 3 : 1945—1991 гг.

*Мартынов, Б. Ф.* История международных отношений стран Латинской Америки (XX — начало XXI вв.) / Б. Ф. Мартынов. — М., 2008.

*Меддоуз, Д. Х.* Пределы роста / Д. Х. Меддоуз [и др.]. — М., 1991.

*Печчеи, А.* Человеческие качества / А. Печчеи. — М., 1985.

Россия и мир в 2020 году. Контуры тревожного будущего / под ред. А. Сушенцова, А. Безрукова. — М., 2015.

*Тоффлер, Э.* Третья волна / Э. Тоффлер. — М., 2002.

*Уткин, А. И.* Правда об Ираке, или Битва в Месопотамии / А. И. Уткин. — М., 2007.

***Электронныя рэсурсы***

http://library.by — Белорусская цифровая библиотека

http://www.narb.by — Национальный архив Республики Беларусь

http://www.shpl.ru — Государственная публичная историческая библиотека России

http://www.historylib.org — Историческая библиотека

http://www.hrono.ru — Хронос. Всемирная история в Интернете

http://www.hist.msu.ru/about/gen_news/ — Исторический факультет Московского государственного университета имени М. В. Ломоносова

http://megabook.ru — Мегаэнциклопедия Кирилла и Мефодия

http://militera.lib.ru — Военная литература

http://historia.ru — Мир истории. Электронный журнал

http://pish.ru — Преподавание истории в школе. Научно-теоретический и методический журнал

# ГРАМАДАЗНАЎСТВА

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

### Агульная характарыстыка вучэбнага прадмета, яго спецыфіка ў сістэме агульнай сярэдняй адукацыі

У сістэме агульнай сярэдняй адукацыі «Грамадазнаўства» з'яўляецца інтэграваным вучэбным прадметам, аснову якога складае сукупнасць навуковых ведаў пра грамадства і чалавека. Крыніцай канструявання зместу вучэбнага прадмета з'яўляюцца сацыяльныя і гуманітарныя навукі: антрапалогія, культуралогія, правазнаўства, паліталогія, псіхалогія, рэлігіязнаўства, сацыялогія, этыка, эстэтыка, філасофія, эканамічная тэорыя і інш.

Грамадазнаўчая адукацыя з'яўляецца важным сродкам сацыялізацыі асобы. Падчас вывучэння грамадазнаўства ў XI класе вучні засвойваюць сістэму сацыяльна-гуманітарных ведаў пра беларускае грамадства і дзяржаву, вопыт творчай дзейнасці і эмацыянальна-каштоўнасных адносін, неабходных для паспяховай жыццядзейнасці ў сучасным свеце. Вывучэнне грамадазнаўства адыгрывае істотную ролю ў развіцці сацыяльнай кампетэнтнасці моладзі, у якую ўваходзяць, нараўне з ведамі, каштоўнаснымі арыентацыямі, матывамі дзейнасці, уменні арыентавацца ў пастаянна нарастаючым патоку інфармацыі, атрымліваць з яго неабходную, ужываць засвоеныя веды для рашэння вучэбна-пазнавальных і практычных задач, паспяховага ажыццяўлення дзейнасці ў розных сферах грамадскага жыцця.

Вучэбны прадмет «Грамадазнаўства» ўносіць істотны ўклад у грамадзянскае станаўленне асобы. Ён далучае вучняў да важных кампанентаў грамадзянскай культуры: навуковых уяўленняў пра адносіны паміж грамадзянінам і дзяржавай; правоў і абавязкаў

грамадзяніна; мадэлей грамадзянскіх паводзін, якія адабраюцца грамадствам; грамадзянскіх каштоўнасных арыентацый. Усё гэта дазваляе развіваць грамадзянскую кампетэнтнасць вучняў.

## Месца вучэбнага прадмета ў вучэбным плане

На вывучэнне вучэбнага прадмета «Грамадазнаўства» ў XI класе на павышаным узроўні адводзіцца 70 гадзін (г. зн. 2 гадзіны на тыдзень).

Змест адукацыі па вучэбным прадмеце на павышаным узроўні прадугледжвае (у параўнанні з базавым узроўнем вывучэння вучэбнага прадмета):

- больш глыбокае вывучэнне асобных пытанняў, якія дазваляюць забяспечыць сістэмнасць ведаў пра беларускую дзяржаву, яе лад, унутраную і знешнюю палітыку;
- пашырэнне асобасна значнага для вучняў вучэбнага матэрыялу (у тым ліку прафарыентацыйнай накіраванасці);
- вывучэнне нарматыўных прававых актаў беларускай дзяржавы;
- пашырэнне вучэбнага матэрыялу пра сацыяльна-эканамічнае, палітычнае, культурнае развіццё рэгіёна, у якім пражываюць вучні.

Пры планаванні адукацыйнага працэсу настаўнік можа самастойна вызначаць аптымальную для канкрэтнай педагагічнай сітуацыі паслядоўнасць вывучэння асобных тэм унутры раздзела.

## Мэта і задачы вывучэння вучэбнага прадмета

Мэтай вывучэння вучэбнага прадмета «Грамадазнаўства» ў XI класе з’яўляецца станаўленне творчай асобы, якая валодае крытычным мысленнем, здольна на аснове асэнсавання тэндэнцый і супярэчнасцей у развіцці сучаснай цывілізацыі і разумення асноўных тэндэнцый развіцця сучаснага беларускага грамадства і дзяржавы вызначыць шляхі канструктыўнай самарэалізацыі, актыўна ўключыцца ў прадукцыйную творчую дзейнасць.

Задачы вывучэння вучэбнага прадмета «Грамадазнаўства» ў XI класе:

- асваенне вучнямі ведаў пра лад, асноўныя галіны права, унутраную і знешнюю палітыку беларускай дзяржавы, глабальныя праблемы сучаснасці, пагрозы і выклікі сучаснага свету і шляхі процідзеяння негатыўным тэндэнцыям, якія неабходны для ўзаемадзеяння з сацыяльным асяроддзем і выканання найбольш важных сацыяльных роляў асобы;
- асваенне вучнямі спосабаў вучэбна-пазнавальнай і практычнай дзейнасці, неабходных для ўдзелу ў жыцці грамадства і прававой дзяржавы, якія дазваляюць эфектыўна дзейнічаць у розных жыццёвых сітуацыях;
- авалоданне вучнямі ўменнямі атрымліваць з разнастайных крыніц і крытычна асэнсоўваць інфармацыю, адэкватна інтэрпрэтаваць яе, сістэматызаваць, аналізаваць атрыманыя даныя;
- асваенне вучнямі вопыту прымянення набытых ведаў і ўменняў для вызначэння ўласнай пазіцыі ў грамадскім жыцці, рашэння вучэбна-пазнавальных і практычных задач, актыўнага ўдзелу ў будучым прафесійным і грамадскім жыцці, садзейнічання прававымі спосабамі і сродкамі абароне правапарадку ў грамадстве, развіцця міжасобасных адносін, уключаючы адносіны паміж людзьмі розных нацыянальнасцей і веравызнанняў, а таксама ў сямейна-бытавой сферы;
- развіццё палітычнай, прававой, эканамічнай культуры асобы ў адзінстве кампанентаў: веды, паводзіны і эмацыянальна-каштоўнаснае стаўленне; выхаванне грамадзянскасці, сацыяльнай адказнасці, прававой самасвядомасці, прыхільнасці да каштоўнасцей, замацаваных у Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

## Асобасныя, метапрадметныя і прадметныя вынікі асваення зместу вучэбнага прадмета «Грамадазнаўства»

**Асобаснымі** вынікамі вучняў XI класа пры асваенні зместу вучэбнага прадмета «Грамадазнаўства» з’яўляюцца:

- каштоўнасныя арыентацыі, якія заснаваны на ідэях патрыятызму, любові і павагі да Айчыны; разуменні неабходнасці

захавання грамадзянскага міру і згоды; адносінах да чалавека, яго правоў і свабод як да вышэйшай каштоўнасці; імкненні да захавання суверэнітэту і тэрытарыяльнай цэласнасці беларускай дзяржавы; прызнанні каштоўнасці сям'і і сямейных традыцый; усведамленні сваёй адказнасці за лёс краіны перад цяперашнім і будучым пакаленнямі;

- гатоўнасць і здольнасць да адукацыі, у тым ліку да самаадукацыі, на працягу ўсяго жыцця; свядомае стаўленне да бесперапыннай адукацыі як да ўмовы паспяховай прафесійнай і грамадскай дзейнасці;
- усвядомлены выбар будучай прафесіі і магчымасцей рэалізацыі ўласных жыццёвых планаў; стаўленне да прафесійнай дзейнасці як да магчымасці вырашэння асабістых, грамадскіх, дзяржаўных, агульнанацыянальных праблем;
- матывацыя і накіраванасць на актыўны і стваральны ўдзел у будучыні ў грамадскім і дзяржаўным жыцці;
- гатоўнасць жыць у полікультурным грамадстве: паважліва ставіцца да прадстаўнікоў іншых культур, весці дыялог з іншымі людзьмі, дасягаць узаемаразумення і знаходзіць агульныя мэты, канструктыўна супрацоўнічаць для іх дасягнення.

Да **метапрадметных** вынікаў вывучэння грамадазнаўства ў XI класе адносяцца:

- уменне свядома арганізоўваць сваю вучэбна-пазнавальную дзейнасць (ад пастаноўкі мэты да атрымання і ацэнкі выніку);
- уменне прадукцыйна ўзаемадзейнічаць з равеснікамі і дарослымі ў вучэбна-пазнавальнай, вучэбна-даследчай, грамадска карыснай, праектнай дзейнасці;
- гатоўнасць і здольнасць самастойна працаваць з рознымі крыніцамі інфармацыі, уключаючы ўменні: арыентавацца ў розных крыніцах інфармацыі; крытычна ацэньваць і інтэрпрэтаваць інфармацыю, атрыманую з розных крыніц; адрозніваць факты, аргументы, ацэначныя меркаванні; аддзяляць асноўную інфармацыю ад другараднай; перадаваць змест інфармацыі адэкватна пастаўленай мэце; пераводзіць інфармацыю з адной знакавай сістэмы ў іншую;
- уменне выкарыстоўваць сродкі інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій пры рашэнні вучэбна-пазнавальных, камуні-

катыўных і арганізацыйных задач з захаваннем прававых і этычных норм, норм інфармацыйнай бяспекі;
- уменне выкарыстоўваць розныя віды публічных выступленняў (даклад, паведамленне, выступленне) для прадстаўлення вынікаў вучэбна-пазнавальнай і творчай дзейнасці;
- навыкі пазнавальнай рэфлексіі: усведамленне вучэбных дзеянняў, якія выконваюцца, і працэсаў мыслення, іх вынікаў, меж сваіх ведаў і няведання, новых пазнавальных задач і сродкаў іх дасягнення.

**Прадметныя** вынікі асваення вучнямі XI класа зместу вучэбнага прадмета «Грамадазнаўства» ўстанаўліваюцца на базавым і павышаным узроўнях.

Прадметныя вынікі асваення вучнямі XI класа зместу вучэбнага прадмета «Грамадазнаўства» *на базавым узроўні* арыентаваны на забеспячэнне пераважна агульнаадукацыйнай і агульнакультурнай падрыхтоўкі.

Прадметнымі вынікамі вучняў XI класа, якія фарміруюцца пры асваенні зместу вучэбнага прадмета «Грамадазнаўства» *на базавым узроўні*, з’яўляюцца:
- уяўленні пра беларускую дзяржаву: асновы канстытуцыйнага ладу, прававую сістэму, унутраную і знешнюю палітыку;
- уяўленні пра асноўныя тэндэнцыі і перспектывы развіцця сучаснага беларускага грамадства, месца і ролю Беларусі ў цывілізацыйным працэсе;
- веданне асноўных паняццяў навук, якія з’яўляюцца крыніцамі фарміравання зместу адукацыі па вучэбным прадмеце;
- уменні характарызаваць, тлумачыць вывучаныя з’явы і працэсы, выкарыстоўваць раней засвоеныя веды, у тым ліку па іншых вучэбных прадметах, пры характарыстыцы вывучаемых з’яў і працэсаў;
- здольнасць і гатоўнасць прымяняць засвоеныя веды і ўменні для рашэння вучэбна-пазнавальных і практычных задач.

Прадметныя вынікі асваення вучнямі XI класа зместу вучэбнага прадмета «Грамадазнаўства» *на павышаным узроўні* арыентаваны на падрыхтоўку да наступнай прафесійнай адукацыі, забеспячэнне магчымасці далейшага паспяховага прафесійнага навучання, развіццё індывідуальных здольнасцей вучняў праз больш глыбокае асваенне ведаў і спосабаў дзейнасці, якія ўласцівы вучэбнаму прадмету.

Прадметныя вынікі вучняў XI класа, якія фарміруюцца пры асваенні зместу вучэбнага прадмета «Грамадазнаўства» *на павышаным узроўні*, уключаюць патрабаванні да вынікаў асваення зместу вучэбнага прадмета на базавым узроўні і дадаткова:

- сістэмныя веды пра прававую сістэму, задачы і асноўныя напрамкі ўнутранай і знешняй палітыкі беларускай дзяржавы, тэндэнцыі развіцця эканамічнай, палітычнай, сацыяльнай і духоўнай сфер беларускага грамадства, месцы і ролі Беларусі ў сучасных цывілізацыйных працэсах;
- уменне раскрываць сутнасць вывучаемых з'яў і працэсаў, выяўляць прычынна-выніковыя сувязі паміж імі;
- уменне самастойна аналізаваць, інтэрпрэтаваць даныя розных крыніц для рашэння вучэбна-пазнавальных і практычных задач; параўноўваць і ацэньваць розныя пункты гледжання па актуальных праблемах развіцця сучаснага беларускага грамадства і дзяржавы;
- вопыт прымянення засвоеных ведаў і ўменняў для ацэнкі розных сацыяльных, эканамічных і палітычных з'яў і працэсаў, фармулёўкі і аргументацыі ўласнага пункта гледжання па розных пытаннях развіцця беларускага грамадства і дзяржавы;
- уменне на аснове засвоеных ведаў вызначаць і абгрунтоўваць уласную лінію правамерных паводзін у розных сферах грамадскага жыцця.

Плануемыя вынікі асваення вучнямі зместу адукацыі па вучэбным прадмеце з'яўляюцца крытэрыяльнай асновай для ацэнкі вынікаў вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў.

Варта мець на ўвазе, што асобасныя вынікі асваення зместу вучэбнай праграмы, звязаныя з асобаснымі рысамі і светапогляднымі ўстаноўкамі вучняў, вызначаны як прагназуемыя і не падлягаюць прамежкавай і выніковай праверцы.

## Рэкамендаваныя формы і метады навучання і выхавання

Дасягненне пастаўленых мэт, паспяховае асваенне зместу вучэбнага прадмета «Грамадазнаўства» прадугледжвае выкарыстанне разнастайных сродкаў і метадаў навучання.

У працэсе выкладання грамадазнаўства ў XI класе рэкамендуецца выкарыстоўваць метады, якія дапамагаюць раскрыць і канкрэтызаваць вывучаемыя паняцці і тэарэтычныя палажэнні, звязаць вывучаемы вучэбны матэрыял з асабістым сацыяльным вопытам, з уласнымі назіраннямі вучняў.

Актывізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці вучняў у працэсе вывучэння грамадазнаўства будзе спрыяць выкарыстанне такіх метадаў, як дыскусія, семінар, практыкум, канферэнцыя, ролевая і дзелавая гульня, метад праектаў і інш. Асаблівай увагі патрабуе выкарыстанне ў адукацыйным працэсе камп'ютарных тэхналогій і праектных методык, пры гэтым важна разумець іх адукацыйныя магчымасці і выразна ўсведамляць межы іх прымянення, умець арганічна спалучаць гэтыя тэхналогіі з традыцыйнымі методыкамі.

Рэалізацыі практыка-арыентаванага падыходу да выкладання вучэбнага прадмета будзе спрыяць правядзенне ўрокаў-практыкумаў, на якіх рэкамендуецца арганізаваць рашэнне вучэбна-пазнавальных і практычных задач з выкарыстаннем розных крыніц сацыяльна-гуманітарнай інфармацыі. Акрамя вучэбнага дапаможніка па грамадазнаўстве, рэкамендуецца выкарыстоўваць нарматыўныя прававыя дакументы беларускай дзяржавы, навукова-папулярную і публіцыстычную літаратуру, матэрыялы электронных і друкаваных СМІ.

Пры вывучэнні вучэбнага прадмета «Грамадазнаўства» ў XI класе неабходна абапірацца на веды вучняў па іншых вучэбных прадметах: «Сусветная гісторыя», «Гісторыя Беларусі», «Геаграфія», «Беларуская літаратура», «Русская литература» і інш. З гэтай мэтай рэкамендуецца прапаноўваць вучням канкрэтызаваць вывучаемыя тэарэтычныя палажэнні гістарычнымі фактамі, статыстычнымі данымі і г. д. Рэалізацыі міжпрадметных сувязей будуць садзейнічаць таксама арганізацыя праектнай дзейнасці вучняў, рашэнне вучэбна-пазнавальных і практычных задач, якія патрабуюць прымянення ведаў па розных вучэбных прадметах.

## Вучэбна-метадычнае і матэрыяльна-тэхнічнае забеспячэнне адукацыйнага працэсу

Неабходнай умовай паспяховага вывучэння вучэбнага прадмета «Грамадазнаўства» з'яўляецца забеспячэнне адукацыйнага працэсу

сродкамі навучання. У вучэбным кабінеце грамадазнаўства мэтазгодна мець тэксты Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь, важнейшых міжнародных прававых дакументаў, заканадаўчых актаў Рэспублікі Беларусь; тэматычныя табліцы і іншыя сродкі нагляднасці.

У працэсе выкладання грамадазнаўства ў XI класе рэкамендуецца выкарыстоўваць увесь пералік кампанентаў вучэбна-метадычнага комплексу па вучэбным прадмеце, рэкамендаваных Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь.

У адукацыйным працэсе рэкамендуецца выкарыстаць таксама створаныя ў Нацыянальным інстытуце адукацыі электронныя адукацыйныя рэсурсы па вучэбным прадмеце «Грамадазнаўства» для XI класа (гл. adu.by/ Электроннае навучанне).

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА

## БЕЛАРУСКАЯ ДЗЯРЖАВА

### 70 гадзін, у тым ліку 2 гадзіны — рэзервовы час

### **Уводзіны** (2 гадзіны)

Змест і асаблівасці вывучэння вучэбнага прадмета «Грамадазнаўства» ў XI класе. Роля грамадазнаўчай адукацыі ў сацыялізацыі выпускнікоў устаноў агульнай сярэдняй адукацыі. Беларуская дзяржава: этапы развіцця, месца ў сучасным свеце. Асноўныя крыніцы інфармацыі пра сучаснае беларускае грамадства і дзяржаву.

### Раздзел 1
### **КАНСТЫТУЦЫЯ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ** (14 гадзін)

**Канстытуцыя — Асноўны Закон Рэспублікі Беларусь.** Канстытуцыя і яе месца ў нацыянальнай прававой сістэме. Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь — прававая аснова беларускай дзяржавы, яе ідэалогіі. Канстытуцыйнае развіццё Рэспублікі Беларусь на сучасным этапе. Забеспячэнне аховы і стабільнасці Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

**Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь і міжнародныя акты ў галіне правоў і свабод чалавека.** Усеагульная Дэкларацыя правоў чалавека — прававы ідэал сучаснасці. Рэалізацыя норм міжнароднага права ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

**Асновы канстытуцыйнага ладу Рэспублікі Беларусь.** Рэспубліка Беларусь — унітарная дэмакратычная сацыяльная прававая дзяржава. Народаўладдзе. Суверэнітэт. Вяршэнства права. Узаемасувязь дэмакратыі і актыўнай грамадзянскай пазіцыі асобы. Грамадзянскае грамадства ў Беларусі.

**Выбары і рэферэндумы.** Выбарчая сістэма Рэспублікі Беларусь. Выбарчы працэс, яго асноўныя стадыі. Рэферэндумы ў Рэспубліцы Беларусь.

**Органы дзяржаўнай улады Рэспублікі Беларусь.** Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь. Нацыянальны сход Рэспублікі Беларусь. Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь. Судовая ўлада.

**Мясцовае кіраванне і самакіраванне.** Сістэма органаў мясцовага кіравання і самакіравання. Парадак іх фарміравання і паўнамоцтвы.

**Канстытуцыйныя правы і абавязкі грамадзян.** Канстытуцыя і нацыянальнае заканадаўства ў галіне абароны правоў чалавека. Правы і свабоды чалавека ў Рэспубліцы Беларусь. Абавязкі грамадзян Рэспублікі Беларусь.

***Практыкум.* Грамадзянін і дзяржава: узаемныя правы і ўзаемныя абавязкі.** Узаемасувязь і ўзаемаабумоўленасць правоў і абавязкаў грамадзяніна Рэспублікі Беларусь. Канстытуцыйныя гарантыі правоў і свабод грамадзян Рэспублікі Беларусь.

***Падагульненне па раздзеле 1.*** Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь — адлюстраванне мэт, ідэалаў, прынцыпаў жыццядзейнасці беларускай дзяржавы.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вывучэнне зместу раздзела 1 — «Канстытуцыя Рэспублікі Беларусь» — на павышаным узроўні павінна быць накіравана на фарміраванне і ўдасканаленне наступных кампетэнцый вучняў:

*вызначаць* сутнасныя прыметы, даваць азначэнні паняццям: выбары, грамадзянін, грамадзянства, грамадзянскае грамадства, ідэалогія беларускай дзяржавы, выбарчая сістэма, канстытуцыя, мясцовае кіраванне, мясцовае самакіраванне, Нацыянальны сход,

Палата прадстаўнікоў, Савет Рэспублікі, Прэзідэнт, суверэнітэт, Савет Міністраў, судовая ўлада, рэферэндум;

правільна *ўжываць* вывучаныя паняцці пры характарыстыцы канстытуцыйнага ладу Рэспублікі Беларусь;

*характарызаваць:*

- месца Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь у нацыянальнай прававой сістэме і яе юрыдычныя ўласцівасці;
- спосабы прыняцця канстытуцыі;
- этапы канстытуцыйнага развіцця Рэспублікі Беларусь; змяненні, унесеныя ў Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь па выніках рэспубліканскіх рэферэндумаў 1995, 1996, 2004 гг.;
- асновы канстытуцыйнага ладу беларускай дзяржавы;
- формы народаўладдзя ў Рэспубліцы Беларусь;
- прынцыпы і стадыі выбарчага працэсу ў Рэспубліцы Беларусь;
- прынцыпы выбарчага права ў Рэспубліцы Беларусь;
- умовы рэалізацыі правоў выбіраць і быць выбраным у Рэспубліцы Беларусь;
- віды рэферэндуму;
- парадак фарміравання і паўнамоцтвы органаў дзяржаўнай улады Рэспублікі Беларусь;
- парадак фарміравання і паўнамоцтвы органаў мясцовага кіравання і самакіравання;
- дзяржаўныя сімвалы Рэспублікі Беларусь;
- стадыі заканадаўчага працэсу ў Рэспубліцы Беларусь;

*называць:*

- меры па забеспячэнні стабільнасці і цэласнасці Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь;
- асноўныя міжнародныя акты ў галіне правоў і свабод чалавека;
- акты беларускага заканадаўства ў галіне абароны правоў чалавека;
- канстытуцыйныя правы і свабоды грамадзян Рэспублікі Беларусь і іх канстытуцыйныя гарантыі;
- канстытуцыйныя абавязкі грамадзян Рэспублікі Беларусь;

*разумець і тлумачыць:*

- сутнасць характарыстык беларускай дзяржавы: суверэнная, унітарная, дэмакратычная, сацыяльная, прававая;

- ♦ сутнасць прынцыпаў плюралізму, вяршэнства права, падзелу ўлад, як яны рэалізуюцца ў Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь;
- ♦ узаемасувязь правоў і абавязкаў грамадзяніна Рэспублікі Беларусь;
- ♦ сутнасць паняццяў: грамадзянская культура чалавека, актыўная грамадзянская пазіцыя асобы;

*выбіраць* з крыніц, створаных у розных знакавых сістэмах (тэкст, табліца, графік, дыяграма і інш.), інфармацыю, неабходную для характарыстыкі канстытуцыйнага ладу Рэспублікі Беларусь, пераўтвараць яе і выкарыстоўваць для рашэння вучэбна-пазнавальных і практычных задач (падрыхтоўкі паведамленняў, эсэ, канкрэтызацыі тэарэтычных вывадаў прыкладамі і інш.);

*працаваць* з тэкстамі нарматыўных прававых дакументаў Рэспублікі Беларусь, матэрыяламі перыядычнага друку;

*прадстаўляць* інфармацыю ў розных знакавых сістэмах (тэкст, табліца, схема і інш.);

*будаваць* мадэль правамерных паводзін, заснаваных на павазе да закона і правапарадку, прыхільнасці каштоўнасцям, замацаваным у Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь.

## Раздзел 2
## АСНОВЫ ПРАВА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ (16 гадзін)

**Асновы грамадзянскага права.** Грамадзянскае права і суб'екты грамадзянска-прававых адносін. Галіна прымянення грамадзянскага права. Асаблівасці Грамадзянскага кодэкса Рэспублікі Беларусь. Грамадзянская праваздольнасць і дзеяздольнасць. Грамадзянская дзеяздольнасць непаўналетніх.

**Асновы працоўнага права.** Прававы механізм працаўладкавання. Правы і абавязкі наймальніка і работніка. Працоўны час і час адпачынку. Аплата працы і яе асаблівасці для непаўналетніх. Працоўная дысцыпліна. Парадак спынення працоўнага дагавора. Сфера прымянення працоўнага права. Працоўны кодэкс Рэспублікі Беларусь.

**Асновы адміністрацыйнага права.** Паняцце адміністрацыйнага права. Суб'екты адміністрацыйна-прававых адносін. Правамерныя паводзіны і адміністрацыйнае правапарушэнне (правіннасць). Віды адміністрацыйных спагнанняў. Абставіны, якія абцяжваюць ад-

казнасць за адміністрацыйную правіннасць. Сфера прымянення адміністрацыйнага права. Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях.

**Асновы сямейнага права.** Заключэнне і скасаванне шлюбу. Правы і абавязкі мужа і жонкі. Правы і абавязкі бацькоў і дзяцей. Сфера прымянення сямейнага права. Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб шлюбе і сям'і.

**Асновы крымінальнага права.** Абставіны, якія выключаюць крымінальную адказнасць. Неабходная абарона. Абставіны, якія абцяжваюць крымінальную адказнасць. Пакаранне, яго мэта і віды. Адказнасць непаўналетніх за крымінальныя правапарушэнні. Сфера прымянення крымінальнага права. Крымінальны кодэкс Рэспублікі Беларусь.

**Праваахоўныя органы ў Рэспубліцы Беларусь.** Асноўныя задачы праваахоўных органаў Рэспублікі Беларусь. Суд. Судовая сістэма. Пракуратура. Натарыят. Органы юстыцыі. Органы дзяржаўнага кантролю. Органы дзяржаўнай бяспекі. Органы ўнутраных спраў.

**Прафесіі ў юрыдычнай сферы.** Абарона справядлівасці і законнасці як прафесія. Прафесійныя і асабістыя патрабаванні да юрыстаў. Установы адукацыі Рэспублікі Беларусь, дзе можна атрымаць юрыдычную прафесію. Запатрабаванасць спецыялістаў з юрыдычнымі прафесіямі на рынку працы.

***Практыкум.*** **Моладзь і права.** Прававая культура моладзі: веданне прававых норм, павага да закона і правапарадку, правамерныя паводзіны. Прававы нігілізм.

***Падагульненне па раздзеле 2.*** Роля права ў забеспячэнні ўстойлівага развіцця беларускага грамадства і дзяржавы.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вывучэнне зместу раздзела 2 — «Асновы права Рэспублікі Беларусь» — на павышаным узроўні павінна быць накіравана на фарміраванне і ўдасканаленне наступных кампетэнцый вучняў:

*вызначаць* сутнасныя прыметы, даваць азначэнні паняццям: адміністрацыйнае права, грамадзянскае права, дзеяздольнасць, неабходная абарона, пакаранне, права, правапарушэнне, злачынства,

праваздольнасць, прававая культура, сямейнае права, працоўны дагавор, працоўнае права, крымінальнае права, фізічная асоба, юрыдычная асоба, юрыдычная адказнасць;

правільна *ўжываць* вывучаныя паняцці, засвоеныя веды аб прававых нормах пры рашэнні вучэбна-пазнавальных і практычных задач;

*характарызаваць:*

- галіну прымянення прававых адносін: грамадзянскага, працоўнага, сямейнага, адміністрацыйнага, крымінальнага права;
- прынцыпы грамадзянска-прававых адносін, замацаваныя ў Грамадзянскім кодэксе Рэспублікі Беларусь;
- асаблівасці грамадзянскай праваздольнасці і дзеяздольнасці непаўналетніх;
- нормы працоўнага права, якія рэгулююць працоўны час, час адпачынку, аплату працы работніка;
- прававы механізм працаўладкавання і спынення працоўнага дагавора;
- правы і абавязкі работнікаў і наймальнікаў;
- асаблівасці працаўладкавання, аплаты працы і адпачынку непаўналетніх;
- прававы механізм заключэння і скасавання шлюбу;
- асабістыя немаёмасныя і маёмасныя правы і абавязкі мужа і жонкі;
- правы і абавязкі бацькоў і дзяцей;
- прыметы адміністрацыйнага правапарушэння;
- віды адміністрацыйных спагнанняў;
- абставіны, якія абцяжваюць адміністрацыйную і крымінальную адказнасць;
- асаблівасці юрыдычнай адказнасці непаўналетніх;
- асноўныя віды пакаранняў за крымінальныя правапарушэнні;
- абставіны, якія выключаюць крымінальную адказнасць;
- асноўныя задачы праваахоўных органаў Рэспублікі Беларусь;

правільна *вызначаць* праваахоўны орган, у які трэба звярнуцца для вырашэння той ці іншай прававой сітуацыі;

*выбіраць* з крыніц, створаных у розных знакавых сістэмах (тэкст, табліца, графік, дыяграма і інш.), неабходную прававую інфармацыю, пераўтвараць яе і выкарыстоўваць для рашэння

вучэбна-пазнавальных і практычных задач (падрыхтоўкі паведамленняў, эсэ, канкрэтызацыі тэарэтычных вывадаў прыкладамі і інш.);

*працаваць* з тэкстамі прававых дакументаў Рэспублікі Беларусь, матэрыяламі перыядычнага друку;

*прадстаўляць* інфармацыю ў розных знакавых сістэмах (тэкст, табліца, схема і інш.);

*будаваць* мадэль правамерных паводзін, заснаваных на павазе да закона і правапарадку.

## Раздзел 3
## АСНОЎНЫЯ НАПРАМКІ ПАЛІТЫКІ БЕЛАРУСКАЙ ДЗЯРЖАВЫ (18 гадзін)

**Сацыяльны партрэт Беларусі.** Сацыяльны і нацыянальны склад насельніцтва краіны, рэгіёна. Якасць і ўзровень жыцця насельніцтва. Сацыяльная абарона насельніцтва. Дэмаграфічная сітуацыя ў Беларусі, рэгіёне. Дэмаграфічная палітыка беларускай дзяржавы. Нацыянальная праграма дэмаграфічнай бяспекі Рэспублікі Беларусь. Гендэрная палітыка беларускай дзяржавы. Прафесіі, запатрабаваныя ў рэгіёне.

**Сацыяльна-эканамічнае развіццё.** Асноўныя паказчыкі нацыянальнай эканомікі. Сацыяльна арыентаваная рыначная эканоміка. Прыярытэты сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь, рэгіёна. Фактары ўстойлівага развіцця Рэспублікі Беларусь.

**Інавацыйнае развіццё краіны.** Навуковы патэнцыял Рэспублікі Беларусь. Сутнасць інавацыйнага шляху развіцця. Асноўныя напрамкі інавацыйнага развіцця Рэспублікі Беларусь, рэгіёна. Высокія тэхналогіі. Энергазберажэнне.

**Рэгіянальная, аграрная і галіновая палітыка.** Прыярытэтныя напрамкі рэгіянальнай і аграрнай палітыкі беларускай дзяржавы. Асноўныя задачы развіцця рэгіёнаў. Развіццё малых і сярэдніх гарадоў. Дзяржаўная праграма адраджэння беларускай вёскі. «Мясцовыя павесткі». Асноўныя напрамкі прамысловага, аграрнага, сацыякультурнага развіцця рэгіёна.

**Нацыянальная і канфесіянальная палітыка.** Нацыянальная палітыка ў Рэспубліцы Беларусь. Беларускае заканадаўства ў сферы нацыянальных і канфесіянальных адносін. Свабода сумлення і ве-

равызнання ў Рэспубліцы Беларусь. Уклад прадстаўнікоў розных нацыянальнасцей і канфесій у сацыяльнае і духоўнае развіццё рэгіёна. Беларусь — краіна міжнацыянальнай і міжканфесіянальнай згоды.

**Развіццё культуры і ўмацаванне здароўя нацыі.** Палітыка беларускай дзяржавы ў галіне культуры. Палітыка беларускай дзяржавы ў галіне аховы здароўя. Фізічная культура і спорт. Развіццё культуры, аховы здароўя і спорту ў рэгіёне.

**Сродкі масавай інфармацыі і развіццё інфармацыйнай культуры.** Сродкі масавай інфармацыі ў Беларусі. Роля сродкаў масавай інфармацыі ў палітычным, культурным жыцці краіны, рэгіёна. Інфармацыйная і медыйная культура насельніцтва.

**Маладзёжная палітыка.** Неабходнасць дзяржаўнай маладзёжнай палітыкі. Адукацыя, працаўладкаванне, занятасць, ахова здароўя — прыярытэты маладзёжнай палітыкі беларускай дзяржавы. Дзяржаўная падтрымка таленавітай моладзі.

***Практыкум.*** **Роля моладзі ў станаўленні моцнай і квітнеючай Беларусі.** Умовы актыўнага ўключэння моладзі ў жыццё грамадства. Удзел моладзі ў грамадскім жыцці краіны, рэгіёна. Дзейнасць дзіцячых і маладзёжных аб’яднанняў.

***Падагульненне па раздзеле 3.*** Асноўныя напрамкі ўнутранай палітыкі беларускай дзяржавы ў XXI ст.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вывучэнне зместу раздзела 3 — «Асноўныя напрамкі палітыкі беларускай дзяржавы» — на павышаным узроўні павінна быць накіравана на фарміраванне і ўдасканаленне наступных кампетэнцый вучняў:

*вызначаць* сутнасныя прыметы, даваць азначэнні паняццям: бюджэт пражытачнага мінімуму, валавы ўнутраны прадукт, дэмаграфічная бяспека, інавацыя, інавацыйнае развіццё, мінімальны спажывецкі бюджэт, свабода сумлення, свабода веравызнання, сацыяльная абарона, сацыяльна арыентаваная рынычная эканоміка, сацыяльныя стандарты, устойлівае развіццё;

правільна *ўжываць* вывучаныя паняцці пры рашэнні вучэбна-пазнавальных і практычных задач;

*характарызаваць:*

- ♦ сацыяльны склад насельніцтва Беларусі і рэгіёна, у якім пражываюць вучні;
- ♦ дэмаграфічную сітуацыю ў Беларусі і рэгіёне, у якім пражываюць вучні;
- ♦ задачы і асноўныя напрамкі дэмаграфічнай, гендарнай, сацыяльнай, эканамічнай, рэгіянальнай, нацыянальнай, канфесіянальнай, маладзёжнай палітыкі беларускай дзяржавы; палітыкі ў сферы культуры, аховы здароўя, фізічнай культуры і спорту;
- ♦ магчымыя шляхі вырашэння дэмаграфічных, гендарных праблем у Рэспубліцы Беларусь;
- ♦ прыярытэтныя напрамкі сацыяльна-эканамічнага развіцця Рэспублікі Беларусь (рэгіёна) на сучасным этапе (у XXI ст.);
- ♦ асноўныя напрамкі інавацыйнага развіцця Рэспублікі Беларусь, рэгіёна, у якім пражываюць вучні;
- ♦ асноўныя напрамкі прамысловага, аграрнага, сацыякультурнага развіцця рэгіёна, у якім пражываюць вучні;
- ♦ фактары, якія забяспечваюць міжнацыянальную і міжканфесіянальную згоду ў Беларусі;
- ♦ дасягненні сацыяльнага, эканамічнага, навуковага, культурнага развіцця Беларусі (рэгіёна) у XXI ст.;
- ♦ ролю моладзі ў сучасным беларускім грамадстве, рэалізацыі дзяржаўнай палітыкі;

*фармуляваць і аргументаваць* свой пункт гледжання па вывучаемых пытаннях;

*выкарыстоўваць:*

- ♦ статыстычныя даныя для характарыстыкі развіцця сучаснага беларускага грамадства, унутранай палітыкі беларускай дзяржавы;
- ♦ раней засвоеныя веды, у тым ліку па іншых вучэбных прадметах, пры характарыстыцы ўнутранай палітыкі беларускай дзяржавы;

*працаваць* з тэкстамі нарматыўных прававых дакументаў Рэспублікі Беларусь, матэрыяламі перыядычнага друку; выбіраць з крыніц, створаных у розных знакавых сістэмах (тэкст, табліца, графік, дыяграма і інш.), інфармацыю пра развіццё беларускага грамадства і дзяржавы, пераўтвараць яе і выкарыстоўваць для

рашэння вучэбна-пазнавальных і практычных задач (падрыхтоўкі паведамленняў, прэзентацый, эсэ, канкрэтызацыі тэарэтычных вывадаў прыкладамі і інш.);

*арыентавацца* ў патоку інфармацыі, якая адносіцца да пытанняў унутранай палітыкі беларускай дзяржавы (адрозніваць факты і меркаванні), разумець і інтэрпрэтаваць інфармацыю, што атрымліваецца з розных крыніц;

*суадносіць* розныя ацэнкі вывучаемых падзей і працэсаў і рабіць абгрунтаваныя вывады;

*прадстаўляць* інфармацыю ў розных знакавых сістэмах (тэкст, табліца, схема і інш.).

## Раздзел 4
## БЕЛАРУСЬ У СУЧАСНЫМ СВЕЦЕ (16 гадзін)

**Аблічча сучаснага свету.** Разнастайнасць сучаснага свету. Прычыны супярэчнасцей у сучасным свеце. Фактары разнастайнасці сучаснага свету. Геапалітычнае становішча Рэспублікі Беларусь.

**Сістэма міжнародных адносін.** Паняцце і віды міжнародных адносін. Міжнародныя арганізацыі. Міжнароднае супрацоўніцтва. Рэспубліка Беларусь у сістэме сучасных міжнародных адносін.

**Нацыянальная бяспека і нацыянальныя інтарэсы беларускай дзяржавы.** Нацыянальныя інтарэсы беларускай дзяржавы: шляхі і сродкі іх рэалізацыі. Сутнасць нацыянальнай бяспекі. Шляхі забеспячэння нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь.

**Удзел Рэспублікі Беларусь у вырашэнні глабальных праблем.** Роля Беларусі ў рэалізацыі мэт устойлівага развіцця. Удзел Беларусі ў рэалізацыі міжнародных праектаў па вырашэнні глабальных праблем.

**Гарызонты інфармацыйнага грамадства.** Паняцце інфармацыйнага грамадства. Тэхналагічныя ўклады. Канцэпцыя постындустрыяльнага (інфармацыйнага) грамадства. Змяненні ў сацыяльнай, эканамічнай, палітычнай, духоўнай сферах у працэсе станаўлення інфармацыйнага грамадства. Перспектывы развіцця Беларусі ва ўмовах інфармацыйнага грамадства.

**Узаемадзеянне краін і народаў ва ўмовах глабалізацыі.** Паняцце глабалізацыі. Супярэчлівы характар наступстваў глабалізацыі. Антыглабалізм. Беларусь у сістэме глабалізацыйных працэсаў.

**Будучыня чалавецтва.** Сучасныя цывілізацыі і перспектывы іх развіцця. Фактары развіцця сучасных цывілізацый. Задачы гуманізацыі грамадскага жыцця. Футуралагічныя прагнозы. Напрамкі інтэграцыі Рэспублікі Беларусь у сусветную супольнасць.

***Практыкум.* Стратэгічныя напрамкі развіцця Рэспублікі Беларусь у XXI ст.** Мэты ўстойлівага развіцця Рэспублікі Беларусь на сучасным этапе. Дасягненні Беларусі ў эканамічнай, палітычнай, духоўнай і сацыяльнай сферах.

***Падагульненне па раздзеле 4.*** Месца і роля Беларусі ў цывілізацыйным працэсе.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вывучэнне зместу раздзела 4 — «Беларусь у сучасным свеце» — на павышаным узроўні павінна быць накіравана на фарміраванне і ўдасканаленне наступных кампетэнцый вучняў:

*вызначаць* сутнасныя прыметы, даваць азначэнні паняццям: антыглабалізм, глабалізацыя, глабальныя праблемы, геапалітыка, інфармацыйнае грамадства, інфармацыйная бяспека, міжнародныя адносіны, нацыянальная бяспека, тэхналагічны ўклад, цывілізацыя;

правільна *ўжываць* вывучаныя паняцці пры рашэнні вучэбна-пазнавальных і практычных задач;

*характарызаваць:*

- фактары, якія вызначаюць разнастайнасць сучаснага свету;
- геапалітычнае становішча Рэспублікі Беларусь;
- асаблівасці развіцця Рэспублікі Беларусь, якія абумоўлены яе геапалітычным становішчам;
- месца і ролю Рэспублікі Беларусь у сістэме сучасных міжнародных адносін;
- сучасныя крызісныя працэсы (міграцыйны, каштоўнасны, эканамічны і інш.), знешнія і ўнутраныя пагрозы, якім можа падвергнуцца Рэспубліка Беларусь;
- прынцыпы і напрамкі знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь;
- нацыянальна-дзяржаўныя інтарэсы Рэспублікі Беларусь;
- сродкі міжнароднага супрацоўніцтва;

- прыметы, тыпы, прычыны глабальных праблем;
- ролю чалавека ў інфармацыйным грамадстве;
- змяненні, якія адбываюцца ў эканамічнай, палітычнай, сацыяльнай і духоўнай сферах інфармацыйнага грамадства;
- перспектывы развіцця Беларусі ва ўмовах інфармацыйнага грамадства;
- магчымыя шляхі забеспячэння інфармацыйнай бяспекі;
- праяўленні глабалізацыі ў сучасным свеце;
- фактары, якія абумоўліваюць глабалізацыю;
- наступствы глабалізацыі;
- асноўныя тэндэнцыі і супярэчнасці ў развіцці сучасных цывілізацый;
- месца і ролю Беларусі ў цывілізацыйным працэсе;
- дасягненні суверэннай Беларусі;
- асноўныя напрамкі і ўмовы інтэграцыі Беларусі ў сусветную супольнасць;
- стратэгічныя напрамкі развіцця Рэспублікі Беларусь у XXI ст.;

*называць* міжнародныя арганізацыі і міждзяржаўныя аб'яднанні, у якія ўваходзіць Рэспубліка Беларусь;

*разумець і тлумачыць:*
- магчымыя шляхі вырашэння сучасных глабальных праблем;
- ролю НТП у развіцці сучасных цывілізацый;

*канкрэтызаваць* прыкладамі вывады:
- пра разнастайнасць сучаснага свету;
- шматвектарную знешнюю палітыку беларускай дзяржавы;

*фармуляваць і аргументаваць* свой пункт гледжання па вывучаемых пытаннях;

*абагульняць* вывучаныя з'явы і працэсы, фармуляваць вывады пра тэндэнцыі ў развіцці сучаснага грамадства;

*выбіраць* з крыніц, створаных у розных знакавых сістэмах (тэкст, табліца, графік, дыяграма і інш.), інфармацыю пра сучасныя цывілізацыйныя працэсы, месца і ролю Беларусі ў іх, пераўтвараць яе і выкарыстоўваць для рашэння вучэбна-пазнавальных і практычных задач (падрыхтоўкі паведамленняў, прэзентацыі, эсэ, канкрэтызацыі тэарэтычных вывадаў прыкладамі і інш.);

*арыентавацца* ў патоку інфармацыі, якая адносіцца да пытанняў развіцця сучаснага грамадства і знешняй палітыкі беларускай дзяржавы (адрозніваць факты і меркаванні), разумець і інтэрпрэтаваць інфармацыю, якая атрымліваецца з розных крыніц;

*суадносіць* розныя ацэнкі вывучаемых падзей і працэсаў і рабіць абгрунтаваныя вывады;

*прадстаўляць* інфармацыю ў розных знакавых сістэмах (тэкст, табліца, схема і інш.);

*выкарыстоўваць:*

- раней засвоеныя веды, у тым ліку па іншых вучэбных прадметах, пры характарыстыцы месца і ролі Беларусі ў сучасным свеце;
- элементы прычынна-выніковага аналізу пры характарыстыцы тэндэнцый у развіцці сучаснага грамадства.

## **Выніковае падагульненне** (2 гадзіны)

# ГЕАГРАФІЯ

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Праграма прызначана для вывучэння вучэбнага прадмета «Геаграфія» ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі на павышаным узроўні.

**Сусветная гаспадарка і глабальныя праблемы чалавецтва (XI клас)** — заключны абагульняльны раздзел геаграфічнага зместу ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі, які інтэгруе веды геаграфічных навук для аналізу ўзаемадзеяння і ўзаемаабумоўленасці прыроднага асяроддзя, чалавека і грамадства, прасторава-часавых заканамернасцей іх дынамікі і эвалюцыі, пазнання законаў тэрытарыяльнай арганізацыі прыроды і чалавечага грамадства.

Геаграфічная навука выйшла на якасна новы ўзровень свайго развіцця, абумоўлены ўзрослым значэннем геаграфіі ў разуменні складаных прыродных, сацыяльна-эканамічных і дэмаграфічных працэсаў, якія адбываюцца на нашай планеце, у аптымізацыі выкарыстання яе прасторы і засваенні рэсурсаў, асэнсаванні будучыні Зямлі і магчымасці развіцця чалавечага грамадства з яго запытамі, якія пастаянна павялічваюцца.

**Мэта** вучэбнага прадмета заключаецца ў фарміраванні ведаў пра геаграфічныя аспекты глабальных праблем чалавецтва і магчымыя шляхі іх пераадолення на аснове разумення дынамікі развіцця сусветнай гаспадаркі на розных прасторавых узроўнях. Вывучэнне геаграфіі на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі павышанага ўзроўню заклікана фарміраваць у вучняў веды: пра сусветную гаспадарку і фактары яе развіцця; сутнасць і наступствы глабалізацыі, змяненні на палітычнай карце свету; сучасныя тэндэнцыі развіцця геаграфічнай абалонкі; найбольш актуальныя геаэкалагічныя і сацыяльна-эканамічныя праблемы, якія ўзнікаюць у геаграфічнай прасторы; сутнасць праблем прыродакарыстання і

ўстойлівага развіцця як асновы гарманічнага развіцця грамадства і прыроды.

Асноўныя **задачы** — фарміраванне ў вучняў з дапамогай геаграфічных ведаў:

- разумення фактараў развіцця сусветнай гаспадаркі, умення тлумачыць іх уплыў на геаграфію галін і відаў эканамічнай дзейнасці;
- умення характарызаваць сучасную структуру, дынаміку развіцця сусветнай гаспадаркі і заканамернасці геаграфіі сельскай гаспадаркі, прамысловасці і сферы паслуг;
- умення вызначаць значэнне і магчымасці геаграфіі ў вырашэнні глабальных праблем чалавецтва;
- разумення сутнасці геаэкалагічных праблем геаграфічнай абалонкі, заканамернасцей іх праяўлення і магчымых шляхоў вырашэння на глабальным, рэгіянальным і лакальным узроўнях;
- уменняў вызначаць заканамернасці фарміравання, тэндэнцыі развіцця і магчымыя напрамкі вырашэння сацыяльна-эканамічных праблем чалавецтва на розным тэрытарыяльным узроўні;
- разумення важнасці і значнасці комплекснага геаграфічнага падыходу да вывучаемых з'яў, базавых геаэкалагічных прынцыпаў, правіл, законаў прыродакарыстання і аховы навакольнага асяроддзя;
- уменняў вылучаць геаграфічныя аспекты глабальных мадэлей развіцця свету, стратэгіі ўстойлівага развіцця чалавецтва і Рэспублікі Беларусь.

Павышаны ўзровень вывучэння геаграфіі прадугледжвае засваенне вучнямі абавязковага зместу праграмы ў адпаведнасці з патрабаваннямі адукацыйнага стандарту па вучэбным прадмеце «Геаграфія» да ўзроўню падрыхтоўкі вучняў. Павышаны ўзровень забяспечвае развіццё асобы вучня сродкамі геаграфіі, спрыяе фарміраванню геаграфічнага светапогляду, каштоўнасна-сэнсавых установак, гатоўнасці і здольнасці да самаразвіцця, асобаснага і прафесійнага самавызначэння.

Ключавыя падыходы пабудовы зместу:

- *комплексны геаграфічны*, які спалучае пры вывучэнні тэрыторыі (малога арэала і населенага пункта, раёна, краіны,

аб'яднання краін, кантынента, тэрытарыяльнай сістэмы) наступныя патрабаванні: улік прасторы, часу і агульных індывідуальных асаблівасцей; абагульненне ведаў пра сучасную структуру, дынаміку развіцця сусветнай гаспадаркі і заканамернасці геаграфіі сельскай гаспадаркі, прамысловасці і сферы паслуг, асноўныя фактары развіцця сусветнай гаспадаркі, іх уплыў на геаграфію галін і відаў эканамічнай дзейнасці; вызначэнне заканамернасцей фарміравання, тэндэнцый развіцця і магчымых напрамкаў вырашэння сацыяльна-эканамічных праблем чалавецтва на розным тэрытарыяльным узроўні;

- *культуралагічны*, які дазваляе разгледзець геаграфічнае асяроддзе праз прызму культуры, вызначыць уплыў чалавека на прыроду, развіваць духоўнасць і гуманістычныя якасці асобы вучня;
- *гуманітарна-экалагічны падыход*, які дазваляе пазнаць сукупнасць поглядаў і дзеянняў, якія выяўляюцца ў павазе годнасці і правоў чалавека, яго каштоўнасці як асобы, клопаце пра дабро людзей, усебаковае развіццё, стварэнні спрыяльных для чалавека ўмоў жыццядзейнасці з улікам экалагічных абмежаванняў;
- *кампетэнтнасны*, які арыентуе вучняў на вынік навучання, фарміраванне здольнасцей вучня для выкарыстання ведаў, уменняў і прымянення вопыту дзейнасці ў розных сітуацыях.

Вучэбная праграма ўключае 2 раздзелы і 15 тэм. Вывучэнне тэарэтычнага матэрыялу з выкананнем практычных работ разлічана на 105 вучэбных гадзін (3 гадзіны на тыдзень). Выніковыя практычныя работы пазначаны зорачкай. У праграме прадугледжаны рэзерв часу. Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў прадстаўлены з улікам іх змястоўнай вобласці і ўзроставых фізіялагічных асаблівасцей. Навыкі вызначаны на аснове дзейнаснага падыходу і выяўляюць гатоўнасць да пэўнага віду дзейнасці, у працэсе якога вучні павінны будуць прымяніць засвоеныя веды і ўменні.

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў складаюцца з трох кампанентаў:

- *ведавага* (веды);
- *практычнага* (уменні);
- *аперацыйнага* (навыкі).

Фарміраванне ведаў, уменняў і навыкаў забяспечвае павышаны ўзровень засваення абавязковага зместу і мае на ўвазе магчымасць працягу адукацыі, а таксама здольнасць самаарганізацыі з мэтай рашэння вучэбных і практычных задач. Вучэбная праграма грунтуецца на выкарыстанні геаграфічнай наменклатуры, якая засвоена вучнямі ў VI—X класах. У раздзеле I — «Геаграфія сусветнай гаспадаркі» — вывучэнне геаграфічнай наменклатуры праходзіць на аснове міжнароднай статыстыкі вядучых галіновых арганізацый і ТНК за 2010—2014 гг. у разрэзе вядучых краін па асобных галінах і відах эканамічнай дзейнасці. У раздзеле II — «Глабальныя праблемы чалавецтва» — разглядаюцца геаэкалагічныя праблемы геаграфічнай абалонкі Зямлі і магчымасці геаграфіі ў іх вырашэнні. Вывучэнне глабальных сацыяльна-эканамічных праблем чалавецтва грунтуецца на навуковых асновах стратэгіі ўстойлівага развіцця.

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА

**(105 гадзін)**

### **Уводзіны** (1 гадзіна)

Сусветная гаспадарка як аснова развіцця чалавечай цывілізацыі. Глабальныя праблемы чалавецтва і роля геаграфіі ў іх вырашэнні. Асаблівасці геаграфічнага падыходу да вывучэння глабальных праблем.

### **РАЗДЗЕЛ I. ГЕАГРАФІЯ СУСВЕТНАЙ ГАСПАДАРКІ** (49 гадзін)

#### **Т э м а 1. Структура і фактары развіцця сусветнай гаспадаркі** (9 гадзін)

Сусветная гаспадарка як глабальная геаграфічная сістэма. Паказчыкі развіцця сусветнай гаспадаркі. Асноўныя мадэлі развіцця сусветнай гаспадаркі. Дынаміка прасторавай структуры сусветнай гаспадаркі.

Сучасная структура сусветнай гаспадаркі: сектаральная, галіновая, тэрытарыяльная. Галіны і віды эканамічнай дзейнасці ў сусветнай гаспадарцы.

Тэндэнцыі развіцця сусветнай гаспадаркі ў XXI ст. Засваенне геаграфічнай прасторы. Узмацненне эканамічнага ўзаемадзеяння і ўзаемазалежнасці краін свету. Павелічэнне разрыву паміж дзяржавамі па ўзроўню сацыяльна-эканамічнага развіцця. Фарміраванне цэнтраў сусветнай гаспадаркі.

Міжнародны геаграфічны падзел працы (МГПП). Уклад М. М. Баранскага, І. А. Вітвера, Ю. Г. Саушкіна ў развіццё тэорыі МГПП. Тэрытарыяльны і міжнародны падзел працы. Фактары міжнароднага геаграфічнага падзелу працы. Гістарычныя тыпы і прасторавыя ўзроўні МГПП.

Міжнародная спецыялізацыя і кааператанне. Разнавіднасці міжнароднай спецыялізацыі і кааперавання вытворчасці (па класіфікацыі ЮНІДА). Найноўшыя змяненні ў міжнародным падзеле працы. Міжнародная спецыялізацыя краін свету.

Інтэрнацыяналізацыя і транснацыяналізацыя сусветнай гаспадаркі. Перадумовы і сутнасць працэсу інтэрнацыяналізацыі сусветнай гаспадаркі. Паказчыкі далучэння краіны да працэсу інтэрнацыяналізацыі: экспартная квота, імпартная квота, знешнегандлёвая квота.

Транснацыяналізацыя сусветнай гаспадаркі. Перадумовы і гісторыя фарміравання. Разнавіднасці транснацыянальных кампаній (ТНК) па месцы размяшчэння, відзе дзейнасці, колькасці краін-гаспадароў, колькасці галін спецыялізацыі. Рэгіянальная і галіновая структура ТНК. Нацыянальная прыналежнасць і галіновая спецыялізацыя буйнейшых ТНК свету.

***Практычныя работы***

1. Вызначэнне фактараў міжнароднага геаграфічнага падзелу працы краін свету (на прыкладзе аднаго рэгіёна свету).

2*. Параўнальная характарыстыка буйнейшых ТНК свету (на прыкладзе трох кампаній на выбар).

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучням неабходна:

***ведаць:***

асноўныя этапы развіцця геаграфіі сусветнай гаспадаркі; паказчыкі развіцця сусветнай гаспадаркі; асноўныя мадэлі развіцця сусветнай гаспадаркі; прасторавыя ўзроўні міжнароднага геаграфічнага падзелу працы, асноўныя формы падзелу працы; перадумовы працэсу інтэрнацыяналізацыі, фактары транснацыяналізацыі, вядучыя ТНК свету;

*асноўныя паняцці:* галіновая структура сусветнай гаспадаркі, тэрытарыяльная структура сусветнай гаспадаркі, міжнародны геаграфічны падзел працы, спецыялізацыя, каапераванне, інтэрнацыяналізацыя сусветнай гаспадаркі, транснацыяналізацыя, транснацыянальная кампанія;

***умець:***

*характарызаваць* мадэлі развіцця сусветнай гаспадаркі, структуру сусветнай гаспадаркі, фактары міжнароднага геаграфічнага падзелу працы, гістарычныя тыпы МГПП, ТНК;

*паказваць* на карце пяць буйнейшых ТНК свету і іх штаб-кватэры (Індустрыяльны і камерцыйны банк Кітая (ICBC); Кітайскі будаўнічы банк (China Construction Bank); Дж. П. Морган-Чэйз (JPMorgan Chase); Джэнерал Электрык (General Electric); Эксан-Мобіл (ExxonMobil)); тры гарады свету — лідары па колькасці ТНК (Токіа, Нью-Ёрк, Лондан); штаб-кватэр ТНК (Пекін, Масква, Ганконг);

***валодаць*** навыкамі вызначэння фактараў міжнароднага геаграфічнага падзелу працы краін свету; параўнальнай характарыстыкі буйнейшых ТНК свету.

### Т э м а 2. Фактары росту сусветнай гаспадаркі (9 гадзін)

Міжнародная эканамічная інтэграцыя. Перадумовы і фактары міжнароднай эканамічнай інтэграцыі. Перавагі і выдаткі эканамічнай інтэграцыі. Адрозненні інтэграцыі ў эканамічна развітых краінах і тых, якія развіваюцца.

Стадыі міжнароднай эканамічнай інтэграцыі: асноўныя крытэрыі і праяўленне на карце свету. Асноўныя рэгіёны эканамічнай інтэграцыі свету. Вядучыя інтэграцыйныя аб’яднанні свету і іх роля ў развіцці сучаснай сусветнай гаспадаркі.

Навукова-тэхнічная рэвалюцыя (НТР) як рухаючая сіла развіцця сусветнай гаспадаркі. Навукова-тэхнічны прагрэс (НТП) і навукова-тэхнічная рэвалюцыя: падабенства і адрозненні. Падыходы да часавых рамак НТП. НТР у гісторыі чалавецтва.

Перыяды развіцця і агульныя рысы сучаснай НТР. Асноўныя навуковыя напрамкі НТР. Уплыў НТР на галіновую і тэрытарыяльную структуру сусветнай гаспадаркі. Структурныя зрухі ў сусветнай гаспадарцы пад уздзеяннем НТР: у прамысловасці, сельскай гаспадарцы, транспартнай сістэме, галіне інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій.

Міжнародныя эканамічныя адносіны. Формы міжнародных эканамічных адносін. Міжнародная спецыялізацыя вытворчасці. Навукова-тэхнічны абмен. Валютна-фінансавыя і крэдытныя сувязі паміж краінамі. Рух капіталу і працоўнай сілы.

Сусветны гандаль, геаграфічная і галіновая структура. Дынаміка аб’ёмаў, галіновая і рэгіянальная структура сусветнага экспарту і імпарту тавараў. Дынаміка аб’ёмаў, галіновая і рэгіянальная структура сусветнага экспарту і імпарту паслуг. Рэгуляванне міжнароднага гандлю, роля Сусветнай гандлёвай арганізацыі (СГА).

Глабалізацыя сусветнай гаспадаркі. Перадумовы, асноўныя этапы і тыпы глабалізацыі сусветнай гаспадаркі. Эканамічная глабалізацыя: формы, супярэчнасці, перавагі і перспектывы. Глабальныя гарады. Паказчыкі выдзялення. Разнавіднасці і рэгіянальная структура.

***Практычныя работы***

3. Параўнальна-геаграфічная характарыстыка вядучых інтэграцыйных аб’яднанняў свету (на прыкладзе двух аб’яднанняў).

4*. Вызначэнне рэгіянальных асаблівасцей міжнароднага гандлю краін Еўропы і Азіі.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучням неабходна:

***ведаць:***

стадыі міжнароднай эканамічнай інтэграцыі; падабенства і адрозненні паняццяў «навукова-тэхнічная рэвалюцыя» і «навукова-тэхнічны прагрэс», асноўныя навуковыя напрамкі навукова-тэхнічнай рэвалюцыі; формы міжнародных эканамічных адносін, асаблівасці галіновай структуры сусветнага экспарту і імпарту, прыметы глабалізацыі;

*асноўныя паняцці:* міжнародная эканамічная інтэграцыя, прэферэнцыйная зона, зона свабоднага гандлю, мытны саюз, агульны рынак, эканамічны і валютны саюз, поўная інтэграцыя, навукова-тэхнічны прагрэс, навукова-тэхнічная рэвалюцыя, сусветны гандаль, глабалізацыя сусветнай гаспадаркі, глабальны горад;

***умець:***

*характарызаваць* стадыі міжнароднай эканамічнай інтэграцыі;

*паказваць* на карце краіны Еўрапейскага саюза, краіны НАФТА, МЕРКАСУР; тры дзяржавы — лідары па аб'ёмах: экспарту тавараў і долі ў сусветным экспарце тавараў (Кітай, ЗША, Германія), імпарту тавараў і долі ў сусветным імпарце тавараў (ЗША, Кітай, Японія), экспарту паслуг і долі ў сусветным экспарце паслуг (ЗША, Вялікабрытанія, Германія), імпарту паслуг і долі ў сусветным імпарце паслуг (ЗША, Германія, Вялікабрытанія); глабальныя гарады (Нью-Ёрк, Лондан, Парыж, Токіа, Ганконг);

***валодаць*** навыкамі параўнальнай характарыстыкі вядучых інтэграцыйных аб'яднанняў свету; вызначэння рэгіянальных асаблівасцей міжнароднага гандлю краін.

### Т э м а 3. Геаграфія сельскай гаспадаркі свету (5 гадзін)

Геаграфія сельскай гаспадаркі свету. Агульная характарыстыка сусветнай сельскай гаспадаркі. Роля прыродных і сацыяльна-эканамічных умоў у размяшчэнні сельскагаспадарчай вытворчасці. Структура сельскагаспадарчых угоддзяў свету і рэгіёнаў.

Геаграфія раслінаводства. Значэнне раслінаводства, яго структура і прадукцыйнасць у залежнасці ад прыродных і эканамічных

умоў. Галіновая і рэгіянальная структура раслінаводства. Геаграфія міжнароднага гандлю прадукцыяй раслінаводства.

Геаграфія жывёлагадоўлі. Значэнне галіны і сувязь з раслінаводствам. Структура жывёлагадоўлі ў свеце, узровень і напрамкі развіцця ў розных групах краін. Геаграфія асноўных падгалін жывёлагадоўлі. Экспарцёры і імпарцёры прадукцыі жывёлагадоўлі.

Геаграфічныя тыпы сельскай гаспадаркі свету на базе галіновай накіраванасці і асаблівасцей прыродакарыстання. Галоўныя тыпы сельскагаспадарчых сістэм свету.

***Практычныя работы***

5. Эканоміка-геаграфічны аналіз збожжавай гаспадаркі свету.

### АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучням неабходна:

***ведаць:***

значэнне прыродных і сацыяльна-эканамічных умоў у размяшчэнні сельскагаспадарчай вытворчасці, структуру сельскагаспадарчых угоддзяў свету і рэгіёнаў; асноўныя геаграфічныя тыпы сельскай гаспадаркі свету;

*асноўныя паняцці:* геаграфічныя тыпы сельскай гаспадаркі;

***умець:***

*характарызаваць* сістэмы земляробства і жывёлагадоўлі; геаграфічныя асаблівасці раслінаводства, жывёлагадоўлі, геаграфію міжнароднага гандлю прадукцыяй сельскай гаспадаркі;

*паказваць* на карце тры вядучыя краіны па долі сельскагаспадарчай прадукцыі ў сусветным валавым прадукце (Кітай, Індыя, ЗША); па аб'ёмах валавога збору: пшаніцы (Кітай, Індыя, ЗША), кукурузы (ЗША, Кітай, Бразілія), рысу (Кітай, Індыя, Інданезія); па пагалоўю: буйной рагатай жывёлы (Бразілія, Індыя, Кітай), свіней (Кітай, ЗША, Бразілія), авечак (Кітай, Аўстралія, Індыя);

***валодаць*** навыкамі эканоміка-геаграфічнага аналізу збожжавай гаспадаркі свету.

## **Т э м а 4. Геаграфія прамысловасці свету** (20 гадзін)

Геаграфія прамысловасці свету. Роля індустрыяльнага сектара ў сусветнай гаспадарцы. Уплыў НТР на галіновую структуру і размяшчэнне прамысловасці. Мадэлі і заканамернасці размяшчэння прамысловасці. Нераўнамернасць развіцця прамысловасці ў краінах рознага тыпу.

Дынаміка галіновай структуры прамысловасці. Міжнародныя галіновыя класіфікатары відаў эканамічнай дзейнасці. Агульная характарыстыка сучаснай прамысловасці свету. Здабываючая і апрацоўчая галіны прамысловасці і іх суадносіны. Новыя тэндэнцыі развіцця здабываючай і апрацоўчай прамысловасці.

Геаграфія энергетыкі свету. Уплыў энергетыкі на развіццё сусветнай гаспадаркі. Дынаміка структуры паліўна-энергетычнага балансу свету. Сістэма МГПП у энергетычнай галіне ў XXI ст. Тыпалогія краін свету па энергетычнай забяспечанасці.

Геаграфія нафтавай прамысловасці. Сусветная нафтавая прамысловасць у сістэме міжнародных адносін. Этапы развіцця і тэрытарыяльная структура сусветнай нафтавай галіны. Дынаміка і рэгіянальная структура сусветнай здабычы нафты. Геаграфія гандлёвых патокаў нафты і роля АПЕК.

Геаграфія газавай прамысловасці свету. Тэрытарыяльная структура сусветнай газавай прамысловасці. Дынаміка і рэгіянальная структура сусветнай здабычы прыроднага газу. Геаграфія гандлёвых патокаў прыроднага газу.

Геаграфія вугальнай прамысловасці свету. Дынаміка і рэгіянальная структура сусветнай здабычы вугалю. Геаграфія міжнароднага гандлю каменным вугалем. Геаграфія «вугальных мастоў» свету. Перспектыўныя зрухі ў геаграфіі здабычы вугалю з пазіцый энергетычнай бяспекі.

Геаграфія электраэнергетыкі. Размеркаванне вытворчасці электраэнергіі па краінах і рэгіёнах. Тыпы краін па структуры электраэнергетыкі. Цеплавая электраэнергетыка. Гідраэнергетыка. Буйнейшыя гідраэлектрастанцыі свету. Ядзерная энергетыка. Міжнародны гандаль электраэнергіяй.

Геаграфія альтэрнатыўнай энергетыкі. Сусветная і рэгіянальная структура. Ветравая, геатэрмальная, сонечная, прыліўная энергетыка.

Геаграфія металургіі свету. Фактары размяшчэння металургічнай вытворчасці. Геаграфія сыравіннай і паліўнай базы, нераўнамернасць запасаў і здабычы. Галіновая структура чорнай металургіі. Геаграфія вытворчасці чыгуну і сталі. Рэгіёны чорнай металургіі свету.

Каляровая металургія свету і яе роля ў сусветнай гаспадарцы. Галіновая структура каляровай металургіі. Геаграфія важнейшых галін каляровай металургіі: алюмініевай, меднай, цынкавай, свінцовай. Сусветны гандаль каляровымі металамі. Буйнейшыя ТНК металургіі.

Геаграфія машынабудавання свету. Фактары размяшчэння галін машынабудавання. Уплыў НТР на структурныя і тэрытарыяльныя зрухі ў машынабудаванні. Геаграфія асноўных галін машынабудавання: транспартнае машынабудаванне (марское суднабудаванне, аўтамабілебудаванне), авіяракетна-касмічная прамысловасць, электронная і электратэхнічная прамысловасць, станкабудаванне. Буйнейшыя ТНК аўтамабілебудавання.

Геаграфія хімічнай прамысловасці свету. Фактары і мадэлі размяшчэння хімічнай вытворчасці. Сучасныя змяненні ў хімічнай прамысловасці развітых краін і краін, якія развіваюцца. Рэгіёны хімічнай прамысловасці свету. Геаграфія вытворчасці: асноўнай хіміі, мінеральных угнаенняў, прадуктаў неарганічнай хіміі і арганічнага сінтэзу. Геаграфія фармацэўтычнай прамысловасці. Буйнейшыя ТНК галіны.

Лёгкая і харчовая прамысловасць свету. Месца галіны ў структуры апрацоўчай прамысловасці. Галіновая структура лёгкай і харчовай прамысловасці. Геаграфія тэкстыльнай і швейнай прамысловасці. Геаграфія харчовай прамысловасці.

***Практычныя работы***

6. Аналіз геаграфіі запасаў і здабычы энергетычных рэсурсаў свету (на прыкладзе нафты і прыроднага газу).

7. Параўнальная характарыстыка геаграфіі альтэрнатыўнай энергетыкі свету.

8. Вызначэнне геаграфічных асаблівасцей выплаўкі чыгуну і сталі (на ўзроўні рэгіёнаў і вядучых краін).

9. Геаграфічны аналіз алюмініевай прамысловасці свету.

10. Аналіз геаграфіі аўтамабілебудавання свету.

11. Геаграфічны аналіз прамысловасці мінеральных угнаенняў свету.

12. Параўнальны аналіз рэгіёнаў хімічнай прамысловасці свету.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучням неабходна:

***ведаць:***

дынаміку паліўна-энергетычнага балансу свету, асаблівасці геаграфіі нафтавай, газавай і вугальнай прамысловасці, электраэнергетыкі, альтэрнатыўнай энергетыкі свету; сыравінную базу і галіновую структуру чорнай і каляровай металургіі, рэгіёны развіцця чорнай металургіі, буйнейшыя ТНК металургіі; галіновую структуру машынабудавання, буйнейшыя ТНК аўтамабілебудавання; рэгіёны развіцця чорнай металургіі свету; фактары размяшчэння хімічнай вытворчасці; геаграфію сыравіннай базы хімічнай прамысловасці; рэгіёны развіцця хімічнай прамысловасці свету; галіновую структуру, фактары і геаграфічныя асаблівасці размяшчэння лёгкай прамысловасці, фактары і геаграфічныя асаблівасці размяшчэння харчовай прамысловасці;

*асноўныя паняцці:* альтэрнатыўная энергетыка;

***умець:***

*характарызаваць* дынаміку галіновай структуры прамысловасці свету; мадэлі і заканамернасці размяшчэння прамысловасці; міжнародныя галіновыя класіфікатары відаў эканамічнай дзейнасці; геаграфію нафтавай, газавай і вугальнай прамысловасці свету, электраэнергетыкі свету, альтэрнатыўнай энергетыкі свету, чорнай металургіі свету, каляровай металургіі свету, машынабудавання свету, хімічнай прамысловасці свету, лёгкай прамысловасці свету, харчовай прамысловасці свету;

*паказваць* на карце тры вядучыя нафтаздабываючыя краіны (Саудаўская Аравія, Расія, ЗША), газаздабываючыя краіны (ЗША, Расія, Катар); вуглездабываючыя краіны (Кітай, ЗША, Індыя); тры галоўныя краіны — вытворцы электраэнергіі (ЗША, Кітай, Індыя); тры буйнейшыя ГЭС свету (Санься, Ітайпу, Сілоду); тры буйнейшыя АЭС свету (Фукусіма, Касівадзакі-Карыва, Запарожская); тры галоўныя краіны — вытворцы сонечнай электраэнергіі

(Германія, Іспанія, Японія), ветравой электраэнергіі (ЗША, Германія, Іспанія), геатэрмальнай электраэнергіі (ЗША, Філіпіны, Інданезія); тры вядучыя краіны па аб'ёмах вытворчасці: чыгуну (Кітай, Японія, Індыя), сталі (Кітай, Японія, ЗША), баксітаў (Аўстралія, Кітай, Бразілія), першаснага алюмінію (Кітай, Расія, Канада), рафінаванай медзі (Кітай, Чылі, Японія), рафінаванага цынку (Кітай, Канада, Рэспубліка Карэя), рафінаванага свінцу (Кітай, Германія, ЗША); тры вядучыя краіны — вытворцы марскіх судоў (Рэспубліка Карэя, Японія, Кітай), легкавых аўтамабіляў (Кітай, ЗША, Японія), станкоў (Кітай, Японія, Германія); калійных угнаенняў (Канада, Расія, Беларусь); азотных угнаенняў (Кітай, Індыя, ЗША); фосфарных угнаенняў (Кітай, ЗША, Індыя); хімічных валокнаў (Кітай, Індыя, Тайвань); фармацэўтычнай прадукцыі (ЗША, Германія, Японія); швейнай прадукцыі (Кітай, ЗША, Рэспубліка Карэя);

***валодаць*** навыкамі аналізу геаграфіі запасаў і здабычы энергетычных рэсурсаў свету; параўнальнай характарыстыкі геаграфіі альтэрнатыўнай энергетыкі свету; вызначэння геаграфічных асаблівасцей выплаўкі чыгуну і сталі (на ўзроўні рэгіёнаў і вядучых краін); геаграфічнага аналізу алюмініевай прамысловасці свету; аналізу геаграфіі аўтамабілебудавання свету, геаграфічнага аналізу прамысловасці мінеральных угнаенняў свету; параўнальнага аналізу рэгіёнаў хімічнай прамысловасці свету.

### Т э м а 5. Геаграфія сферы паслуг (5 гадзін)

Геаграфія сферы паслуг. Месца сферы паслуг у сусветнай гаспадарцы. Фактары, якія вызначаюць дынаміку развіцця сферы паслуг. Класіфікацыя і структура паслуг у сусветнай гаспадарцы. Міжнародныя галіновыя класіфікатары паслуг.

Геаграфія і галіновая структура сферы паслуг. Асаблівасці развіцця сферы паслуг на этапе пераходу да постындустрыяльнага развіцця. Дыферэнцыяцыя ступені развіцця сферы паслуг у краінах і рэгіёнах свету. Галіновая спецыялізацыя паслуг у краінах і рэгіёнах сусветнай гаспадаркі. Геаграфія экспарту і імпарту паслуг у сучасным свеце.

Геаграфія транспарту. Транспартная сістэма свету і яе структура. Роля і месца ў светагаспадарчай сістэме розных відаў транс-

парту: чыгуначнага, марскога і рачнога, аўтамабільнага, трубаправоднага, авіяцыйнага, інфармацыйна-камунікацыйных сістэм. Геаграфія асноўных відаў транспарту ў свеце. Зрухі ў развіцці і размяшчэнні прадукцыйных сіл пад уздзеяннем транскантынентальнай транспартнай інфраструктуры. Кантэйнерызацыя.

Геаграфія сусветнага турызму. Роля міжнароднага турызму ў развіцці сусветнай гаспадаркі і сферы паслуг. Рэгіянальныя асаблівасці турысцкага патэнцыялу і яго выкарыстання. Геаграфія турысцкіх патокаў свету. Засваенне новых тэрыторый свету для развіцця турызму на постындустрыяльнай стадыі.

***Практычныя работы***

13. Параўнальная характарыстыка геаграфіі турызму ў рэгіёнах свету (на прыкладзе Еўропы і Азіі).

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ
ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучням неабходна:

***ведаць:***

месца сферы паслуг у сусветнай гаспадарцы; галіновую структуру транспартнага комплексу свету; асаблівасці геаграфіі відаў транспарту (чыгуначнага, аўтамабільнага, воднага, паветранага, трубаправоднага); асаблівасці транспартнай сеткі свету, геаграфію міжнароднага турызму;

*асноўныя паняцці:* геаграфія транспарту, транспартная сістэма свету, полімагістраль;

***умець:***

*характарызаваць* геаграфію відаў транспарту (чыгуначнага, аўтамабільнага, воднага, паветранага, трубаправоднага); геаграфію міжнароднага турызму;

*паказваць* на карце тры вядучыя марскія порты свету (Шанхай, Сінгапур, Пусан); тры вядучыя краіны па колькасці турысцкіх прыбыццяў (Францыя, ЗША, Іспанія);

***валодаць*** навыкамі параўнальнай характарыстыкі геаграфіі турызму ў рэгіёнах свету.

**Падагульняльнае паўтарэнне** (1 гадзіна)

## РАЗДЗЕЛ II. ГЛАБАЛЬНЫЯ ПРАБЛЕМЫ ЧАЛАВЕЦТВА (53 гадзіны)

### Т э м а 6. Геаэкалагічныя праблемы літасферы (4 гадзіны)

Глабальныя праблемы чалавецтва. Геаэкалагічныя асаблівасці літасферы і яе значэнне для жыцця людзей. Асноўныя геаэкалагічныя функцыі літасферы: рэсурсная, геадынамічная, геафізічная і геахімічная. Роля біёты, чалавека і яго гаспадарчай дзейнасці ў вялікім (геалагічным) кругавароце рэчываў.

Трансфармацыя геаэкалагічных функцый літасферы. Асноўныя прыродныя прычыны змянення функцый літасферы. Уплыў сучасных тэктанічных і геамарфалагічных працэсаў на стан навакольнага асяроддзя.

Уплыў дзейнасці чалавека на літасферу і яго геаэкалагічныя наступствы. Геаэкалагічныя змяненні навакольнага асяроддзя пры правядзенні горных работ, разведцы, здабычы, транспарціроўцы і выкарыстанні карысных выкапняў. Рэкультывацыя парушаных ландшафтаў.

***Практычныя работы***

14. Параўнальная характарыстыка асноўных напрамкаў рэкультывацыі парушаных ландшафтаў.

#### АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучням неабходна:

***ведаць:***

геаэкалагічныя асаблівасці літасферы і яе асноўныя функцыі, асноўныя прыродныя і антрапагенныя прычыны змянення літасферы, вялікі (геалагічны) кругаварот рэчываў, асноўныя геаэкалагічныя наступствы ўплыву чалавека на літасферу;

*асноўныя паняцці:* глабальныя праблемы чалавецтва, геаэкалагічныя наступствы, горныя работы, біёта, вялікі кругаварот рэчываў;

***умець:***

*вызначаць* значэнне элементаў літасферы для розных відаў гаспадарчай дзейнасці;

*аналізаваць* наступствы антрапагеннага ўздзеяння на літасферу;

***валодаць*** навыкамі вызначэння ўзаемасувязі вывучаемых з'яў на розным тэрытарыяльным узроўні, асновамі аналізу і абагульнення інфармацыі з розных крыніц аб праяўленні геаэкалагічных вынікаў уздзеяння на літасферу на прыкладзе сваёй мясцовасці, іх уплыве на чалавека і яго гаспадарчую дзейнасць.

### Т э м а 7. Геаэкалагічныя праблемы атмасферы (7 гадзін)

Геаэкалагічныя асаблівасці атмасферы і яе значэнне для жыцця людзей. Ахоўныя функцыі атмасферы. Кліматычныя ўмовы і рэсурсы, іх занальна-рэгіянальныя асаблівасці, значэнне для чалавека і розных відаў яго гаспадарчай дзейнасці.

Уплыў дзейнасці чалавека на атмасферу, клімат і надвор'е. Забруджванне атмасферы і яго ўздзеянне на біёту і чалавека. Крыніцы і важнейшыя кампаненты антрапагеннага забруджвання атмасферы. Прасторава-часавыя заканамернасці распаўсюджвання розных відаў антрапагенных забруджвальнікаў атмасферы.

Роля антрапагеннага фактару ва ўтварэнні парніковага эфекту, дэградацыі азонавага слоя, выпаданні кіслотных ападкаў і лакальным забруджванні паветра.

Магчымыя змяненні клімату. Асноўныя прычыны змянення клімату. Уплыў антрапагеннага ўздзеяння на змяненне клімату. Геаэкалагічныя наступствы ўздзеяння змяненняў клімату на гаспадарчую дзейнасць і здароўе чалавека.

Асноўныя напрамкі аховы атмасферы. Метады і спосабы зніжэння антрапагеннага забруджвання атмасферы.

***Практычныя работы***

15. Ацэнка кліматычных умоў сваёй мясцовасці, іх уплыў на чалавека і яго гаспадарчую дзейнасць.

16*. Параўнальны аналіз занальных асаблівасцей аграрокліматычных рэсурсаў свету.

#### АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ<br>ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучням неабходна:

***ведаць:***

геаэкалагічныя асаблівасці атмасферы; ролю кліматычных і пагодных умоў у жыцці чалавека і яго гаспадарчай дзейнасці,

асноўныя крыніцы і найбольш важныя кампаненты антрапагеннага забруджвання атмасферы, сучасныя тэндэнцыі і геаэкалагічныя наступствы змянення клімату;

*асноўныя паняцці:* кліматычныя рэсурсы, парніковы эфект, змяненне клімату, экстрэмальныя кліматычныя з’явы;

***умець:***

*вызначаць* значэнне кліматычных і пагодных умоў для розных відаў гаспадарчай дзейнасці;

*аналізаваць* прычыны і наступствы антрапагеннага ўздзеяння на стан атмасферы і клімат;

***валодаць*** навыкамі вызначэння ўзаемасувязі вывучаемых з’яў на розным тэрытарыяльным узроўні; асновамі аналізу і абагульнення інфармацыі з розных крыніц пра кліматычныя ўмовы сваёй мясцовасці, іх уплыў на чалавека і яго гаспадарчую дзейнасць.

### Т э м а 8. Геаэкалагічныя праблемы гідрасферы (6 гадзін)

Геаэкалагічныя асаблівасці гідрасферы. Асноўныя геаэкалагічныя функцыі гідрасферы і яе значэнне для жыцця людзей. Водныя рэсурсы і водазабеспячэнне. Занальныя і рэгіянальныя асаблівасці водазабеспячэння краін свету.

Уздзеянне дзейнасці чалавека на гідрасферу. Уплыў розных відаў гаспадарчай дзейнасці чалавека на колькасць і якасць водных рэсурсаў. Крыніцы і віды антрапагеннага забруджвання гідрасферы. Уплыў забруджвання вады на чалавека і біёту.

Геаэкалагічныя аспекты воднай гаспадаркі. Праблемы кіравання водаспажываннем. Дэфіцыт і дэградацыя вод сушы. Рацыянальнае выкарыстанне мінеральных і тэрмальных вод.

Геаэкалагічныя асаблівасці Сусветнага акіяна. Антрапагеннае ўздзеянне на Сусветны акіян. Геаэкалагічныя наступствы забруджвання Сусветнага акіяна. Геаэкалагічныя аспекты выкарыстання прыродных рэсурсаў Сусветнага акіяна. Рэгіянальныя і лакальныя геаэкалагічныя праблемы акіянаў, унутраных мораў і марскіх узбярэжжаў.

Асноўныя напрамкі павышэння эфектыўнасці выкарыстання і аховы водных рэсурсаў сушы і Сусветнага акіяна. Метады і спосабы зніжэння антрапагеннага забруджвання гідрасферы.

***Практычныя работы***

17. Аналіз геаэкалагічнага стану водных рэсурсаў сваёй мясцовасці, меры па ахове.

### АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучням неабходна:

***ведаць:***

геаэкалагічныя асаблівасці гідрасферы, сучасны геаэкалагічны стан элементаў гідрасферы, уплыў розных відаў гаспадарчай дзейнасці на водныя рэсурсы, асноўныя крыніцы і віды антрапагеннага забруджвання гідрасферы, асноўныя напрамкі павышэння эфектыўнасці выкарыстання і аховы водных рэсурсаў сушы і Сусветнага акіяна;

*асноўныя паняцці:* водная гаспадарка, водазабеспячэнне;

***умець:***

*вызначаць* значэнне гідрасферы для розных відаў гаспадарчай дзейнасці;

*аналізаваць* прычыны і наступствы антрапагеннага ўздзеяння на гідрасферу;

***валодаць*** навыкамі вызначэння ўзаемасувязі вывучаемых з'яў на розным тэрытарыяльным узроўні; асновамі аналізу і абагульнення інфармацыі з розных крыніц пра гідралагічныя ўмовы сваёй мясцовасці, іх уплыў на чалавека і яго гаспадарчую дзейнасць.

### Т э м а 9. Геаэкалагічныя праблемы біясферы (7 гадзін)

Геаэкалагічныя асаблівасці біясферы. Яе роля ў геаграфічнай абалонцы і значэнне для жыцця людзей. Сучасныя ландшафты свету.

Геаэкалагічныя асаблівасці глеб і іх узаемадзеянне з геасферамі. Антрапагенная дэградацыя глеб. Водная і ветравая эрозія глеб. Забруджванне і ўшчыльненне глеб.

Зямельныя рэсурсы і іх выкарыстанне. Дэградацыя зямель як комплексны прыродна-антрапагенны працэс. Неспрыяльныя геаэкалагічныя наступствы антрапагеннага выкарыстання зямельных рэсурсаў.

Праблема апустыньвання і абязлесення. Маштабы праяўлення, асноўныя прыродныя перадумовы і антрапагенныя прычыны. Мерапрыемствы па прадухіленні апустыньвання і абязлесення.

Роля расліннасці і жывёл, іх значэнне ў гаспадарчай дзейнасці чалавека. Біёта — крыніца харчовых і тэхнічных рэсурсаў. Праблемы выкарыстання і аховы жывой прыроды. Прыродныя і антрапагенныя фактары ўздзеяння на біёту.

Прыродная разнастайнасць Зямлі і праблема яе захавання. Спосабы аховы натуральных ландшафтаў. Асабліва ахоўныя прыродныя тэрыторыі ў свеце, іх віды і значэнне. Перспектывы развіцця асноўных асабліва ахоўных прыродных тэрыторый па мацерыках і краінах.

***Практычныя работы***

18. Ацэнка геаэкалагічнага стану прыроды сваёй мясцовасці, меры па ахове.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучням неабходна:

***ведаць:***

геаэкалагічныя асаблівасці біясферы, значэнне біясферы для чалавека і яго гаспадарчай дзейнасці, геаэкалагічныя наступствы антрапагеннага ўздзеяння на біясферу, асаблівасці працэсаў дэградацыі зямель, апустыньвання, абязлесення, асноўныя напрамкі рацыянальнага выкарыстання зямельных рэсурсаў, аховы натуральных ландшафтаў і прыроднай разнастайнасці Зямлі;

*асноўныя паняцці:* дэградацыя зямель, абязлесенне, прыродная разнастайнасць;

***умець:***

*аналізаваць* прычыны і наступствы антрапагеннага ўздзеяння на стан прыроднага асяроддзя;

*вызначаць* стан прыроднага асяроддзя сваёй мясцовасці і прапаноўваць магчымыя шляхі яго паляпшэння;

***валодаць*** навыкамі вызначэння ўзаемасувязі вывучаемых з’яў на розным тэрытарыяльным узроўні; асновамі аналізу і абагуль-

нення інфармацыі з розных крыніц пра геаэкалагічны стан прыроднага асяроддзя на розным тэрытарыяльным узроўні і меры па яго ахове.

### Тэма 10. Дэмаграфічная праблема (5 гадзін)

Праблема дэмаграфічнай нагрузкі. Нераўнамернасць дынамікі колькасці і ўзнаўлення насельніцтва ў развітых краінах і краінах, якія развіваюцца. Дэмаграфічны пераход. Праблема дэпапуляцыі, геаграфія і сацыяльна-эканамічныя наступствы. Прагноз дынамікі колькасці насельніцтва свету.

Праблема дэмаграфічнага старэння. Дынаміка ўзроставай структуры насельніцтва свету, адрозненні паміж развітымі краінамі і краінамі, якія развіваюцца. Размеркаванне ў свеце асоб, старэйшых за працаздольны ўзрост. Сацыяльна-эканамічныя наступствы дэмаграфічнага старэння. Прагноз дэмаграфічнага старэння ў свеце.

Праблема міжнароднай міграцыі. Дынаміка маштабаў і структуры міграцыі насельніцтва ў сучасным свеце. Асноўныя калідоры і напрамкі міжнароднай міграцыі. Геаграфія міжнароднай эміграцыі і іміграцыі. «Інтэлектуальная» міграцыя. Нелегальная міграцыя. Дэмаграфічныя і сацыяльна-эканамічныя наступствы міжнароднай міграцыі.

Шляхі вырашэння дэмаграфічнай праблемы. Дэмаграфічная палітыка і яе асаблівасці ў розных рэгіёнах і краінах.

***Практычныя работы***

19. Аналіз фактараў і рэгіянальных адрозненняў дынамікі колькасці насельніцтва свету (1995—2015).

#### АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучням неабходна:

***ведаць:***

асаблівасці дынамікі колькасці насельніцтва свету развітых краін і краін, якія развіваюцца; асаблівасці ўзнаўлення насельніцтва свету развітых краін і краін, якія развіваюцца; геаграфію дэпапуляцыі; прагноз дынамікі колькасці насельніцтва свету;

*асноўныя паняцці:* дэмаграфічная нагрузка, дэмаграфічны пераход, дэпапуляцыя, дэмаграфічнае старэнне;

***умець:***

*характарызаваць* праблему дэмаграфічнай нагрузкі; адрозненні дынамікі колькасці насельніцтва развітых краін і краін, якія развіваюцца; геаграфічныя асаблівасці дэпапуляцыі; сацыяльна-эканамічныя наступствы дэпапуляцыі;

*паказваць* на карце дзесяць буйнейшых краін свету па колькасці насельніцтва (Кітай, Індыя, ЗША, Інданезія, Бразілія, Пакістан, Нігерыя, Бангладэш, Расія, Японія); тры краіны свету: з найбольшымі тэмпамі росту колькасці насельніцтва (Аман, Ліван, Кувейт), з адмоўнай дынамікай колькасці насельніцтва (Грузія, Літва, Латвія), з пашыраным тыпам узнаўлення насельніцтва (Індыя, Ангола, Калумбія), са звужаным тыпам узнаўлення насельніцтва (Італія, Венгрыя, Японія), з найбольшай доляй асоб, старэйшых за працаздольны ўзрост (Японія, Германія, Італія), з найбольшай доляй эмігрантаў (Гранада, Сурынам, Гаяна), з найбольшай доляй імігрантаў (Катар, ААЭ, Кувейт); тры асноўныя калідоры міжнароднай міграцыі паміж краінамі, якія развіваюцца, і развітымі краінамі (Мексіка — ЗША; Турцыя — Германія; Кітай, Філіпіны, Індыя — ЗША);

***валодаць*** навыкамі эканоміка-геаграфічнага аналізу фактараў і рэгіянальнай дынамікі колькасці насельніцтва свету.

### Т э м а 11. Харчовая праблема (4 гадзіны)

Прычыны харчовай праблемы ў свеце. Прыродныя і сацыяльна-эканамічныя фактары, якія ўплываюць на харчовую сітуацыю ў свеце. Навукова абгрунтаваная і фактычная структура харчавання насельніцтва.

Рэгіянальныя аспекты харчовай праблемы. Харчовае забеспячэнне насельніцтва краін свету. Краіны, якія развіваюцца, у глабальнай харчовай сістэме. Тыпы краін па ўзроўні забяспечанасці харчаваннем.

Шляхі вырашэння харчовай праблемы. Экстэнсіўны і інтэнсіўны падыходы да вырашэння харчовай праблемы. «Зялёная рэвалюцыя» і яе наступствы. Харчовая бяспека.

***Практычныя работы***

20. Аналіз геаграфіі забяспечанасці краін свету асноўнымі відамі харчавання.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучням неабходна:

***ведаць:***

прычыны ўзнікнення, асаблівасці праяўлення і магчымыя шляхі вырашэння глабальнай харчовай праблемы; рэгіянальныя аспекты харчовай праблемы, геаэкалагічныя і сацыяльна-эканамічныя наступствы «зялёнай рэвалюцыі» ў краінах свету, якія развіваюцца;

*асноўныя паняцці:* харчовая бяспека, «зялёная рэвалюцыя»;

***умець:***

*выяўляць* і *аналізаваць* прычыны і асаблівасці праяўлення глабальнай харчовай праблемы, магчымыя шляхі яе вырашэння;

*тлумачыць* глабальныя і рэгіянальныя асаблівасці харчовай праблемы;

*абгрунтоўваць* неабходнасць аптымізацыі вытворчасці і выкарыстання прадуктаў харчавання ў краінах і рэгіёнах свету;

***валодаць*** навыкамі абагульнення інфармацыі з розных крыніц пра глабальную харчовую праблему.

## **Т э м а 12. Мінеральна-рэсурсная праблема** (4 гадзіны)

Значэнне мінеральных рэсурсаў для гаспадарчай дзейнасці чалавека. Прыродныя і сацыяльна-эканамічныя фактары выкарыстання мінеральна-сыравінных рэсурсаў. Асноўныя групы мінеральна-сыравінных рэсурсаў.

Заканамернасці размяшчэння мінеральна-сыравінных рэсурсаў. Рэсурсазабяспечанасць краін і рэгіёнаў свету па асноўных відах мінеральных рэсурсаў.

Шляхі вырашэння мінеральна-рэсурснай праблемы. Рацыянальнае выкарыстанне мінеральна-сыравіннага патэнцыялу планеты. Рэсурсазберагаючыя і малаадходныя тэхналогіі, выкарыстанне другасных і альтэрнатыўных рэсурсаў.

***Практычныя работы***

21. Аналіз геаграфіі забяспечанасці краін свету асноўнымі відамі мінеральных рэсурсаў.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ
ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучням неабходна:

***ведаць:***

прычыны ўзнікнення, асаблівасці праяўлення і магчымыя шляхі вырашэння глабальнай мінеральна-рэсурснай праблемы;

*асноўныя паняцці:* рэсурсазабяспечанасць, мінеральна-сыравінная бяспека;

***умець:***

*выяўляць* і *аналізаваць* прычыны, фактары і асаблівасці праяўлення глабальнай мінеральна-рэсурснай праблемы, магчымыя шляхі яе вырашэння;

*тлумачыць* глабальнасць і адноснасць мінеральна-рэсурснай праблемы;

*абгрунтоўваць* неабходнасць рацыянальнага выкарыстання мінеральных рэсурсаў у краінах і рэгіёнах свету;

*паказваць* на карце асноўныя мінеральна-сыравінныя рэгіёны сусветнай гаспадаркі;

***валодаць*** навыкамі разліку паказчыкаў рэсурсазабяспечанасці краін і рэгіёнаў свету мінеральнымі рэсурсамі.

## **Т э м а 13. Энергетычная праблема** (4 гадзіны)

Этапы развіцця сусветнай энергетыкі. Значэнне энергетыкі для развіцця сусветнай гаспадаркі. Дынаміка і прагноз спажывання паліўна-энергетычных рэсурсаў у развітых краінах і краінах, якія развіваюцца.

Уплыў энергетыкі на навакольнае асяроддзе. Геаэкалагічныя праблемы выкарыстання традыцыйных і альтэрнатыўных крыніц энергіі.

Шляхі вырашэння энергетычнай праблемы. Рацыянальнае выкарыстанне энергетычнага патэнцыялу планеты. Перспектывы развіцця альтэрнатыўнай энергетыкі. Энергетычная бяспека.

***Практычныя работы***

22. Аналіз геаграфіі забяспечанасці краін свету асноўнымі відамі энергетычных рэсурсаў.

### АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучням неабходна:

***ведаць:***

прычыны ўзнікнення, асаблівасці праяўлення і магчымыя шляхі вырашэння глабальнай энергетычнай праблемы;

*асноўныя паняцці:* энергетычная бяспека;

***умець:***

*выяўляць* і *аналізаваць* прычыны і асаблівасці праяўлення глабальнай энергетычнай праблемы, магчымыя шляхі яе вырашэння;

*тлумачыць* глабальныя і рэгіянальныя асаблівасці энергетычнай праблемы;

*абгрунтоўваць* неабходнасць рацыянальнага выкарыстання традыцыйных і альтэрнатыўных крыніц энергіі ў краінах і рэгіёнах свету;

*паказваць* на карце асноўныя аб'екты развіцця сусветнай энергетыкі;

***валодаць*** навыкамі разліку паказчыкаў рэсурсазабяспечанасці краін і рэгіёнаў свету энергетычнымі рэсурсамі.

## Т э м а 14. Палітычныя праблемы (5 гадзін)

Дынаміка палітычнай карты свету ў канцы XX — пачатку XXI ст. Колькасныя і якасныя змяненні на палітычнай карце свету ў XXI ст.

Праблема рэгіянальных канфліктаў. Фактары рэгіянальных канфліктаў у сучасным свеце. Геаграфія рэгіянальных канфліктаў і сучасных лакальных войнаў. Шляхі вырашэння рэгіянальных канфліктаў.

Праблема міжнароднага тэрарызму. Міжнародны тэрарызм як глабальны выклік сучаснасці. Прычыны і формы праяўлення міжнароднага тэрарызму. Міжнародныя меры пераадолення праблемы міжнароднага тэрарызму.

Праблема міру, раззбраення і прадухілення ядзернай вайны. Перадумовы праблемы ў сучасным свеце. Міжнародны кантроль

за ядзернай зброяй. Забарона хімічнай зброі, скарачэнне ваенных расходаў і ўзбраенняў. Роля ААН у вырашэнні глабальных палітычных праблем. Мэты развіцця тысячагоддзя.

***Практычныя работы***

23. Характарыстыка палітыка-геаграфічнага становішча краіны свету (на выбар).

### АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучням неабходна:

***ведаць:***

фактары рэгіянальных канфліктаў у сучасным свеце; прычыны з'яўлення міжнароднага тэрарызму; асноўныя рысы праблемы міру, раззбраення і прадухілення ядзернай вайны;

*асноўныя паняцці:* рэгіянальны канфлікт, новая незалежная дзяржава;

***умець:***

*характарызаваць* геаграфію рэгіянальных канфліктаў; прычыны міжнароднага тэрарызму; формы міжнароднага кантролю праблемы міру, раззбраення і прадухілення ядзернай вайны; мэты развіцця тысячагоддзя;

*паказваць* на палітычнай карце свету прыклады новых незалежных дзяржаў, прызнаных ААН (Усходні Тымор, Паўднёвы Судан, Эрытрэя); прыклады рэгіянальных канфліктаў (араба-ізраільскі, індыйска-пакістанскі, афганскі, карыбскі, турэцка-курдскі).

## Т э м а 15. Рацыянальнае прыродакарыстанне і стратэгія ўстойлівага развіцця чалавецтва (6 гадзін)

Асноўныя перыяды гісторыі ўзаемадзеяння чалавека і прыроды. Прыродакарыстанне і яго асноўныя формы. Геаэкалагічныя прынцыпы, правілы, законы прыродакарыстання і аховы навакольнага асяроддзя.

Геаэкалагічная ёмістасць тэрыторыі. Крытэрыі, паказчыкі і параметры геаэкалагічнага стану навакольнага асяроддзя.

Індывідуальныя, этнічныя, сацыяльныя і іншыя асаблівасці ўспрымання чалавекам глабальных праблем. Гуманітарна-экалагічны падыход і яго значэнне ў вырашэнні глабальных праблем.

Магчымыя шляхі вырашэння глабальных праблем. Узаемасувязь глабальных праблем. Сцэнарыі будучага стану навакольнага асяроддзя. Глабальныя мадэлі развіцця свету.

Паняцце і асноўныя прынцыпы ўстойлівага развіцця чалавецтва. Геаграфічныя аспекты стратэгіі ўстойлівага развіцця чалавецтва і Рэспублікі Беларусь.

***Практычныя работы***

24. Распрацоўка сцэнарыя вырашэння адной з глабальных праблем чалавецтва.

### АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучням неабходна:

***ведаць:***

асноўныя геаэкалагічныя прынцыпы, правілы, законы прыродакарыстання і аховы навакольнага асяроддзя, ролю чалавека і яго гаспадарчай дзейнасці ў змяненні прыродных працэсаў, асноўныя глабальныя праблемы чалавецтва, прычыны ўзнікнення, магчымыя наступствы і шляхі вырашэння, галоўныя палажэнні стратэгіі ўстойлівага развіцця чалавецтва і Рэспублікі Беларусь;

*асноўныя паняцці:* прыродакарыстанне, гуманітарна-экалагічны падыход, стратэгія ўстойлівага развіцця;

***умець:***

*вызначаць* узаемасувязі натуральных і грамадскіх з'яў і працэсаў;

*абгрунтоўваць* выкарыстанне прыродных рэсурсаў у залежнасці ад іх запасаў, гаспадарчай значнасці, патрэбнасцей і мэтазгоднасці асваення;

*аналізаваць* шляхі ўдасканалення прыродакарыстання;

***валодаць*** асновамі аналізу і абагульнення інфармацыі з розных крыніц пра глабальныя праблемы чалавецтва, магчымыя напрамкі і варыянты вырашэння; навыкамі вызначэння ўзаемасувязі вывучаемых з'яў на розным тэрытарыяльным узроўні.

## **Заключэнне** (1 гадзіна)

## **Падагульняльнае паўтарэнне** (1 гадзіна)

Геаграфія ў сучасным свеце. Галоўныя функцыі геаграфічнай навукі. Формы геаграфічнай дзейнасці і вобласць прымянення геаграфічных ведаў. Перспектывы развіцця геаграфіі. Міжнароднае супрацоўніцтва ў галіне геаграфіі і вырашэння глабальных праблем чалавецтва.

## **Рэзерв часу** (1 гадзіна)

# БІЯЛОГІЯ

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Праграма прызначана для вывучэння вучэбнага прадмета «Біялогія» ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі на павышаным узроўні.

У курсе біялогіі XI класа вучні працягваюць вывучаць агульныя заканамернасці, характэрныя для жывой прыроды. Тут разглядаюцца пытанні ўзаемасувязі арганізмаў і навакольнага асяроддзя, раскрываюцца прынцыпы арганізацыі і функцыянавання біялагічных сістэм надарганізменных узроўняў: папуляцыйна-відавога, экасістэмнага і біясфернага — і такім чынам абагульняюцца веды пра жыццё і ўзроўні яго арганізацыі. Раскрываюцца светапоглядныя пытанні пра паходжанне і развіццё жыцця на Зямлі, абагульняюцца і паглыбляюцца паняцці пра эвалюцыйнае развіццё арганізмаў і біясферы ў цэлым, паходжанне і эвалюцыю чалавека. Завяршаецца фарміраванне паняцця пра наасферу і адказнасць чалавека за жыццё на Зямлі.

Пераемныя сувязі паміж раздзеламі забяспечваюць цэласнасць курса біялогіі, а яго змест спрыяе фарміраванню развітой асобы, якая валодае асновамі навуковых ведаў, што грунтуюцца на біяцэнтрычным мысленні, і здольная творча іх выкарыстоўваць у адпаведнасці з законамі прыроды і агульначалавечымі маральнымі каштоўнасцямі.

Вывучэнне біялагічнага матэрыялу дазваляе вырашаць задачы экалагічнага, эстэтычнага, патрыятычнага, фізічнага, працоўнага, санітарна-гігіенічнага выхавання вучняў. Яны павінны добра разумець, што чалавек — частка прыроды, яго жыццё залежыць ад яе, і таму ён павінен захаваць прыроду для сябе і наступных пакаленняў людзей.

Для разумення вучнямі сутнасці біялагічных з’яў у вучэбную праграму ўведзены лабараторныя і практычныя работы, рашэнне экалагічных задач, экскурсіі. Усё гэта дае магчымасць накірава-

на ўздзейнічаць на асобу вучня: трэніраваць памяць, развіваць назіральнасць, мысленне, вучыць прыёмам самастойнай вучэбнай дзейнасці, спрыяць развіццю дапытлівасці і інтарэсу да вучэбнага прадмета «Біялогія».

Для дасягнення высокага ўзроўню біялагічнай адукацыі неабходна дабіцца пэўнай завершанасці ведаў пра ўмовы жыцця, разнастайнасць біясістэм, заканамернасці, характэрныя для кожнага ўзроўню арганізацыі жывой прыроды. Хоць у змест курса ўключаны асновы розных галін біялогіі, яго адрознівае цэласнасць, паколькі галоўнай ідэяй з'яўляецца шматузроўневасць жыцця на Зямлі і ўзаемасувязь працэсаў і з'яў, якія адбываюцца на кожным з узроўняў.

Змест вучэбнай праграмы адлюстроўвае стан навукі і яе ўзаемасувязь з вырашэннем сучасных праблем грамадства. Улічваючы, што праблема экалагічнай адукацыі набыла ў цяперашні час першараднае значэнне, у праграме дадзенага курса істотнае месца займае экалагічны аспект.

Павышаны ўзровень вывучэння біялогіі накіраваны на развіццё пазнавальных інтарэсаў, інтэлектуальных і творчых здольнасцей вучняў, фарміраванне цэласнай сістэмы ведаў пра жывую прыроду, яе сістэмную арганізацыю, засваенне ведаў і спосабаў дзеянняў, якія складаюць дастатковую базу для выбару прафесіі, працягу выбранага напрамку адукацыі, асобаснага самаразвіцця.

Праграма павышанага ўзроўню ўключае ў сябе ўсе раздзелы і тэмы, якія вывучаюцца на базавым узроўні. Узроўні адрозніваюцца паміж сабой глыбінёй вывучаемага матэрыялу, што дасягаецца дыферэнцыраваннем лабараторнай і практычнай часткі, а таксама дадатковым увядзеннем у вучэбную праграму павышанага ўзроўню назіранняў, сістэмы біялагічных задач і практыкаванняў тэарэтычнага і прыкладнога характару.

У вучэбнай праграме пазначаны асноўныя патрабаванні да ўзроўню падрыхтоўкі вучняў. Асаблівую ўвагу трэба надаць фарміраванню спецыяльных уменняў: праводзіць назіранні, выстаўляць гіпотэзы, афармляць вынікі назіранняў, рабіць на іх аснове вывады, — а таксама фарміраванню агульнавучэбных уменняў працаваць з вучэбнай, навукова-папулярнай і навуковай літаратурай, інтэрнэт-рэсурсамі і г. д.

У праграме раскрыты асноўны змест тэм, вызначаны час, адведзены на іх вывучэнне. Ён уключае ў сябе і час для выканання лабараторных і практычных работ, на правядзенне экскурсій, падагульняльных вучэбных заняткаў, тэматычнага і выніковага кантролю.

Узаемадзеянне біялогіі з іншымі вучэбнымі прадметамі ажыццяўляецца шляхам рэалізацыі міжпрадметных сувязей (выкарыстанне для тлумачэння сутнасці біялагічных працэсаў і з'яў неабходных ведаў з фізікі, хіміі, геаграфіі, гісторыі, матэматыкі).

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА

**(4 гадзіны на тыдзень; усяго 140 гадзін, з іх 5 гадзін — рэзервовы час)**

### Арганізм і асяроддзе (22 гадзіны)

Узроўні арганізацыі жыцця. Экалогія як навука.

*Экалагічныя фактары.* Паняцце пра фактары асяроддзя (экалагічныя фактары). Класіфікацыя экалагічных фактараў. Заканамернасці ўздзеяння фактараў асяроддзя на арганізм. Межы трываласці (талерантнасці). Паняцце пра стэнабіёнты і эўрыбіёнты. Узаемадзеянне экалагічных фактараў. Паняцце пра лімітуючыя фактары.

Святло ў жыцці арганізмаў. Фотаперыяд і фотаперыядызм. Экалагічныя групы раслін у адносінах да светлавога рэжыму.

Тэмпература як экалагічны фактар. Пайкілатэрмныя і гамаятэрмныя арганізмы. Адаптацыі раслін і жывёл да розных тэмпературных умоў.

Вільготнасць як экалагічны фактар. Экалагічныя групы раслін у адносінах да вільгаці. Адаптацыі раслін і жывёл да рознага воднага рэжыму.

Прыстасаванні жывых арганізмаў да сезонных рытмаў умоў пражывання.

*Асяроддзі жыцця і адаптацыі да іх арганізмаў.* Паняцце пра асяроддзе пражывання і ўмовы існавання арганізмаў. Воднае асяроддзе. Тэмпературны, светлавы, газавы і салявы рэжымы гідрасферы. Адаптацыі арганізма да жыцця ў вадзе. Наземна-паветранае і глебавае асяроддзі пражывання. Адаптацыі арганізма да жыцця ў наземна-паветраным асяроддзі і глебе. Жывы арганізм як ася-

роддзе пражывання. Асаблівасці экалагічных умоў унутранага асяроддзя гаспадара. Адаптацыі да жыцця ў іншым арганізме — паразітызм.

***Дэманстрацыі:*** схемы ўздзеяння экалагічных фактараў на арганізмы; табліцы з выявамі раслін і жывёл розных экалагічных груп.

***Лабараторныя работы***

1. Вывучэнне асаблівасцей будовы раслін розных экалагічных груп.

***Практычныя работы***

1. Вывучэнне прыстасаванасці арганізмаў да экалагічных фактараў.
2. Рашэнне задач па тэме «Экалагічныя фактары».
3. Вывучэнне прыстасаванасці жывёл да воднага асяроддзя пражывання.
4. Вывучэнне прыстасаванасці насякомых да наземна-паветранага асяроддзя пражывання.
5. Вывучэнне прыстасаванасці раслін да апылення, распаўсюджвання пладоў і насення.

## **Від і папуляцыя** (10 гадзін)

*Від — біялагічная сістэма.* Паняцце віду. Від як таксанамічная катэгорыя. Крытэрыі віду. Арэал віду. Паняцце пра эндэмікі і касмапаліты.

*Папуляцыя — адзінка віду.* Характарыстыка папуляцыі. Уласцівасці папуляцыі: колькасць, шчыльнасць, нараджальнасць, смяротнасць. Структура папуляцыі: прасторавая, палавая, узроставая, эталагічная (паводзінская).

Дынаміка колькасці папуляцый і яе рэгуляцыя. Прычыны дынамікі колькасці папуляцыі. Незалежныя і залежныя ад шчыльнасці папуляцыі фактары рэгуляцыі колькасці.

***Дэманстрацыі:*** схемы, якія ілюструюць крытэрыі віду, дынаміку колькасці папуляцый.

***Лабараторныя работы***

2. Марфалагічны крытэрый віду.
3. Генетычны крытэрый віду.

***Практычныя работы***

6. Выяўленне зменлівасці ў асобін аднаго віду.

7. Рашэнне задач па тэме «Від. Папуляцыя».

***Экскурсіі***

1. Апісанне відавой разнастайнасці парку (лесу).

## **Экасістэмы** (27 гадзін)

*Экасістэма як адзінства біятопа і біяцэнозу.* Паняцце біяцэнозу і біятопа. Склад біяцэнозу. Сувязі арганізмаў у біяцэнозах: трафічныя, тапічныя, фарычныя, фабрычныя.

Відавая структура біяцэнозу. Прасторавая структура біяцэнозу: вертыкальная (яруснасць) і гарызантальная (мазаічнасць).

Экасістэма. Структура экасістэмы. Прадуцэнты, кансументы, рэдуцэнты. Ланцугі і сеткі харчавання. Пашавыя і дэтрытныя ланцугі. Трафічныя ўзроўні. Экалагічныя пірамiды (піраміда лікаў, піраміда біямас, піраміда энергіі).

Прадукцыйнасць экасістэм. Біямаса і прадукцыйнасць. Першасная і другасная прадукцыя.

*Узаемаадносіны арганізмаў у экасістэмах.* Канкурэнцыя, драпежніцтва, сімбіёз.

*Дынаміка экасістэм.* Сезонная дынаміка. Паняцце экалагічнай сукцэсіі.

*Аграэкасістэмы.* Склад і структура аграэкасістэмы. Адрозненне аграэкасістэм ад прыродных экасістэм.

***Дэманстрацыі:*** схемы структуры біяцэнозу і экасістэмы, яруснага размеркавання арганізмаў, ланцугоў і сетак харчавання, экалагічных пірамід, сувязей арганізмаў у экасістэмах; прыклады сімбіёзу, сезонных змяненняў экасістэм і сукцэсіі, аграэкасістэм.

***Практычныя работы***

8. Складанне ланцугоў харчавання і рашэнне задач па тэме «Ланцугі харчавання».

9. Складанне сетак харчавання ў розных экасістэмах і рашэнне задач па тэме «Сеткі харчавання».

10. Рашэнне задач па тэме «Экалагічныя піраміды, правіла 10 %».

11. Рашэнне задач па тэме «Балансавая роўнасць».

12. Рашэнне задач па тэме «Прадукцыйнасць экасістэм».

13. Рашэнне задач па тэме «Змяненне экасістэм».

14. Параўнальная характарыстыка прыродных экасістэм і аграэкасістэм.

***Экскурсіі***

2. Вывучэнне экасістэм сваёй мясцовасці (відавая і прасторавая структура, сезонныя змяненні, наяўнасць антрапагенных змяненняў).

## **Эвалюцыя арганічнага свету** (24 гадзіны)

*Гіпотэзы паходжання жыцця.* Асноўныя гіпотэзы паходжання жыцця.

*Біялагічная эвалюцыя.* Паняцце біялагічнай эвалюцыі. Развіццё эвалюцыйных поглядаў. Агульная характарыстыка тэорыі эвалюцыі Ч. Дарвіна. Тэорыя штучнага адбору. Рухаючыя сілы і асноўныя вынікі эвалюцыі паводле Ч. Дарвіна.

*Сінтэтычная тэорыя эвалюцыі.* Агульная характарыстыка сінтэтычнай тэорыі эвалюцыі. Папуляцыя — элементарная адзінка эвалюцыі. Элементарная эвалюцыйная з'ява. Передумовы (элементарныя фактары) эвалюцыі. Генетычная разнастайнасць у папуляцыях. Роля мутацыйнай і камбінацыйнай зменлівасці. Міграцыі (паток генаў). Эвалюцыйная роля мадыфікацый. Хвалі жыцця, дрэйф генаў, ізаляцыя.

Рухаючыя сілы эвалюцыі. Барацьба за існаванне. Формы барацьбы за існаванне. Натуральны адбор (рухаючы і стабілізуючы).

Вынікі эвалюцыі. Прыстасаванні — асноўны вынік эвалюцыі. Відаўтварэнне. Фактары відаўтварэння. Спосабы відаўтварэння (алапатрычнае і сімпатрычнае відаўтварэнне). Асноўныя палажэнні сінтэтычнай тэорыі эвалюцыі.

*Макраэвалюцыя і яе доказы.* Паняцце макраэвалюцыі. Палеанталагічныя, эмбрыялагічныя, параўнальна-анатамічныя, малекулярна-генетычныя доказы эвалюцыі.

*Галоўныя напрамкі эвалюцыі.* Прагрэс і рэгрэс у эвалюцыі. Шляхі дасягнення біялагічнага прагрэсу: арагенез, алагенез, катагенез. Спосабы ажыццяўлення эвалюцыйнага прагрэсу (дывергенцыя, канвергенцыя).

*Разнастайнасць сучаснага арганічнага свету як вынік эвалюцыі.* Класіфікацыя арганізмаў. Прынцыпы сістэматыкі. Сучасная біялагічная сістэма.

*Няклетачныя формы жыцця — вірусы*. Будова вірусаў. Пранікненне вірусаў у клетку-гаспадара. Размнажэнне вірусаў. Віроіды. Бактэрыяфагі. Вірулентныя фагі, умераныя фагі.

***Дэманстрацыі:*** мадэлі палеанталагічных знаходак; калекцыі «Формы захаванасці выкапнёвых відаў раслін і жывёл», «Гамалогія плечавога і тазавага паясоў канечнасцей», «Гамалогія будовы канечнасцей наземных пазваночных», «Рудыментарныя органы пазваночных»; табліцы, відэаролікі, якія ілюструюць будову вірусаў, пранікненне іх у клетку, размнажэнне і фарміраванне вірусных часціц.

***Лабараторныя работы***

4. Вывучэнне гамалагічных органаў, рудыментаў і атавізмаў як доказаў эвалюцыі.

5. Выяўленне арамарфозаў і аламарфозаў у раслін.

6. Выяўленне арамарфозаў і аламарфозаў у жывёл.

***Практычныя работы***

15. Параўнальная характарыстыка натуральнага і штучнага адбору.

16. Параўнанне рухаючага і стабілізуючага адбору.

17. Параўнанне алапатрычнага і сімпатрычнага відаўтварэння.

***Экскурсіі***

3. Вынікі натуральнага адбору.

### **Паходжанне і эвалюцыя чалавека** (8 гадзін)

Фарміраванне ўяўленняў пра эвалюцыю чалавека. Месца чалавека ў заалагічнай сістэме.

*Этапы і напрамкі эвалюцыі чалавека*. Папярэднікі чалавека. Аўстралапітэкі. Старажытнейшыя людзі. Чалавек умелы. Чалавек прамахадзячы. Старажытныя і выкапнёвыя людзі сучаснага тыпу.

*Рухаючыя сілы антрапагенезу і іх спецыфіка*. Перадумовы антрапагенезу. Біялагічныя і сацыяльныя фактары. Роля працы ў фарміраванні чалавека. Грамадскі спосаб жыцця як фактар эвалюцыі. Вядучая роля сацыяльных фактараў у гісторыі развіцця чалавека. Якасныя адрозненні чалавека.

Чалавечыя расы, іх паходжанне і адзінства. Расізм. Асаблівасці эвалюцыі чалавека на сучасным этапе.

*Дэманстрацыі:* шкілеты чалавека і пазваночных жывёл; мадэлі выкапнёвых рэшткаў чалавека і яго матэрыяльнай культуры.

### **Паводзіны як вынік эвалюцыі** (4 гадзіны)

Паводзіны як форма адаптацыі жывога арганізма. Узроўні паводзін і эвалюцыя. Формы паводзін: прыроджаныя (таксісы, рэфлексы, інстынкты) і індывідуальна набытыя (навучанне, разумовая дзейнасць). Інстынктыўныя паводзіны беспазваночных і пазваночных жывёл.

Грамадскія паводзіны жывёл: групавы спосаб жыцця, сацыяльная іерархія асобін.

Паводзіны чалавека як сацыябіялагічнага віду, заснаваныя на асаблівасцях яго патрэбнасцей.

Чалавек у сацыяльным асяроддзі. Сурагатныя адносіны. Чалавек і прыроднае асяроддзе.

### **Біясфера — жывая абалонка планеты** (12 гадзін)

*Структура біясферы.* Паняцце біясферы. Межы біясферы. Кампаненты біясферы: жывое і біягеннае рэчыва, відавы склад; біякоснае і коснае рэчыва. Біямаса паверхні сушы, Сусветнага акіяна, глебы. Біягеахімічныя функцыі жывога рэчыва: энергетычная, газавая, акісляльна-аднаўленчая, канцэнтрацыйная.

Кругаварот рэчываў у біясферы. Кругаварот вады, кіслароду, вугляроду і азоту.

*Эвалюцыя біясферы.* Асноўныя этапы развіцця біясферы. Уплыў гаспадарчай дзейнасці чалавека на біясферу. Асноўныя парушэнні ў біясферы, выкліканыя дзейнасцю чалавека (забруджванне навакольнага асяроддзя, вычарпанне прыродных рэсурсаў, апустыньванне). Маштабы парушэнняў (лакальныя, рэгіянальныя, глабальныя). Пагроза экалагічных катастроф і іх папярэджванне.

*Ахова прыроды.* Рацыянальнае прыродакарыстанне, аднаўленне прыродных рэсурсаў і навакольнага асяроддзя. Стварэнне малаадходных тэхналогій. Запаведная справа. Ахоўныя прыродныя тэрыторыі. Захаванне генафонду.

***Дэманстрацыі:*** схемы працягласці біясферы, уплыву гаспадарчай дзейнасці чалавека на прыроду; карты прыродаахоўных тэрыторый Рэспублікі Беларусь.

***Практычныя работы***

18. Складанне схем кругавароту рэчываў.

19. Прагназаванне і мадэліраванне змяненняў у экасістэме пад дзеяннем антрапагенных фактараў.

## **Падагульняльнае паўтарэнне** (28 гадзін)

### Малекулярны і клетачны ўзроўні арганізацыі жыцця (6 гадзін)

Будова малекул бялкоў, ліпідаў, вугляводаў, нуклеінавых кіслот і іх біялагічная роля. Асаблівасці будовы і функцыянавання ферментаў. Захоўванне спадчыннай інфармацыі. Біялагічна актыўныя рэчывы.

Асаблівасці будовы клеткі як найменшай жывой сістэмы. Працэсы, якія адбываюцца на ўзроўні клеткі: паступленне рэчываў у клетку і вывядзенне з яе, пераўтварэнне рэчываў, сінтэз АТФ, нуклеінавых кіслот, бялкоў, вугляводаў (фотасінтэз). Узнаўленне клеткі, перадача спадчыннай інфармацыі, гены і храмасомы.

### Арганізменны ўзровень арганізацыі жыцця (8 гадзін)

Аднаклетачныя, каланіяльныя і мнагаклетачныя арганізмы. Тканкі, органы і сістэмы органаў. Прыметы жывых арганізмаў, іх праяўленні ў бактэрый, пратыстаў, грыбоў, раслін і жывёл. Рэгуляцыя функцый у жывых арганізмах. Абарона арганізма ад чужародных цел. Спосабы размнажэння арганізмаў. Утварэнне і развіццё палавых клетак. Індывідуальнае развіццё арганізмаў, у тым ліку арганізма чалавека. Заканамернасці спадчыннасці і зменлівасці арганізмаў, у тым ліку арганізма чалавека. Узаемасувязь арганізмаў з навакольным асяроддзем, адаптацыі арганізма да асяроддзя пражывання.

### Папуляцыйна-відавы ўзровень (2 гадзіны)

Віды жывых арганізмаў, крытэрыі віду. Папуляцыя, уласцівасці і структура папуляцыі, дынаміка колькасці папуляцыі і яе рэгуляцыя.

## Экасістэмны ўзровень арганізацыі жыцця (4 гадзіны)

Структура экасістэм. Функцыі арганізмаў у экасістэме. Сувязі арганізмаў розных відаў у экасістэме. Харчовыя сувязі. Паток рэчыва і энергіі ў экасістэме. Умовы існавання экасістэм — прыток сонечнай энергіі і кругаварот рэчываў. Прадукцыйнасць экасістэм. Дынаміка экасістэм. Аграэкасістэмы.

## Эвалюцыя відаў жывых арганізмаў (8 гадзін)

Канцэпцыі і тэорыі эвалюцыі. Перадумовы, механізмы і вынікі эвалюцыі з пазіцый сінтэтычнай тэорыі эвалюцыі. Спосабы відаўтварэння. Макраэвалюцыя і яе заканамернасці. Асаблівасці эвалюцыі чалавека.

Разнастайнасць жыцця — вынік эвалюцыі. Сучасная біялагічная сістэма. Параўнальная характарыстыка асноўных таксонаў жывых арганізмаў (царстваў, тыпаў, аддзелаў, класаў кветкавых раслін, класаў хордавых жывёл).

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

### Арганізм і асяроддзе

Вучань павінен:

*ведаць:*

- узроўні арганізацыі жыцця;
- класіфікацыю экалагічных фактараў;
- заканамернасці ўздзеяння экалагічных фактараў на арганізмы, узаемадзеяння экалагічных фактараў;
- ролю святла, тэмпературы, вады ў жыцці жывых арганізмаў;
- адаптацыі жывых арганізмаў да асяроддзя пражывання;
- экалагічныя групы жывёл і раслін у адносінах да пэўнага фактару асяроддзя;

*мець уяўленне:*

- пра межы трываласці арганізмаў;
- стэнабіёнты і эўрыбіёнты;
- пайкілатэрмных і гамаятэрмных жывёл;

*разумець сутнасць* узаемасувязі арганізмаў і навакольнага асяроддзя;

*умець:*

- ♦ праводзіць назіранні за жывымі арганізмамі з мэтай высвятлення іх прыстасаванасці да асяроддзя пражывання;
- ♦ характарызаваць узроўні арганізацыі жыцця, асяроддзі жыцця, адаптацыі жывых арганізмаў розных відаў да асяроддзя пражывання;
- ♦ рашаць экалагічныя задачы;
- ♦ складаць кароткі канспект прачытанага тэксту, вылучаць галоўнае, ставіць пытанні да тэксту, складаць кароткія рэфераты;
- ♦ будаваць схемы, табліцы, дыяграмы, графікі на аснове пэўных даных;
- ♦ знаходзіць неабходную інфармацыю ў розных крыніцах і выкарыстоўваць яе для вырашэння праблем, якія ўзнікаюць;

*валодаць* асноўнымі тэрмінамі і паняццямі пры апісанні заканамернасцей уздзеяння экалагічных фактараў на жывыя арганізмы і іх адаптацыі да асяроддзя жыцця;

*выкарыстоўваць набытыя веды:*

- ♦ для стварэння аптымальных умоў пры вырошчванні культурных і пакаёвых раслін, утрыманні свойскіх жывёл;
- ♦ прадухілення неспрыяльных уздзеянняў фактараў асяроддзя на арганізм чалавека.

### Від і папуляцыя

Вучань павінен:

*ведаць:*

- ♦ крытэрыі віду;
- ♦ асноўныя ўласцівасці папуляцыі, структуру папуляцыі;
- ♦ прычыны дынамікі колькасці папуляцый і механізмы яе рэгуляцыі;

*мець уяўленне:*

- ♦ пра касмапаліты і эндэмікі;
- ♦ абсалютную і ўдзельную нараджальнасць і смяротнасць;
- ♦ размеркаванне асобін у папуляцыі;
- ♦ ёмістасць асяроддзя;

*разумець сутнасць:*

- ♦ папуляцыйна-відавога ўзроўню арганізацыі жыцця;
- ♦ працэсаў, якія адбываюцца на ўзроўні віду і папуляцыі;

*умець:*
- правodзіць параўнанне розных відаў арганізмаў;
- адрозніваць віды па марфалагічным крытэрыі;
- вызначаць віды па вызначальніку або вызначальных картках, складаць ключы для вызначэння відаў;
- праводзіць назіранні за арганізмамі відаў раслін і жывёл;
- рашаць экалагічныя задачы;

*валодаць* асноўнымі тэрмінамі і паняццямі пры апісанні відаў і папуляцый;

*выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні:*
- для вызначэння відавой разнастайнасці;
- абгрунтавання мер па іх ахове і асабістым удзеле ў ахоўных мерапрыемствах;
- правядзення назіранняў за арганізмамі розных відаў у прыродзе.

**Экасістэмы**

Вучань павінен:

*ведаць:*
- структуру біяцэнозу, экасістэмы;
- сувязі арганізмаў у экасістэмах;
- функцыі жывых арганізмаў у экасістэме;
- віды змянення экасістэм;
- асноўныя аграэкасістэмы і іх адрозненні ад натуральных экасістэм;

*мець уяўленне:*
- пра відавое багацце і відавую насычанасць біяцэнозу;
- дамінанты і эдыфікатары;

*разумець сутнасць* кругавароту рэчываў і пераўтварэння энергіі ў экасістэмах;

*умець:*
- тлумачыць узаемадзеянне і ўзаемасувязь кампанентаў экасістэмы;
- характарызаваць прадукцыйнасць экасістэм;
- складаць ланцугі і сеткі харчавання, экалагічныя пірамiды і аналізаваць іх;
- параўноўваць натуральныя і штучныя экасістэмы;
- рашаць экалагічныя задачы;

*валодаць* навыкамі рашэння экалагічных задач;
*выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні:*
- для стварэння і падтрымання ўстойлівасці штучных экасістэм: акварыума, саду, сквера, парку, агарода і г. д.;
- абгрунтавання мер па ахове прыродных экасістэм;
- вырошчвання экалагічна чыстай сельскагаспадарчай прадукцыі.

### Эвалюцыя арганічнага свету

Вучань павінен:
*ведаць:*
- асноўныя гіпотэзы паходжання жыцця на Зямлі;
- асноўныя палажэнні эвалюцыйнай тэорыі Ч. Дарвіна і сінтэтычнай тэорыі эвалюцыі;
- перадумовы, рухаючыя сілы і вынікі эвалюцыі;
- формы барацьбы за існаванне;
- спосабы дасягнення гетэрагеннасці папуляцый;
- формы натуральнага адбору і механізм іх дзеяння;
- спосабы відаўтварэння;
- шляхі і спосабы дасягнення біялагічнага прагрэсу;
- доказы эвалюцыі;
- асноўныя таксанамічныя адзінкі, якія выкарыстоўваюцца ў сістэматыцы;
- прынцыпы класіфікацыі відаў жывых арганізмаў і сучасную біялагічную сістэму;
- асаблівасці будовы вірусаў, спосабы пранікнення ў жывыя арганізмы, размнажэнне, вірусныя захворванні, метады іх прафілактыкі і лячэння;

*разумець сутнасць:*
- эвалюцыйнай тэорыі Ч. Дарвіна;
- сінтэтычнай тэорыі эвалюцыі;
- эвалюцыйнага працэсу;

*умець:*
- характарызаваць эвалюцыйны працэс, перадумовы, рухаючыя сілы і вынікі эвалюцыі;
- характарызаваць біялагічны і морфафізіялагічны прагрэс і рэгрэс, іх ролю ў эвалюцыі, спосабы і шляхі дасягнення прагрэсу і рэгрэсу групамі арганізмаў;

- распазнаваць рудыменты і атавізмы;
- выконваць меры па прафілактыцы вірусных хвароб;
- рашаць біялагічныя задачы;
- аналізаваць тэксты, рыхтаваць па іх кароткія паведамленні, складаць анатацыі;

*валодаць* паняційным апаратам для апісання працэсаў біялагічнай эвалюцыі;

*выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні:*

- для крытычнага аналізу публікацый у сродках масавай інфармацыі пра эвалюцыю;
- тлумачэння працэсаў фарміравання адаптацый у арганізмаў розных відаў, відаўтварэння, разнастайнасці відаў жывых арганізмаў;
- прафілактыкі віруснай інфекцыі.

### Паходжанне і эвалюцыя чалавека

Вучань павінен:

*ведаць:*

- становішча чалавека ў заалагічнай сістэме, перадумовы і рухаючыя сілы эвалюцыі чалавека;
- якасныя адрозненні чалавека ад жывёл;
- расы чалавека і іх адметныя рысы;
- асаблівасці эвалюцыі чалавека на сучасным этапе;

*разумець сутнасць* працэсу эвалюцыі чалавека;

*умець:*

- абгрунтоўваць месца чалавека ў заалагічнай сістэме;
- характарызаваць этапы антрапагенезу, ролю біялагічных і сацыяльных фактараў у эвалюцыі чалавека;
- даказваць адзінства чалавечых рас;
- знаходзіць у біялагічных слоўніках і даведніках значэнне тэрмінаў, звязаных з праблемай эвалюцыі чалавека, у розных крыніцах (у тым ліку і ў інтэрнэце) неабходную інфармацыю па эвалюцыі чалавека;
- праводзіць параўнанне будовы і функцыянавання арганізма чалавека і жывёл;

*валодаць:*

- асноўнымі тэрмінамі і паняццямі па эвалюцыі чалавека;

- навыкамі аналізу тэкстаў, вылучэння галоўнага, напісання анатацый, кароткіх паведамленняў, выступлення з паведамленнямі, вядзення дыскусіі;

*выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні* для крытычнага аналізу публікацый у сродках масавай інфармацыі па эвалюцыі чалавека.

### Паводзіны як вынік эвалюцыі

Вучань павінен:

*ведаць* формы паводзін (прыроджаныя і набытыя) жывёл і чалавека;

*разумець сутнасць* паводзін як адаптацыі жывога арганізма, сурагатных адносін;

*умець:*

- характарызаваць прыроджаныя і індывідуальна набытыя формы паводзін;
- адрозніваць праяўленні ў прыродзе розных форм паводзін;
- характарызаваць асаблівасці паводзін чалавека як біясацыяльнай істоты;
- праводзіць назіранні за жывёламі ў прыродзе;

*валодаць* асноўнымі тэрмінамі і паняццямі пры апісанні паводзін чалавека і жывёл;

*выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні* для абгрунтавання і захавання норм паводзін чалавека ў грамадстве.

### Біясфера — жывая абалонка планеты

Вучань павінен:

*ведаць:*

- межы біясферы, кампаненты біясферы, біягеахімічныя функцыі жывога рэчыва;
- асноўныя парушэнні ў біясферы, выкліканыя дзейнасцю чалавека;
- асноўныя забруджвальнікі навакольнага асяроддзя, прычыны і вынікі забруджвання біясферы, абяднення рэсурсаў;
- запаведнікі і нацыянальныя паркі Рэспублікі Беларусь;
- уплыў чалавека на біясферу;
- глабальныя і рэгіянальныя экалагічныя праблемы;
- асноўныя этапы эвалюцыі біясферы;

*разумець сутнасць* вучэння пра біясферу;
*умець:*
- ♦ абгрунтоўваць неабходнасць аховы біясферы, захавання генафонду і відавой разнастайнасці арганічнага свету;
- ♦ складаць схемы кругавароту рэчываў у біясферы;
- ♦ рашаць экалагічныя задачы;

*валодаць* навыкамі аналізу тэкстаў, вылучэння галоўнага, напісання анатацый, кароткіх паведамленняў, выступлення з паведамленнямі, вядзення дыскусіі па праблемах біясферы, ролі чалавека ў біясферы;
*выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні:*
- ♦ для абгрунтавання мер па ахове навакольнага асяроддзя, рэдкіх відаў і відаў, якія знікаюць, жывых арганізмаў;
- ♦ памяншэння забруджвання навакольнага асяроддзя бытавымі адходамі, эканомнага расходавання вады, электраэнергіі, цяпла і г. д.

### Падагульняльнае паўтарэнне

Вучань павінен:
*ведаць:*
- ♦ узроўні арганізацыі жыцця і іх элементарныя адзінкі;
- ♦ асаблівасці структуры жывых сістэм на кожным узроўні арганізацыі;
- ♦ асноўныя працэсы і з’явы, характэрныя для жывых сістэм кожнага ўзроўню арганізацыі;
- ♦ асноўныя біялагічныя тэорыі і законы (клетачная, храмасомная, тэорыя эвалюцыі, законы Мендэля, біягенетычны закон і інш.);

*разумець сутнасць:*
- ♦ структурнай арганізацыі жыцця на Зямлі;
- ♦ узаемасувязі жывых сістэм розных узроўняў;

*умець:*
- ♦ аналізаваць і абагульняць матэрыял падручнікаў (вучэбных дапаможнікаў), навуковых і навукова-папулярных выданняў, інтэрнэт-крыніц і г. д.;
- ♦ супастаўляць вывучаныя паняцці, шукаць новыя сувязі і адносіны паміж імі, прасочваць развіццё паняццяў у іх іерархічнай залежнасці, г. зн. вызначаць падпарадкаванасць ў выпадку супастаўлення паняццяў;

- класіфікаваць веды, прыводзіць іх у сістэму;
- вычляняць галоўныя ідэі і сістэматызаваць матэрыял вакол асноўных паняццяў;
- выяўляць узаемасувязь будовы і функцый;
- знаходзіць агульныя прыметы ў будове і жыццядзейнасці розных біялагічных сістэм;
- выяўляць сувязь паміж біялагічнымі сістэмамі і падсістэмамі (паміж арганоідамі, клеткамі, органамі і сістэмамі органаў, арганізмамі ў экасістэмах, рознымі экасістэмамі);
- знаходзіць рысы ўскладнення ў арганізмаў розных сістэматычных груп;
- параўноўваць аб’екты і афармляць матэрыял параўнання ў табліцы;
- складаць аналітычныя, параўнальныя і абагульняльныя табліцы;
- пераводзіць таблічны матэрыял у дыяграмы і графікі;

*валодаць:*

- спосабамі арыентацыі ў інтэрнэт-крыніцах інфармацыі (часопісы, сайты, адукацыйныя парталы і г. д.);
- рознымі сродкамі камунікацыі;
- асноўным паняційным апаратам.

## ЛІТАРАТУРА

### *Для настаўніка*

Кодекс Республики Беларусь об образовании. — Минск : Нац. центр правовой информ. Респ. Беларусь, 2011. — 400 с.

Положение об учреждении общего среднего образования, утвержденное постановлением Министерства образования Республики Беларусь от 20.12.2011 № 283.

Правила проведения аттестации учащихся при освоении содержания образовательных программ общего среднего образования, утвержденные постановлением Министерства образования Республики Беларусь от 20.06.2011 № 38.

Санитарные нормы и правила «Требования для учреждений общего среднего образования», утвержденные постановлением Министерства здравоохранения Республики Беларусь от 27.12.2012 № 206.

*Борщевская, Е. В.* Методические рекомендации по использованию электронных образовательных ресурсов по учебному предмету «Биология» / Е. В. Борщевская // Біялогія і хімія. — 2013. — № 2. — С. 49—51.

*Гарбар, Е. Е.* Развитие умений работать с текстом / Е. Е. Гарбар // Біялогія і хімія. — 2013. — № 11. — С. 19—24.

*Гричик, В. В.* Уроки биологии в 10—11 классах : пособие для учителей учреждений общ. сред. образования с белорус. и рус. яз. обучения / В. В. Гричик [и др.]. — Минск : Аверсэв, 2014. — 159 с.

*Клевец, И. Р.* Подходы к развитию у учащихся коммуникативных умений на уроках биологии / И. Р. Клевец // Біялогія і хімія. — 2013. — № 12. — С. 24—38.

*Яковлева, Т. Г.* Использование технологии развития критического мышления на уроках биологии / Т. Г. Яковлева // Біялогія і хімія. — 2014. — № 1. — С. 28—35.

*Яцына, И. Д.* Активизация познавательной деятельности учащихся интегрированными методами / И. Д. Яцына // Біялогія і хімія. — 2013. — № 12. — С. 43—47.

### *Для вучняў*

*Маглыш, С. С.* Біялогія : вучэб. дапам. для 11-га кл. устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / С. С. Маглыш, А. Я. Карэўскі ; пад рэд. С. С. Маглыш. — 2-е выд., выпр. і дап. — Мінск : Народная асвета, 2016. — 261 с.

*Дубков, С. Г.* Сборник задач по общей биологии. 10—11 класс / С. Г. Дубков, И. В. Богачева, И. Р. Клевец. — Минск : Сэр-Вит, 2016. — 88 с.

*Хруцкая, Т. В.* Сшытак для лабораторных і практычных работ па біялогіі для 11 класа : дапам. для вучняў устаноў агул. сярэд. адукацыі з беларус. мовай навучання / Т. В. Хруцкая. — Мінск : Аверсэв, 2015. — 32 с.

*Хруцкая, Т. В.* Рабочая тетрадь по биологии для 11 класса : пособие для учащихся учреждений общ. сред. образования с рус. яз. обучения / Т. В. Хруцкая. — Минск : Аверсэв, 2014, 2015. — 127 с.

*Маглыш, С. С.* Тетрадь для практических, лабораторных работ и экскурсий по биологии для 11 класса : пособие для учащихся учреждений общ. сред. образования с рус. яз. обучения / С. С. Маглыш. — 2-е изд. — Минск : Сэр-Вит, 2014. — 64 с.

*Маглыш, С. С.* Рабочая тетрадь по биологии для 11 класса : пособие для учащихся учреждений общ. сред. образования с рус. яз. обучения / С. С. Маглыш, А. Е. Каревский. — 2-е изд. — Минск : Сэр-Вит, 2014. — 160 с.

# ФІЗІКА

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

### Агульная характарыстыка вучэбнага прадмета. Каштоўнасныя арыенціры зместу вучэбнага прадмета

Значэнне вучэбнага прадмета «Фізіка» вызначаецца той роляй, якую адыгрывае фізічная навука ў жыцці сучаснага грамадства, яе ўплывам на тэмпы развіцця навукова-тэхнічнага прагрэсу, культуры чалавека, фарміраванне сацыяльна значных арыентацый, якія забяспечваюць гарманізацыю адносін чалавека з навакольным светам.

Фізіка як навука пра найбольш агульныя законы прыроды і як вучэбны прадмет уносіць істотны ўклад у сістэму ведаў пра навакольны свет. Яна раскрывае ролю навукі ў эканамічным і культурным развіцці грамадства, садзейнічае фарміраванню сучаснага навуковага светапогляду.

Для вырашэння задач фарміравання асноў навуковага светапогляду, развіцця інтэлектуальных здольнасцей і пазнавальных інтарэсаў вучняў у працэсе вывучэння фізікі асноўную ўвагу неабходна надаваць не перадачы сумы гатовых ведаў, а знаёмству з метадамі навуковага пазнання навакольнага свету, пастаноўцы праблем, якія патрабуюць ад вучняў самастойнай дзейнасці па іх вырашэнні.

Гуманітарнае значэнне фізікі як састаўной часткі агульнай сярэдняй адукацыі заключаецца ў тым, што яна садзейнічае авалоданню вучнямі навуковым метадам пазнання, які дазваляе атрымліваць аб'ектыўныя веды пра навакольны свет.

Веданне фізічных законаў неабходна для вывучэння хіміі, біялогіі, астраноміі і іншых навук.

Вывучэнне фізікі на павышаным узроўні накіравана на больш глыбокае авалоданне асноўнымі фізічнымі паняццямі і законамі, неабходнымі для далейшай паспяховай адукацыйнай і прафесійнай дзейнасці.

Змест вучэбнага прадмета «Фізіка» ў XI класе, канцэнтруючыся па змястоўных лініях (фізічныя метады даследавання з'яў прыроды, фізічныя аб'екты і заканамернасці ўзаемадзеяння паміж імі, фізічныя аспекты жыццядзейнасці чалавека), структуруецца на аснове фізічных тэорый: адноснасці, хвалевай, квантава-механічнай.

## Месца вучэбнага прадмета ў Тыпавым вучэбным плане агульнай сярэдняй адукацыі

Тыпавы вучэбны план агульнай сярэдняй адукацыі ўстанаўлівае для XI класа на вывучэнне фізікі на павышаным узроўні 4 вучэбныя гадзіны на тыдзень.

Час, прапанаваны на вывучэнне асобных тэм у змесце вучэбнага прадмета, з'яўляецца прыкладным. Гэта залежыць ад таго, якія метады навучання і педагагічныя тэхналогіі, формы вучэбных заняткаў выкарыстоўвае настаўнік, і ад вучэбных дасягненняў вучняў.

## Мэты і задачы вывучэння вучэбнага прадмета на павышаным узроўні

Вывучэнне фізікі на павышаным узроўні ў XI класе накіравана на дасягненне наступных мэт і задач:

- засваенне ведаў пра метады навуковага пазнання прыроды; сучасную фізічную карціну свету: уласцівасці рэчыва і поля, прасторава-часавыя заканамернасці, дынамічныя і статыстычныя законы прыроды; знаёмства з асновамі фундаментальных фізічных тэорый;
- авалоданне ўменнямі праводзіць назіранні, планаваць і выконваць эксперымент, апрацоўваць рэзультаты вымярэнняў і прадстаўляць іх у выглядзе табліц, графікаў, дыяграм, выстаўляць гіпотэзы і будаваць мадэлі, устанаўліваць межы іх прымянімасці;
- прымяненне ведаў для тлумачэння з'яў прыроды, уласцівасцей рэчыва, прынцыпу работы тэхнічных устройстваў, рашэння фізічных задач, самастойнага набыцця і ацэнкі дакладнасці новай інфармацыі фізічнага зместу, выкарыстання сучасных інфармацыйных тэхналогій для пошуку, перапрацоўкі і прад'яўлення вучэбнай і навукова-папулярнай інфармацыі па фізіцы;

- развіццё пазнавальных інтарэсаў, інтэлектуальных і творчых здольнасцей у працэсе рашэння фізічных задач і самастойнага набыцця новых ведаў пры выкананні праектаў, эксперыментальных даследаванняў, падрыхтоўцы дакладаў, рэфератаў і іншых творчых работ;
- выхаванне здольнасці да супрацоўніцтва ў працэсе сумеснага выканання задач, уважлівых адносін да меркавання апанента, абгрунтавання выказваемай пазіцыі, гатоўнасці да маральна-этычнай ацэнкі выкарыстання навуковых дасягненняў, гордасці за вучоных-фізікаў, якія сыгралі вядучую ролю ў стварэнні сучаснага свету навукі і тэхнікі;
- выкарыстанне набытых ведаў і ўменняў для вырашэння практычных, жыццёвых задач, рацыянальнага прыродакарыстання і аховы навакольнага асяроддзя, забеспячэння бяспекі жыццядзейнасці чалавека і грамадства.

У працэсе асваення зместу вучэбнага прадмета «Фізіка» прадугледжваецца фарміраванне ў вучняў прадметных і метапрадметных уменняў і навыкаў, універсальных спосабаў дзейнасці і ключавых кампетэнцый.

Прыярытэтамі пры вывучэнні зместу фізікі на павышаным узроўні з’яўляюцца: *вучэбна-пазнавальная дзейнасць, інфармацыйна-камунікатыўная дзейнасць, рэфлексіўная дзейнасць*.

***Вучэбна-пазнавальная дзейнасць:***

- выкарыстанне для пазнання навакольнага свету розных прыродазнаўчанавуковых метадаў: назірання, вымярэння, эксперыменту, мадэліравання;
- фарміраванне ўменняў адрозніваць факты, гіпотэзы, прычыны, вынікі, доказы, законы, тэорыі;
- авалоданне адэкватнымі спосабамі рашэння тэарэтычных і эксперыментальных задач;
- набыццё вопыту выбару гіпотэз для тлумачэння вядомых фактаў і для эксперыментальнай праверкі выбраных гіпотэз.

***Інфармацыйна-камунікатыўная дзейнасць:***

- валоданне маналагічным і дыялагічным маўленнем, здольнасць разумець пункт гледжання суразмоўніка і прызнаваць права на іншае меркаванне;
- выкарыстанне для вырашэння пазнавальных і камунікатыўных задач розных крыніц інфармацыі.

***Рэфлексіўная дзейнасць:***

- валоданне навыкамі кантролю і ацэнкі сваёй дзейнасці, уменне прадбачыць магчымыя вынікі сваіх дзеянняў;
- арганізацыя вучэбнай дзейнасці: пастаноўка мэты, планаванне, вызначэнне аптымальных суадносін мэты і сродкаў.

Пры вывучэнні фізікі асноўная ўвага павінна надавацца фарміраванню ў вучняў фізічных паняццяў на аснове назіранняў фізічных з'яў, выкананню вучнямі самастойных эксперыментаў з наступным аналізам іх вынікаў, развіццю ўменняў прымяняць на практыцы тэарэтычныя веды, атрыманыя на ўроках фізікі. Асноўныя паняцці і законы фізікі павінны быць пададзены вучням не як канчатковыя і нязменныя ісціны, а ў іх гістарычным развіцці з высвятленнем меж прымянімасці вывучаных законаў, з прыкладамі існавання розных сістэм навуковых паняццяў.

### Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў

Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў на павышаным узроўні накіраваны на рэалізацыю кампетэнтнаснага падыходу; фарміраванне метапрадметных, агульнапрадметных і прадметных кампетэнцый, у выніку якіх вучань набывае сукупнасць ведаў, якія забяспечваюць фарміраванне сучаснай фізічнай карціны свету; уменняў, навыкаў, вопыту дзейнасці, неабходных для працягу прафесійнай адукацыі, працоўнай дзейнасці, паспяховай сацыялізацыі ў грамадстве, асобаснага і прафесійнага развіцця, а таксама веды для захавання навакольнага асяроддзя і здароўя.

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА

**(140 гадзін)**

### ВАГАННІ І ХВАЛІ

### 1. Механічныя ваганні і хвалі (25 гадзін)

Вагальны рух. Гарманічныя ваганні. Амплітуда, перыяд, частата, фаза ваганняў. Ураўненне гарманічных ваганняў.

Спружынны і матэматычны маятнікі.

Ператварэнні энергіі пры гарманічных ваганнях. Свабодныя і вымушаныя ваганні. Рэзананс.

Распаўсюджванне ваганняў у пругкім асяроддзі. Хвалі. Частата, даўжыня, скорасць распаўсюджвання хвалі і сувязь паміж імі.

Гук.

***Дэманстрацыі, доследы, камп'ютарныя мадэлі***

- Ваганні цела на нітцы і спружыне.
- Кінематычная мадэль гарманічных ваганняў.
- Залежнасць каардынаты цела, якое вагаецца, ад часу.
- Залежнасць перыяду гарманічных ваганняў матэматычнага маятніка ад яго даўжыні.
- Вымушаныя ваганні.
- Рэзананс.
- Утварэнне і распаўсюджванне папярочных і падоўжных хваль.
- Цела, якое вагаецца, як крыніца гуку (камертон).
- Залежнасць гучнасці гуку ад амплітуды ваганняў.
- Залежнасць вышыні тону ад частаты ваганняў.

## АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучань павінен:

*мець уяўленне* пра фізічныя з'явы: хвалевы рух, гукавая хваля;

*ведаць/разумець:*

- ♦ сэнс фізічных мадэлей: матэматычны і спружынны маятнікі, падоўжныя і папярочныя хвалі;
- ♦ сэнс фізічных паняццяў і з'яў: свабодныя ваганні, гарманічныя ваганні, амплітуда, перыяд, частата, фаза ваганняў, вымушаныя ваганні, рэзананс, даўжыня хвалі, скорасць распаўсюджвання хвалі;

*умець* апісваць/тлумачыць фізічныя з'явы: механічныя ваганні і хвалі, рэзананс;

*валодаць:*

- ♦ эксперыментальнымі ўменнямі: вызначаць асноўныя характарыстыкі гарманічных ваганняў;

♦ практычнымі ўменнямі: рашаць якасныя, графічныя, разліковыя задачы на вызначэнне амплітуды, перыяду, частаты ваганняў спружыннага і матэматычнага маятнікаў, фазы, зрушэння, скорасці, паскарэння і энергіі гарманічных ваганняў, даўжыні і скорасці хвалі з выкарыстаннем ураўнення гарманічнага вагання, формул: перыяду і частаты ваганняў спружыннага і матэматычнага маятнікаў, сувязі частаты, даўжыні і скорасці распаўсюджвання хвалі.

***Франтальныя лабараторныя работы***

1. Вывучэнне ваганняў грузу на нітцы.

2. Вымярэнне паскарэння свабоднага падзення з дапамогай матэматычнага маятніка.

3. Вымярэнне жорсткасці спружыны на аснове заканамернасцей ваганняў спружыннага маятніка.

### 2. Электрамагнітныя ваганні і хвалі (23 гадзіны)

Вагальны контур. Свабодныя электрамагнітныя ваганні ў контуры. Формула Томсана.Ператварэнні энергіі ў вагальным контуры.

Пераменны электрычны ток.

Трансфарматар. Вытворчасць, перадача і размеркаванне электрычнай энергіі. Экалагічныя праблемы вытворчасці, перадачы і размеркавання электрычнай энергіі.

Электрамагнітныя хвалі і іх уласцівасці. Шкала электрамагнітных хваль.

Розныя віды электрамагнітнага выпраменьвання і яго практычнае прымяненне. Дзеянне электрамагнітнага выпраменьвання на жывыя арганізмы.

***Дэманстрацыі, доследы, камп'ютарныя мадэлі***

- Электрамагнітныя ваганні.
- Залежнасць частаты электрамагнітных ваганняў ад электраёмістасці і індуктыўнасці контуру.
- Атрыманне пераменнага току пры вярчэнні праводзячага вітка ў магнітным полі.
- Асцылаграмы пераменнага току.
- Перадача электрычнай энергіі на адлегласць.

- Трансфарматар.
- Выпраменьванне і прыём электрамагнітных хваль.
- Уласцівасці электрамагнітных хваль.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ
ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучань павінен:

*мець уяўленне:*

- пра шкалу электрамагнітных хваль;
- скорасць распаўсюджвання электрамагнітнай хвалі;
- шляхі развіцця электраэнергетыкі і экалагічныя праблемы вытворчасці і перадачы электраэнергіі;
- уласцівасці і прымяненне інфрачырвоных, ультрафіялетавых і рэнтгенаўскіх выпраменьванняў;

*ведаць/разумець* сэнс фізічных паняццяў: вагальны контур, свабодныя электрамагнітныя ваганні, пераменны электрычны ток, амплітудныя і дзеючыя значэнні сілы пераменнага току і напружання, трансфарматар;

*умець* апісваць і тлумачыць фізічныя з'явы: электрамагнітныя ваганні, пераменны электрычны ток, электрамагнітныя хвалі;

*валодаць* практычнымі ўменнямі: рашаць якасныя, графічныя, разліковыя задачы на вызначэнне перыяду і энергетычных характарыстык электрамагнітных ваганняў, дзеючых значэнняў сілы току і напружання, каэфіцыента трансфармацыі, характарыстык электрамагнітных хваль з выкарыстаннем формул: Томсана, энергіі электрамагнітных ваганняў, дзеючых значэнняў сілы току і напружання, сувязі даўжыні і частаты хвалі.

## **3. Оптыка** (39 гадзін)

Электрамагнітная прырода святла.

Інтэрферэнцыя святла, яе назіранне і прымяненне.

Прынцып Гюйгенса — Фрэнеля. Дыфракцыя святла. Дыфракцыйная рашотка.

Закон адбіцця святла. Сферычнае люстэрка.

Закон праламлення святла. Паказчык праламлення. Поўнае адбіццё.

Формула тонкай лінзы. Аптычныя прыборы.

Папярочнасць светлавых хваль. Палярызацыя святла.

Дысперсія святла. Спектр. Спектральныя прыборы.

***Дэманстрацыі, доследы, камп'ютарныя мадэлі***

- Інтэрферэнцыя святла.
- Дыфракцыя святла.
- Атрыманне спектра з дапамогай дыфракцыйнай рашоткі.
- Закон праламлення святла.
- Поўнае адбіццё святла.
- Святлавод.
- Аптычныя прыборы.
- Атрыманне спектра з дапамогай прызмы.
- Нябачныя выпраменьванні ў спектры нагрэтага цела.

### АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучань павінен:

*мець уяўленне:*

♦ пра электрамагнітную прыроду святла;

♦ назіранне і прымяненне інтэрферэнцыі;

♦ устройства і прынцыпы дзеяння аптычных і спектральных прыбораў;

♦ уклад беларускіх вучоных у развіццё фізічнай оптыкі;

*ведаць/разумець:*

♦ сэнс фізічных паняццяў і з'яў: кагерэнтнасць, інтэрферэнцыя, дыфракцыя, дысперсія, паказчык праламлення, палярызацыя святла;

♦ сэнс фізічных законаў і прынцыпаў: адбіцця і праламлення святла, прынцыпу Гюйгенса — Фрэнеля;

*умець* апісваць і тлумачыць фізічныя з'явы: адбіццё, праламленне святла, інтэрферэнцыю, дыфракцыю, палярызацыю, дысперсію;

*валодаць:*

♦ эксперыментальнымі ўменнямі: вызначаць даўжыню хвалі бачнага святла, паказчык праламлення рэчыва, фокусныя адлегласці збіральных і рассейвальных лінз;

♦ практычнымі ўменнямі: рашаць якасныя, графічныя, разліковыя задачы на вызначэнне даўжыні светлавой хвалі, парадку дыфракцыйных максімумаў, на пабудову ходу светлавых праменяў у прызмах і плоскапаралельных пласцінах, у люстрах і сістэмах лінз; характарыстык выявы ў люстрах,

тонкіх лінзах з выкарыстаннем законаў прамалінейнага распаўсюджвання, адбіцця і пралямлення святла, формул: дыфракцыйнай рашоткі, сферычнага люстэрка, тонкай лінзы.

***Франтальныя лабараторныя работы***

4. Вымярэнне даўжыні светлавой хвалі з дапамогай дыфракцыйнай рашоткі.

5. Вымярэнне паказчыка пралямлення шкла.

6. Вывучэнне тонкіх лінз.

### 4. Асновы спецыяльнай тэорыі адноснасці (8 гадзін)

Прынцып адноснасці Галілея і электрамагнітныя з’явы. Пастулаты Эйнштэйна. Пераўтварэнні Лорэнца. Прастора і час у спецыяльнай тэорыі адноснасці.

Закон узаемасувязі масы і энергіі.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ
ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучань павінен:

*мець уяўленне* пра адноснасць адначасовасці;

*ведаць/разумець:*

♦ пастулаты Эйнштэйна, вынікі з пераўтварэнняў Лорэнца;

♦ сэнс фізічных законаў: узаемасувязь масы і энергіі;

*валодаць* практычнымі ўменнямі: рашаць якасныя, разліковыя задачы на вызначэнне скарачэння даўжыні, запавольванне часу ў розных інерцыяльных сістэмах адліку, на прымяненне закону ўзаемасувязі масы і энергіі.

## КВАНТАВАЯ ФІЗІКА

### 5. Фатоны. Дзеянні святла (9 гадзін)

Фотаэфект. Унутраны і знешні фотаэфект. Эксперыментальныя законы знешняга фотаэфекту. Квантавая гіпотэза Планка.

Фатон. Ураўненне Эйнштэйна для фотаэфекту.

Ціск святла. Імпульс фатона. Карпускулярна-хвалевы дуалізм.

***Дэманстрацыі, доследы, камп'ютарныя мадэлі***

- Фотаэлектрычны эфект.
- Законы знешняга фотаэфекту.
- Устройства і дзеянне фотарэле.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ
ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучань павінен:

*мець уяўленне:*

- ♦ пра цеплавое выпраменьванне і квантавую гіпотэзу Планка;
- ♦ ужыванне фотаэфекту;
- ♦ ціск святла;
- ♦ карпускулярна-хвалевы дуалізм;

*ведаць/разумець:*

- ♦ сэнс фізічных паняццяў: фатон, унутраны і знешні фотаэфект, чырвоная мяжа, работа выхаду, ціск святла, імпульс фатона;
- ♦ сэнс фізічных законаў: знешняга фотаэфекту;

*умець* тлумачыць з'яву знешняга фотаэфекту;

*валодаць* практычнымі ўменнямі: рашаць якасныя, графічныя, разліковыя задачы на вызначэнне энергіі і імпульсу фатона, чырвонай мяжы фотаэфекту, затрымліваючага патэнцыялу, работы выхаду з выкарыстаннем ураўнення Эйнштэйна для фотаэфекту.

## **6. Фізіка атама** (10 гадзін)

З'явы, якія пацвярджаюць складаную будову атама. Ядзерная мадэль атама.

Квантавыя пастулаты Бора. Квантава-механічная мадэль атама вадароду.

Выпраменьванне і паглынанне святла атамамі і малекуламі. Спектры выпраменьвання і паглынання.

Спантаннае і індуцыраванае выпраменьванне. Лазеры.

***Дэманстрацыі, доследы, камп'ютарныя мадэлі***

- Лінейчасты спектр выпраменьвання.
- Спектр паглынання.
- Мадэль вопыту Рэзерфарда.
- Лазер.
- Галаграма.

### АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ
### ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучань павінен:

*мець уяўленне:*

- пра фізічныя мадэлі: ядзерная мадэль атама, мадэль атама вадароду паводле Бора;
- прынцып дзеяння лазера;
- дасягненні беларускіх вучоных у галіне спектраскапіі і квантавай электронікі;

*ведаць/разумець:*

- ♦ сэнс фізічных паняццяў: асноўны і ўзбуджаныя энергетычныя станы атама;
- ♦ сэнс пастулатаў Бора;

*умець* тлумачыць працэс выпраменьвання і паглынання энергіі атамам;

*валодаць* практычнымі ўменнямі: рашаць якасныя і разліковыя задачы на вызначэнне частаты і даўжыні хвалі выпраменьвання атама пры пераходзе электрона ў атаме з аднаго энергетычнага стану ў іншы.

## 7. Ядзерная фізіка і элементарныя часціцы (23 гадзіны)

Пратонна-нейтронная мадэль будовы ядра атама.

Дэфект мас. Энергія сувязі атамнага ядра.

Ядзерныя рэакцыі. Законы захавання ў ядзерных рэакцыях. Энергетычны выхад ядзерных рэакцый.

Радыеактыўнасць. Закон радыеактыўнага распаду. Перыяд паўраспаду. Альфа-, бэта-радыеактыўнасць, гама-выпраменьванне. Дзеянне іанізуючых выпраменьванняў на жывыя арганізмы.

Дзяленне цяжкіх ядзер. Ланцуговыя ядзерныя рэакцыі. Ядзерны рэактар. Рэакцыі ядзернага сінтэзу.

Ядзерная энергетыка. Экалагічныя праблемы яе вытворчасці.

Элементарныя часціцы і іх узаемадзеянні.

***Дэманстрацыі, доследы, камп'ютарныя мадэлі***

- ♦ Назіранне трэкаў у камеры Вільсана.
- ♦ Фатаграфіі трэкаў зараджаных часціц.
- ♦ Ядзерны рэактар.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ
ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучань павінен:

*мець уяўленне:*

- пра ядзерную энергетыку і экалагічныя праблемы яе вытворчасці;
- элементарныя часціцы і іх узаемадзеянні;
- дасягненні беларускіх вучоных у галіне ядзернай фізікі і фізікі элементарных часціц;

*ведаць/разумець:*

- сэнс фізічных паняццяў: пратонна-нейтронная мадэль ядра, ядзерная рэакцыя, энергія сувязі, дэфект мас, энергетычны выхад ядзернай рэакцыі, перыяд паўраспаду, ланцуговая ядзерная рэакцыя дзялення;
- сэнс фізічных з’яў і працэсаў: радыеактыўнасць, радыеактыўны распад, дзяленне і сінтэз ядзер;
- сэнс фізічных законаў: радыеактыўнага распаду, захавання ў ядзерных рэакцыях;

*валодаць* практычнымі ўменнямі: рашаць якасныя, разліковыя і графічныя задачы на вызначэнне прадуктаў ядзерных рэакцый, энергіі сувязі атамнага ядра, перыяду паўраспаду радыеактыўных рэчываў з выкарыстаннем закона захавання электрычнага зараду і масавага ліку, формулы ўзаемасувязі масы і энергіі.

## 8. Адзіная фізічная карціна свету (3 гадзіны)

Сучасная фізічная і прыродазнаўчанавуковая карціны свету.

АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ
ДА ВЫНІКАЎ ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучань павінен:

*мець уяўленне* пра сучасную прыродазнаўчанавуковую карціну свету.

# ХІМІЯ

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Змест адукацыі вучэбнага прадмета «Хімія» арыентаваны на асваенне вучнямі кампетэнцый, неабходных для рацыянальнай дзейнасці ў свеце рэчываў і хімічных ператварэнняў на аснове ведаў пра ўласцівасці найважнейшых рэчываў, якія акружаюць чалавека ў паўсядзённым жыцці, і разуменне сутнасці хімічных ператварэнняў, а таксама на фарміраванне ў вучняў разумення ролі хіміі ў вырашэнні найбольш актуальных праблем, што стаяць перад чалавецтвам у XXI ст. Ад правільнага вырашэння гэтых праблем залежыць здароўе людзей, узровень іх жыцця і стан навакольнага асяроддзя.

Мэта вывучэння хіміі на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі — фарміраванне сістэмы хімічных ведаў і вопыту іх прымянення, якая забяспечвае разуменне прыродазнаўчанавуковай карціны свету, актыўную адаптацыю ў соцыуме і бяспечныя паводзіны, гатоўнасць працягваць адукацыю на наступных узроўнях і ступенях прафесійнай адукацыі.

Задачы вывучэння хіміі на III ступені агульнай сярэдняй адукацыі:

- фарміраванне сістэмных хімічных ведаў, якія ствараюць аснову для бесперапыннай адукацыі і самаадукацыі на ўсіх этапах навучання і будучай прафесійнай дзейнасці;
- фарміраванне і развіццё ключавых, агульнапрадметных і прадметна-спецыяльных кампетэнцый — ведаў, уменняў, спосабаў і вопыту дзейнасці — з улікам спецыфікі хіміі як фундаментальнай прыродазнаўчай навукі;
- фарміраванне і развіццё ў вучняў сацыяльна значных агульнакультурных і асобасных каштоўнасных арыентацый, якія прадугледжваюць рацыянальнае і бяспечнае выкарыстанне рэчываў у паўсядзённым жыцці;

- фарміраванне пашыраных сістэмных хімічных ведаў, якія ствараюць аснову для бесперапыннай прыродазнаўчанавуковай адукацыі і будучай прафесійнай дзейнасці, звязанай з хіміяй.

Дадзеная вучэбная праграма па вучэбным прадмеце «Хімія» прызначана для вывучэння хіміі ў XI класе ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі на павышаным узроўні ва ўмовах профільнага навучання.

Вучэбная праграма складзена ў адпаведнасці з вучэбным планам, які прадугледжвае для вывучэння хіміі на павышаным узроўні 4 гадзіны на тыдзень (усяго 140 гадзін).

Павышаны ўзровень вывучэння хіміі ўключае ў сябе базавы ўзровень. На павышаным узроўні ажыццяўляецца больш глыбокая падрыхтоўка вучняў за кошт пашырэння тэарэтычнай інтэрпрэтацыі хімічных з’яў, пераліку эксперыментальных і разліковых задач, увядзення ўскладненых задач.

Структура вучэбнай праграмы прадугледжвае вывучэнне агульнай і неарганічнай хіміі ў XI класе. Вывучэнне вучэбнага матэрыялу пачынаецца з тэмы «Важнейшыя класы неарганічных рэчываў», якая падрыхтуе вучняў да засваення вучэбнага матэрыялу па агульнай і неарганічнай хіміі. Далей вывучаюцца раздзелы агульнай хіміі, прысвечаныя асноўным паняццям і законам, уключаючы перыядычны закон; тэорыі хімічнай сувязі; заканамернасці працякання хімічных рэакцый; хіміі раствораў. Завяршаецца курс вывучэннем хіміі элементаў.

Пры вывучэнні курса вучні будуць знаёміцца з залежнасцю ўласцівасцей рэчываў ад іх будовы, ужываннем хімічных злучэнняў і іх ператварэнняў у розных сферах жыццядзейнасці чалавека.

Для кожнай тэмы ў праграме вызначаны пытанні, якія належыць вывучыць, тыпы разліковых задач, пазначаны пералікі дэманстрацый, лабараторных доследаў, тэмы практычных работ. Настаўніку даецца права замены дэманстрацыйных і лабараторных доследаў на іншыя (раўнацэнныя), больш даступныя ва ўмовах дадзенай установы адукацыі. Па сваім меркаванні настаўнік можа павялічыць лік дэманстрацыйных доследаў. Прадугледжаны час на правядзенне кантрольных работ.

Пазначаная ў праграме колькасць гадзін, якія адводзяцца на вывучэнне вучэбных тэм, з’яўляецца прыкладнай. Яна можа быць

пераразмеркавана паміж тэмамі ў разумных межах (2-4 гадзіны). Рэзервовы час настаўнік выкарыстоўвае па сваім меркаванні. Акрамя таго, магчыма змяненне паслядоўнасці вывучэння пытанняў у межах асобнай тэмы пры адпаведным абгрунтаванні такіх змяненняў.

У праграме ёсць раздзел «Асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў». На аснове гэтых патрабаванняў ажыццяўляецца кантроль і ацэнка вынікаў вучэбнай дзейнасці вучняў, якасці засваення ведаў і ўзроўню сфарміраванасці кампетэнцый.

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА ПРАДМЕТА

**(4 гадзіны на тыдзень; усяго 140 гадзін, з іх 4 гадзіны — рэзервовы час)**

### Тэма 1. Важнейшыя класы неарганічных рэчываў (6 гадзін)

Важнейшыя класы неарганічных рэчываў: аксіды, асновы, кіслоты і солі. Іх класіфікацыя, наменклатура, спосабы атрымання і хімічныя ўласцівасці.

Узаемасувязь паміж класамі неарганічных рэчываў.

*Дэманстрацыі*

1. Узоры неарганічных рэчываў.

### Тэма 2. Асноўныя паняцці і законы хіміі (10 гадзін)

Асноўныя паняцці хіміі. Атам, малекула, рэчыва. Хімічны элемент. Простыя і складаныя рэчывы. Рэчывы малекулярнай і немалекулярнай будовы. Формульная адзінка.

Колькасныя характарыстыкі рэчыва: маса, колькасць рэчыва, малярная маса, малярны аб'ём (газаў).

Паняцце пра стэхіяметрыю. Закон захавання масы рэчыва. Закон пастаянства саставу рэчыва. Закон аб'ёмных адносін. Закон Авагадра. Малярны аб'ём і малярная канцэнтрацыя газу. Адносная шчыльнасць газаў.

***Разліковыя задачы***

1. Разлік аб'ёмных адносін газападобных рэчываў па хімічных ураўненнях.

2. Вылічэнне малярнай канцэнтрацыі газу.

***Дэманстрацыі***

2. Узоры рэчыва колькасцю 1 моль.

3. Доследы, якія даказваюць выкананне закону захавання масы рэчываў у хімічных рэакцыях.

### **Т э м а 3. Будова атама і перыядычны закон** (14 гадзін)

Ядзерная мадэль будовы атама. Састаў атамнага ядра. Атамны нумар, масавы лік. Ізатопы. З'ява радыеактыўнасці.

Стан электрона ў атаме. Атамная арбіталь. Энергетычны ўзровень, энергетычны падузровень. *s*-, *p*-, *d*-, *f*-арбіталі. Асноўны і ўзбуджаны стан атама. Электронна-графічныя схемы, электронныя канфігурацыі атамаў элементаў першых чатырох перыядаў. *s*-, *p*-, *d*-, *f*-элементы.

Перыядычнасць змянення радыуса атама, металічных і неметалічных уласцівасцей, электраадмоўнасці з павелічэннем атамнага нумара элементаў А-груп. Змяненне кіслотна-асноўных уласцівасцей аксідаў і гідраксідаў з павелічэннем атамнага нумара для элементаў А-груп. Узмацненне кіслотных уласцівасцей аксідаў і гідраксідаў з павелічэннем значэння ступені акіслення элемента ў злучэнні.

Перыядычны закон і перыядычная сістэма хімічных элементаў Д. І. Мендзялеева. Фізічны сэнс нумара перыяду і нумара групы. Фізічны сэнс перыядычнага закону.

Характарыстыка хімічнага элемента па яго становішчы ў перыядычнай сістэме і будове атама. Значэнне перыядычнага закону.

***Дэманстрацыі***

4. Табліцы перыядычнай сістэмы хімічных элементаў.

### **Т э м а 4. Хімічная сувязь і будова рэчыва** (16 гадзін)

Прырода і тыпы хімічнай сувязі (кавалентная, іонная, металічная). Абменны і донарна-акцэптарны механізмы ўтварэння кавалентнай сувязі.

Валентныя магчымасці і ступені акіслення атамаў элементаў А-груп.

Гібрыдызацыя атамных арбіталей і прасторавая будова малекул арганічных і неарганічных злучэнняў (вуглевадароды, аміяк, іон амонію, вада).

Рэчывы малекулярнай і немалекулярнай будовы. Тыпы крышталічных структур: атамная, іонная, малекулярная, металічная.

Міжмалекулярнае ўзаемадзеянне. Уплыў міжмалекулярнага ўзаемадзеяння на агрэгатны стан рэчыва. Вадародная сувязь і яе ўплыў на фізічныя ўласцівасці рэчыва. Значэнне вадароднай сувязі для прыродных аб'ектаў.

*Дэманстрацыі*

5. Узоры рэчываў з рознымі тыпамі хімічнай сувязі.

6. Крышталічныя рашоткі рэчываў з рознымі тыпамі хімічнай сувязі.

*Лабараторныя доследы*

1. Складанне мадэлей малекул неарганічных і арганічных злучэнняў.

### Тэма 5. Хімічныя рэакцыі (14 гадзін)

Класіфікацыя хімічных рэакцый.

Цеплавы эфект хімічнай рэакцыі. Рэакцыі экза- і эндатэрмічныя. Тэрмахімічныя ўраўненні.

Скорасць хімічных рэакцый. Залежнасць скорасці хімічных рэакцый ад прыроды рэагуючых рэчываў (энергія актывацыі), канцэнтрацыі (закон дзеючых мас), тэмпературы (правіла Вант-Гофа), плошчы паверхні судакранання, наяўнасці каталізатара.

Абарачальнасць хімічных рэакцый. Хімічная раўнавага. Паняцце пра канстанту хімічнай раўнавагі. Напрамак зрушэння хімічнай раўнавагі пад дзеяннем знешніх фактараў (прынцып Ле Шатэлье).

Акісляльна-аднаўленчыя працэсы. Важнейшыя акісляльнікі і аднаўляльнікі. Састаўленне ўраўненняў акісляльна-аднаўленчых рэакцый на аснове метаду электроннага балансу. Акісляльна-аднаўленчыя працэсы ў прыродзе, тэхніцы, побыце.

***Разліковыя задачы***

3. Разлікі па тэрмахімічных ураўненнях.

***Дэманстрацыі***

7. Экза- і эндатэрмічныя працэсы.

8. Залежнасць скорасці хімічных рэакцый ад плошчы паверхні судакранання рэагуючых рэчываў.

9. Каталітычнае і некаталітычнае раскладанне пераксіду вадароду.

10. Дзеянне воцатнай і сернай кіслот на цынк (жалеза).

11. Акісляльна-аднаўленчыя рэакцыі.

***Лабараторныя доследы***

2. Даследаванне ўплыву тэмпературы і канцэнтрацыі кіслаты на скорасць узаемадзеяння цынку (жалеза) і салянай кіслаты.

***Практычныя работы***

1. Хімічныя рэакцыі (1 гадзіна).

## Т э м а 6. Хімія раствораў (14 гадзін)

Растворы. Растварэнне як фізіка-хімічны працэс. Цеплавыя эфекты пры растварэнні. Гідраты і крышталегідраты.

Залежнасць растваральнасці рэчываў ад прыроды рэчыва, тэмпературы і ціску.

Спосабы выражэння саставу раствораў: масавая доля, малярная канцэнтрацыя раствoранага рэчыва.

Электралітычная дысацыяцыя злучэнняў з рознымі тыпамі хімічнай сувязі.

Ступень электралітычнай дысацыяцыі. Моцныя і слабыя электраліты. Ураўненні дысацыяцыі моцных і слабых электралітаў. Канстанта дысацыяцыі.

Умовы неабарачальнага працякання рэакцый іоннага абмену ў растворах электралітаў.

Хімічныя ўласцівасці асноў, кіслот, солей у святле тэорыі электралітычнай дысацыяцыі.

Вада як слабы электраліт. Вадародны паказчык (pH) раствору. Характарыстыка кіслотных і асноўных уласцівасцей раствораў на падставе велічыні pH раствору.

Гідроліз солей.

***Разліковыя задачы***

4. Разлік мас або аб'ёмаў рэчываў, неабходных для падрыхтоўкі раствору з зададзенай масавай доляй (малярнай канцэнтрацыяй) растворанага рэчыва.

5. Вылічэнне pH раствораў моцных кіслот і шчолачаў.

***Дэманстрацыі***

12. Электраправоднасць раствораў электралітаў.

13. Рэакцыі іоннага абмену, якія працякаюць з утварэннем газу, асадку, маладысацыіраванага рэчыва.

14. Хімічныя ўласцівасці кіслот, асноў і солей.

***Лабараторныя доследы***

3. Рэакцыі іоннага абмену.

4. Вызначэнне кіслотна-асноўнага характару раствору з дапамогай індыкатараў.

5. Гідроліз солей (вызначэнне pH раствораў солей).

***Практычныя работы***

2. Вывучэнне ўласцівасцей кіслот, асноў і солей у святле тэорыі электралітычнай дысацыяцыі (1 гадзіна).

3. Рашэнне эксперыментальных задач па тэме «Хімія раствораў» (1 гадзіна).

## **Т э м а 7. Неметалы** (36 гадзін)

Становішча неметалаў у перыядычнай сістэме хімічных элементаў.

Будова знешніх электронных абалонак атамаў неметалаў. Электронна-графічныя схемы, электронныя канфігурацыі атамаў неметалаў. Валентныя магчымасці, ступені акіслення атамаў неметалаў у злучэннях.

**Вадарод.** Вадарод як хімічны элемент і простае рэчыва. Ізатопы вадароду. Фізічныя ўласцівасці.

Хімічныя ўласцівасці: узаемадзеянне з неметаламі, шчолачнымі і шчолачна-зямельнымі металамі, аксідамі металаў, гідрыраванне ненасычаных арганічных злучэнняў.

Лятучыя вадародныя злучэнні неметалаў (састаў, фізічныя ўласцівасці, змяненне кіслотных уласцівасцей злучэнняў у групах і перыядах).

Гідрыды шчолачных і шчолачна-зямельных металаў (фізічныя ўласцівасці, узаемадзеянне з вадой).

Пераксід вадароду: будова малекулы, фізічныя і хімічныя ўласцівасці: рэакцыя раскладання, узаемадзеянне з растворамі перманганату калію і ёдыдаў.

Атрыманне вадароду ў лабараторыі і ў прамысловасці. Выкарыстанне вадароду як экалагічна чыстага паліва і сыравіны для хімічнай прамысловасці.

**Галагены.** Галагены як хімічныя элементы і простыя рэчывы. Фізічныя ўласцівасці простых рэчываў. Важнейшыя прыродныя злучэнні галагенаў.

Атрыманне хлору ў лабараторыі дзеяннем акісляльнікаў на канцэнтраваную саляную кіслату. Атрыманне хлору ў прамысловасці электролізам расплаву хларыду натрыю.

Хімічныя ўласцівасці галагенаў: узаемадзеянне з металамі, вадародам, растворамі солей галагенавадародных кіслот; узаемадзеянне хлору са шчолачамі на холадзе і пры награванні, хлараванне арганічных злучэнняў. Галагены як акісляльнікі.

Асаблівасці хімічных уласцівасцей фтору: узаемадзеянне з кіслародам, вадой.

Галагенавадароды. Атрыманне галагенавадародаў. Фізічныя ўласцівасці.

Галагенавадародныя кіслоты. Сіла галагенавадародных кіслот. Хімічныя ўласцівасці галагенавадародных кіслот: дзеянне на індыкатары; узаемадзеянне з металамі, асноўнымі і амфатэрнымі аксідамі, гідраксідамі металаў, солямі. Асаблівасці фторавадароднай кіслаты: узаемадзеянне з аксідам крэмнію(IV) (дзеянне на шкло).

Солі галагенавадародных кіслот. Якасныя рэакцыі на галагеніды.

Біялагічнае значэнне і прымяненне галагенаў і іх злучэнняў.

**Кісларод і сера.** Кісларод і сера як хімічныя элементы і простыя рэчывы. Простыя рэчывы кіслароду і серы, алатропія (кісларод, азон; рамбічная, манаклінная, пластычная сера). Прыродныя злучэнні кіслароду і серы.

Фізічныя ўласцівасці кіслароду і азону. Будова малекулы азону.

Хімічныя ўласцівасці кіслароду: акісленне простых і складаных рэчываў (металаў, неметалаў, аксіду вугляроду(II), аксідаў жалеза(II) і (II, III), сульфідаў жалеза і цынку, арганічных злучэнняў).

Асаблівасці хімічных уласцівасцей азону: узаемадзеянне з растворам ёдыду калію.

Фізічныя ўласцівасці рамбічнай серы. Састаў і будова малекулы. Хімічныя ўласцівасці: узаемадзеянне з фторам, кіслародам, вадародам, металамі.

Прымяненне кіслароду і серы.

Вадародныя злучэнні кіслароду і серы.

Вада. Будова малекулы. Асаблівасці фізічных уласцівасцей, абумоўленыя вадароднымі сувязямі. Хімічныя ўласцівасці вады: узаемадзеянне з актыўнымі металамі, кіслотнымі і асноўнымі аксідамі, галагенамі, гідрыдамі металаў, солямі (гідроліз).

Серавадарод (будова малекулы, фізічныя ўласцівасці, уплыў на арганізм чалавека). Хімічныя ўласцівасці: узаемадзеянне з кіслародам з утварэннем серы і аксіду серы(IV); узаемадзеянне з аксідам серы(IV).

Серавадародная кіслата як слабая двухасноўная кіслата і яе солі — сульфіды і гідрасульфіды. Якасная рэакцыя на сульфід-іоны.

Кіслародныя злучэнні серы.

Аксід серы(IV): будова малекулы, фізічныя ўласцівасці. Хімічныя ўласцівасці: узаемадзеянне з вадой з утварэннем сернай кіслаты; асноўнымі аксідамі з утварэннем сульфітаў; шчолачамі з утварэннем сульфітаў і гідрасульфітаў.

Аксід серы(VI), фізічныя ўласцівасці. Хімічныя ўласцівасці: узаемадзеянне з вадой з утварэннем сернай кіслаты, раскладанне пры награванні.

Серная кіслата як моцная двухасноўная кіслата. Хімічныя ўласцівасці разбаўленай сернай кіслаты: дзеянне на індыкатары, узаемадзеянне з металамі, асноўнымі і амфатэрнымі аксідамі, гідраксідамі металаў, солямі. Акісляльныя ўласцівасці канцэнтраванай сернай кіслаты на прыкладзе ўзаемадзеяння з металамі (медзь, серабро, цынк, магній). Хімічныя рэакцыі, якія ляжаць у аснове прамысловага атрымання сернай кіслаты.

Сульфаты: калію, натрыю (бязводны і крышталічны, глаўберава соль), магнію; купарвасы (медны, жалезны, цынкавы).

Прымяненне сернай кіслаты і сульфатаў (глаўберава соль, сульфат магнію, медны купарвас).

**Азот і фосфар.** Азот і фосфар як хімічныя элементы і простыя рэчывы. Фізічныя ўласцівасці простых рэчываў. Алатропія фосфару (белы, чырвоны, чорны фосфар). Хімічныя ўласцівасці азоту і фосфару: узаемадзеянне з актыўнымі металамі (утварэнне нітрыдаў і фасфідаў); узаемадзеянне з кіслародам (утварэнне аксіду азоту(II), аксідаў фосфару(III) і (V)); узаемадзеянне азоту з вадародам. Біялагічная роля і прымяненне азоту і фосфару.

Аміяк. Будова малекулы. Асаблівасці фізічных уласцівасцей, абумоўленыя вадароднымі сувязямі. Хімічныя ўласцівасці аміяку: узаемадзеянне з кіслародам (гарэнне і каталітычнае акісленне), вадой, кіслотамі. Хімічныя асновы прамысловага атрымання аміяку. Гідрат аміяку. Солі амонію, рэакцыі іх узаемадзеяння са шчолачамі і раскладання пры награванні. Якасная рэакцыя на іоны амонію. Прымяненне аміяку і солей амонію.

Аксід азоту(II): састаў, фізічныя і хімічныя ўласцівасці (узаемадзеянне з кіслародам).

Аксід азоту(IV): састаў, фізічныя і хімічныя ўласцівасці (асаблівасці ўзаемадзеяння з вадой).

Азотная кіслата. Будова малекулы. Хімічныя ўласцівасці азотнай кіслаты: дзеянне на індыкатары, узаемадзеянне з асноўнымі і амфатэрнымі аксідамі, гідраксідамі металаў, солямі. Акісляльныя ўласцівасці канцэнтраванай і разбаўленай азотнай кіслаты пры ўзаемадзеянні з металамі.

Нітраты: тэрмічнае раскладанне.

Хімічныя рэакцыі, якія ляжаць у аснове прамысловага атрымання азотнай кіслаты.

Прымяненне азотнай кіслаты і нітратаў.

Аксіды фосфару(III) і (V), іх утварэнне ў выніку акіслення фосфару. Узаемадзеянне аксіду фосфару(V) з вадой з утварэннем фосфарнай кіслаты; з асноўнымі аксідамі, шчолачамі з утварэннем сярэдніх солей.

Фосфарная кіслата: асаблівасці электралітычнай дысацыяцыі. Хімічныя ўласцівасці: дзеянне на індыкатары, узаемадзеянне з металамі, асноўнымі аксідамі, асновамі, солямі, аміякам. Солі

фосфарнай кіслаты: фасфаты, гідра- і дэгідрафасфаты. Якасная рэакцыя на фасфат-іон.

Прымяненне фосфарнай кіслаты і фасфатаў.

Важнейшыя мінеральныя ўгнаенні: азотныя, фосфарныя, калійныя, комплексныя.

**Вуглярод і крэмній.** Вуглярод і крэмній як хімічныя элементы і простыя рэчывы. Фізічныя ўласцівасці простых рэчываў. Алатропія вугляроду (алмаз, графіт, карбін, фулерэны, графен). Хімічныя ўласцівасці вугляроду і крэмнію: узаемадзеянне з кіслародам і металамі. Узаемадзеянне вугляроду з вадародам і крэмніем.

Прымяненне вугляроду і крэмнію.

Аксід вугляроду(II): хімічныя сувязі ў малекуле, фізічныя ўласцівасці. Таксічнасць аксіду вугляроду(II). Хімічныя ўласцівасці: узаемадзеянне з кіслародам, аксідамі металаў; выкарыстанне для атрымання метанолу і мурашынай кіслаты.

Аксід вугляроду(IV): будова малекулы, фізічныя ўласцівасці. Хімічныя ўласцівасці: узаемадзеянне з вадой, асноўнымі аксідамі, шчолачамі (утварэнне карбанатаў і гідракарбанатаў).

Аксіды вугляроду як забруджвальнікі атмасфернага паветра.

Вугальная кіслата як няўстойлівае злучэнне. Карбанаты і гідракарбанаты. Хімічныя ўласцівасці солей вугальнай кіслаты: узаемадзеянне з кіслотамі, тэрмічнае раскладанне, узаемапераўтварэнне карбанатаў і гідракарбанатаў.

Карбанаты натрыю і калію: кальцыніраваная сода, пітная сода, паташ, іх прымяненне ў быце. Прымяненне карбанатаў у вытворчасці шкла. Карбанат кальцыю ў прыродзе ў саставе мелу, вапняку, мармуру, іх выкарыстанне. Асноўны карбанат медзі(II) (малахіт): састаў, прымяненне.

Аксід крэмнію(IV): немалекулярная будова, фізічныя ўласцівасці. Хімічныя ўласцівасці: узаемадзеянне са шчолачамі (у растворах і пры сплаўленні), асноўнымі аксідамі, солямі, плавікавай кіслатой.

Крэмніевая кіслата: атрыманне дзеяннем моцных кіслот на растворы сілікатаў; дэгідратацыя пры награванні. Сілікагель.

Вытворчасць будаўнічых матэрыялаў (цэмент, бетон, шкло). Хімічныя рэакцыі, якія ляжаць у аснове вытворчасці шкла і цэменту.

***Дэманстрацыі***

15. Узоры розных неметалаў.

16. Атрыманне вадароду ўзаемадзеяннем цынку з салянай кіслатой.

17. Прыродныя злучэнні галагенаў.

18. Якасныя рэакцыі на хларыд-, брамід-, ёдыд-іоны.

19. Узоры сульфатаў.

20. Выяўленне сульфат-іонаў у растворы.

21. Узоры нітратаў.

22. Узоры мінеральных угнаенняў.

23. Крышталічныя рашоткі графіту і алмазу.

24. Рэакцыя ўзаемадзеяння карбанатаў з кіслотамі.

25. Узаемаператварэнні гідракарбанату і карбанату кальцыю.

***Лабараторныя доследы***

6. Выпрабаванне індыкатарам раствораў вадародных злучэнняў неметалаў.

7. Даследаванне хімічных уласцівасцей разбаўленага раствору сернай кіслаты.

8. Выяўленне іонаў амонію ў растворы.

9. Выяўленне фасфат-іонаў у растворы.

***Практычныя работы***

4. Рашэнне эксперыментальных задач па тэме «Неметалы» (1 гадзіна).

5. Распазнаванне мінеральных угнаенняў (1 гадзіна).

## Т э м а 8. Металы (20 гадзін)

Становішча металаў у перыядычнай сістэме хімічных элементаў. Электронна-графічныя схемы і электронныя канфігурацыі атамаў металаў. Ступені акіслення атамаў металаў у злучэннях. Кіслотна-асноўныя ўласцівасці кіслародных злучэнняў $d$-элементаў у розных ступенях акіслення.

Распаўсюджанасць металаў у зямной кары.

Фізічныя ўласцівасці металаў.

Афарбоўванне полымя лятучымі злучэннямі металаў (натрыю, калію, стронцыю, барыю, рубідыю, медзі).

Агульныя хімічныя ўласцівасці металаў: узаемадзеянне з неметаламі, вадой, кіслотамі, воднымі растворамі шчолачаў і солей. Рад актыўнасці металаў.

Асноўныя прамысловыя метады атрымання металаў (пірametaлургія, гідраметалургія, электраметалургія).

Электроліз водных раствораў і расплаваў солей.

Атрыманне важнейшых металаў (жалеза, цынк, медзь, свінец, хром, тытан).

Сплавы металаў: чыгун, сталь, бронза, латунь, мельхіёр, дзюралюміній.

Прымяненне металаў і сплаваў.

**Металы IA-групы.** Шчолачныя металы: становішча ў перыядычнай сістэме хімічных элементаў. Будова атама, фізічныя ўласцівасці. Злучэнні натрыю і калію ў прыродзе. Атрыманне натрыю электролізам расплаваў злучэнняў.

Хімічныя ўласцівасці літыю, натрыю і калію: узаемадзеянне з кіслародам, вадой, вадародам, неметаламі (азот, фосфар, сера, галагены).

Злучэнні натрыю і калію: аксіды, пераксіды, гідраксіды, гідрыды, солі, іх фізічныя і хімічныя ўласцівасці.

Біялагічная роля і прымяненне натрыю, калію і іх злучэнняў.

**Металы IIA-групы.** Становішча шчолачна-зямельных металаў і магнію ў перыядычнай сістэме хімічных элементаў, будова атама, фізічныя ўласцівасці. Знаходжанне кальцыю і магнію ў прыродзе.

Атрыманне кальцыю электролізам расплаву хларыду кальцыю і алюмінатэрмічна. Хімічныя ўласцівасці металаў IIA-групы на прыкладзе кальцыю і магнію: узаемадзеянне з кіслародам, вадой, кіслотамі, вадародам, неметаламі (азот, фосфар, сера, галагены).

Важнейшыя злучэнні кальцыю: аксід (нягашаная вапна), гідраксід (гашаная вапна), карбанат, гідракарбанат, сульфат (гіпс), карбід, іх уласцівасці, атрыманне і прымяненне.

Гідраксід магнію як нерастваральная аснова, гідраксіды кальцыю і барыю як шчолачы.

Жорсткасць вады і спосабы яе памяншэння.

Прымяненне важнейшых злучэнняў кальцыю і магнію.

**Алюміній.** Знаходжанне ў прыродзе. Фізічныя ўласцівасці.

Хімічныя ўласцівасці алюмінію: узаемадзеянне з кіслародам, галагенамі, вадой, кіслотамі і шчолачамі. Алюмінатэрмія.

Аксід і гідраксід алюмінію. Амфатэрныя ўласцівасці аксіду і гідраксіду алюмінію. Солі алюмінію. Метаалюмінаты і гідраксаалюмінаты як прадукты ўзаемадзеяння солей алюмінію са шчолачамі.

Вытворчасць алюмінію.

Прымяненне алюмінію, яго злучэнняў і сплаваў.

**Металы B-груп.** Асаблівасці электроннай будовы атамаў. Ступені акіслення атамаў у злучэннях.

Злучэнні марганцу і хрому ў розных ступенях акіслення. Акісляльныя ўласцівасці злучэнняў марганцу і хрому ў вышэйшай ступені акіслення.

Агульная характарыстыка кіслотна-асноўных уласцівасцей аксідаў і гідраксідаў металаў B-груп.

**Жалеза.** Знаходжанне ў прыродзе.

Фізічныя і хімічныя ўласцівасці жалеза. Важнейшыя злучэнні жалеза: аксіды, гідраксіды, солі. Якасныя рэакцыі на іоны $Fe^{2+}$ і $Fe^{3+}$.

Хімічная і электрахімічная карозія жалеза, спосабы засцярогі ад карозіі.

Прымяненне металаў B-груп (жалеза, хром, медзь, цынк, нікель, марганец, тытан, серабро) і іх злучэнняў. Біялагічная роля злучэнняў металаў B-груп.

***Дэманстрацыі***

26. Калекцыя ўзораў металаў і сплаваў.
27. Узаемадзеянне металаў з вадой, кіслародам.
28. Электроліз.
29. Афарбоўванне полымя злучэннямі металаў.
30. Акісляльныя ўласцівасці злучэнняў марганцу ў вышэйшай ступені акіслення.
31. Атрыманне і акісленне гідраксіду жалеза(II).
32. Доследы па карозіі жалеза.

***Лабараторныя доследы***

10. Узаемадзеянне металаў з растворамі кіслот.
11. Выяўленне іонаў кальцыю ў растворы.
12. Амфатэрныя ўласцівасці гідраксіду алюмінію.
13. Выяўленне іонаў жалеза(II) і жалеза(III) у растворах.

***Практычныя работы***

6. Рашэнне эксперыментальных задач па тэме «Металы» (1 гадзіна).

## **Т э м а 9. Хімічныя рэчывы ў жыцці і дзейнасці чалавека** (6 гадзін)

Хімічныя рэчывы ў паўсядзённым жыцці чалавека.

Хімія і сельская гаспадарка.

Хімія і прамысловасць. Ахова навакольнага асяроддзя ад шкоднага ўздзеяння хімічных рэчываў.

***Практычныя работы***

7. Рашэнне эксперыментальных задач па тэме «Атрыманне і ўласцівасці неарганічных злучэнняў» (1 гадзіна).

***Экскурсія***

Экскурсія на прамысловае або сельскагаспадарчае прадпрыемства (з улікам асаблівасцей рэгіёна).

### АСНОЎНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ВУЧЭБНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ВУЧНЯЎ

Вучні павінны:

*даваць азначэнні паняццям:*

- рэчыва; атам, малекула, хімічны элемент; простае і складанае рэчыва, хімічнае злучэнне; валентнасць; колькасць рэчыва; адносная шчыльнасць газу; хімічная рэакцыя; тыпы хімічных рэакцый (злучэння, раскладання, замяшчэння, абмену); рэакцыя нейтралізацыі; класы неарганічных злучэнняў: аксіды, кіслоты, асновы, солі, амфатэрныя гідраксіды; індыкатар; каталізатар;
- амфатэрнасць; алатропія; перыядычная сістэма хімічных элементаў (перыяд, група); радыус атама; ізатопы; атамная арбіталь, энергетычны ўзровень і энергетычны падузровень, *s*-, *p*-, *d*-арбіталі, электронная канфігурацыя атама; валентныя электроны; хімічная сувязь, кавалентная сувязь: палярная і непалярная, адзінарная і кратная (двайная, трайная), $\sigma$–сувязь і $\pi$-сувязь, спалучаная, пептыдная, вадародная; даўжыня сувязі, валентны вугал; хімічная формула (малекулярная, структурная, эмпірычная); электраадмоўнасць; іон, іонная сувязь; металічная сувязь; міжмалекулярнае

ўзаемадзеянне; дыполь; малекулярная і немалекулярная будова рэчыва; формульная адзінка; атамныя, іонныя, металічныя, малекулярныя крышталі; ступень акіслення; аднаўляльнік, акісляльнік, аднаўленне, акісленне;

- сумесь; раствор; растваральнасць рэчыва; крышталегідрат; аніён, катыён; электраліты і неэлектраліты, моцныя і слабыя электраліты; ступень электралітычнай дысацыяцыі; вадародны паказчык (pH); рэакцыі іоннага абмену; жорсткасць вады;
- скорасць хімічнай рэакцыі; энергія актывацыі, хімічная раўнавага; канстанта хімічнай раўнавагі; канстанта дысацыяцыі; гідроліз солей;
- сплавы; карозія, рад актыўнасці металаў.

Вучні павінны ў м е ц ь:

*называць:*

- рэчывы па хімічных формулах; класы неарганічных і арганічных злучэнняў; прыметы і ўмовы працякання хімічных рэакцый;
- тып хімічнай сувязі; катыёны і аніёны; умовы працякання рэакцый іоннага абмену; хімічныя элементы — металы і неметалы;
- фармулёўкі законаў: захавання масы рэчыва, пастаянства саставу, Авагадра, аб'ёмных адносін, перыядычнага, дзеючых мас; правіла Вант-Гофа; фактары, якія ўплываюць на скорасць хімічных рэакцый; прыклады неабарачальных і абарачальных хімічных рэакцый; важнейшыя акісляльнікі і аднаўляльнікі; фізічныя і хімічныя ўласцівасці вывучаных металаў, неметалаў, кіслотных, асноўных, амфатэрных аксідаў, асноў, амфатэрных гідраксідаў, кіслот, солей, аміяку; моцныя і слабыя электраліты па формулах; якасныя рэакцыі на іоны $Ca^{2+}$, $NH_4^+$, $Ba^{2+}$, $Cl^-$, $SO_4^{2-}$, $CO_3^{2-}$, $Fe^{2+}$, $Fe^{3+}$, $PO_4^{3-}$; будаўнічыя матэрыялы на аснове прыродных аксідаў і солей, спосабы засцярогі металаў ад карозіі;

*вызначаць:*

- якасны і колькасны састаў злучэння па хімічнай формуле; простыя і складаныя рэчывы па формулах; прыналежнасць рэчыва да вызначанага класа неарганічных і арганічных злучэнняў па хімічнай формуле;

- рэчыва-акісляльнік і рэчыва-аднаўляльнік па ўраўненні акісляльна-аднаўленчай рэакцыі;
- неарганічныя і арганічныя злучэнні (эксперыментальна па якасных рэакцыях);
- валентнасць і ступень акіслення хімічнага элемента па формуле злучэння; тып хімічнай сувязі (паміж металам і неметалам; паміж атамамі неметалаў з рознымі значэннямі электраадмоўнасці; у простых рэчывах); тып хімічнай рэакцыі па ўраўненні;
- прасторавую будову малекул з пазіцыі гібрыдызацыі атамных арбіталей;

*адрозніваць:*

- сімвалы хімічных элементаў і хімічныя формулы; неарганічныя злучэнні розных класаў па формулах; простыя і складаныя рэчывы па формулах; тыпы хімічных рэакцый па ўраўненнях;
- рэчывы з розным тыпам хімічнай сувязі па формулах;
- ураўненні хімічных рэакцый, запісаныя ў малекулярнай, поўнай і скарочанай іонных формах;
- карбанаты, хларыды, фасфаты, сульфаты, іоны $Fe^{2+}$ і $Fe^{3+}$ (эксперыментальна).

Вучні павінны ажыццяўляць наступныя спосабы дзейнасці:

*састаўляць:*

- формулы электронных канфігурацый і схемы запаўнення электронамі электронных слаёў атамаў хімічных элементаў першых чатырох перыядаў перыядычнай сістэмы; ураўненні электралітычнай дысацыяцыі кіслот, шчолачаў, солей; ураўненні хімічных рэакцый у малекулярнай, поўнай і скарочанай іонных формах; ураўненні акісляльна-аднаўленчых рэакцый на аснове метаду электроннага балансу;
- формулу неарганічнага злучэння па валентнасці (ступені акіслення) хімічных элементаў; структурныя формулы рэчываў малекулярнай будовы; ураўненні рэакцый, якія характарызуюць хімічныя ўласцівасці вывучаных рэчываў і спосабы іх атрымання;

*характарызаваць:*

- фізічныя і хімічныя ўласцівасці злучэнняў розных класаў; узаемасувязь паміж класамі неарганічных злучэнняў;

♦ міжмалекулярнае ўзаемадзеянне; раствор; растваральнік, раствoранае рэчыва; растваральнасць; кіслоты, шчолачы, солі як электраліты;
♦ хімічныя элементы па становішчы ў перыядычнай сістэме і будове атамаў; заканамернасці змянення ўласцівасцей хімічных элементаў і ўтвараемых імі рэчываў (простыя рэчывы, вадародныя злучэнні, аксіды, гідраксіды) на аснове становішча элемента ў перыядычнай сістэме; галіны практычнага выкарыстання неарганічных рэчываў;

*тлумачыць:*

♦ фізічны сэнс атамнага нумара, нумара перыяду і нумара групы (для А-груп); фізічны сэнс перыядычнага закону; заканамернасці змянення ўласцівасцей хімічных элементаў першых чатырох перыядаў; электраправоднасць раствораў электралітаў;
♦ механізмы ўтварэння хімічнай сувязі: іонная, кавалентная (абменны і донарна-акцэптарны), металічная; уплыў міжмалекулярнага ўзаемадзеяння на агрэгатны стан рэчыва;
♦ залежнасць скорасці хімічнай рэакцыі ад розных фактараў (прырода рэагуючых рэчываў, канцэнтрацыя, тэмпература, ціск, каталізатар, плошча паверхні судакранання); сутнасць хімічнай раўнавагі і ўмовы яе зрушэння; механізм працэсу электралітычнай дысацыяцыі; прычыны карозіі металаў і сутнасць спосабаў яе папярэджання;

*аналізаваць* вынікі лабараторных доследаў, практычных работ; вучэбную інфармацыю;

*прымяняць:*

♦ вывучаныя паняцці і законы пры характарыстыцы саставу і ўласцівасцей рэчываў, хімічных рэакцый, спосабаў атрымання рэчываў, рашэнні разліковых задач (у рамках вучэбнай праграмы);
♦ правілы бяспечных паводзін пры абыходжанні з рэчывамі, хімічным посудам, лабараторным абсталяваннем і награвальнымі прыборамі;

*абыходзіцца* з неарганічнымі рэчывамі, хімічным посудам, лабараторным абсталяваннем, награвальнымі прыборамі;

*праводзіць* матэматычныя вылічэнні пры рашэнні разліковых задач; хімічны эксперымент;

*карыстацца* падручнікам, інструкцыяй па правілах бяспечных паводзін у хімічным кабінеце, інструкцыяй пры выкананні хімічнага эксперымента.

Вучэбнае выданне

ВУЧЭБНЫЯ ПРАГРАМЫ
ПА ВУЧЭБНЫХ ПРАДМЕТАХ
ДЛЯ ЎСТАНОЎ АГУЛЬНАЙ СЯРЭДНЯЙ АДУКАЦЫІ
З БЕЛАРУСКАЙ МОВАЙ НАВУЧАННЯ І ВЫХАВАННЯ

**XI КЛАС**
**(ПАВЫШАНЫ ЎЗРОВЕНЬ)**

Нач. рэдакцыйна-выдавецкага аддзела *Г. І. Бандарэнка*
Рэдактар *Н. М. Мамчыц*
Вокладка *Ю. М. Галавейка*
Камп'ютарная вёрстка *Ю. М. Галавейка*
Карэктары *К. В. Шобік, Д. Р. Лосік, Л. Г. Ганчарэнка*

Падпісана ў друк 15.07.2016. Фармат 60×84 $^{1}/_{16}$. Папера афсетная.
Друк афсетны. Ум. друк. арк. 14,41. Ул.-выд. арк. 12,3.
Тыраж 1500 экз. Заказ

Навукова-метадычная ўстанова «Нацыянальны інстытут адукацыі»
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Пасведчанне аб дзяржаўнай
рэгістрацыі выдаўца, вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/263 ад 02.04.2014. Вул. Караля, 16, 220004, г. Мінск

ААТ «Прамдрук». Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца,
вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 2/21 ад 23.11.2013.
Вул. Чарняхоўскага, 3, 220049, г. Мінск